# Туга па радзіме

## Паэзія беларускай эміграцыі

Паэзія беларускай эміграцыі

Міхась Кавыль

Вінцук Адважны

Наталля Арсеннева

Уладзімір Клішэвіч

Уладзімір Дудзіцкі

Рыгор Крушына

Хведар Ільяшэвіч

Янка Юхнавец

Анатоль Бярозка

Сяргей Ясень

Янка Золак

Алесь Змагар

Алесь Смаленец

Масей Сяднёў

Алесь Салавей

# ТУГА ПА РАДЗІМЕ

## Паэзія беларускай эміграцыі

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ
ЛІТАРАТУРА»
1992

ББК 84Бел7
Т 81

*Укладанне, прадмова і біяграфічныя даведкі
Барыса Сачанкі*

В книгу включены произведения поэтов белорусской эмиграции XX столетия. Большинство из них в Беларуси печатаются впервые.

Т $\frac{4702120000-112}{М 302(03)-92}$ БЗ 54-91

ISBN 5-340-01086-6

© Укладанне, прадмова,
біяграфічныя даведкі.
Сачанка Б. І., 1992

## ВЯРТАННЕ ДАДОМУ

«Усяму свой час, і час кожнай з'явы пад небам... час раскідваць камяні, і час збіраць камяні...» Так гаварыў мудрэйшы з мудрых Эклезіяст. Жыццё не раз пацвярджала неабвержнасць і праўдзівасць гэтых слоў. І ў нас, у Беларусі, колькі і якіх ні раскідвалі камянёў! Іншы раз самых дарагіх, тых, на якіх трымаюцца падмуркі нацыянальнай самасвядомасці народа, яго сіла і веліч. Менавіта на раскідванні такіх камянёў некаторыя гадамі зараблялі сабе хлеб і да хлеба, а нярэдка і вучоныя, ганаровыя званні.

І вось, нарэшце,— нібыта адверажанне: што мы робім? І выкінутае з памяці і духоўнай скарбніцы народа зноў пачынае паступова займаць сваё належнае месца,— у культуру, гісторыю, мастацтва вяртаюцца ва ўсёй сваёй першароднасці, непаўторнасці і значнасці факты, імёны, творы, без якіх Беларусь была як бы і не Беларусь — для адных «Северо-Западный край», для другіх — «Усходнія Крэсы».

Надышоў час паглядзець па-новаму і да дыяспару — на тых беларусаў, якія па розных прычынах апынуліся за межамі нашай краіны, жывуць там: іх жа ні многа, ні мала — некалькі мільёнаў. Доўгія гады пра іх нават не ўспаміналі — баяліся як чорт ладана. А калі і згадвалі, дык толькі ў адмоўным плане. Асабліва цяжкія абвінавачанні падалі на галовы тых, хто не выракся роднай мовы, быў нераўнадушны да таго, што дзеялася на Бацькаўшчыне. Баронячыся ад незаслужаных абвінавачанняў і папрокаў, сёй-той з эмігрантаў не вытрымліваў, адказваў тым самым. Прымешваліся палітычныя амбіцыі, іншыя інтарэсы... Узнікалі не зусім прыгожыя спрэчкі, якія адно абвастралі і без таго складаныя, напружаныя адносіны. Пра аб'ектыўнасць і справядлівасць не думалася, кожны імкнуўся як балючай даняць свайго апанента. Хвала Богу, здаецца, гэта скончылася.

Сёння ёсць магчымасць паглядзець і на эміграцыю куды больш узважана, спакойна, дыферэнцыравана. Ад гэтага ніхто не прай-

грае, выйграе толькі справядлівасць. І ўсе мы, беларусы, дзе б, з якога боку мяжы ні жылі.

Вядома, беларуская эміграцыя, як, дарэчы, і ўсякая — неаднародная і па сваім паходжанні, і па палітычных, рэлігійных і іншых поглядах, ды і па становішчы ў сучасным грамадстве; да яе нельга падыходзіць апалагетычна. Многія ж з эмігрантаў, асабліва старэйшага пакалення, у гады вайны паказалі сябе не з лепшага боку, а то і перакінуліся ў стан ворага, дапамагалі яму руйнаваць гарады і вёскі, забіваць людзей — якраз тых, хто не скарыўся акупантам, бараніў родную зямлю, ішоў у лес, у партызаны, ці змагаўся з фашысцкай навалай у падполлі,— сталі фактычна саўдзельнікамі жудасных злачынстваў. І гэта не трэба забываць! Зноў жа — пра гэта таксама варта помніць! — не ўсе, хто быў быццам у варожым стане — здраднікі. Некаторым проста не было з чаго жыць, і яны змушаны былі дзесьці працаваць — акупанты ж адносіліся да тых, хто не працуе, як да сабатажнікаў — садзілі ў турмы, высылалі ў Германію, а то і расстрэльвалі. Не варта забываць і яшчэ пра адно — сёй-той, спазнаўшы сталінскія лагеры і цудам вырваўшыся адтуль, не хацеў больш рызыкаваць, і калі адступалі, гнаныя Чырвонай Арміяй, немцы, адступіў разам з імі. Наіўныя пытанні, што некаторыя маладзейшыя таварышы задаюць — чаму, маўляў, не бралі ў рукі зброю, не ішлі ў лес, у партызаны, а быццам супрацоўнічалі з акупантамі, адпадаюць па той простай прычыне, што партызаны не вельмі бралі да сябе «ворагаў народа», з такімі абыходзіліся ў тыя гады, як правіла, паводле законаў ваеннага часу...

Апынуўшыся далёка ад свайго дому, на чужыне, не маючы часта ні прафесіі, ні сродкаў для існавання, большасць нашых суайчыннікаў ішлі працаваць на заводы і фабрыкі, на палі і фермы. Але сярод іх былі і такія, хто не хацеў есці хлеб з працы рук сваіх, а ўладкоўваўся на розныя радыёстанцыі, пісаў такое, што сорамна было чытаць і чуць...

І ўсё ж, нягледзячы на гэта, гаварыць пра эміграцыю толькі адмоўнае, як рабілася зусім нядаўна, было б несправядліва. Лепшая яе частка з гонарам вытрымала выпрабаванні лёсу, захавала любоў і прыхільнасць да сваёй Бацькаўшчыны, роднай зямлі, мовы нашай, перадала гэтую любоў сваім дзецям і ўнукам. Сёння, у сувязі з чарнобыльскай бядою, яна робіць усё магчымае, каб аблегчыць пакуты нашых людзей, дапамагчы нам.

Створаны ў эміграцыі і пэўныя духоўныя каштоўнасці. Не браць іх пад увагу было б проста неразумна. Задача — вярнуць гэтыя каштоўнасці на Радзіму, назнаёміць з імі тых беларусаў,

якія пра іх мала ці зусім нічога не ведаюць. Гэта не лёгка, бо сёй-той з творцаў гэтых каштоўнасцей не такі, якім яго хацелася б бачыць. Але не будзем забываць на тыя ўмовы, у якіх гэтыя творцы змушаны былі жыць. Народная мудрасць кажа: ходзячы ля вады — замочышся, а завіхаючыся ля мукі — запылішся... Не ўбярогся ад гэтага і сёй-той з вядомых у эміграцыі творцаў... Не, ніхто не збіраецца іх апраўдваць! Кесару — кесарава! Але ж і спрашчаць, а то свядома ці несвядома скажаць факты з біяграфіяй, як гэта іншы раз у нас робіцца, прыпісваць тое, чаго не было — таксама няма патрэбы. Ды і помніць трэба, не забываць: некаторыя з гэтых людзей не жылі пры савецкай уладзе, савецкага ладу жыцця яны не ведалі, не бачылі на свае вочы, меркавалі пра яго па тых звестках, што даходзілі са сродкаў масавай інфармацыі. А звесткі тыя не заўсёды, як вядома, былі праўдзівыя. Ды і тое, што рабілася ў нашай краіне ў трыццатыя — саракавыя гады, не выклікала прыхільнасці ў каго б там ні было. А яны ж, нашы землякі-суайчыннікі, былі сынамі і дочкамі свайго народа, любілі сваю Бацькаўшчыну, лёс яе быў ім неабыякавы. І рэакцыя на высылкі, арышты і расстрэлы ні ў чым не вінаватых была адпаведная...

Калі пачалася вайна і немцы акупіравалі Беларусь, аўтарытэт гэтых вядомых і за мяжою, і ў нас, у рэспубліцы, людзей вельмі ж патрэбны быў розным прахвостам ад палітыкі, калабарантам. І яны выкарыстоўвалі іх аўтарытэт у сваіх мэтах. І паўстаць супраць не заўсёды выпадала, ды і не ў кожнага хапала адвагі — такое магло каштаваць жыцця. (Пра гэта добра расказваюць у сваіх успамінах М. Забэйда-Суміцкі і Л. Геніюш.) Так, гэта нікому з іх не робіць гонару. Што ж, за хістанні, нерашучасць і ўсё іншае яны панеслі пакаранне — іх імёны гадамі не згадваліся ў нашым друку, а самі яны змушаны былі жыць далёка ад сваёй Радзімы. Ды некаторыя жывуць і цяпер там. А якое жыццё без Радзімы, без надзеі нават убачыць яе, як душыць «зямлі чужой ярмо», прызналася ў адным з вершаў найлепшая паэтка беларускай эміграцыі Наталля Арсеннева:

Не цалавала рук
нікому я ў жыцці.
Табе ж,
мая зямля,
Я цалавала б ногі...

«Смачная і даўкая костка» — «Бацькаўшчына і Радзіма» — не дае нікому спакойна жыць на чужыне. Успаміны маленства трывожаць, мучаць гадамі. Адсюль і хвароба — страшная, невылечная — настальгія.

З размоў з эмігрантамі, з пісьмаў і творчасці вядома, што самае вялікае, запаветнае жаданне кожнага з іх — вярнуцца дадому, зноў быць там, дзе нарадзіўся, жыў. Аднак вярнуцца дадому, на Бацькаўшчыну, не кожнаму ўдаецца. У гэтым некаторую перавагу над усімі астатнімі маюць хіба творцы — яны вяртаюцца дадому калі не самі, дык сваімі творамі...

«Туга па Радзіме» — гэта спроба вярнуць на Бацькаўшчыну тое, што ёй па праву належыць. Будзем спадзявацца, што ўслед за першай ластаўкай прыляціць, вернецца з доўгага выраю і ўсё, што таго заслугоўвае.

*Барыс Сачанка*

# Наталля Арсеннева

*Наталля Арсеннева нарадзілася 20 верасня 1903 г. у Баку ў сям'і рускага служачага, які паходзіў з роду тых Арсенневых, што даў па жаночай лініі паэта М. Лермантава. Адразу ж пасля нараджэння дачкі бацькі пераязджаюць у Вільню, дзе будучая паэтэса вучыцца спярша дома, потым паступае ў Віленскую гімназію. У часе першай сусветнай вайны, калі нямецкія войскі падышлі да Вільні, сям'я Арсенневых эвакуіравалася ў Яраслаўль. Назад у Вільню вярнуліся ў студзені 1920 г.*

*Закончыла Першую беларускую гімназію, працавала настаўніцай, а пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР — у рэдакцыі абласной газеты «Вілейская праўда». У 1940 г. была высланая ў Казахстан. Па просьбе Саюза пісьменнікаў Беларусі ў 1941 г. вернутая на радзіму.*

*З прыходам нямецка-фашысцкіх захопнікаў працавала ў «Менскай (Беларускай) газэце», была кіраўнічкай аддзела літаратуры так званага Беларускага культурнага згуртавання.*

*У 1944 г. выехала ў Германію. Цяпер жыве ў ЗША.*

*Вершы Н. Арсенневай друкаваліся на старонках заходнебеларускіх выданняў, у газеце «Літаратура і мастацтва». У 1927 г. у выдавецтве Б. Клецкіна выйшаў зборнік яе паэзіі «Пад сінім небам». Напісала таксама зборнікі паэзіі «Жоўтая восень», «Сягоння» (выйшаў з друку ў 1944 г.), «Не астыць нам». У 1979 г. выдала вялікі том выбранай паэзіі «Між берагамі» (Нью-Йорк — Таронта).*

## МІЖ БЕРЕГАМІ

Няцямным немаўлём я пяты памачыла
упершыню ў кіпень ракі майго жыцця.
І вось — другі ўжо бераг шэры неўпрыцям
расце перад вачмі...
                    Ён прыме на спачынак.

А я б — яшчэ плыла,
                    няхай між берагамі
каменне, і віры, і дна глыбінны жвір...
Ці раз параненая імі да крыві,
не паддалася ўсё ж, не пала я ў змаганні.

Рака, рака жыцця!
                    У градаў гнеўнай пене,
У зернятах пяску на плёсах залатых,
бурлі ж павек між берагамі ты,
і ў грудзі — ўжо не мне —
                    а змене бі па змене!

*Рочэстэр, 1971*

# ПАД СІНІМ НЕБАМ

1920—1927

## ПАД СІНІМ НЕБАМ

Ад злых, нявеtлых песняў гора,
ад змораў шэрае зямлі,
у неба сіню, ў неба мора
ты зрок прысталы падымі.
У сінім небе няма распачы
глухой, што гасіць паволі ўсё,
пад сінім небам усё іначай —
здаецца светлым, як сны, жыццё,
такім нязнаным, дзіўным, узлётным,
жыццём-натхненнем без слёз, турбот.
У сініх неба несмяротных
бясконцым святам сплывае год.
Дык гэт, у неба, у край без сценяў,
ад зла, нязбыўнага ў жыцці,
на белых крылах летуцення,
Пясняр,
па слова-чар ляці!

* * *

Сонца вясновае ў золаце косаў,
срэбныя вербы па плёсах бялёсых,
восені зырка-чырвонай пажары
начныя зводы і начныя чары,

сэрца развагі, і сэрца парывы,
песні, што ўлетку сплываюць на нівы,
плач лесуна, сінь азёр лебядзіных,
жахі глухое паўночнай гадзіны,

долі пакора, і з доляй змаганне,
роднай старонкі ціхое каханне,—
ўсё, што у думках нясцішных пяе,—
вершы мае.

*1925*

## ЛЕТУЦЕННІ

Дзе ў чужыне будзе сад так гадаваны,
Дзе такі там хорам важна збудаваны,
Што мне замянілі б хату і бярозкі,
Хату і бярозкі беларускай вёскі?

*Я. Купала*

Часам, як толькі заплюшчу я вочы,
бачу я край той, дзе мора плюскоча,
бачу я хварбы паўдня.

Бачу я мора духмянае кветак,
белыя дрэвы, прыгожа ўсё гэтак
ў ласках гарачага дня.

Бачу нябёсныя сінія далі,
ўзоры, што зорныя ночы саткалі
з кроз, успамінаў, надзей...

Гэта — краіна маіх нарадзінаў,
тая, што сніцца мне ночнай часінай,
праўда, радзей а радзей.

Толькі чаму ж маё сэрца не йрвецца
ў тую краіну, чаму яно б'ецца
ціха, спакойна зусім?

Мусіць, чужыя паўдзённыя чары —
новы абраз — гэны, колішні, стары
выціснуў ў сэрцы маім.

Нашага кволага сіняга неба,
нашых палосак няспелага хлеба
сяння адных я хачу.

Сум нашых срэбрам раззораных ночаў,
рэчкі, што ў лозах зялёных плюскочуць —
толькі яны уваччу.

Ці ж мне заменіць блакітнае мора,
ці ж мне заменяць няўсяжныя горы,
зораў паўдня калассё,—

нашае цьмянае сонца ціхое,
любае думкам і сэрцу ўвясною
любае мне над усё?

Не, бо ля светлага сіняга мора
вечна аб радасці хвалі гавораць,
там ад яе не ўцячы,

бо там без працы, а родзяць зярняты,
бо там чужое нам, вечнае свята,
тамака сэрца маўчыць.

Тут жа ж, у нас, па гайкох, пералесках
пасля зімы зацвітаюць пралескі,
сцюжу змяняе вясна.

Тут пасля гора жыцця шлях святлее,
тут пасля слёз расцвітаюць надзеі,
тут і у сэрцы вясна!

*1920*

## КРЫНІЦА

За ніўямі, балатамі,
за хваёвымі барамі
ёсць празрыстая крыніца.
Ўсе атруты, ўсе пакуты
з сэрца людскага, бы путы,
зніме дзіўная вадзіца.
Лечыць цела, што збалела,
і душу, калі змарнела,
веру, моц ліе у грудзі.

Вось гадамі, з калітамі
да яе й брыдуць лагамі
горам гнобленыя людзі.
Толькі ж горкая дарога
да яе... Людскім нябогам,
гэтым — смеласці ды сілы
не дастала... З паўдарогі
іншых пушчы і разлогі
завярнулі... Тых вунь збілі
з ног ці гора, ці турботы,
ці мо слёзы адзіноты.
Зноў жа гэныя згубілі
веру ў долю, у свае сілы,
ў сілу дзіўнае крыніцы,—
а без веры — стой дзень цэлы,
не, не дасць здароўя целу
жыццядайная вадзіца.
Ды нялёгка і далёка
нават з вераю глыбокай
дашукацца тэй паляны,
дзе зялёнаю лагчынай
мкне удалеч ручаіна,
гоіць сэрца, гоіць раны,
над вадою, над жывою,
дзе ківаюць галавою
сіняватыя вярбіны,
дзе на словы людскай мовы,
свежы, сонечны, бы новы,
грае бор на ўсе галіны!
Тут, у цішы, ўбогі, хворы,
пазабыўшы крыўды й гора,
неўзабаве схамянецца.
Сілы — дасць яму крыніца,
веру — сонца, што іскрыцца,
смеласць — неба, што смяецца.
Дзень спяе пра шчасце з воляй,
ноч спаўе ціхой патоляй,
замрыць з жыццём нямілым...
Гляне ў неба — й зноў паўстане
на няроўнае змаганне
верны сын зямелькі шчырай!

*1921*

## КАЛІ ЛЮДЗІ ПАКРЫЎДЗЯЦЬ ЦЯБЕ

Калі людзі пакрыўдзяць цябе,
калі хочацца плакаць, маліцца,—
ты ідзі вузкай сцежкай у лес,
там так лёгка на крыўды забыцца!
Быццам прыйдзеш ты ў хорам дзіўны,
дзе няма ані слёз, ні маны,
дзе пачуеш у шэптах лісця:
«Ты даруй неразумным, як я»...
І адыдзе туга, шугане
ўвышыню, бы ўстрывожаны рой.
Зразумееш, што ўсё праміне
у жыцці, нават гора з бядой...

*Вільня, 1921*

## ВОСЕНЬ

Хай жаўцее, сціхае сад з кажнай гадзінай,
сонца косы гарачыя ўсюды не сее,
хай гарыць, як агонь, ліст чырвонай асіны,
хай апошнія кветкі у садзе жаўцеюць,—
будзем чакаць вясны!

Хай паўзуць над зямлёю калматыя хмары,
хай цямнее рака, хай жыццё замірае,
не агорнуць нас восені горкія мары,
кажны з нас яшчэ светлае шчасце пазнае,—
будзем чакаць вясны!

Хай у душах надзея на долю канае,
зло мінецца, бы летнім дзяньком навальніца,
прыйдзе час — сонца ў сініх нябёсах заззяе,
закрасуе вясновай красою зямліца,—
будзем чакаць вясны!

*Вільня, 1920*

## КАЛІ НОЧ ЗАПАНУЕ

Любяць людзі прыгожыя песні,
любяць сумныя гукі жалейкі,
як пагодныя дні напрадвесні,
як раздолле, як спеў салавейкі.

Любяць казкі аб дзеях мінулых,
аб жыцці сваіх продкаў свабодных,
аб гушчарных бароў шумах-гулах,
аб прадоннасці рэк мнагаводных.

Любяць песні аб славе, аб долі,
аб асілках вялікіх, магутных,
аб братох, што каналі ў няволі,
аб часінах старонкі пакутных.

Не было сапраўды мо нічога,
мо і песні і казкі мінучы,—
чуе сэрца ў іх гукі былога,
а душа уздыхае балюча.

Тыя ўздыхі мо ветрык падхопіць,
панясець і развеець у полі...
А калі ён сканае паволі,
калі ў хмарах бліск сонца утопіць

і туман папаўзе над лясамі,
над асінаў сям'ёй палахлівай,
над зялёнай няспелаю нівай
дарагімі, маўляў, паясамі,

Калі ноч запануе усюды,
калі выпаўзуць начныя чары,
духі-сцені агорнуць абшары,
сны сплятуцца, сны-мары і цуды,

калі смутныя начныя гукі
палюцца з-за хваляў туману
на глухую лясную паляну
і замрэ ўсё ад дзіўнае мукі,

як жыццё прыабернецца казкай,
калі з казкаю сэрца зліецца,—
мо старое ў душы страпянецца
і прывабіць нязведанай ласкай?

Явай стануцца гожыя песні,
явай стануцца гукі жалейкі,
светлай явай, як дні напрадвесні,
як раздолле, як спеў салавейкі.

*1921*

## НОЧЫ Й ДУМКІ

Ёсць ночы белыя, ёсць цёмныя, глухія.
Ёсць гаманлівыя — і ёсць зусім ціхія.
Іх — больш за ўсё люблю з лядзяным ззяннем зор,
што на шаўкох нябёс празрысты ткуць вузор.
Люблю за супакой, хоць сонны, а чароўны,
люблю за сіні змрок, за смутак невыслоўны,
што на душы ляжыць, калі сяджу адна
і ў глыбіню гляджу нябёсную без дна...

Ёсць думкі светлыя, ёсць чорныя, благія,
ёсць думкі, як і ноч, зусім-зусім ціхія.
Іх — больш за ўсё люблю, з манлівасцяй надзей,
з усім, што лекам тут зямной душы людзей.
Люблю за цішыню дзіўную ў сэрцы, тую,
з якою я нідзе й ніколі не сумую,
за тое, што гарыць, што з імі дух расце
і кажа жыць не так, як тут жывуць усе!

*Вільня, 1921*

## ВЯСНА

З кажнай хмаркі ў небе празрыстым,
з кажнай лужынкі, светлай і чыстай,
усміхаецца ясна вясна!

Надзяць сіняй нябёсныя далі,
ручаі звон і грукат узнялі,
сапраўды, надыходзіць вясна!

Снег ляжыць яшчэ коўдрай ваўнянай
пад узгоркам, а вецер вясняны
ўжо прымчаўся ні згэтуль, ні стуль,

Абсыхаюць у садзе сцяжыны,
і набраклы яблын галіны
прагна йрвуцца да сонца касуль.

Сэрца б'ецца трывожна, няроўна,
мне і сумна й вясёла-чароўна,
вусны ціха шапочуць: «Вясна...»

Недзе радасці дзіўнай падзецца,
ўсё сягоння зрабіла б, здаецца,
бо папраўдзе на свеце вясна!

*Вільня, 1921*

## ПРАЛЕСКІ

Мілыя, мілыя сінія кветкі,
светлай вясны улюблёныя дзеткі!
Кветак ёсць шмат, што за вас прыгажэй,
толькі, пралескі, вы сэрцу бліжэй...

Гляну я ў вашыя сінія вочкі —
і быццам бачу гайкі і лясочкі,
дзе з-пад снягоў націраеце вы,
мілыя дзеці вясны!

Толькі зірну я на вашыя краскі,
ўспомню вясновыя шчырыя ласкі,
ласкі і сонца й нябёс,
песні, што ветрык прынёс
з ясных палёў, дзе зямля абсыхае,
сонца дзе зрання да ночкі гуляе.

Вашыя вочкі ў сабе адбіваюць
сіняе неба і хмаркі, што таюць,
будзіце ціхі, родны мне сум,
нібы ў лесе вясняны той шум,
будзіце сілы, што ўзімку драмалі,
будзіце думкі, што скутыя спалі,
будзіце шэпты надзей,
што мне за ўсё саладзей...

Поўныя рожавай мглы пералескі
вас гадавалі, красуні-пралескі,
неба вас песціць, вам сонейка шле
золата кос, пацалункі нясе
ветрык вам весні... вас любіць вясна,
вас па лясох рассыпаець яна.

Вы усцілаеце сцежку вясне,
вы яе сымбаль, адзнака яе...
Мо вы таму мне за ўсё й саладзей,
дзеці вясняных надзей?

*1921*

## МАЙ

Абляцелі вішні... Пагусцелі клёны,
зашумеў, бы ўлетку, свежы, новы гай,
праляцеў нячутна красавік зялёны,
на зямлі пануе светла-пышны май.
Пасінела й неба... Ласкай залатою
залівае сонца поле і мяне.
Пасмаю сівою проста прада мною
таюць плямы-горы недзе ў тумане.
Сонца шчыра грэе. Хораша у полі,

зацвітаюць краскі між травы густой.
Чую ўсёй душою, што я зноў на волі,
што ізноў у сэрцы — веснавы настрой!
Сцень паклаўся сіні ад бярозаў тонкіх
на дыван, заліты залатым святлом.
У красе калінаў, у лістках рамонкаў
свецяцца расінкі, з маладым лісцём
ветрычак жартуе, а ўгары, ў нябёсах
белыя хмарыны заплятаюць сецць.
Пад гарой палоскі маладых калоссяў
зырка зеленеюць... Хочацца глядзець,
заглядаць бясконца у блакіт празрысты,
аб нічым не думаць, толькі сніць а сніць,
сніць аб сінім небе, гэткім чыстым, чыстым,
і аб сонцы й шчасці, што мне значаць дні.

*Вільня, 1921*

## ВОСЕНЬ

Як не любіць мне восень залатую,
калі праз вопратку асін густую
тон прабіваецца чырвоны, слаўны тон,
і ў золаце стаіць маўклівы, пышны клён?

Як не любіць мне восень залатую,
калі на ніву, зжатую, пустую,
ліецца уначы, як малако, туман
і павучынне скрозь на хмызняку палян.

Як не любіць мне восень залатую,
як не любіць мне частку году тую,
калі я веру ўсім, калі душа гарыць,
і хочацца так век,
хоць сумаваць, а жыць...

*Вільня, верасень, 1921*

## ВОСЕНЬ У ВІЛЬНІ

Клёны апалі, і золата й хварбы
крыюць зямлю дарагім дыванам.
Поўныя жмені лістоў тых узяў бы,
восеньскім сплёў бы іх, пышным вянком.
Таюць аблокі у небе высокім,
хвалі туману над Вільняй стаяць.
Места мярэсціцца ўнізе, далёка,
вежы касцёлаў у неба глядзяць,
цэркваў блішчаць залатыя галовы,
цёмнымі плямамі дрэвы ляглі,
сіняй палоскаю бор нат хваёвы
ледзь а відаць за істужкай Вяллі...

Чуюцца, чуюцца восені чары
ў хварбах, у тонах лісця і нябёс,
лёгкім дрыжэнні кляноў у пагары,
свежасці йльдзістай, што вецер прынёс...

*1921*

* * *

Светлы дзень дагараець над сумнай зямлёю...
Ліпаў лісцейка хварбай гарыць залатою,
сад пажоўклы цямнее, маўчыць.

Каля яблынак сцені кладуцца густыя,
пацямнелі ігрушы й кляны маладыя,
зараз ясны заход дагарыць.

Аджываюць нячутна жаданні
ў гэты час, час маўклівы змяркання.

Я хачу на часінку забыцца аб горы
і глядзець, як у рожавым захаду моры
сонца косы бярэцца тапіць.

Я памерці хачу вось такою парою,
хваляй сонца залітая ўся залатою,
больш каб слова не чуць «пацярпі!».

Аджываюць нячутна жаданні
ў гэты час, час маўклівы змяркання...

Я хачу ў гэты момант пазнаць сваю долю,
я хачу зведаць шчасце, хачу я на волю,
ў далі родных, шырокіх палёў!

Я хачу, я хачу... Ды няма ў мяне сілы,
каб не думаць аб тым непрыхільным, нямілым,
сумным часе апошніх гадоў!

Аджываюць нячутна жаданні
ў гэты час, час маўклівы змяркання.

Сад маўчыць... Не пяець, як раней, як вясною,
аб тым шчасці, жыло што калісьці са мною,
сад маўклівы і цёмны стаіць.

Каля яблынак сцені кладуцца густыя,
пацямнелі ігрушы й кляны маладыя,
зараз ясны заход дагарыць.

Засынаюць нячутна жаданні
ў гэты час, час маўклівы змяркання.

*1920*

## ЛЕС ШУМЕЎ

Лес шумеў... Ледзьве чутнымі гукамі
гоман соснаў высокіх сплываў.
Вецер дзіўна-прыгожымі згукамі
новы шэпт, новы спеў выклікаў.

Між камлямі хваінаў чырвонымі
ззяў крывавы асенні заход.
Далячынямі неба прадоннымі
выплываў белых зор карагод.

А між імі, з усмешкай халоднаю,
ўсходзіў месяц, прыбраны ў імглу...
Гэны вечар малюнкамі роднымі
выклікаў нейкі смутак, тугу.

Смутак рос, калыхлівымі хвалямі
плыў а плыў у душу ён маю...
Так туман, неабсяжнымі далямі,
залівае увосень зямлю.

*Вільня, 1922*

## ЦІХА ПЛЫЎ МЕСЯЦ

Ціха плыў месяц між хмараў празрыстых,
зоры гублялі халодныя слёзы,
вецер зрываўся між клёнаў бязлістых,
вецце калышачы голых бярозаў.

Таялі плямы туманныя сценяў,
срэбра снягоў залівалі зімовых.
Светла было мне ад белых праменняў,
шчасна было мне ад думак тых новых.

Нейкая дзіўная сіла ўставала
ў сэрцы, да сяння пакорліва-хворым,
месяц, здаецца, рукою б дастала,
зоры б зрывала з паднебнай прасторы.

Долі пайшла б палявацць я далёка
дзеля зямліцы, што спіць без прасвету,
і разліла б, як сягнуць можа вока,
шчасце над белым, аснежаным светам.

*Вільня, 1921*

* * *

Ночкай сягоння мне ў самыя вочы
месяц зімовы глядзеў і смяяўся:

— Сумна табе? — ён як быццам пытаўся.—
Праўда, не спіцца у светлыя ночы?
Устань і зірні на акно, што адзета
тонкаю сеткаю з рож серабрыстых,
пэўна, як глянеш, прыпомніш ты лета,
яркія красак у садзе маністы.
Пэўна прыпомніш ліпнёвыя ночкі,
зорак узор, прыгажэйшы за сонца,
сонна прыціхлыя ліпкі, дубочкі,
цёмнае неба без краю, бясконца.
Успомніш, як ціха бывала ў пакоі,
ўсе ужо спалі, а ў вокны глядзела
мляўкая цемра, паўночча глухое.
Успомніш, аб чым ты тады летуцела,
ўспомніш, як бралася плакаць парою,
ўспомніш, як сэрца чагосьці шукала,
ўспомніш, аб чым гэткай ночкай з сабою,
толькі з сабою аднэй гаварыла.
Успомніш, як глянеш на срэбныя краскі,
ўсе свае думкі, надзеі дзіўныя,
сумныя, быццам зімовыя казкі,
ясныя, быццам вяснянкі лясныя.
Успомніш пра ўсё, што тады ты хацела,
ўсё, што ў жыцці ты яшчэ не пазнала,
твары няясныя тых, што нясмела
толькі у снох, у лятунках кахала...

У снох... а не спіцца у светлыя ночы,
сон мой сягоння так рана парваўся,
бо цераз вокны мне ў самыя вочы
месяц прыгожы глядзеў і смяяўся.

*1921*

## ЛЮБЛЮ Я СОНЦА ЗАЛАТОЕ

Люблю я сонца залатое,
люблю прыгожаю вясной,
калі ўсё новае, святое
смяецца радасна са мной.

Люблю нябёс вясняных ласкі
цалункі цёплых ясных кос,
што песцяць дрэвы без падказкі,
што грэюць лісцейка бяроз.

Аджыў наш сад. Да сонца дрэвы
галінкі цягнуць, бы ў паўсне.
Направа сіні сцень, налева —
усё ўсміхаецца вясне!

Цвіце чарэмха і чарэшня,
паненкай яблынка стаіць,
з ёй ветрык песціцца, і песня
святлу, вясне ўвушшу звініць!

Вясна, вясна, дачка лятункаў,
нясі ж святло, нясі жыццё,
нясі атруту пацалункаў,
красуй, вясна, кахай усё!

Любі, тулі, сагрэй каханнем,
жыццё зямлі, жыццё людзей!
Табе адкажа сад пяяннем,
дый сэрцу будзе весялей.

Цалуй лясы, ідзі гуляці
ў палі, ў лясы пагодным днём.
Кахай, кахай зямліцу-маці,
палі яе, палі агнём!

*1921*

## КРАСАВІК

*Максіму Гарэцкаму*

Неба сіняе, сіняе, сіняе...
ані межаў у ім, ані дна.
На зямлі ж прыгажуняй-княгіняю
пазірае мне ў вочы вясна.
Лазнякі срэбным пухам акрыліся,
вецер пыл па-над імі мяце,
тут — пралескі ў раўку затаіліся,
сірацінай фіялка цвіце,
там — жаўцеюць вяночкі вясновыя
красак нейкіх нязнаных яшчэ,
там — ізноў, залатыя, ліллёвыя...
з іх вясна дываны свае тчэ.
Як тут ціха, ні гулу, ні гоману,
пачынае нат сум засынаць,
ды душою жывою, нястомнаю
чую ўсё ж я, што ўсюды вясна.
І нічога мне ўжо не жадаецца,
ні кахання, ні светлых мінут,
у душы маёй штосьці зрываецца,
што няўзнак адцвітае, а тут —
тут фіялкі цвітуць цёмна-сінія,
сеюць водар салодкі вясны,
што брыдзе прыгажуняй-княгіняю,
рассыпае вясновыя сны.

*Вільня, 1922*

## СЫПЛЮЦЦА З КЛЁНАЎ ЛІСТЫ

Сыплюцца з клёнаў лісты,
сыплюцца ціха, маўкліва,
крыюць зямлю і кусты
пражаю жоўтай, шасцівай.

Сыплецца саду краса,
кроплі дажджу, як раса,
ззяюць сцюдзёнай палівай.
Восень... дык дождж і не дзіва...

Сыплюцца з клёнаў лісты,
сыплюцца ціха, маўкліва,
крыюць зямлю і кусты
пражаю жоўтай, шасцівай.

Сэрца і б'ецца й баліць,
плача па небе й зямлі,
тонець у сумах, сумлівах
Восень...
дык сум і не дзіва...

*Вільня, 1921*

## ТОЛЬКІ ЎЧОРА

Толькі ўчора, здаецца, плылі ручаі
і вясянае сонца зямлю цалавала,
а сягоння ўжо жутла жаўцеюць лісты,
а сягоння ўжо восень бязмала.

Толькі ўчора, здаецца, пралескі цвілі
і ў шаўкі прыбіраліся цішкам бярозы,
а сягоння ўжо яблыкі з дрэваў знялі
і па шкле плывуць восені слёзы.

Толькі ўчора, здаецца, над змрочнай ракой
салавей заліваўся,
мы ж — дыхаць не смелі,
а сягоння ўжо поўніцца сэрца тугой,
быццам шчасця й тады мы не мелі...

*Вільня, 1922*

## УВЕЧАРЫ

Смутак няясны зышоў на душу...
Кленчыць, маліцца?
Чаго я хачу?
Лёгкія хмары плывуць спакваля,
мглою чырвоны ўбіраючы шлях...

Гукі і гоман нясуцца здалёк,
быццам хто гора задзержаць не ўзмог
і закрычэў, застагнаў на ўвесь свет...
Не, гэта места шуміць так... і след
гукі глухія кладуць на душу.
Сонца заходзіць...
Чаго я хачу?

Хочацца любасці нечай да мукі,
хочацца сціснуць халодныя рукі,
хочацца кінуць усё і пайсці,
думкі развеяць мне хочацца... ці
ўзяць і заплакаць, каб сцішыць душу.
Цемра надходзіць... Чаго ж я хачу?

Можа, хачу я таго, што ўжо маю,
можа, хачу недасяжнага раю?
Не, не зямных я хацела б уцех,
радасцяў дробных праз слёзы і смех...
Я... я б раззорыць хацела душу.

Цемра надходзіць... Чаго я хачу?

*1922*

## ПЕРАД НОЧАЙ

Цямнее заход над палоскаю бору
далёка... далёка... Над самаю ж скроняй
шапочуць галіны расцвілае ліпы,
што цвет залаты долу сыпле і сыпле.
Успыхнулі першыя зоры ў прадонні
над цёмнай, далёкай палоскаю бору.
І ноч агарнула свет сіняй тугою,
і сціхлі ў тэй сіні апошнія гукі...
Ды думкам, хаценням — няма супакою,
плывуць яны, думкі, як хвалі ракою,
аж хочацца выцягнуць, выкінуць рукі
у ноч, што накрыла свет сіняй тугою...

*Вільня, 1922*

* * *

У небе палаюць чырвоныя хмары.
Як горкія мары, на нівы, папары
кладуцца вячорныя сцені.

Ад пахаў гарачых рака, бач, самлела,
нячутна, нясмела святло адляцела,
сплёў месяц правідныя сеці.

Ноч сонныя дрэвы прывабіла ласкай,
таёмнай, нянаскай, нячутаю казкай
апошнія сцішыла гукі.

Закінуў у далечы вецер жалейку,
што хмару-зладзейку будзіла зняцейку,
адкінуў і ў вецці схаваўся.

Адна ноч над цёмнай зямлёй варажыла,
сны-чары насіла, галлё варушыла
і горка а дзіўна маўчала.

Ды хто ж разгадаў яе сумы-трывогі —
гушчары, разлогі ці месяц двурогі?
Не,— кволае сэрца людское!

*1922*

## ШЭПТЫ НОЧЫ

Што сумна шэпчуць мне тыя ночы,
калі па краскі кладуцца росы,
губляе месяц між цемры косы,
як быццам срэбрам праліцца хоча...

Калі з душою душа гавора
аб вечных болях, аб вечных муках
і пад цяжарам бязмерным гора
губляе голас у ночных гуках,
калі здаецца, вось-вось уцяміш,

пазнаеш тайны жыцця і Бога
і пойдзеш новаю дарогай;
калі ўжо золак далечы пляміць,
а сэрца плача і смерць прароча...

Што сумна шэпчуць мне тыя ночы?

*1922*

## НА МАТЫЎ ХАЎТУРНАГА МАРШУ

Гукі ўрачыстага маршу хаўтурнага
ціха ў паветры імглістым плывуць.
Сэрцы ад свету няветлага, хмурнага
ў свет неспазнаны, таёмны вядуць.
Гукі трымцяць, наплываюць, зліваюцца,
плачуць, растуць, ад зямлі адрываюцца.
З імі — і сэрца дрыжыць:
досі ўжо, досі ўжо жыць!
Што нам з жыцця недарэчнага, сумнага,
з лішняга дня, што, як рэшта, не згас?
Ляж, адпачні, дзіцянё неразумнае,
з доляй змагацца нямоц і нячас.
Гукі хаўтурнага маршу з ёй, доляю,
добрай, благою — не хочуць гуляць.
Чуеш? Ціхой зліваюць патоляю
сэрца, і восень, і жальбы галля...
Досі ўсцяж шчасця шукаць па аселіцах,
шчасце ж людское, як казкі,— мана.
Ледзьве, бадзяжнае, недзе аселіцца,—
нехта паруціцца ўраз адагнаць...
Досі ж... А гукі трымцяць, разліваюцца,
плачуць, растуць, ад зямлі адрываюцца...
З імі і восень дрыжыць:
досі ўжо, досі ўжо жыць...
Што ў тэй нязнанай краіне за хмарамі
можа сыноў чалавечых злякаць?
Мала іх пошасці, войны з пажарамі
білі, аж слёзы плылі, як рака?

Там жа — ні слёзаў няма, ні гарачага
болю, калі — няма як памагчы.
Там, як калісьці, гадамі дзіцячымі,
возьмуцца сны нашы душы лячыць.
Чуеш... як пошчакі маршу хаўтурнага
ціха ў паветры імглістым плывуць?
Сэрцы ад свету няветлага, хмурнага
недзе ў нязнаную далеч вядуць?
Гукі трымцяць, наплываюць, зліваюцца,
плачуць, растуць, ад зямлі адрываюцца...
З імі і сэрца дрыжыць:
досі ўжо, досі ўжо жыць!

*1921*

## НЕДАСЯЖНАЕ

Мая душа ад скраю і да дна
наліта светлай нейкай сілай.
Мне ўсё здаецца ясным, мілым:
і неба сіняе, і хвалі тумана,
і ніў далячыня, і залатыя клёны,
і хвояў баравых убор чорназялёны.
Здаецца,
шчасце дзесь каля мяне, так блізка,
здаецца, я магу узяць яго рукой.
Ды не сягну... Вось так, як над ракой
схінаюцца галлём вярбіны нізка-нізка,
а ўсё не здолеюць напіцца тэй вады,
што надзіць іх і дні, і тыдні, і гады.

*1921*

## МЭТА ЖЫЦЦЯ

Мэта жыцця,
кажуць людзі без сілы,
мэта жыцця — дачакацца магілы.
Як пражывеш ты, сумленна, ці не,
ці не ўсё роўна,— бо смерць не міне.

Мэта жыцця,
кажуць поўныя сілы,
з доляй змагацца да самай магілы,
веры не траціць і страху не мець,
смела, байцамі памерці, згарэць.
Мэта жыцця яшчэ, кажуць,
не йрвацца
ў неба, а толькі зямлі прыглядацца.
Зведаць грахі ўсе, ўсяго спрабаваць,
каб не так горка было паміраць.
Мэта жыцця, ўрэшце кажуць,
хавацца
з сэрцам ад смуткаў, з слязіма не знацца.
Думкі аб праўдзе? Дурное — і ўсё!
Мэта жыцця — захаваць жыццё!

*Слонім, 1922*

## ЖЫЦЦЁ

Клічуць вечарам зоры ў сусвету прасторы...
Поўны нейкае зморы ці прыгноблены, хворы —
не ідзе чалавек...

Ночкай месяц варожа так прынадна, прыгожа...
Гэй, паслухаеш, можа, кінеш жыцце, нябожа?
Не, не йдзе чалавек...

Не, не йдзе, хоць паволі сэрцам рвецца да волі,
штодня нудзіцца болей — і жыве мімаволі,
несвядома амаль,

хоць да самага раннія лёс ягоны — змаганне,
сумаванне па шчасці ці па долю сяганне,
неакрэслены жаль...

*1923*

## ШЧАСЦЕ

Шчасце — як сонца: маленькая хмарка
пройдзе па небе ціхім сярод дня,—
сонца ўжо свеціць так жутла, няярка,
момант — і сонца няма.

Шчасце — як вішняў вясняныя краскі:
вецер павее, заплача вясна,—
сыплюцца снегам на дол яны гразкі,
момант — і красак няма.

Шчасце — як светлыя, ясныя мары:
рэзкае слова, заўвага адна,—
і дагараюць яны у пажары,
момант — і мараў няма.

*Слонім, 1923*

## КАЛЫХАНКА

Ноч рассыпала募раў агні,
ў сінім небе яны патанулі.
Вее сон над прасторам зямлі.
Люлі, люлі, сыночак мой, люлі.

З гэтых зорных чырвоных агнёў
я спляту прамяністы вяночак.
Над галоўкай павешу тваёй,
люлі ж, люлі, засні, мой сыночак.

Будуць зоры маленькаму ззяць,
будуць светлыя сны пасылаць.

Ціша ўсюды і сонны спакой...
Вербы гнуткае веццe схінулі
над сцюдзёнаю, змерзлай ракой.
Люлі, люлі, сыночак мой, люлі.

Я падслухаю шэпты вярбін,
я падслухаю шэляхі ночкі
і ў напеў пазбіраю адзін.
Люлі ж, люлі, засні, мой сыночак.

Будуць вербы шасцець, шапатаць,
Будуць снамі цябе асыпаць.

Як бы плачучы, ў кропельках слёз
прыгажуні-бярозы паснулі.
Гэта ў пэрлы прыбраў іх мароз.
Люлі, люлі, сыночак мой, люлі.

Тыя пэрлы-слязінкі збяру,
наніжу з іх пацёркаў шнурочак
і на шыйку завешу тваю.
Люлі ж, люлі, засні, мой сыночак.

Будзе з імі малы засынаць,
ручкай пацеркі-слёзы кранаць.

Ноч рассыпала зораў агні,
ў сінім небе яны патанулі...
Спіць усё, й ты, маленькі, засні.
Люлі, люлі, сыночак мой, люлі.

*Слонім, 1924*

## СНЕГ ПАДАЎ

Снег падаў з неба іскрынкамі зор...
Ён крыў зямлю карунак дыванамі.
Ледзь вецер шапацеў між голымі клянамі
і зноў ляцеў туды, дзе сніў прастор,

ды пасам зубчастым сінеўся бор
над анямелымі даўно палямі,
што скутыя ляжалі маразамі,
адпачываючы ад летніх змор.

Адпачывала ўсё — і лес, і поле,
і неба глыбіня... Ды не людская доля.
Людская доля бо — усцяж цярпець,
шукаць чагось з няўтомнаю тугою,
глядзець на крыўды, зло...
і летуцець
аб соладзі нязнанай супакою.

*Слонім, 1924*

## РАЗВІТАННЕ

Тонкай мглой абвязаліся сінія далі,
сіня-сінія далі на ўзмежжы нябёс.
Па жытох расплыліся вятраныя хвалі,
ветру плаўныя хвалі, што вечар прынёс...

І паволі, паволі чырвоным пажарам,
занялося чырвоным пажарам усё:
І жыта, і кляноў верхавіны, і хмары,
й нат будзённае, шэрае ў шэрым, жыццё.

Дзень канаў з недаверлівай, кволай усмешкай,
з прыкрай, горкай усмешкаю хворых людзёў,
і звінелі яму развітанне узмежкам
зелянкавыя конікі — дзеці палёў.

Развітанне з жыццём, развітанне навекі,
развітанне навекі з жыццёвай маной,
калі чорная ноч моцна сцісне павекі,
моцна сцісне павекі над сцерплай зямлёй...

*Хэлмна, 1924*

## РОДНЫ КРАЙ

Сонца заходзіць... На вежах кляшторных
скрозь загараюцца тысячы зорных
зырка-чырвоных агнёў...
Хараша... Сэрца ж міжвольна імкнецца
ў край, што яшчэ харашэйшым здаецца,
родны, найлепшы з краёў.
Там... Там усё быццам так, а іначай
хваляй у сэрца ліецца гарачай,
там... Там усё мне мілей:
Сіняе, сіняе неба бясконца,
шчыра вясёлае, яснае сонца,
далеч бязмежных палей.
Там, там у гожыя, цёплыя ранкі
песняю срэбнай вітаюць жаўранкі
першыя пробліскі дня,

песняю будзяць ціхія лагчыны,
дзе яшчэ пасмам густым, цёмна-сінім
сонна калышацца ймгла.
Сонца расу там усмешкаю сушыць,
вецер там краскі калыша, варушыць,
хваляй плыве па лугох,
хвоек залёных шумяць верхавіны,
ў жаху адвечным трапечуць асіны
ў змрочных, гушчарных барох.
Вёсны там... Пешчы нясмелыя сонца
будзяць жыццё пакрысе у старонцы,
робіцца неба сіней,
вецер крыніцай пад небам плюскоча,
нешта зямлі веснавое шапоча,
звоніць, пяе ў лагчыне́.
Леты там... Хвалі па жыце лунаюць,
колер зялёны на срэбны мяняюць,
срэбны на сіні, сівы...
Сцежкай вузкой у жытох заблудзіцца —
золатам можна накрыцца, заліцца:
жыта — вышэй галавы.
Восень там... Постаці жоўтых бярозаў,
ліст, парудзелы ад першых марозаў,
скрозь пад нагамі шуміць,
плавае з лёгкаю хваляю ветру,
срэбрам блішчыць у празрыстым паветры
ніць, павучынная ніць...
Зімы там... Песні дзікія завеі,
ночы глухія, у небе лялеі —
краскі сцюдзёныя зор,
бор, што прыбраны ў снежныя шаты,
высіцца пышны, магутны, багаты,
топчачы сценяў вузор...
Вёскі там... Мох, саламяныя стрэхі,
чырвань рабін у садку для пацехі,
студня з даўгім жураўлём,
куст недацвілай, апалай паўрожы,
крыж учарнелы ў канцы раздарожжы,
дах ад дажджу над крыжом.
Вечарам травенскім тут, на расстанні,
людзі пяюць, адмаўляюць літаніі,
кленчаць на цёплай зямлі...
Кленчаць, а сонца за вёскай знікае,

ніткай густой, залатой падтыкае
крыж, і людзей, і палі...
Верай магутнаю, светлаю сілаю
вее над гэтай грамадкай пахілаю,
надзіць прыгожасцяй май...
Навет адзін абразок гэткі ў полі —
й сэрца цябе не забудзе ніколі,
родны мой край!

*Хэлмна, 1924*

## ВЯЧОРНЫ АБРАЗОК

Змярканне...
З яснага блакіту
знікаюць хварбы, бліскі дня,
і чыстым золатам заліта
ціхіх палёў далечыня.

Істужкай сцежка ўецца ў жыце,
збягае ўніз, паўзе вышэй,
паўз ручаёў сталёвых ніці
бяжыць кудысь далей, далей...

На ўзгорку млын-вятрак ляніва
крыламі часам узмахне,
і статак галубоў пужлівых
з-пад даху ў неба-выш памкне...

Лятуць, купаюцца ў паветры,
знікаюць, круцяцца узноў —
лісты, што ўвосень носяць ветры,
а захад іх хварбуе ў кроў.

*Хэлмна, 1924*

## ВЯЧОРНАЮ ПАРОЮ

Вечар неба хварбуе ў гарачыя тоны,
чыстым золатам густа залоціць рабіны,
і здаецца паветра густым і зялёным,
бы вада у азёрах, зялёных ад ціны.

Гаснуць косы на вежах гатыцкіх касцёлаў,
запаляючы шыбы дзіўнымі агнямі.
Зоры —
вочы малых засмучоных анёлаў —
мігацяць у хмурынах, парваных над намі.

Час таёмны, не ноч, ані дзень, калі сцені,
сцені ночы зліваюцца з косамі сонца,
калі хочацца раптам устаць на калені
і стаяць так, без руху, маўкліва, бясконца...

Ў гэты час аджывае у думках старое,
ўспамінаюцца даўныя сэрца хваробы...
І так лёгка душою — вячорнай пароюу
зразумець свету сумы, сумлевы й жалобы!

*Хэлмна, 1924*

## ПЫТАННЕ

Даль, нябёсаў туманная даль
тае, гасне над ліпаў калонамі,
што усталі суценьмі зялёнымі
паміж доляй ды мною, на жаль,
і звіняць пад дажджом, як крышталь.

Цішыня... цішыня над старонкаю
Ў срэбнай золкасці травы дрыжаць.
Жаўрукі нават з песняю звонкаю
ў гэткі дзень не ўзляцяць сенажаць
срэбрам гукаў з нябёс благаслаўляць,
ані з зоркай рамонкавай тонкаю
летні вецер не прыйдзе гуляць...

Божа! Дні мае, хіба што шчасныя,
ціха сходзяць, сплываюць удаль,
па сабе пакідаючы жаль,
па мінулым — тугу перадчасную,
што звініць, быццам кропляў крышталь.

І пытаюся з болем міжвольным я:
што ж ты робіш з душою, з сабой,
як праходзіш жыцця пуцінай,
што ты робіш з той воляю вольнаю?
Бо мінуць — і не вернеш, на жаль.

*Хэлмна, 1924*

## УНАЧЫ

Ноч спакоем чаравала,
сцені ціхія сплятала
у бярозах, апавітых
срэбнай, снежнаю імглой.

Знекуль думак, сноў забытых,
ім, штодзённем скутых, збітых,
нечаканы выплыў рой...

Аджылі ўспаміны, здані
дзён калішніх, сны, жаданні,
неба весняга павець...

Захацелася уночы
ў змрок зімовы не глядзець,
а, спусціўшы твар і вочы,
не любіць і не цярпець.

*1924*

## НА СЕНАЖАЦІ

Косы звіняць... Спеўна ўзносяцца зыкі,
поўняць жыццём жаўтацвет-сенажаць,
майстры дзіўныя з нязнаных музыкаў,
косы звіняць...
Кмену пах цягне па мокрых пракосах,
водарыць сенам у пухкіх капах,
дыхае поле у сонцавых косах,
кмену йдзе пах...
Песню жанкі запяялі нясмела,
і — зазвінела уся сенажаць,
з гукамі — ўдалеч, здаецца б, ляцела...
Косы звіняць...

*Доры, 1925*

## УЛЕТКУ

Смугой зямчужнай хмары абвязалі
нябёсы, сонца пуць.
Па залатых жытох за хваляй срэбра хвалі
плывуць, плывуць, плывуць...
Які прастор вакол! Без берагу, без краю
калышацца жыта,
ў ружовым полымі вятраны дзень згарае,—
як цёпла... Любата!
Шматхварбным дыванам, красой-вясной сатканым,
кладзецца сенажаць,
дзе ўдзень, і на зары, і ўвечары, і зрана
скрозь жаўранкі звіняць.
І заклік іх званкі, і ветру уздыханне,
што баразніць палі,—
імкнуць у вышыню за ўсіх, за ўсё, за сяння
маліць, маліць, маліць...

*Доры, 1925*

## УВЕЧАРЫ

Не ўцячы ад тугі. (Залацістыя сеці
ясны вечар накінуў на нівы й лугі.)
Затрымаліся, ўвышу не хочуць ляцеці
мае думкі крылатыя, дзеці тугі.

Жаль чагосьці, чаго? (Сіняватыя сцені
праз дарогу ляглі, і сцямнела ў лагох.)
Абудзіліся казкі душы — летуценні,
штось шапочуць, і надзяць, і плачуць, чаго?

Нешта ў сэрцы расце...
                    (Па-над срэбрам аблокаў
моўчкі ўзняў маладзік свой заплаканы твар.)
Яшчэ момант... і рыне паводкай шырокай
мая песня — натхненне, жыцця майго чар!

*Хэлмна, 1925*

## ВАСІЛЬКІ

У жытох расцвілі, расцвілі васількі...
На прасторах шырокіх, не нашых палёў,
між маўклівых, зялёных яшчэ каласоў,
на чужацкай зямлі расцвілі.

Расцвілі, па узгорках пясчаных бягуць...
А ўнізе, пад гарой зеляненоць кляны,
асыпаюцца яблыны — слёзы вясны —
і цвітуць васількі і ў лагу.

Краскі любыя, памяткі іншых палос,
белых дзічак на межах, сцяжынак-шляхоў,
краскі — памяткі песні званкіх жаўрукоў
пад паветкаю сініх нябёс...

Там, у родных палёх, вы не гэтак цвілі,
гэткі сум не імгліўся у вашых вачох,
гэтак хутка ваш стан не хінуўся, не сох,
краскі роднай, далёкай зямлі!

*Хэлмна, 1925*

## НОЧ

Загаслі апошнія косы
кароткай маёвай зары.
І чыстыя зоры, як росы,
як слёзы, заззялі ўгары.
Растаялі лёгкія хмары,
і сталася неба — без дна.
Спавіўшы імглою абшары,
там ноч панавала адна.
Акрыўшыся хусткай туманаў,
ступіла яна на зямлю,
над светам, паснулым да рана,
раскінула ўладу сваю:
спляла сіняватыя сцені
між цёмных кляновых камлёў
і месяца косы-праменні
сыпнула у цемру палёў.
Збудзіла зноў ночныя змовы,
шэпт-шэлях густое травы,
ўзняла з жабім хорам размовы,
заплакала ў плачы савы.
Да сэрца людскога паволі
вужакай слізкой падпаўзла,
старыя, забытыя болі
з прадоння узноў узняла.
Збудзіла ў адных, няіначай,
як важкай крануўшы рукой,
найгоршае пекла распачы,
а ў іншых — дзіўны супакой.

*Хэлмна, 1925*

# ЖОЎТАЯ ВОСЕНЬ

1927—1937

## ЖОЎТАЯ ВОСЕНЬ

Нервы ўвосені страшаць нас совамі,
ша... шасцяць кажановымі крыламі...
Непрыветнай вітаемся моваю
мы з асеннімі казкамі-былямі.
А ці ж восень папраўдзе панурая?
Груганнём над ніўямі расселася?
Рызманамі зрудзелымі, бурымі
на асінах павісла, на верасе?
Жоўта скрозь...
                    Над палямі шырокімі
спяць дубы, як мядзяныя волаты,
ўкруг бярозы стаяць белабокія,
сыплюць з косаў расплеценых золата,
спіць лог жоўты, туманамі змочаны,
пахне мохам, лістамі, як ладанам...
І сціскаецца сэрца няхочучы
смуткам любым, дзіўным, неразгаданым.
Дзе ж тут жах, кажановыя шэляхі,
плач савіны, вятругі нервовыя?
Восень жоўтая смуткам кудзеліцца,
сном кладзецца на вецце дубовае.
Для мяне яна —
                    блізкая, знаная,
новай песняй у сэрца ўціскаецца
і натхненнямі, здаўна чаканымі,
нада мной, як лісцём, асыпаецца...

## КАБ КРЫЛЫ...

Злавілася сонца у сеці,
у сеці, сатканыя з хмар...
Каб крылы саколія мець мне
ды дзесь па-над хмары ўзляцець мне,
у сонца нясцерпны пажар!

Хай вочы мае занявідзяць,
хай змоўкне навекі мой спеў,
хай людзі мяне зненавідзяць,—
а дух мой да сонца ўзляцеў!

*Хэлмна, 1922*

## ІШЛА ВЯСНА

І парловыя хмаркі вяночкі плялі
над паўсоннай, імглістай прасторай зямлі,
і цалункі гарачыя сонцавых кос
з сініх-сініх, прачыстых сплывалі нябёс,
і пралескі ўсміхаліся ў сцені лагчын,
і ў мутной, але сіняй вадзе калыін
запаляліся сонцам мільёны агнёў,—
бо вясна йшла у руні палёў.
І дрыжэлі знаёмыя струны ў душы,
пазрываныя ў часе зімовай цішы,
і хацелася некуды йрвацца, ляцець,
і хацелася крылы птушыныя мець,
і хацелася свет абымаць, цалаваць,
і пяяць, і пяяць, і пяяць, і пяяць,—
бо йшчэ раз за маіх пералётных гадоў
йшла вясна ў зеляніне садоў!

*Хэлмна, 1928*

## УЗНОЎ ВЯСНА

Тонкім прадзівам сонечных, ясных праменняў
сад асыпаны, ў белым стаіць захапленні,
пышнай цешыцца, весняй красой.
Зноў вясна... Яшчэ раз у жыцці пералётным
бачу чары вясны маладой, несмяротнай,
вечна новай і вечна жывой.

Быццам морскія хвалі ўзбярэжжам —
мкне па выраі вырай бязмежжам.
Зноў вясна... Яшчэ раз... Колькі ж іх
прамінула,
колькі ж іх пражыла, ды ці шмат іх адчула
я няўважнай, нясталай душой?
Ці ж падумала я, што жыццё уцякае,
што чагось ад мяне спадзяецца, чакае,
і нічога не зроблена мной...

«Кінь стаяць на жыцця узбярэжжы»,—
кліча вырай у сінім бязмежжы.
«Добра, птахі! Растаеце ў небе-прадонні,
я ж пайду напярэймы жыццю хоць сягоння,
разам з сонцам, зямлёю, вясной,
разам з садам, што ў прадзіве ясных праменняў
сам у ясным, у белым стаіць захапленні,
пышнай цешыцца, весняй красой.
А над ім, быццам хвалі ўзбярэжжам,
мкне па выраі вырай бязмежжам.

*Хэлмна, 1927*

## НА ПАРОЗЕ

На парозе ночы затрымаўся дзень,
дзень ціхі, зімовы, спавіты ў ліллёвы
далікатны сцень...
І хоць вабіць неба хварбай залатою,
І хоць ззяюць хмары рожавым агнём,—
цяжка развітацца з сонечным святлом,
цяжка спавівацца ночы туманом...
Бо здаецца сонца дарагім бясконца,
бо жыццё здаецца проста без цаны,

і жудой халоднай у чужой старонцы
выдаюцца чорнай ночы туманы...
Гэтак перад смерцяй сэрца замірае
пры адзінай думцы, што ідзе... туды,
хоць само ірвецца ў край, што сном завецца,
хоць смуціцца, б'ецца,
каб як адляцецца
ад нягод, пакутаў, ад важкой нуды,
адляцець... туды.

*Хэлмна, 1928*

## ЯШЧЭ АДНА ВЯСНА

Мінулі халады, і снег дадзелы тае...
У лужынах вады, у белых балаках,
у сіні загустой, што неба залівае,
вітаю я вясну на полі, між дарог...
Узноў ідзе вясна, йдзе новая адвечна,
як сотні год таму — праменны, дзіўны чар...
Ды сэрца не гарыць, а тужыць недарэчна,
бо ў ім, гаркім штагод — слабейшы весні жар.
Калісь расло яно, ірвалася у вышу,
зракалася ўвясну усіх, што ёсць, клапот,
а сяння — хай вясна, шукае сэрца цішы,
не сніць, не лятуціць, закутае у лёд.
І нават слоў няма, каб прывітаць гарача
каханую вясну так, як калісь, даўней.
А ўсё-ткі ў думках штось ці цешыцца ці плача,
і сонца свеціць мне штораз ясней, ясней!

*Хэлмна, 1928*

## СМЯЯЛАСЯ Ў ВОЧЫ ВЯСНА

Смяялася ў вочы вясна адно колькі радасных дзён,
вятром загадаўшы лунаць над люстрамі талай вады...
Ды кінула злосны праклён,
адыходзячы ўдалеч, зіма:
узноў халады...

Узноў загулі вятругі ў сетцы рухомай галін
і сівер без права й пары суворую песню завёў,
сцяў лёдам ваду каляін,
і бела узноў...
Ды вернецца, прыйдзе ў палі ў зялёнай кароне бяроз
вясна, прыгажуня-вясна, туліцца пачне да зямлі,
і рогат вятроў і мароз, што снегу ў душу намялі,
адгоніць яна...

*Хэлмна, 1928*

## ПЕРШЫ СНЕГ

Сяння раніца й сонца ўставалі
у вянку з каляровых агнёў,
і карункамі йльдзянымі ззялі
залатыя галіны кляноў.
Нетутэйшыя, дзіўныя краскі
загараліся ў шыбах вакон...
Было ранне — старонкаю з казкі,
было ранне, як казачны сон.
А пасля... неба згасла... сцямнела...
вецер голлем сухім зашасцеў,
з шэрай вышы, і чысты і белы
снег густы паляцеў, паляцеў.
Ён паблытаў дзіўныя узоры
у галлі разварушаных дрэў,
ён маркотныя ніваў разоры
снежнабелай пялёнкай адзеў,
сыпкіх гурбаў намёў, перайначыў
свет, хаду нашых чынаў і дзён.
Згасіў зоры й агні, каб зазначыць,
што ўсё ж доля — не казка й не сон.

*Хэлмна, 1928*

## ТУГА

Лёгка-займглёныя восені далі
ўясна-зялёным блакіце стаялі.
Гаснучы, сыпаўся дзень пазалотай
з неба на тонкіх бяроз пераплёты.

Чырваняй кволай, старой акварэлі
клёны й асіны у лесе гарэлі.
Дзень дапаліўся, і цемра нядбала
ў шэрасці хварбы жывыя схавала.
Лес у густым, мутнаватым тумане
ў змрок адышоўся, як шэрае зданне...
Цёмна... Бярозы нябачна у полі
сыплюць асеннія слёзы паволі.
Услухайся ў плач іх, жаллівы без меры.
Ці разумееш у плачы тым шэрым,
што яшчэ нехта у вечар туманны
тужыць усупал з табой па нязнаным?

*Хэлмна, 1930*

## ЧАСТА ЎВЕЧАРЫ

Часта ўвечары, так, напрадвесні,
калі гасне заход, перад ночай,
гэтак хочацца выліцца песняй,
а так мучыць пачуцце нямочы!
Усе словы здаюцца малымі,
ўсе — не тымі, што выцвісці хочуць,
бо ніяк не параджу я з імі,
што здалёк і смяюцца й сакочуць.
Словы — ветры на крылах птушыных,
словы — зоры са шляху сусветаў,
словы — пэрлы з нязнаных глыбіняў,
словы — будзьце слухмяны паэту!
Слова — музыка першых грымотаў,
слова — павадка яблынь вясновых,
слова — думкі нястрымнай узлёты,
слова — будзь жа паэту слухмяным!
З цябе вытку паяс шматкалёрны,
каб агнём у ім ніткі гарэлі,
упляту ў яго ззянні ды зоры,
раззваню скрозь жаўронкавай трэляй,
аджыўлю ў табе зыркасць зарніцаў
і шум-шэлях расістага жыта,
ўспомню ўсё, што забытым маніцца,
ўспомню ўсё, што даўно пражыта.

Не ўцякай жа нябёснай пуцінай,
не хавайся ў далечах нязнаных...
Слова — вецер на крылах птушыных,
Слова, будзь жа мне, будзь паслухмяным!

*Хэлмна, 1930*

## ТАЕ ВЕЧАР

Тае вечар, пачаты на росных лугох.
Ціша... ціша...
З даляў выліўся вецер, пайшоў па кустох,
ледзь калыша...
Смакам свежым паветра густое абмыў,
пахам бору,
закруціўся і ў цёмную далеч адплыў,
недзе ў зоры.
Зорам цесна у небе, як нам на зямлі,
Ймглой трымцівай
ноч абсыпалі, снегам ляглі на галлі
йгруш над нівай...
Белы пыл, як туман серабраны, залёг
нізам, вышай...
Стаяў вечар, пачаты на росных лугох,
ціша... ціша...

*Хэлмна, 1932*

## КАЛІ

Калі згасне апошняе ззянне
там, высока, паміж балачынаў,
і выходзіць з лагчынаў змярканне,
абхінуўшыся хусткаю сіняй,
калі сняць вербалозы над рэчкай
аб вясняным, аб сонечным свяце,

калі белаю воўнай авечкаў
устаюць туманы з сенажаці,
калі ў небе зялёным, бяззорным
маладзік залаты выплывае,
калі складным, залівістым хорам
жабі род у лагу запявае, —
о, тады забываецца неяк
свет і ўсё на зямлі, навакола,
расцвітае высока, вясёла,
светлым зданнем — вясёлкай шугае
у нябёснае сіняе поле,
дзе смяецца яна і вітае
ўсё, што ёсць...
а не будзе ніколі.

*Хэлмна, 1932*

## ЗАПАЛІЛІ КАШТАНЫ

Запалілі ў прысадах каштаны
свечкі белых, пахучых кветак.
Там, далёка ў даліне туманнай,
спіць імгла сіняватых палетак,
а над ёю хінуцца узгоркі,
гіне шэраю пасмай далеч,
на заходзе — шнурком пацёркаў
ззяюць хмараў чырвоных каралі.
І плыве ў неба разам з вятрамі
свет мільёнам, мільёнам хаценняў,
пакуль ноч не суцішыцца снамі
у палёх, пахаваных у сцені,
пакуль пацеркі хмараў парваных
не згараць між нябёсных палетак
і не згасяць густыя каштаны
свечкі белых, пахучых кветак.

*Хэлма, 1932*

## ВЯЧОРНАЯ МІСТЭРЫЯ

Сплёў вечар вянок прамяністы
з шыпшыны і макаў чырвоных,
у небе завесіў прачыстым,
на ясных нябёсных загонах...
А сонцу вянок спадабаўся,
у чырвані сонцу да твару...
Так — захад у хварбы прыбраўся,
так вечар заняўся пажарам.
Усё, што такім было знаным,
адразу зрабілася дзівам:
настольнікам, золатам тканым,
паслаліся жытнія нівы,
агнём загарэліся стрэхі,
сады і вяршаліны бору,
і густа праз хмараў узрэхі
сыпнулі, як зерняты, зоры.
Бярозаў зялёныя рукі
застыглі, бы ў часе малітвы,
прачнуліся ночныя гукі,
нячутыя ў дзень працавіты,
затросся лазняк з пераляку,
пачуўшы крок чорнае ночы...
І росамі вечар заплакаў,
у змроку хаваючы вочы...

*Хэлмна, 1932*

## ПАРАЛЕЛЬ

Ціхі вечар, маркотны, ласкавы,
так паволі, паволі зышоў,
і зліліся у змрочнасці лавы
пад прысадай густых каштаноў.
Заляглі цёмна-сінія сцені
у завулках, у цёмных кутох,
дзе міргаюць і гаснуць праменні
у разбітых, мутных ліхтарох.
Ноч абмыла пяшчотаю парнай
камяніцы і вочы вакон

і прарвaўся з блізкое кавярні
неспакойнае музыкі тон...
Гаручковая смеласць размовы,
недарэчны, адрывісты смех,
голад шчасця, спрадвечны а новы,
ўсцяж жывое жаданне уцех,
пад прысадамі змрочнымі лавы,
дзе купляюць на ноч пачуццё,—
гэта места спрадвечнае права,
гэта места старога жыццё...

А далёка, далёка, далёка
сніць аб лепшым вячорны прастор...
Там жыта падняліся высока,
звоніць рэзвых казёлчыкаў хор,
там туман сіняватай сцяною
спавівае ужо сенажаць,
там так ветла над соннай зямлёю
тоняй сіняю зоры дрыжаць,
там паволі, маркотна, ласкава
спавівае ноч нівы й палі...

Там, не тут, там спрадвечнае права,
праўда вечная маці — зямлі.

*Хэлмна, 1932*

## ЗАВЕЯ

У нясмелай, замлелай цішы
ўстаў туманны, няветлы ранак,
ціха вецер галлё калыша,
недзе плачуць званочкі санак,
нізка, нізка сівыя хмары
над зямлёю ціхой клубяцца...
Ціша...
раптам — віхор ударыў,
стаў заводзіць, гусці, смяяцца.
А з віхурай прыйшла завея,
ўсё змяшала,
змяла,
пайрвала,

разгайдала галлё ў алеях,
паблытала...
«Месца, месца,
волі, волі!»
Мкне у месце,
мкне у полі,
беліць вочы белай беляй
гнеўна — спеўная завея,
б'ецца,
ўецца,
скача,
плача,
сыпкім снегам сее, вее,
не лякаецца няўдачаў
гнеўна-спеўная завея!

*Хэлмна, 1933*

## НОВАЯ ЗІМА

У вабыймах дзіўнага спакою
спіць палёў неабсяжны прастор...
Зноў на шыбах мастацкай рукою
тчэ зіма далікатны узор.
Зноў сінее зімовая далеч,
зноў зяленяцца змрокі, як лёд,
і гарыць пурпуровай эмаляй
няжывы і халодны заход...
А нядаўна, здаецца учора,
на блакітных палотнах нябёс
ткалі шоўкам зялёным узоры
маладыя галіны бяроз,
пахла мёднай ліпой у паветры,
дыхаў пешчай гарачаю змрок,
і змяталі вячорныя ветры
пыл з распаленых сонцам дарог...
Так нядаўна, учора, здаецца,
хоць мяцеліца сяння мяце
і на сэрца жывое кладзецца
пыл лядзяны гусцей а гусцей.

*Хэлмна, 1933*

## ЦІША

Ціха... Між клёнаў бязлістых
туліцца змрок надвячорны.
Месяц сцюдзёны і чысты
выплыў у небе прасторным.
Сцішаны спевам мяцеліц,
дзень дапаліўся вятраны,
сінімі робяцца белі
даляў чужых і нязнаных.
Сумна... дадзела праменнасць
зыркіх зімовых заходаў.
Хочацца нейкай адмены,
неперажытых прыгодаў.
Хочацца летніх палудняў,
палкасці й золата ніваў,
звону чмялёў — перагудаў,
смелых, гарачых парываў...
Дзе ж там!
                    Між клёнаў бязлістых
дзень дапаліўся зімовы.
Месяц сцюдзёны і чысты
выплыў у небе ліллёвым...

*Хэлмна, 1933*

## ВЕЧАР

Вецер вячорны на клёнах
шпарка праймкнуўся... і згінуў,
кінуўшы ўслед палатніну
пахаў зялёных.
Дзесь па кутох між дамамі
сцень сінявацы гусцее...
Гасіць калёраў завею
вечар над намі...
Ў цемры жывой і гарачай
ззяюць дзе-недзе ліхтарні.
Сонна ў далёкай кавярні
музыка плача...

Ломяцца ў змроку вясняным
дзіўна маркотныя гукі.
Выцягнуў шэрыя рукі
вечар над намі...

## ВЯЧОРНАЯ ЧАСІНА

Дрыжаць над вадою вячорныя сцені
дзіўною, няўхопнай бадай чарадой,
і моўчкі хінуцца старыя вярбіны
ў бясслоўнай малітве вячорнай часіны,
часіны натхнення — над соннай вадой.
А захад згарае у зменных адценях
прадзіўнае хварбы шыпшынна-жывой,
і пылам ружовым здаюцца аблокі,
што таюць бязмежнай, бязмернай, далёкай —
як сцяг пакаленняў — нябёс пуціной.
Так ціха... Не, штосьці дрыжыць і спявае,
спявае наўкола, ўгары, над зямлёй...
Мо рэчныя хвалі шасцяць у вярбінах,
мо конікаў песня звініць несупынна,
мо вецер гуляе з вярбінкай малой?
І рэчныя хвалі пяюць малітвенна,
і конікі звоняць нямоўкна мяжой,
і вецер шасціць у галінах вярбінаў,—
ці ж дзіва, што чар перадночнай часіны
расцвіў палымenna ўва мне й нада мной?

*Хэлмна, 1933*

## НОЧ

Згас у хмарах заход прамяністы
і ўзняла ноч паволі павекі,
варажыць узялася ўрачыста,
уваходзячы ў бору засекі:
«Ад бяссонных пакутаў распачы,
і ад вусцішы чорнай паўночнай,
ад спякоты гарачага плачу,

ад паглядаў нядобрых, урочных,
ад сноў-мараў, што могуць прысніцца,
ад злых думак, гаркіх а здрадлівых,—
я краплю бор халоднай расіцай.
Адгані сум, лес-бор шапятлівы,
неківайце, калматыя хвоі,
чорнай пражаю тонкіх галінаў:
белы месяц усходзіць вышою,
заглядае у змрочнасць лагчынаў,
і туман ручнікoм белатканым
ужо сцелецца нізка і роўна...
Не шасцеце ж аб страхах нязнаных
незгаданых, як доля, бясслоўных».
Шэпча ноч і кідае расою,
навакола кідае ўрачыста...

Там, высока, за хмар паласою,
згас, датлеўшы, заход прамяністы.

*Хэлмна, 1933*

## ПРЫВІДЫ

Апусцілі бярозы залёныя рукі ў распачы,
больш не хочуць расці, зелянець ані гутарак весці,
шэры змрок над зямлёю паўзе, ноч і цемру сцюдзёную
весціць,
ледзь калматы лазняк варушыцца ў лагчыне, ды дзесьці
здань-сава глуха плача...
А ноч чорнае кола сціскае наўкола, сціскае,
ўсё бліжэй, і шчытней, аж зацісне, задушыць, здаецца.
Цішыня, уздыхае цішком, а мо кпліва смяецца.
Сэрца б'ецца трывожнай, бяскрылаю птушкай у клетцы,
ў чорнай ночы ратунку шукае...
Не, парвецеся струны гудлівыя — початыя гукі,
расступіся, калматая ноч, і пусці маё сэрца на волю,
да жыцця, да святла, да натхнення, да шчасця без болю!

Срэбнай стужкай туман-пустацвет знік, растаяў у полі
і ўгару узнімаюць бярозы зялёныя рукі...

*Хэлмна, 1933*

## ХАЦЕННІ

Як калоссе ў жытняй ніве —
цягне дух мяне ў гару.
Тут — нічога больш не дзівіць,
тут — нічога не збяру.
Нежывой, зімовай почай
сніцца мне ліпнёвы змрок,
а ўвясну — пляла б ахвоча
я ўжо восеньскі вянок.
Цемрынёю, бездарожжам
аднаго пайшла б шукаць:
што ніколі мець не можна,
што ніхто не можа даць!

*Хэлмна*

## ВЯСЁЛКА

Лягла вясёлка мастом трымцівым,
мастом, сатканым з калёраў кволых,
ад мокрых сцежак, ад росных ніваў
у бор сасонны, сівы й вясёлы.
Красою чыстай ты цешыш вочы,
красой нясталаю, як доля...
Чаго ж прыйшла ты, чаго ты хочаш,
чаго ўзрунела, вясёлка, ў полі?
Пацешыць хочаш нязвычнай казкай,
узняць з нізінаў у вышу вока?
Гарыць вясёлка нянаскай краскай,
мастом трымцівым лягла высока.
Мастом тым здані да нас зыходзяць
з паднебнай вышы, з нязнаных даляў,
вясняным чарам нас надзяць, зводзяць,
калышуць спеўным напевам хваляў...
З краіны дзіўнай маны й надзеі
і сны сплываюць па ім, няйначай.
Шчаслівы ж той, хто сніць умее,
шчаслівы той, хто іх пабачыць!

*Хэлмна, 1933*

## У ЗАДУШКІ

У вогкім ад дажджоў паветры,
паміж крыжоў — туманных зданняў,
міргаюць свечкі жоўтым ззяннем
на хваравіта-ўпартым ветры.

Няма ўжо вас... Вы там, няўрокам,
дзе свецяць зоры серабрана,
дзе чарнатканыя туманы
хаваюць дзень... Вы дзесь далёка...

Нядаўна й тут вясна нясмела
цвіла, дымела срэбрам далеч,
і над крыжамі красавалі
каліны пышна, пахка, бела...

Нядаўна й тут звінела лета
ў гарачы поўдзень гудам пчолаў,
і пахла мёдным пахам зёлаў
з магілаў, косамі прыгрэтых...

А сяння вось, з упартым ветрам,
стаіць асенні змрок над вамі,
і плача вецер над крыжамі
у вогкім ад дажджу паветры.

Няма і вас... Дзе вы? Ў нязнаным...
Ці лепей вам, ці там мо горай,
вы нам не скажаце, й з пакорай
прымаем вашае маўчанне.

Гады ці дні — й над намі, ласка
жывых, трымцець тут будуць свечы,
ды вецер на крыжох нявечыць
зноў будзе,
нашыя ўжо,
краскі.

*Хэлмна, 1934*

## ВЯСНОВАЯ КАЛЫХАНКА

Снежнаю мяцеліцай
сыплецца нядзеляю
цвет — краса вішнёвая,
па траве пасцелецца
белаю пасцеляю,
коўдраю пуховаю.
А вятры вячорныя
закалышуць ціхаю
спеўнай калыханкаю:
«Спі да рання зорнага,
пакуль ночка дыхае
на траве каханкаю.
Сны хай сняцца гожыя
табе, крыўды латаюць...
Сонечна-гуллівыя
сны — дзе ўсе прыгожыя,
сны — дзе ўсе багатыя,
сны — дзе ўсе шчаслівыя!

*Хэлмна, 1934*

## ВОСЕНЬ

Восень выходзіць у поле
ў белым вянку з павучыння,
восень на ўзмежку, паволі,
з цяжкай пасажнае скрыні
цягне сувоі туманаў,
тканых на дне балацяных,
голых,
бязлістых лагчынаў.
Гінуць у шэрасці далі,
гаснуць у шэрасці гукі...
Йгрушы на межах распялі
цёмнапальчастыя рукі...
Цяжка над ржавым іржышчам
стогне,
заводзіць і свішча
вецер, адданы на мукі.

*Хэлмна, 1935*

## НЕЗГАДАНАЕ

Дзень стуліў залатыя расніцы,
супачыў недзе ў попеле хмар.
Квола зорная рунь каласіцца,
квола месяца ззяе пажар.
Невымоўна глыбокая ціша
тчэ трывожны, дзіўны супакой.
Ноч і надзіць,
і кліча,
й калыша,
ноч гуляе з душою людской.
Незгаданаю ўсмешкаю Буды
усміхаецца бездань нябёс...
А зямля спачывае нязбудна
у паводцы нявылітых слёз.
І хоць гасне у сэрцы надзея
пад цяжарам падзей ды ахвяр,—
ў небе зорная рунь зелянее,
ў небе месяца ззяе пажар.

*Хэлмна, 1934*

## УВОСЕНІ

Я не магу пісаць, бо хмарамі густымі
спавіта неба сінь, бо сонца не відаць,
бо кроплямі дажджу, бліскучымі, малымі,
бясконца, дзень увесь, заліта шыбаў гладзь.
І сумна, сумна мне, і сумна невымоўна,
і хочацца ісці, знайсці нязнаны шлях
туды, дзе ўжо вясна, дзе пышна і чароўна
красуе белы сад, салодкі сее пах.
Дзе матылі мігцяць, яскравыя, бы краскі,
калышуцца й шумяць зялёныя жыта,
дзе шчодра, самахоць сплывае сонца ласка,
дзе цешыцца жыццём — і чар і любата!

*Хэлмна, 1934*

## МЕСТА

Над местам у полымі белым
зялезнае рэха стаіць
і цягне бясконца, дадзела
цягуча-пявучую ніць...
Мы топчам рытмічна і гулка
асфальты, нас гоніць паспех,
над намі каменне завулкаў
зігзагамі значыць свой бег.
Над намі — бетонаў штадзённасць
і шэрасць панурая сцен,
над намі нябёсаў зялёнасць
парэзалі сеткі антэн,
мы слухаем воўчае песні
сірэнаў і гоману крам,
дзе скрозь запаляецца й чэзне
здзічэлая чырвань рэклам,
мы дыхаем горкай бензінай,
муроў абмінаем рады
ды ймкнём наўздагон і гадзінам
і днём, невядома куды,
бяжым... і у смазе пякучай,
што гоніць цікаўных нас жыць,
не бачым, што ніткай бліскучай
вясна ў паветры дрыжыць,
не бачым, што гнуткія лозы
ўжо срэбны размоткаюць пух,
што дзесь, па-за нашаю прозай,—
праўдзівая радасць і рух!

*1935*

## ЗІМОВАЯ НОЧ

Загарэліся зоры агнямі
па палотнах нябеленых хмар.
Дзесь высока, высока над намі
поўнач б'е невядомы званар.
Змрок зімовы калышацца нізка
па лагчынах, сівых хвайнікох—

ткаць нам дзіўную казку ўзяліся
ноч
і ціша
і месяц — утрох.
Туманамі, што ткаюць, ірвуцца,
усплываюць над здані хваін,
мост з праменняў плятуць, каб даткнуцца
ў небе вытканых зорных тканін.
А каб сум па нябёсных прасторах
кажны й тут супакоіць бы мог,—
запаляюць мільённыя зоры
у прадонных зімовых снягох...

*1935*

## ЗІМОЮ

Пастрасалі, разнеслі ўначы вятругі
нежывое, пажоўклае лісце бярэзін.
Шкляным пылам іскрыцца мароз на галлі,
беліць далі густыя і мутныя снежань.
Па іржавых паўтонах асенніх гадзін —
навакола паўсонная, белая пустка
ды над гойстрымі вежамі цёмных хваін
шэра-сініх нябёсаў зімовая хустка.
Што зіма — пазнаю не па белі галля,
а па тым, што ў душы маёй мова маўчання:
першы снег, ранні змрок дакучаюць, баляць,
кажны крок паўз жыццё — запыняюць і ганяць.
Не люблю я, не ўмею падкаджваць зіме,
красавацца на шыбах зімовай шыпшынай,
пакуль холад зімовы дарэшты задзьме
мае думкі й парывы апошнія спыніць.
І жыву я ўзіму толькі тым, што было:
йду між пальцамі золата восені сыпаць
ды ў дадзелым маўчанні галля без лістоў
слухаць шуму пажоўклых кастрычніцкіх ліпаў.

*1935*

## ЗОРЫ

У лагох, налітых туманамі,
белым статкам пасуцца таполі.
З цёмна-сініх глыбіняў над намі
ноч зыходзіць спакойна, паволі.
Ззяюць зоры, міргаюць вачыма,
узнімаюць густыя расніцы,
быццам сочаць і пільна й няспынна,
што за сон нам сягоння прысніцца...
Калі ўгледзецца ў зорныя светы
простым, людскім прыгашаным зрокам —
мала быць расспяваным паэтам,
навет мала — натхненным прарокам.
Хто ж бо ўцісне у словы пустыя
чар нябёсаў адвечны і сталы?
І метафар на свеце замала,
і ўсе рыфмы здаюцца не тыя,
і не праўдзяць ні формы, ні меры,
рытм найлепшы — здаецца ніякім,—
можна толькі ў захопленні верыць
ясным зорам з глыбінь Задыяку.

*Хэлмна, 1935*

## З ВОСЕНЬСКІХ НАСТРОЯЎ

Дзень асенні ўстае па-над нівамі,
праціраючы вочы слязлівыя,
йржавай рызай лісця ды анучамі
брудна-шэрых туманаў абкручаны...
Ўстаў, зірнуў, пазяхнуў... Зварухнулася
груганоў грамада між асінамі,
чорнай сажай крылля разгарнулася,
зашумела, ўсплыла над галінамі,
і памкнула ў палі з крыкам вусцішным,
сотняй горлаў хрыплівых згарушчаным.
А дзень, збуджаны ім, па-над нівамі
скрозь заплёхаў дажджамі краплівымі,
мокрым ветрам раз'енчыўся нечага,
растапіўся у смутках
да вечара...

*Хэлмна, 1935*

## АСЕННІ ВЕЧАР

Чырвоны бляск асенні захад
праз рэдкі кужаль хмараў цэдзіць,
густы сасоннік крые бляхай
з рудава-жоўтай, чыстай медзі.
Чырвона й сіня ў соснах гонных,
па ймхі кладуцца пасмай сцені,
і пах гаркі, лясны, сасонны
ўстае з зямлі, як сон асенні.
Яшчэ часіна — і з гушчараў
маўчком, нячутна выйдзе цемра,
ўнізе, паміж камлёў няздарных,
клубком разблытаецца шэрым,
павісне зрэб'ем нечасаным
над лесам сцішаным, над намі...
О, ноч, жывога дня нірвана,
прыйдзі,
й суціш, суціш нас снамі!

*Равіч, 1936*

## ВОСЕНЬ У ГАІ

Ціха восень да ймшы пахавальнай
жаўтатканы дыван рассцілае
на дне ціхай, вільготнай лагчыны.
Ціха восень да ймшы пахавальнай
паліць жоўтыя свечкі у гаі —
ўсё бярозкі малыя, асіны...
Сіняй хваляй клубяцца туманы
і правідным, пахучым кадзілам
спавіваюць пажоўклыя дрэвы...
Сумнай песняй, няўхопнай а знанай,
песняй-жальбай забытых магілаў
лес заводзіць, пануры, зжаўцелы...
А у тон яму вецер высока
штось шапоча ў бязлістых каронах,
мо літанні да яснага сонца,
мо малітвы да сіняў глыбокіх,
да вясняных жывых пераззвонаў
ў небасяжнай нябёснай староццы...

*Равіч, 1936*

## ЧАСІНЫ ТВОРЧАСЦІ

Растуць у лесе вершы ўвечары...
Разлёгся лес імхамі, плесняю.
Іду сцяжынкай непрыкмечанай
і цешу сэрца новай песняю.
Нялёгка йсці праз нетры слоўныя,
якія йлгуць, тварыць нязнанае,
і рытмы праставаць няроўныя,
і рыфмы уздзіраць дзірванныя,
шукаць метафары разменнае
у думках — жоўтых пыльных хронікаў,
і ў словы выліваць штодзённыя
глухія гутаркі сасоннікаў...
А ўсё ж,
            люблю тварыць я ўвечары!
Цямнее лес сцяною точанай...
Іду сцяжынкай непрыкмечанай
па ймхох, расой вячорнай змочаных,
Туман кладзецца між хваінамі,
трасуць асіны пазалотаю,
і цягне вільгацяй лагчыннаю,
вадой стаячай і чаротамі...
Ўнізе, смалой наліты чорнаю,
ляжыць ставок, затканы плесняю.
Іду, ў ваду гляджу узорную,
і цешу сэрца
            новай песняю!

*Равіч, 1935*

## АСЕННЯЯ ЭЛЕГІЯ

Дзень устаў яснай цішай
над сцішаным полем асеннім,
усміхнуўся пажоўклым асінам
праз сіні, настылы туман,
растапіў асцярожна
ў барознах залеглыя сцені,
а тады...
зашумеў у лазе,
балазе загулялы цыган.

Закруцілася слупам рыжавым
іржавае лісце ігрушаў,
загула разнаструнна
над руняй іглістай імгла,
усё ён, дзень,
у палёх пагартаў,
расцягаў, разварушыў,
пахам восеньскім, моцным,
урочным, упіўся, відаць.
На пажоўклыя дрэвы
з напевам хрыплівым зваліўся,
пакрышыў, пераблытаў
пабітыя пальцы сукоў,
а пасля...
уздыхнуў і уміг
пераціх, занямеў, засмуціўся,
лёг на ўзмежку нязручна
ў анучах зрудзелых лістоў...
Так і ў нас
перасціхнуць калісьці,
як лісце, парывы, змаганні,
прамінуць усе праўды,
папраўдзе пайрвуцца, як ніць,
азірнёмся назад,
на бязладныя сцені,
хаценні, жаданні,
ляжам з восеняй слёзнай
ў барознах слізкіх
супачыць...

*Равіч, 1936*

## ПРЫЗАБЫТАЕ

Ад палёў паўзе холад восені.
Над рудым жніўём, над пракосамі
ймгла звіваецца.
У сон зямлі сырой, цяжкі, змораны,
сыпле дробны дождж зярнё спорнае,
увіхаецца...

Час праз пальцы йдзе ніткай шэраю,
ніткай шэраю яго й мераю,
йрву ды блытаю.
А здалёк, з павучыння непамяці,
устае, каб ізноў мяне раніці —
прызабытае...

*Равіч, 1936*

## ФЕСТЫВАЛЬ

Слата... Асенняе змярканне
глядзіць вачмі сляпымі ў змрок,
дзе парудзелым, мокрым зданнем
плывуць бярозы праз пясок.
Плывуць і белымі рукамі
ірвуць густы, густы туман,
а над слатой, над туманамі,
нябёс палатаны рызман...
Бязлюднай пушчай выдаюцца
нябёсы, сінія даўней,
У сценах восеньскіх, у пустцы,
штораз пусцей, штораз цямней.
І толькі рад бярозаў нема
з вачэй сляпых страсае жаль...

Спраўляюць восень, ноч і цемра
глухі, распачны фестываль.

*Равіч, 1936*

## КАЛІ СКОНЧЫЦЦА ДЗЕНЬ

Толькі ўночы жыву я душою узлётнай,
аб якой гэтак часта не помню зусім,
і зайздросціць магла б тады качкам дзікім,
што ўзнімаюцца з крыкам над сонным балотам
рухам вольным і дзіўна мяккім.

Я ляцела б за імі над пасмай зялёнай
шэрым крыллем касіць парудзелы чарот,
я пазбыцца хацела б клапотаў, нягод,
як той дзень, што ў прадонныя, зорныя тоні
адплывае над плесняй балот.
Але тое, што збуджана, сцішыць няможна,
супраць волі, ўсё лёгкім здаецца згары,
хай у цесным жыцці, як за кратай астрожнай,
так няўдзячна, так цяжка тварыць!

*Равіч, 1936*

## ВЯЧОРНЫ АБРАЗОК

Вятраны змрок... Старыя вербы
над рэчкай пранікамі пяраць
па шэрай воднай палатніне.
Ўгары, праз хмараў рэдкіх шчэрбы,
зіркае месяц круглатвары,
зялёна-сіні.
Зіркае ў цемру, што лагчынай
паўзе і вільгацяю свежай
дубцы лазы надрэчнай мочыць.
А вецер трэпле балачыны
ўгары раскіданай адзежы
і ў ноч валочыць...

*Равіч, 1936*

## НОЧНЫЯ ГАДЗІНЫ

Ліжа страх нежывое аржонне
і хінецца да межаў рызманых.
Сенажаць балацяная тоне
ў фасфарычна-зялёным тумане.
Ледзь кульгаюць самотнай дарогай
здані бурыя — вольхі старыя.
Пуста, вусцішна й глуха...

Нічога,
зараз цемра ўсё чыста пакрые.
Ноч расцягне паўцені на межах
пачарніць фасфарычныя хмары,
вецер песняй глухою, начлежнай,
разварушыць альшэўнік няздарны,
пойдуць вольхі самотнай дарогай,
а над шляхам іх цёмным, нізінным,
белы месяц бліскучым нарогам
ноч парэжа на скібы-гадзіны...
Паплывуць яны, ночы гадзіны,
недзе ў цемру бязмэтнай штафэтай.
Не стрымаеш, не вернеш, не спыніш
іх — нязнаныя дзеці сусветаў...

*Равіч, 1936*

## ХВОРАЯ ВОСЕНЬ

Дождж імжыць ужо некалькі дзён,
і на свеце так нудна і шэра.
На асенні дурны забабон,
як на грыпа, зямля захварэла.
Хрыпла плача з-за мокрых вуглоў
і трасецца асінавай трасцай,
жоўтай пенай аслізлых лістоў
у далечы плюе, дзе удасца.
Будзе гэтак туляцца, стагнаць,
пакуль лёд не сатне яе сіні,
пакуль снежань не прыйдзе ёй даць
снежнабелы драбок аспірыны.

*Равіч, 1936*

## АСЕННЯЮ ЦІШАЙ

Над мутнай вадой каляінаў,
над бураю гонтаю дахаў,
у страху
калматыя елкі
з імглістага хутра галінаў

выцягваюць сінія пальцы
у цёмнае неба...
ў кацелкі
там зоры гуляюць, як мальцы:
блісне, загарыцца, сарвецца,
пакоціцца зорка —
і згіне.
Здаецца, на мокрай галіне
завісне, згарыць, расплывецца.
І ўзноў супакойна, і сіня
і зорна
у небе прасторным,
як можна быць толькі ў вышы
асенняю цішай.

*Равіч, 1936*

## ЛЕБЯДЗІНАЯ ПЕСНЯ

Дзень пусты і крыклівы прылёг цішынёю на межах.
Трэскі смольныя вечар у хмарах сівых запаліў.
І над жоўтым натоўпам асін у рызманнай асенняй адзежы
горкі дым смалякоў туманамі паплыў і паплыў.

Гэтак ціха й чароўна-прыгожа ўсё ў белых абыймах
туманаў...
Дзіўным, казачным морам пад ногі плыве сенажаць...
Скуль бяруць вечары гэткі змрок і густы й серабраны,
і ці можна у словах іх чар невыслоўны аддаць?

Але прыйдзе мой дзень, і знайду я патрэбныя словы,
тыя словы, якія цяпер не пачую ніколі й нідзе,
буду ўмець і чмялямі гусці ў раззалочаным цвеце ліповым
і шаўковай шасцець асакой на зялёнай, зацвілай вадзе.

Ўсё папраўдзе скажу я тады, для сябе не пакіну нічога,
ўсе памылкі, ўсе ўзлёты злічу і расою рассыплю ў лагох.
Доўг жыццю заплачу, рэшту з добрага, рэшту з благога,
паспрабую аддаць яму, хай не злічу, ці не ўспомню ўсяго.

Раскажу аб мяцеліцах начных, няспаных да ранняя
гадзінах,
супакоі асенніх змяркання́ў у яснасці сплаканых зор...
А ўсе словы ў песню злучу я прыпевам нязнаным,
адзіным,
а ўсе песні — ў адзін, шчэ не чуты, магутны аккорд!

Зашумяць, запяюць у аккордзе мядзяныя хвалі калосся,
пахінуцца зялёнай сцяной, загалосяць вяршаліны дрэў,
туманамі заплача над жоўтымі пожнямі восень...
Лебядзінаю песняю людзі ахрысцяць мой спеў!

*Равіч, 1936*

## МЕСЯЦ

Месяц мокры і срэбны вылазіць з балота...
Расхінаючы гушчу пасохлых чаротаў,
па-над чорнай вадою, бліскучы й харошы,
лічыць золата жоўтае, золата грошай,
і кідае мядзяную рэшту нядбала
у слізкую ваду, дзе ўжо скарбаў цімала.
За балотам, за шляхам, пад цёмнай сярмяжкай
горад дыхае хрыпла, задышліва, важка...
Ў вечным грукаце, скрыгаце й стогне каменным
лічыць грошы ці грошы шукае нязменна,
а бліскучую рэшту, зусім бестурботна,
гэтаксама шпурляе ў слізкое балота...

*1935*

## НАПРАДВЕСНІ

Шэры дзень пазірае ў акно,
шэры дзень, як той пух на вярбіне.
Пуста, сіня
і туманна ў палёх навакол.
Ручаінамі звоняць равы
пад лазою, налітаю сокам.

Гэт высока
ў даль сівую плывуць журавы.
І хоць снег яшчэ ў лесе ляжыць,
хоць з-за хмар льецца жаўранка песня,
ўжо прадвесне,
і так хочацца цешыцца й жыць!

*1936*

## НОЧ

Ад зораў — аж бела.
З паднебнай раллі
ноч пільна, ноч смела
глядзіць у палі.
Ліллёва й зялёна
дыміць сенажаць,
дзе мокрым пласконнем
туманы ляжаць.
Разбуджаны месяц
павіс на галлі
і пальцы, ўсе дзесяць,
камлі абнялі
так моцна, так шчыльна,
што сцішаны ўздых
скаціўся у шыльнік
з хваін маладых,
парваў, расцярушыў
бель месячных кос
і, ўзноў непарушны,
прыльгнуў да палос...
Боль, горычы, наўды
зляцелі дзесь проч.
Ілгуць усе праўды,—
адна праўда — ноч!

*Равіч, 1936*

## АХРЫСЦІЎ МЯНЕ НЕХТА Ў ЗЯЛЁНАЙ ДУБРОВЕ

Не ў царкоўцы малітвай, святою вадой —
ахрысціў мяне нехта ў зялёнай дуброве.
Як паганін, я пушчы пяю залатой,
разумею палёў васільковых размовы.
Да мяне не з імглой, не з мутой ручаін
надыходзіць вясна, і не снегам счарнелым,—
мне смяецца яна жоўтым пухам вярбін,
срэбным звонам жаўронка ў палёх зарунелых.
Не спякотаю й лета мне дыхае ў твар,
не вятрамі красу абівае з чарэсняў,—
каласістая ніва —
адвечны пясняр —
залатыя, гарачыя спеліць мне песні.
Восень зноў —
не залой, не сцюдзёным дажджом,
не тугою цягучай душу маю раніць,—
мне яна павучынне пляце над мяжой,
сном ціхім на сівое кладзецца аўсянне.
І зіма —
не марозамі страшыць мяне,
не сляпою мяцеліцай засціць мне вочы,—
над снягамі, на сінім нябёс палатне
распаляе яна серабраныя ночы...
І заўсёды,
заўсёды паганскай жудой
маё сэрца сціскаецца ночай зімовай.

Не ў царкоўцы малітвай, святою вадой,—
ахрысціў мяне нехта ў зялёнай дуброве.

*Равіч, 1936*

## ПАЭТ

Свет гарыць...
Патайком і адкрыта
б'юцца людзі... Не злічыш нязгод...
А над светам, манаю спавітым,

восень жоўта цвіце, як штогод.
Ты, паэт,
хоць і бачыш пажары
дзесь здалёк, хоць і ты барацьбіт,
але, ўпіўшыся восені чарам,
лічыш вершаў разбуджаны рытм.
Сочыш сцень балачын над аўсяннем,
сінім змрокам малюеш палі...
Для цябе сяння
гнеў ці змаганне —
па-за межы жыцця адплылі.

*Равіч, 1936*

## ЗАМІЖ МЯНЕ

Я —
не жыву вясной...
Рунеюць сенажаці,
курэе сіні дым над кратамі палёў,
і за мяне
цвіце над шэрай пасмай гаці
празрысты, белы пух вярбін і тапалёў.
Я —
й летам не жыву,
бо за мяне сінеюць
у полі васількі й хінуцца каласы,
і жаляцца-пяюць на жоўтых пожнях жнеі,
маёй
зыркой тугой дрыжаць іх галасы.
А ўвосені узноў —
заміж мяне асіны
чырвоны гасяць жар у рэдкім тумане,
і плача дробны дождж так нудна, несупынна,
па сонцы і вясне,
але...
заміж мяне.

*Равіч, 1937*

# СЯГОННЯ

1941—1943

## СЯГОННЯ

Мне кажуць, што пісаць заўсёды, ўсюды можна.
Папера, алавік, натхненне... верш гатоў.
Паэт, абы прысеў, а верш змайструе, зложыць,
з радкоў, як з сена, ўмірг патрапіць скідаць стог.
Але пра што пісаць?
Пракорам быць па часе,
пізаць каралі рос, вянок асенні віць?
Пажарышчаў дзікіх мой верш і так не згасіць,
не змые з душ людскіх пурпуравай крыві.
Дапраўды, што пісаць і заўтра,
і сягоння?
Трупоў не ўваскрасіш санетам аб вясне...
Сягоння
кожны верш хаўтурным звонам звоніць,
найлепшай рыфмай рот галодны не заткнеш...
Пісаць аб салаўёх, аб снежнай белі вішняў?
Замоўклі салаўі пад медны рык гармат,
а белы вішняў снег таксама смешна лішні,—
аб іншым гойстры штых нам піша аж зашмат
Няхай жа свет гарыць, хай плавіцца у горне
грымотных новых дзён, куецца, як нарог.
Нарэшце мо й паэт харэі, ямбы згорне
і зноў пачне пісаць, гуслярыць...
Даў бы Бог!

*Менск, 1941*

## ПЯСНЯР

Трэба быць песняром і цяпер,
калі дзень наш —
                    і з смерцяй братанне,
калі ночы, як ранены звер,
дзесь па норах залізваюць раны.
Не,
   паэт не матыль — у агні
па матыллю апальваць крылы,
на пажарышчах плеснець і гніць
ён не будзе...
                    Паэт жа — асілак!
Ці ж не ён
                з трапятання асін
укладае асеннія песні,
ўмее словам бліскучым скасіць
рунь увесну,
чар казачны здзейсніць?
З чаду,
з шэрага дыму руін,
з віску куляў, гарматных грымотаў
ён, падумаўшы выплавіць гімн
гэткі ж жудасны, гэткі ж смяротны.
Загрыміць новы гімн, шугане
аж у неба крывавай пагоняй,
сэрцы чорнай дугою сагне...
Трэба ж быць песняром
                              і сягоння.

*Менск, 1941*

## АСЕННІ ВЕЦЕР

Асенні вецер зноў гайсае
па жоўтым лянішчы палян.
Мятуць бярозы валасамі
нябёс запылены дыван.
Лісцё рабін, крушыны, бэзу
палае медзяй і агнём,
над свежым ворывам гарэзіць,
ваюе з ветрам варанне.

І дзіўнай соладзяй кладзецца
зноў на душу асенні дым,
гарыць пявучым смуткам сэрца,
як плаўкім золатам — сады,
бо страсянула раннем сінім
з сябе я даўных спраў цяжар,
знайшла свой шлях...
Іду з краінай
пад новы плён араць папар.
І хоць упарта, аднастойна
пляткарыць вецер у галлі,
няхай на сэрцы неспакойна,—
я веру ў лёс свае зямлі!

*Менск, 1941*

## У СОНЕЧНЫ ДЗЕНЬ

Я зачэрпнула сягоння
жменю сонечных праменняў
і гуляла з імі доўга:
перасейвала ў далонях,
рассыпала на каленях,
зноў збірала, каб не стылі,
яны ж
пахлі хмельна, сонна,
сяння выбраным
пласконнем,
і было так люба, міла
рассяваць іх жоўтым пылам.
Свет здаваўся сіні, сіні,
і бязвінны, як калісьці,
летуцелася, што з сэрца я магла б,
нібы асіннік,
стрэсці жах штадзённай смерці,
скінуць жаль пажоўклым лісцем,
Што магла б разблытаць шэрасць
нашых дзён, пачаць ад
старту...
І яшчэ хоць раз даць веры,
што жыццё чагосьці варта!

*Менск, 1941*

## АСЕННЯЯ ДАРОГА

Золата, мосяж і медзь сонца дакоўвае раннем,
не раскуе толькі ймглы, што спавіла сенажаць...
Зноў напілася зямля соннага зелля туманаў
і у рудое рыззё лісту зарылася спаць.
Крокам, нага за нагу, цішу разблытваюць коні.
Зорная шрэнь апляла шыю і грыву й клубы.
Вецер у шкляным галлі мерзлых шыпшыннікаў
звоніць.

Не адгукаецца даль, сытая жоўтай сяўбы...
Ціша вясенняга дня, йржавая пустка наўкола...
Цяжка даць веры,
што свет душыць за горла вайна,
цяжка даць веры,
што ён аж захлынаецца болем,
чорнай, гарачай крывёй,
мусіць цярпець і канаць!
Так,
разбадзялася смерць,
люба ёй зрэзваць калоссе,
ляскаць клыччом,
вылупляць ямы вачэй без павек.
Ды не скасіць ёй жыцця,
нат чалавека не скосіць, —
ён —
несмяротны, як свет. Свет ёсць, дык ёсць чалавек!
А пакуль ёсць чалавек —
можна з крыві і руінаў
веліч ідэяў снаваць, найпрыгажэйшых за ўсё,
можна натхнення гарэць за чалавецтва... і гінуць,
каб на руінах жыцця зноў красавала
жыццё!

*Менск, 1941*

## ТОЛЬКІ ЎВЕСНУ

Толькі увесну бывае неба такое сіняе,
толькі увесну бывае далеч такая чыстая...
Кіну ж у неба, высака, гора маё палыннае,
слёзы зніжу на нітачку,
хай жа звіняць маністамі.

Смуткі мае між хмарамі згаснуць рудой пагардаю...
У годы грымот, пажарышчаў, у дні змагароў і волатаў,
іншаю мерай мерыцца ўсё,
пашы сэрцы старыя
нанава лёс перакоўвае казачна-цяжкім молатам.
Горан палае зорамі... Зоры імкнуць каметамі,
свет наляту падпальваюць, гасяць жыцці мільёнамі...
Дзе ж маім смуткам мерацца з плачам — тугою сусветнаю?
Буду ж трываць, угледжвацца ў далі палёў зялёныя!

*Менск, 1941*

## НЕ ХОЧАЦЦА

Доўга на вуліцах ліпы жоўтае лісце лічылі,
а палічыўшы,
сыпнулі ў ледзьве прымерзлую гразь...
Неяк не хочацца словам зноўку развязваць крылле,
рыфмы ў далонях туліць,
сэрца тугою араць.
Так, бо пісаць і тужыць — сяння адно, сінанімы.
Кожнае слова баліць, колець іржавым цвіком,
з кажным знізаным радком зноў устаюць успаміны
начных пажараў, трупоў, ледзьве прыкрытых пяском.
Хочацца бегчы, шукаць нейкія новыя словы,
словы, якія з жыцця ветрам гарачым змялі б
жоўтыя рукі крыжоў, шэрыя твары палонных,
целы, што гойдае ноч на шыбяніцах галін.
Дзе іх шукаць?
ці ў душы,
ці — у заплаканых хатах,
ці мо ў лісці, што лягло ў ледзьве прымерзлую
гразь?
Слоў гэткіх сяння няма...
Вось і не хочацца кратаць
рыфмамі чорныя дні, сэрца тугою араць...

*Менск, 1941*

## СПАРЫШЫ

Выйшла я серпам зубчатым
срэбра калосся крышыць.
Пахла дакучліва мятай,
я ў жыце знайшла спарышы.
Смехам сыпнулі сяброўкі:
«Ой, сцеражыся, глядзі!»
Сноп я вязала, аж змоўклі,
моцна ж вязала, наўздзіў...
Што ж, каб Васіль тут на полі
зносіў за мною снапы,—
я не ўтуліла б ніколі
вачэй,
не баялася кпін.
Гэтак хацеў ён жаніцца,
так супакойваў мяне...
Усё панясла навальніца,
я ўсё адступіла
вайне.
Змёў, наляцеўшы на вёску,
хлопцаў вясковых віхор,
чырвань пажараў расплёскаў
усюды —
з зямлі аж да зор...
Жудасна, доўга дымілі
гэнымі днямі бары...
Сэрца трывогаю стыла...
Няхай яно лепей згарыць!
Хай спапяляцца на попел
сэрца і ўсё у жыцці!
Як прычакаць цябе, сокал,
сынка як табе нарадзіць?
Дзе успаміны закінуць?
Як тут прысыпаць пяском
ночы струмень цёмна-сіні,
сузор'і — луску акунькоў,
росную мяккасць пракосаў,
здушаны шургат галля,
дзяцельнік ссохлы у косах,
распалены шэпт Васіля?
Эх, Васілёк,
мой хлапчына,
з кім ты начуеш і дзе?

У пыле сыпкім каляінаў,
ў цвілым багавінні ў вадзе?
Выпіў ты ўжо
ці не выпіў
чарку да дна?
Не спяшы...
Пахнуць дакучліва ліпы.
Я ў жыце
знайшла спарышы.

*Менск, 1941*

## КАЛІ

Ой, калі ж высахне кроў,
знойдзецца нейкае выйсце?
Ці калі тлець будзе зноў
вогнішча жоўтага лісця,
ці калі прыгаршчы зор
снежань сыпне на узмежжы,
ці калі сонца лязом
год напалам перарэжа?
Мо тады сціхне дыміць
смутак і нашы і нечы,
можа, адвучымся мы
позіркам кідаць за плечы,
можа, заўмеем сягаць
зноў неагляднa у зоры,
мо з нас нарэшце туга
вечную змые пакору?
Белаю пенай вясна
плешча на шэрыя брукі...
Сны нецвярозыя сняць
лозы, раскінуўшы рукі,
важка, паволі ў душу
капае сонечны солад...
Я ж раўнадушна пішу
словы, што навет не колюць.
Ціха скрыголіць пяро...
звоніць зялёнае лісце
Ой, калі ж высахне кроў,
знойдзецца нейкае выйсце?

*Менск, 1942*

## ПАСЛЯ БУРЫ

Загрымела,
відаць, на «бывайце» у полі...
Уздыхаючы хрыпла, між зблытаных зёл
адпаўзае ў бязмежнае хмара, паволі
падымаючы цяжкі, намоклы прыпол.
Над чупрынай хваінаў чырвоным алоўкам
нехта цёмнае неба чыркнуў яшчэ раз.
Вецер срэбныя кроплі пасцягваў з чаромхаў
і павёў у вячорную даль — на папас.
Я злавіла адну з іх...
Заціснула ў жмені,
ды сплыла паміж пальцаў яна неўпрыцям.
Не злавіць,
не ўтрымаць,
белым хмелем не ўспеніць
і няўлоўнае шчасце людскога жыцця!

*Менск, 1942*

## З ВЫРАЮ

Як засмаглы за песнямі-шчыгел,
прыляцела із выраю й я...
Зноў ступаю няўмытай Нямігай,
зноў сугуччамі думкі пыляць.
Так іх шмат,
што не зловіш рукамі,
у адмераны рытм не ўвагнеш.
Белай брагаю пырскае, пляміць
твар мой
першы, йшчэ восеньскі снег!
Сэрцу цесна ў сетцы адзежын,
столькі сіл назбірала я ў ім!
Сіння —
ўсе я пазносіла б межы,
сіння —
ў пекла пайшла б, як у дым!
Гнуць спіну прад бядой —
перажытак,

шчэ дурней —
шчэцяй руннай дрыжэць...
Не баяцца давайма,
                    а жыта
нашай долі выспельваць барзджэй!
А як кон напару і ўдарыць
кулаком алавяным з пляча
па вятрамі распаленым твары —
шкода сілаў і слёз —
                    распачаць!
Лепей жылы сухія напружыць,
сціснуць пальцаў пругкіх пяцярні —
міма сцежак чужых
і калюжын —
выйсці шчасце сваё бараніць!

*Менск, 1942*

## КРОПЛІ ЗОЛАТА ВОСЕНЬ ГУБЛЯЕ

Кроплі золата восень губляе
з перапоўненай чары жыцця...
Што да чараў,
дык пэўна — я ляік,
а жыццём я іду —
                    напрасцяк.
Мо таму хіба й смагі не маю,
хоць асенняе пахне віно
не то вераснем мне,
не то маем,
кружыць галаў знямогай ляной.
Жоўты свет
            ім упіўся дап'яна,
я ж
    цвярозая ўдалеч іду.
Досыць маю асінавых панік,
снегападаў кляновых і дум.
Але сэрца па-свойму
і шчасцем
і тугою няўлоўнай баліць...

Мо таму, што з сабой яго нашча
я ў рудыя забрала палі,
мо таму,
што ў асенняй трывозе
ёсць атрута, нязнаная нам,
і цыкутаю жоўтаю восень
труціць нашыя сэрцы няўзнак?
Не!
Ў паэтаў яна не пацэліць,
не патрапіць іх долу прыгнуць.
Скажуць:
«Вішні вясной запылелі»,
й кажны ў сэрцы
пачуе вясну!

*Менск, 1942*

## ТКАЛЛЯ

Наснавала дваццаць губак
на пасаг, на ручнікі.
Як зара чырвоным чубам
махане над бору зрубам,
паўкідаю ў бёрда іх.
Нат не буду задумляцца,
ці пашле той кон сватоў,—
запяю і буду ткаці,
як вучыла дзеўку маці,
у дванаццаць у нітоў!
Жоўтым вокам пазірае
крыва, скоса ў шыбы дзень...
Я пры кроснах не гуляю,
прыбіваю, датыкаю
мо ўжо губку, мо ўжо дзве...
Зігаціць асновы кужаль,
бы цымбальных струнаў гладзь.
Эх, заграю!
Мушу здужаць!
Чаўнакі расстаўлю гужам,
скіну хустку, буду ткаць!

Калі ж вечар змочыць бровы
мне зарой,
і на сцяну
кіне полымем,— я словы
песні зблытаю ў палове
і уток пакіну снуць,
бо ў яры,
ў зялёным гудзе,
у чарэмхавых дымох,
хтось чакаць па ткаллю будзе,
каб хоць сяння не змарудзіць,
шчасце сплесці удваёх...
Што з таго,
што ўсцяж гарматы
выюць дзесь на маладзік,
што галосіць смерць па хатах,
па барох?
Не бойся, сватай,
а на рэшту — не глядзі!

*1942*

## ПЕРАД БУРАЙ

Неба пеніцца сіваю шумаю хмараў.
Прыціскаючы крылле да сэрца, у сіні,
як п'яныя, куляюцца ластаўкі...
Парыць...
Сонна пчолаў сузор'і зігцяць у шыпшынах...
Ся...
Грыміць...
Так, здалёк, з-над балотаў і плёсаў
глуха коцяць грымоты, згінаючы лозы,
быццам нехта спяшаецца з поля ў калёсах
па няроўнай, дзікой, каменістай дарозе.
Далеч пахне налітымі мёдам вуллямі,
ажно чуецца дзіўная соладзь на вуснах,
і здаецца жыццё залатым караваем,
а не місаю брыдка накрышаных лустаў.
Нат вайна —
ўжо не боль, толькі стрэмка-дакука,
хоць часамі так зблізку загляне ў вочы,

што асмаліць мне вейкі,
апырскае рукі
журавінавым сокам...
Сэрца жахам падточыць.
Так, хоць часам,
часамі і сціснуцца грудзі,
хоць заломяцца пальцы ў гойстрай журбоце,—
сонца жвірам мядзяным спяшаецца-студзіць
успаміны...
усмешкай за смуткі мне плоціць.
Бо й навошта тужыць,
калі хваляй калосся
ўжо за год ураджай усплыве на магілах,
і заплачуць на даўных баёвішчах восі,
каб снапоўе на сініх аржоннях не стыла.

*Менск, 1942*

## МАЛАДЗІК

Ноч надышла баразніць
неба прастору пустую.
Выпаўз на дах маладзік,
выцягнуў меч...
і вартуе.
Хай падцікаецца зло,—
ўмірг адсячэць яму голаў...
Хто там?
Не, гэта галлё
ліпаў прасейвае шолах...
Ціха... Ся...
Кроплямі ў змрок
капае нечая песня,
пэўна, хтось сэрца урок
ночай лілёвай ля весніц...
Голас, ну й голас!
Наўздзіў!
Эх, і даецца ж у знакі!
Комін абняў маладзік,
меч апусціў....
і заплакаў...

*1942*

## ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ

Радасць жаўранкам звоніць над хмарамі,
хай не згледжу яе, не збяру...
Дні насталі важкія, змагарныя,
зноў
спрабуе расці
Беларусь.
Зноў спрабуе,
із думкамі нашымі,
з дзіўнай, кволаю музыкай слоў...
Слоў,
што кпілі з іх ворагі, страшылі,
што ледзь ветрам іх не замяло.
Наша ж мова —
цудоўная, спеўная,
ўмее спелым калоссем шумець,
галасіць навальніцай улеўнаю,
вераснёваю медзяй звінець.
Мова наша —
выкутая з золата —
не йржавее,
блішчыць,
зігаціць.
Гэта мова паэтаў і волатаў,
скарб, які нас трымаў пры жыцці.
Каб не мова,
даўно б мы растаялі,
расплыліся б імглой між чужых,
збеглі ў вырай гусінаю стаяю...
Але з мовай —
і мы будзем жыць.
Будзем жыць!
Днямі яснымі, новымі,
пойдзем, пойдзем з табой у гару,
наша жытная
і васільковая,
несмяротная Беларусь!

*Менск, 1942*

## МАЛІТВА

Магутны Божа! Ўладар сусветаў,
вялізных сонцаў і сэрц малых,
над Беларусяй ціхой і ветлай
рассып праменне Свае хвалы.
Дай спор у працы будзённай, шэрай,
на хлеб штадзённы, на родны край.
Павагу, сілу і веліч веры
у нашу праўду, у прышласць — дай!
Дай урадлівасць жытнёвым нівам,
учынкам нашым пашлі ўмалот.
Зрабі свабоднай, зрабі шчаслівай
краіну нашу і наш народ!

## САЛАЎІ

Ў сырадой пахучы ночы
я нырца дам з галавой.
Запяю
        і заахвочу
ў жоўтых лозах салаўёў.
Зазвіняць яны...
                        пасыплюць
трэляў шкляную капель.
Пад чаромхай роснай вып'ю
я па кроплі іхны спеў.
Буду піць, каб чар не знішчыць,
аж да рання,
                  аж да дня,
пакуль сінія агнішчы
у лагох не задымяць,
пакуль сонца бель ігрушаў
жоўтым шоўкам не затчэ,
пакуль дзень не запарушыць
пыльным золатам вачэй.
А тады...
              ніхто не ўловіць,
ці пяю я сонцу гімн,
ці ў налітых сырадоем
лозах звоняць салаўі.

Не уцяміць,
ці то трэляў
мкне кіпенны снегапад,
ці п'яную радасць меле
поўны пчол і сонца
сад?

*1942*

## З КАМАРЫНАЙ ПЕСНЯЙ

Ледзь астрыг над руняй маладою
залаты, гарачы жвір зары,—
пацягнулі з песняй камары
у лагі, ўпівацца сырадоем...
І чамусь —
надумалася й мне
скінуць з плеч штадзённасці пастронкі
й з камарынаю гурбою звонкай
патануць у цёплым тумане...
Бо дадзела ўсцяж па нечым плакаць,
у далонях крыць настылы твар,
кажны страх
і крыўду,
кажны ўдар
пераэкоўваць сто разоў, як жваку.
Збрыдла жар надзей з-пад друзаў выграбаць,
і назад пужліва аглядацца,
і цярпець,
каб хіжым рыжым пацам
грызла сэрцы нам змярканнямі журба...
Не, дарма!
Нас выстругаў калісьці
не з мяккой, струхлелае асіны Кон,
але з дубу моцнага, пад звон
рэзвых ветраў і буйнога лісця.
І таму —
не ўдол, а дагары
мы глядзім, зрадніўшыся з жудою,
хай плывуць над руняй маладою
з недапетай песняй
камары...

*Менск, 1943*

## КУДЫ?

Сыны зямлі, сыны сусвету,
куды і з прагнасцяй дзікой
вы імкняцё?
Паверце, й кон,
і чар няўлоўных, дзіўных мэтаў —
адно Калумбава яйко.
І разгадаць жыццё так проста,
так нескладана, нудна жыць!
Усе ж мы дойдзем да мяжы,
усе ж уславім пенным тостам
жыцця й дажынкі,
і зажын.
Дапраўды,
мала трэба спрыту,
каб лёс наперад варажыць:
і фарысей, і шэры мытар
адным прасеяцца тут сітам
і пад адзін патрапяць крыж.
Дарма агеньчык блудны веды
спрабуе з цемры нам міргаць.
Не аджанець ён нашых бедаў,
брыдзе, кульгае нашым следам
старая, ў зморшчынах, туга...
Сыны зямлі, сыны сусвету,
куды ж і з прагнасцяй дзікой
вы імкняцё?
Паверце, й кон,
і чар няўлоўных, дзіўных мэтаў
адно — Калумбава яйко.

*1943*

## ВЕЧАР У ВІЛЬНІ

Расплёў, размёў віхор пярэстых хмараў дым...
Дзень адпаўзае ў змерк вузкіх завулкаў лазам...
І ўсе на мяне з кутоў, з муроў рудых
сівым, як даўніна, даўно забытым сказам.
Мне чуецца ці смех, ці плач, ці штось яшчэ

ў сімфоніі ціхой вячорных гукаў места.
Лязом мяча Вялля спрабуе заблішчэць,
і полымя зары Пяркуна хорам песціць.
Над дахамі, увыш узняўшы бель крылля,
стаіць, усё ў агні, Трохкрыжжа на старожы,
і кленчыць перад ім лясоў лілёвых шлях
імглой налітыя далечы бурых пожняў...
Як тут люблю я ўсё:
чырвоны вулак брук,
і залатым пяском асыпаныя дахі...
Манюся тут сваю апошнюю зару
я сустракаць,
адсюль —
пайсці адвечным шляхам.
Але пакуль жыву — хоць дзе — цяжкім каўшом
хачу я піць жыцця і мёд, і нават дзёгаць.
Хачу, каб лёс мяне на шумных кірмашох
вадзіў,
вадзіў,
вадзіў,
як лерніка сляпога.

*1943*

## МОЎЧКІ НОЧЫ СУЗОР'ЯМІ КАПАЮЦЬ

Моўчкі ночы сузор'ямі капаюць
на стаптаны, скамечаны снег.
Над хваінай сівой, сівалапаю,
месяц дугі ад вечара гне...
А у думках — гады перажытыя,
безліч белых да прыкрасці зім,
ніткі тропаў, што гурбы аблыталі,
нудны спеў, што вядуць палазы,
белых стрэхаў снапы, абабітыя
злой, куслівай Ягой — вятругой,
мроі, што пад аснежаным выкратнем
закілзаць не даюцца й тугой!

Ды чаму б
        і не ўпесціцца мроямі,
аж пачне над радзімаю днець?
Моўчкі капаюць ночы сузор'ямі
на стаптаны, скамечаны снег...

*Менск, 1943*

## ПЕРАЖЫТАЕ

Заўсёды знаю я, куды ісці манюся,
хай часам праз жыццё і вобмацкам брыду.
Чаго ж стаяць, чакаць, аж сонца твар апусціць
і сцені на душу далоні пакладуць?
Ужо ж і так, няўзнак, з упэцканай палітры
нябёсаў сцёрла ноч чырвоны цёплы тон
і адкаціўся ў змрок хмурын мядзяных злітак,
за сонцам і за днём кароткім наўздагон.
Ужо ж і так, і так зімовае змярканне
паблытала ніты далёкіх пуцявін,
і адпаўзла, стаўляць нам пасткі, нечаканасць,
і неадцяты шлях застаўся нам — адзін...
А трэба йсці далей,
Бо толькі тое наша,
што нам само яшчэ пад ногі не лягло,
што ззяе нам здалёк,
што нас і цягне й страшыць...
А перажытае —
        хай ноч засыпле ймглой!

*1943*

## ПЕСНЯ

*Прысвячаецца Забэйду-Суміцкаму*

Не тады, ведай, родзіцца песня,
калі просяць паэту:
        «Пішы»,
а тады, калі пенай чарэсняў
яна ўспеніцца недзе ў душы.

калі сэрца зярняты пачуццяў
пафатрэ, перамеле на мак,
калі ўдасца закелзаць і спутаць
моцнай рыфмаю слоў маладняк.
Так было тут
і з нашай сустрэчай
ды і з музыкай песняў тваіх.
Іх паслухаць мы йшлі, як на веча,
хай нам звон вечавы не званіў.
У той вечар —
твой голас быў звонам,
Ён — званіў з нашым сэрцам улад,
ён — у душы нам сыпаў «Лявоніх»
залацісты, агністы апад,
ён у вочы пылеў нам,
не песняй —
нашай шэрай, нішчымнай вясной,
ён — іскрыпкаю спеўнай ля весніц
сустракаў каласістую ноч,
цьмяным смуткам пад ногі нам слаўся,
зыркім вогнішчам кроў распаляў,
і смяяўся задзірыста й плакаў,
змазваў з душаў штадзённасці ляк...
Ён — з няшчырасці нас абяззбройваў,
а што нам над усё даражэй —
ён, твой голас —
гарачай тугою
па краіне таптанай дрыжэў...
О, пясняр!
Ты так дзіўна упесціў
нас, што з душаў пяшчоты не змыць!
Хай жыве беларуская песня,
несмяротная —
так, як і мы!

*Менск, 1943*

## АСЕННІ ХОЛАД

Так неяк збрыдла мне ўсё.
Жыццё даўно ў жалобнай раме.
Стаптаны мрой сівы драсён.
Трэ зачыняць, здаецца, краму.

Ні новых тэм, ні слоў няма,
усё абсмоктана, бы костка.
Хто ж днём асеннім пераймаць
памкне бель яблынных пялёсткаў?
Хто з шэрай сівернай імглы
наткаць патрапіць ясных тонаў?
Хто пераўе сухі палын
на шоўк вясны, мяккі й зялёны?
Бадай у кажнага ў грудзёх
трымціць асінавае сэрца.
Не чуе свет з трывогі ног,
ці ж да актаў яму, да тэрцын?
Спявай сабе, як салавей —
на радасць песні не спатрэбіш.
Пагардай сяння дораць верш:
з яго ж не выймеш булкі хлеба,
не затаўчэш ім ні куцці,
не вернеш тых,
каго не стала.
Скрозь нудна, шэра у жыцці,
навін так шмат —
і гэтак мала!
Дык хоць гарыць лісцё асін
чырвоным сполахам наўкола,
сінеюць пальцы, і ў душы
такі асенні, золкі
холад...

*Менск, лістапад, 1943*

## ДЫСАНАНС

Сыпле цёплым жвірам
сонца проста ў твар,
уваччу ўсё шырай
залаты пажар.
Скачуць па балонках
«зайчыкі» й пяро.
Каб хутчэй і з сонцам
скочыць за парог!
Не сядзіцца неяк
нам сягоння тут:

заўтра ж вішні белай
беляй зацвітуць.
І здаецца — гэткай
кволай вішняй я
аб вясне над светам
буду зноў пяяць.
Гэта я, не вішня,
белы, сыпкі снег
буду сыпаць цішкам
у мой верш,
ці ж не?
Я — пачую радасць —
прызабыты скарб —
я —
дам жалям рады,
уздыхнуўшы: «Каб,
каб хутчэй, нарэшце...»
І... стае пяро...
Ну й каго тут цешыць,
калі ўсюдых —
кроў?

*Менск, красавік, 1944*

# НЕ АСТЫЦЬ НАМ

1944—1949

## БЕЗ ПЕСНІ ЖУРАЎЛІНАЙ

Сказалі ўсё, што мелі, адшасцелі
аб залатой вясне асіны ды кляны
і скінулі лісцё...
Канец навэлі...
Пачатак новае, так іншай ад вясны.
Ці шкадаваць старой,
ці захапляцца новай,
якую нам ужо тчэ восеньская ноч?
Не знаю...
Ды дрыжаць узноў на вуснах словы,
і сэрца ўзноў снуе ў грудзёх,
маўляў чаўнок.
Гудуць гудкі, грымяць па бруках колы...
У думках — смерць... жыццё...
жыццё і смерць.
Каго хвалюе тут, што восень поліць
лісцё прысад,
каму па іх тугу займець?
У месце, між руін, пад гуд машынаў
нячутна ж, як звіняць у небе журавы,
у вырай лятучы...
Тут, на чужыне,
як ні глядзі, іх вокам не злавіць.
А што ж за восень
без журботы жураўлінай,
без павучыння і без сініх туманоў?
Таму —
хоць не цвілі,
на вуснах вянуць словы
і сэрца
— не снуе, ледзь, ледзь, трымціць —
чаўнок.

*Берлін, верасень, 1944*

## УНОЧЫ

Калматыя, чорныя бровы
суровая хмарыць ноч.
Лірычныя мроі ды словы
адкінула я даўно.
Ісці праз жыццё із санетам —
сягоння, дапраўды, смех:
нат з гойстрым штыхом да светных
ты сяння не дойдзеш вех.
Не слова сягоння,
а куля
парадак вядзе ў нас.
Паэт лепшы той, хто туліць
гранату ў руках...
Вайна...
Інакшых і рыфмы і рытму
жадае людскі натоўп.
Іх з вёснаў ці сноў не вытчаш,
спрабуй хоць бы пораў сто.
А ўсё ж,
як ніхто не бачыць,
ледзь ноч начапляе зор
на неба,—
лірычным плачам
зноў плача маё пяро.
І сняцца мне нашыя нівы,
і роднага неба дыван...
Аб іх успамінаў не змыеш
ты з сэрца,
як ні змывай!

*Берлін, верасень, 1944*

## СУСТРЭЧА

На станцыі —
свісткі, хаос, перапалох.
Снуе натоўп, патраціўшы галовы.
Над клумкамі пярэстымі
удзвёх
стаяць дзяўчаты з «Ост'-ам» на грудзёх,

і свет здаецца ім страшным і новым.
Яны
нядаўна з Случчыны...
Яшчэ
нат не даелі чорнага акрайца,
што маці ім паклала ў торбу, бо пячэ
ён штосьць у горле сяння... Шмат начэй
не спалі...
А куды цяпер? «Парайце!»
Паказваеш ім, дзе, куды й пашто.
Пайшлі...
Забарбанілі колы нудны марш па рэйках.
Іду і я...
І пахнуць мне палі
І саснікі мае айчыны, як калісь,
і сум пякучы паліць вейкі...
Ну, а яны, дзяўчаты, пэўна, спяць
ужо ў куточку дзе, і сняць,
што свежым
асеннім ранкам на сяле рыпяць
вароты,
што курыць імглой лісцё куп'я,
і што вакол —
спакой бязмежны...

*Берлін, верасень 1944*

## УЦЕКАЧЫ

Віюцца, як кужаль блакітны,
на шпулю калёсаў шляхі...
На возе —
малыя, мяхі...
Навокал —
ніўя ды ракіты,
імшары, сасоннікі, сітнік,
сівы небасхіл...
Смяюцца малыя й скуголяць,
сысолячы чорны сухар.
Бацькі ж...
быццам плёхае вар

па сэрца іх пехта няўмольны,
калі расцвітае над полем
уночы пажар.
Ён топча ім здаўна па пятах,
лапочучы крыллем рудым.
Грызецца у вочы, бы дым:
ці гэта не родная хата?
І рвецца да нівы нязжатай
душа...
        каб туды...
Віюцца нячэсаным зрэб'ем
дарогі на шпулі калёс.
Жаўцее на ўзлессі галлё,
звіняць журавы у паднеб'і,
сумуюць палі:
дзе наш сейбіт,
куды ўжо занёс яго лёс?
А ён.—
у чужыне,
ён чэзне
па краі, бы ўвосень быльнёг.
І сняцца яму, абы лёг
па працы —
                дзядоўскі бярэзнік,
і сонца, і вецер гарэзны,
і звон аваднёў.

*Берлін, лістапад, 1944*

## СІВОЙ ВЯРБОЙ

Слата і змрок...
Душа пустуе,
ў смузе маркотнай далячынь...
Сівой вярбой хіба пайду я
над плёсам цішу сцерагчы.
Ўрасту карэннем моцна ў гліну,
карой адзенуся рудой,
шырока рукі разгаліню
над шэрай, соннаю вадой.
І буду жыць,

як жыў спрадвеку
увесь вакольны, вольны свет:
піць туманоў надрэчных лекі,
пух белы сеяць на траве.
І браць, раскінуўшы галіны,
із прагай сонца і цяплінь,
у гуд услухвацца пчаліны
і ціха зерняты спяліць.
Ці раз вярбіну упесціць лета,
ці раз да сну утуліць снег,—
і я забуду ўсё, што ў свеце
мяне змушала паланець.
І пад карой маёй,
на ветры,
не будзе біцца ўжо й званіць
нямоўчны звон —
людское сэрца,
крыніца праўды і маны.

*Берлін, лістапад, 1944*

## ЗДАГОНІМ СОНЦА

Малоціць дождж снапоўе стрэхаў,
аж шэры пыл вакол курыць...
Хто ж рассыпкім прысыпле смехам
сягоння смутак наш стары?
Ўжо ж не здагнаць цяпла і сонца
на крылах навет журавом.
Ды трэба жыць, каб шлях свой скончыць
як мае быць,
і мы жывём...
Ірвёмся, ймкнём, сварымся, просім,
а шчасця ў рукі ўсё не ўзяць.
Ці не няпрошаныя госці
мы на балі тваім, зямля?
Як так — не думай, што пазбыцца
ты нас патрапіш абы-чым.
І мы у твар заўмеем выцяць
каго патрэба,
хоць маўчым.

Малоціць дождж па стрэхах пясцяй,
аж золкім дымам дзень дыміць...
Здагонім сонца ўсё ж і шчасце,
калі не жуpавы,—
дык мы!

*Берлін, лістапад, 1944*

## СНЕЖАНЬ НА ЧУЖЫНЕ

Снежань...
Не такі, як там, у нас,
расшываны прошвамі бярэзін
і хваін,
пабелены да дна
серабранаю завеяй...
Чысты...
Свежы...
Тут — яшчэ ўсё восень, золь, дажджы
і шнуры аслізлага асфальту.
Тут,
калі й прыжджэш, рады ў гады,
як мяцеліцы —
дапраўды, жалю варта!
Тае ўмомант жменька сакаўных
яблынных пялёсткаў пад нагамі,
не паспееш навет і сасніць
аб далёкім,
родным, аб каханым...
Аб парошах, гурбах, што нагроб
каля весніц вецер, азяродах,
дзе тырчыць яшчэ забыты сноп
канюшыны, збіты непагодай...
Каб туды як сяння,
распыліць
сум, упіўшыся дап'яна белым сокам,
хай трашчаць, з рабінаў срэбны пыл
абтрасаючы,
сварлівыя сарокі!

*Берлін, снежань, 1944*

# ЖЫЦЦЁ

Жыццё —
як бярозавы сок,
жыццё —
як салодкая брага:
п'еш, п'еш —
і, маўляў хто урок,
яшчэ горшая чуецца смага.
Ледзь верасень, спрытны каваль,
у медзь закуе далячыні,—
нам хочацца ўжо, каб трава
узноў зелянела ў лагчынах.
Ледзь цёплаю сіняй пляхне
вясна па марцовым рызманні,
ледзь ветры пазлізваюць снег —
зноў сняцца нам восень, туманы...
Адразу жадаем абняць
мы ўсё (не пакінуць нічога):
прасцяг каласся і сасняк
і продані неба сівога.
З кульгавай, гугнавай нудой
сустрэцца цяпер цяжкавата.
Не звіць ёй між намі гняздо,
калі ўсцяж —
ні ўцехі, ні свята,
калі не ўтаймуеш бяды,
хай сэрца жывое ёй выmі,
а кон —
мо узноў на гады —
сыноў разлучыў із радзімай.
Не дзіва, што п'ецца, як сок,
сягоння штадзённасць, як брага,
дык быццам знарок хто урок,
шчэ горшая чуецца смага.

*1944*

## РАБІНА

Асыпала попелам сыпкім змярканне
акно і паперу, пяро і мяне...
Пад небам зімовым,
над шэрым парканам
рабіна галіны шкляныя хіне.
І столькі спакойнае, простай пакоры
прад лёсам з вятрамі ды сцюжай у ёй,
што гасне імкненне падзеі паскорыць,
і цішаю поўніцца сэрца
й маё.
І хочацца шрэняй ахутацца срэбнай,
таксама хістацца на ветры й чакаць
із верай глыбокай,
аж з сіняга неба
хлыне на зямлю залатая рака,
аж сокі густыя закружаць у жылах,
аж сэрца заб'е ў залатыя званы,
і сном недаснёным растае ў расцвілых
далечах
туга
прад абліччам вясны!

*Берлін, студзень, 1945*

## ЗАБУДЗЕМСЯ

У ночвах завулкаў вечар
марознай імглы намясіў...
Цалуе ў твар мяне вецер,
згарнуўшы набок валасы.
Прыемны мне смелы дотык
ягоных сцюдзёных губ.
Хай будзе, што будзе потым —
дап'ём наш п'яны багун!
Забудземся хоць на імгненне,
што сочыць, як той ганчак,
смерць нашы сляды і сцені,
што шмат хто — ужо зачах,

што трэба ісці наперад,
хоць сяння
і гэнам — ноч,
праз сілу, без смаку й меры,
крывавае піць віно...
У ночвах завулкаў вечар
марознай імглы намясіў...
Да рук маіх туліцца вецер,
згартае набок валасы.
Абвій жа мне шыю,
варта
даткнуць маіх цёплых губ.
Хай будзе, што будзе заўтра —
дап'ём наш п'яны багун!

*Берлін, студзень, 1945*

## ПАЧАКАЙ!

Мы прыйшлі сюды з вузкіх загонаў,
раззалочаных мятліцай і званцом,
з-пад нябёсаў сініх і прадонных,
ад народам складзеных канцон.
Дзе ж у свеце, ройным і шумлівым,
між вянкамі іскрыстымі зор,
ёсць такія йшчэ, як нашы, нівы,
ёсць такая ціша і прастор?
Дзе яшчэ
знічом чырвоным паланее
гэтак голле восеньскае ліп?
Дзе такія сінія завеі
мкнуць навыперадкі ўвесну паўз палі?
Дзе
прад абразом нябёсаў светлым
ночы паляць столькі зорных свеч,
дзе,
дзе ж гэткі вось шчаслівы й ветлы,
як у нас,
быць можа чалавек?
Толькі ўспомніш гэта ўсё —
і паліць,

цісне сэрца нешта,
не сагнаць.
І блакітным ладанам удалеч
найшчырэйшая плыве туга...
Ды няхай
сівы палын на межах
сяння звоніць па табе,
мой край,
зноў чаромхавым пахучым снегам
кон цябе асыпле,
пачакай!
Зноўку ўспыхнуць напярэймы ветрам,
над палеткамі тваімі песні жней,
і далёка,
за сівыя нетры,
ты свой смутак церпкі пражанеш!

*Берлін, студзень, 1945*

## НОЧ

Трасецца свет ад гуду танкаў,
бадзяжыць смерць,
збірае плён.
А ноч —
ноч месяца баханкай
спакойна ломіцца з зямлёй.
Як Вечны Жыд,
яна ці тое
ў сваёй вандроўцы па шляхох
ужо тут бачыла...
Пустою
гульнёй і боль ёй
і спалох.
Міне вайна...
Чырвонай парай
з палёў баёвых кроў сплыве...
Зноў вёсны мёдных зёл напараць,
сінь разліюць...
ды чалавек —
ці здрадзіць ён
баёвым ранкам,

крыжом, крыві, атруце слёз?
Што, ноч?
ды месяца баханкай
ноч моўчкі ломіцца з зямлёй...

*Амбэрг, сакавік, 1945*

## БУДУ СЯННЯ

Сыпле раніца ў акяніцы
раззалочаны сонца жвір.
Выйду ў сіню вятрамі ўмыцца,
косы росамі перавіць.
Накіпаюць вясной далечы,
дым зялёны паўзе з лагчын...
Дзе ж устоіць тут смутак нечы,
дзе ж увесну яго зберагчы?
Не патраплю я й так у распачы
праклінаць і людзей і жыццё.
Усёй бяды,
як ні плач — не аплачаш,
хай нат веры слязам дасцё.
Вось і буду — вясне уторыць,
і з вятрамі ў платох спяваць,
аж расою сівой, вячорнай
наліецца ў лагох трава,
ажно белыя плечы йгрушаў
туманамі накрые ноч,
ажно вочы мне зацярушаць
іскры —
месяца серабро!

*Амбэрг, 1945*

## ЛЯВОНІХА

Іржавым пяром на балонах лісцін
кладзе лістапад свой раскідзісты росчырк...
Праймаюць і смутак і золь да касці,
няма ім упынку ні раннем ні змрокам.

Гэй, вятры, ветружыны —
завірухі,
засыпайце лужыны
белым пухам,
пад глухія тэрцыны
цёмных хвояў,
леце, леце ў сэрцы нам
белы солад.
Паслухалі ветры... «Лявоніху» йдуць.
па шэрым памосце іржышчаў ды лянішч,
распырскваюць з песняй балота, ваду,
як быццам пад'елі дзе ўсмак дурнап'яну:
«Ой, Лявон Лявоніху
маладую,
сваю ўцеху — сонейка
не шкадуе,
як прыцісне пруткую,
пойдзе ў скокі,
вірам хата круціцца
сінявокай!»
Імклівей, імклівей, шпарчэй і шпарчэй,
рагочучы, скача над гурбамі вецер.
Гадзіна, другая — і скрозь разатчэ
ён срэбрам ды беляй і нівы і вецце.
А тады усцешыцца:
«Й я не зломак»,
усміхнецца месяцу
залатому,
усміхнецца хвойнікам
і дубровам,
як Лявон Лявонісе
чарнабровай.

*Рэгенсбург, лістапад, 1945*

## ПЕРШЫ СНЕГ

Упілілася ў сэрца радасць,
а спытаўся б хай хто, чаго?
Мо таму, што над беляй лядаў
белы, снежны імкне агонь?
Мо таму, што марозны вецер
Пыл сузорны у твар мяце,

што ўшываецца ліпаў веццe
срэбнай шчэцяй усё гусцей?
Снежань, снежань,
чаго ашукваць
нас тут свежасцяй, чысцінёй,
непарушную бель рассукваць
на пачуццях,
на свежых пнёх,
пасцінаных блізу да кораня
існаванняў людскіх?
Душа
й так у кажнага перагорана,
перараненa... Ціха, ша...
Упілілася ў сэрца радасць,
хоць і знаю — усё мана.
Мкне завея над беляй лядаў
у няўхопнае... Не суняць...
Задзірасты, марозны вецер
пыл сузорны ў твар мяце,
і ўшываецца ліпаў веццe
срэбнай шчэцяй усё гусцей.

*Рэгенсбург, снежань, 1945*

## Я — ПІШУ

Моўчкі адыходзіць небам дзень,
ведучы на паваду рудое сонца.
Плямы сценяў сініх дзе-нідзе
залілі ўжо залаты сасоннік.
А ён спаць не хоча. Сонцу ўслед
пахне цёплаю мядоваю смалою
і ўсё шэпча, мо начы й няўтон,
аб уцехах сонечных, маўляў, малое.
Спаць не хочацца і мне. Вазьму пяро,
расцвіце мо на паперы колькі зорак,
як вышэй, дзе звонкі срэбны рой
ужо вылецеў страчаць вячорны морак.
Так... ідзе паволі небам ноч,
ведучы на паваду бялявы месяц.
У сутонні сонным спіць даўно
сцішаны сасоннік... Голаў звесіў.

Я ж пішу...
Навошта я пішу,
для каго? Па шчырасці — не знаю.
Бо ж не вершы ў свеце узнімаюць шум,
і не рыфмы шум той сунімаюць.

## ДОЖДЖ

Срэбрам тоўчаным асыпаў дождж
шыбы задымелага бараку.
З гэткай шчыраю, пякучаю жадой
ён даўно, даўно ужо не плакаў.
Плач удосыць...
Я — я не з такіх,
і з табой напэўна не заплачу.
Я не плачу, я твару, калі
мяне жаль агортвае гарачы.
І тады
мой кожны крок — сляза,
кажны ўчынак — кропля залатога ляку,
вось як тыя, што дні два нізаць
не сціхае дождж на шыбінах бараку.

## МАЦІ

Маці!
За кужэльную нітку даўжэйшы твой смутак па нас,
за кужэльную шэрую нітку з твайго калаўрота.
Хай вішнёвай паводкаю плешча ў вокны вясна —
да Цябе яна прыйдзе адно разам з нашым зваротам.
Маці!
І мы прагнем,як светлага Прыйсця, тых дзён,
калі радасцяй зыркай ізноў загараць Твае вочы.
І хоць нашыя сэрцы ўкавала на камень жыццё,
вызнаём:
да Цябе мы, як дзецьмі калісь,
прытуліцца так горача хочам!

## ВОСЕНЬСКАЕ

Як тварыць? З чаго, калі часы такія —
ўсё вакол адно імкнецца спаць.
Сінім шклом шкліць раніцы глухія
тут і там бярэцца лістапад.
З цел аголеных зрываюць у прысадах
ліст апошні жоўты тапалі,
І маркота восеньская скрадам,
нейк няўзнак, імкненні папяліць.
Не нальеш з пустога, а у кожным
сэрцы і ў далечах пусціня.
І з кійком і торбай падарожнай
не памкнеш гасцінцам пераняць
долю, песні...
                    Ў вырай з жураўліма
адляцела ўсё ці мо палегла спаць.
Шкліць шляхі ламлівым, сінім шклівам
тут і там канчае лістапад.

*Міхэльсдорф, 1946*

## ЁН ДАЙШОЎ

Горкі хлеб чужацкі,
                    хай і белы,
хай аж просіцца — пад'есці ўсмак.
Лепшы там,
                    у хаце — заімшэлы,
з асцюкамі войстрымі, праснак.
Зашчымела сэрца у хлапчыны,
штораз горай... Не перадыхнуць,
аж і ён і з выраем гусіным
у вясновых сінях патануў...
Доўга йшоў вандроўнік ці каротка,—
хто сачыў?
                    Звінелі журавы,
зелянелі ў затанях чароты,
лапухом успыхвалі равы.
Дні рабіліся цяплейшыя, аж вішні
срэбнай пенай пырснулі на свет.
На балі вясновым, пышным, лішні
ён ішоў па росах, па жарстве.

Ногі ранамі крывавымі зардзелі,
вецер стрэчны вочы прыгасіў.
Аж аднэю ночай,
белай, белай,
ён дайшоў...
Шчаслівы, хоць без сіл.
Мёдам капалі густым, салодкім ліпы,
пыл мяккі пад ногі слаўся, піў сляды,
хтосьці росамі ў вочы госцю сыпаў,
абтрасаючы вішнёвыя сады.
Стая... дзве... І ў засені парканаў
хата вырасце пад шапкаю страхі.
Каб хутчэй адно дабегчы... глянуць...
Грудзі сціснула...
ўваччу кругі... кругі...
Вось нарэшце й вербы... Ніткі срэбра
мігацяць між імі... Свіслач...
што?
Чорны комін... Чорнай хаты рэбры...
Пажарышча
ўжо
парос
асот.
На бакі рассунуў хмары ветах:
хто там лёг, ды крыжам, у вуглёх?
Ну, і трэба ж было бегчы столькі свету,
каб сатлелы абымаць парог?
І чаго шукае ён, чужынец,
там, дзе поўзае вужом у друзах жудзь?
Можа, ў мораку яму шыпшынай
кроплі згуслае крыві цвітуць?
Мо ў чорных сценах папялішчаў,
каля коміна, што ўсіх пeратрываў,
ён знайшоў усё ж сваіх,
каханых,
блізкіх
і прыпаў ім ногі цалаваць?
Пасма белае дзень выткаў на усходзе,
ніткі пацерак рассыпаў Млечны Шлях,
да вады прыльгнула шчыльна ймгла
на бродзе,-
сына
раз яшчэ
праводзіла-зямля.

Ён ішоў, нікому не патрэбны,
з той тугой, якой ужо нічым не змыць.
А ўздагон яму глядзелі вербы
невідучымі, старэчымі вачмі.

*Рэгенсбург, травень, 1946*

## І СНІЦЦА МНЕ

Люблю я летуцець,
калі рука чыясьці
стаўляе прасніцы з кудзеляю сівой
і пачынае ніткі дажджавыя прасці
над галавой.

Няма канца дажджу, ні гуду верацёнаў.
Віецца з песняй ніць на шпулю, на душу,
і сніцца мне, што звоніць наш сасоннік
у сэрцы і ўвушшу...

Што ў засенях сасон сузорыць сон ліллёвы,
жывіцай плачуць з радасці камлі,
і новых песняў строй у голлі вецер ловіць,
страсаючы з крылля
залёны пыл далін.

Кахалі й вы, як я,
старыя нашы пушчы,
віхрамі ўспенены, шумлівы акіян.
Ці горкі сум па іх
тут вашых душ не сушыць?
Баліць мая...

Блакітная, далёкая Радзіма,
калісь — штодзённы хлеб,
а сяння — толькі сон,
мы вернемся, чакай,
хай хворымі, старымі,
а вернемся!
Так дай нам Кон!

*Рэгенсбург, сакавік, 1945*

## СНЕЖАНЬ

Свежым снегам асыпаў снежань
вайстраверхія дахі вежаў,
камяніцы, каменне брукаў,
бровы жвавых наўздзіў людзей.
Пад аснежаны сэрца стукат
выплятаю я сетку сцежак
на бязмежным прасцягу снежным,
дзе ружовы разліўся дзень.
Места спіць... Ды ужо званіцы
клічуць пышных і клічуць ніцых
выйсці, вочы узняўшы ў вышу,
хай сабе не маліцца — спачыць.
Белы вецер нясе, калыша
гэты кліч... І далечам сніцца:
нехта белы, найбельшы кліча
іх, блакітных, ад злога ўцячы.

А куды уцячы нам, нясытым
ні усмешак, ні слёз,
                    не блакітным,
не аснежаным белым снежнем —
толькі шэрым і думкай і ўсім.
Хай заходзіцца з плачу ў вежах
звон па звоне,
                    ніхто ж карытаў,
поўных клунь, у зямное ўшыты,
не пакіне, дарма прасіць!
Свежым снегам асыпаў снежань
вайстраверхія дахі вежаў,
камяніцы, каменне брукаў,
бровы жвавых наўздзіў людзей.
Пад аснежаны сэрца стукат
дапляла я мярэжу сцежак
на бязмежным прасцягу снежным,
дзе ружовы разліўся дзень.

*Рэгенсбург, снежань, 1945*

## У ГАСПОДЗЕ ПАДУАНСКАЙ

Гудзе гаспода. Ў Падуі старой
такі ўжо звычай: жыць, пакуль жывецца
і цешыцца...
Ды тут — ледзь чутны песняў строй.
Гуляе па стале, заставе рэзвы рой
праменняў...
У акно чырвоны б'ецца вечар.
Кранецца чары ён —
і з чары залатой
італьскае віно пагарай праліецца.
Адно не да віна Францішку Скарыне.
Упіўся сяння ён, ды не віном, а славай!
Ён — доктар лекарскіх навук! Гадней
за іншых мо аб роднай старане
засведчыў аб сабе.
Ён — «Падую уславіў»,
сказаў Мусаты.
Бач, із торбай на гарбе
ненадарма гады гібеў ён на чужыне,
пяскі чужых дарог таптаў
і... трызны правіў.
Але чамусьці ў сэрцы бы асцюк
сядзіць аўсяны, колкі...
Не — і ўколе...
Засланы бела стол нагадвае Куццю
у Полацку, у хаце,
Палату
імклівую, а за мурамі поле,
дзе гэтаю парой снягамі ўжо цвітуць
так бела
межы й дзічак голле!
Хацелася б ісці, ляцець, імкнуць туды,
бадзёра друкаваць сляды на чыстых, на харошых
балонках першае парошы,
піць густы
марозны вецер, срэбныя ляды,
бары мінаючы у шпаркіх палукошах,
і так спяваць, каб віўся снежны дым
над пожнямі
ды плыў з сівых далечаў пошчак!
Што ж, чараў тут няма:
і звер у гушчары.

свой логаў знае,
птах — гняздо у гаі мае,
у рэках рыбы чуюць родныя віры,
руплівая пчала, што ў грэчках ад зары
гудзе, вулля свайго бароніць із адчаем.
Таксама й чалавек: малеча ці стары —
да роднага кутка дзіўною ласкай тае.
І ласкі гэтай смыль
патрапяць прысушыць
адно, хіба, вятры зялёнага Надзвіння...
Пара туды, пара!
Хай золата кашы
братом і не прыдбаў ён тутка, на чужыне —
ад цела недужаў і недужаў душы
ён лек дзіўны знайшоў,
што гора й боль суніме.
Маўчыць гаспода ў Падуі старой,
і толькі ў Скарыны мігціць агеньчык ніцы.
Там, разгарнуўшы кніжыцу ў рудой
ціснёнай скуры,
зноў лацінскіх словаў рой
ён сочыць пільна.
А праз акяніцы
ў камору ноч глядзіць,
і ў чары залатой
італьскае віно сузор'ямі іскрыцца.

*Рэгенсбург, 1946*

# НА РОСТАНЯХ

## РАЗВІТАННЕ

Шмат нам цвіло,
шмат нам свяціла
ужо ў жыцці трымцівых зор,
ды ўсё сыпкім,
нясталым пылам
размёў на ростанях віхор.

Ён долю ўспеніў,
пакамечыў,
нас, як лісцё, сарваў з галля,
пагнаў па пушчах,
па пустэчах,
дзе не аруць і не спяляць.

Мы дапаляліся
і гаслі,
мы зноў шугалі угару,
змянялі выганы і яслі
ў адным імкненні: «Беларусь!»

З аднэю думкай:
«зноў пабачыць»,
з ліпнёвай радасцяй
гарачай
з адною мараю «дажыць»,
прыльгнуць да роднае мяжы.

І вось сягоння
чабарэе
нам не яна, а далячынь,
салоных мораў
плачуць рэі,
віхор у ветразях гучыць.

І ўсё далей
сплывае ў шэрасць,
у змрок той Краї, дзе люба ўсё.
О, Беларусь, хай так,
мы з верай
Цябе і ўдалеч панясём!

## А БЕРАГ ДАЛЁКА

Зноў вецер і хвалі,
зноў мора і мора...
Зноў кагарак плоймы крыламі гудуць,
зноў сыплюцца, сеюцца белыя пёры
і сонца
ў сівую, густую ваду.
Каторы ўжо дзень?
Ці мо час тут знядужаў,
ці часу, як кажуць, няма наагул?
Паўзе дзесь за намі успененым вужам
усё-ткі наш след, і далечы бягуць.
Бягуць запаволі...
Баюся, каб песням
між небам і морам навек не застыць.
У сініх прасторах ім сумна, ім цесна,
не цешыць ні вецер,
ні дзень залаты.
Раіцца у хвалях адвечная вусціш,
няма ў іх уцехі,
яна — на зямлі.
Зямля мае думкі і песні,
дык, мусіць,
ім бераг зялёны вазьмуся суліць.
Далёка наш бераг, далёка...
Між намі
над хвалямі кагаркі ўспенілі сінь.
Ці хтосьці там сяння, Купальскімі днямі,
уцеху спяліць у густым каласі?
А мы
ці дзе згледзім уцеху,
ці межы

бадзянню дзе знойдзем?
Каму ж адгадаць...
Навокал ні межаў, ні следу, ні сцежак,
сінеюць адно далягляд і вада.

## ЗОРЫ

Мне спаць не хочацца...
Даўно ужо згасіла
змярканне на вадзе пагары зыркай плямы,
і зоры расцвітаюць сінім пылам
адны ўгары, другія — пад нагамі.
Пакорнае лягло ў прадонне мора,
у цемры дыхаюць ледзь чутна хвалі.
Вятры іх песнямі паілі ўдзень, дык морыць
іх важкі сон цяпер,
і не цікавіць далеч...
Я ж,
я ж усцяж гляджу на цяг бязмежжаў цьмяных,
стараюся пазнаць, што пахавана ў цішы...
Дарма... скрозь цемра й змрок,
хай угары над намі
блакітны Млечны Шлях у зоры неба вышыў.

## ТУТ ГЭТАГА НЯМА

Кахаем мы жыццё застала
і зашмат,
хоць і жывём мо крышачку замала.
Па годзе год каханне гэта паліць
нас...
аж прапаліць на няма.
Жывём так на зямлі і мы ўсе, і вясна.
Залоцімся, цвіцём, расцём — адным працягам.
Аж захлынаюцца палі ад прагі
хутчэй і зарунецъ і каласы узняць.
Тут — гэтага няма.
Тут — вечнае адно.

І ўвесну і зімой плывуць кудысьці хвалі.
Ў барозны іх ці кон, ці вечнасць пааралі,
прадоннае лягло пад імі дно.
Усцяж яны пяюць адзіны, дзіўны гімн,
ды ведаю адно, —
жыцця у ім не славяць.
А я люблю жыццё,
ягоны смак гаркавы
ніколі йшчэ не здаўся мне благім.
Плыві ж,
плыві,
плыві, адвечны акіян,
у вечнасць...
Для жывых яна — пустое слова.
Твой супакой мяне ў сіло не зловіць:
з калоссем залацець хачу ў палёх і я!

## ЗНАЮ

Шэры дым — дробны дождж — над вадою
курыць.
Кроплі сыплюцца густа на рукі, на твар.
Як іх прагна пілі б і лісты, і трава!
Ды навокал адно,
і ўнізе, і ўгары,
хваляў шэрых дрыгва,
хваль сівых гушчары,
і на сэрцы дрыгва...
Як параіць сабе,
каб яшчэ раз паверыць чужыне... і жыць?
Парваліся із роднай зямлёю гужы,
ды сумую па ёй я не менш, не слабей,
хоць бяжыць без сцяжын
да другой карабель.
Дробны дождж над вадой тчэ сівыя радкі,
кроплі таюць на вейках салонай расой,
але знаю ўжо я,
што смалою сасон,
захачу — і запахне мне вецер марскі,
што мы скрозь панясём
сон аб родным краі!

## ПЕРШАЯ ВОСЕНЬ

Асенні дзень паўз места йдзе.
Хай дзе-нідзе рудзее медзь
лісця,
ўжо ясна, што па ўсім.
Дзень знае: ззяе далячынь,
але вясны не надтачыць,
дык змоўк і сціх.
Прыціхла й я, руды лісток,
што ймкне,
куды — ці знае хто,
адно далей, далей, далей
над пасмай ходзішчаў,
дзе скрозь
як і у нас, лісцё бяроз
і сціплых ліп лягло... сатлець.
Так проста... Ці ў нас, ці тут,
лісты рудзеюць і лятуць
па месце ў восеньскі прасцяг.
Адно ці й тут бярэ ў палон
вясна муры й сівы бетон —
не знаю я.
Такой бяды! Яшчэ трымціць
часамі й сонца у лісці,
і мне не ў думцы засынаць,
дык будзем жыць як набяжыць,
аж зноў зазвоняць капяжы:
— Вясна, вясна, вясна!

## ТУТ ГЭТКАЕ ЗАВУЦЬ ЗІМА

Тут гэткае завуць — зіма!
У нас такой зіме й назову не прыдумаць.
Да снегу непадобную, густую каламазь
дзяўчаты басаножкамі распырскаваюць сумна,
скуголяць тармазы задыханых машын,
нязграбна слізгаючыся на павароце...
Кляне ўсё места слоцьудосыць, ад душы,
а снег ідзе, капаючы у лёце.

Ды ў парку, дзе цяпер няма чаго шукаць,
ні ценю, ані модаў на уборы,
ён мокрага галля чапляецца, штукар,
малюючы яго у дзіўныя узоры.
І на часіну сад, пакуль не абтрасе
з галінаў лётны пыл,
здаецца белай казкай,
такою чыстаю, дзявочай у красе,
што ажно хочацца ў захапленні запляскаць!
Ніхто не пляскае,
бо й хто тут мае час
зірнуць на Божы свет адкрытымі вачыма?
Імкне натоўп,
і енчаць і вішчаць
машыны ў гоне,
міма,
міма,
міма...

## ВЯСНА

Я думала:
якая тут вясна
у шэрай пушчы неабсяжных вежаў,
дзе за каменнямі сцюдзёнымі не знаць
нат пядзі тэй зямлі, што ў нас нарогі рэжуць?

Ажно і тут яна ускрэсла і цвіце
і ў сіні зыркай над ярамі вуліц,
і ў плямах сонечных на цёмнай цэгле сцен,
і ў красках, што да губ дзяўчаты туляць.

Усюды, дзе ні глянь,
адно людзям няўцям,
яна, зялёныя, свае сукае ніці,
мільёнам парасткаў імкнецца да жыцця
із кажнай шчэрбіны у вулічным граніце.

Смяецца ў галасох гарэзнікаў малых,
хвалюецца ў гудкох прарэзлівых машынаў...
І зноў бярэшся радасны спяліць
сны, што сплылі былі із выраем птушыным.

Хто ведае,
мо ўлевай веснавой
напоеныя, ўзыдуць, зарунеюць,
пад ногі лягуць залатым жнівом
і ціха зашасцяць: «Вяжэце, жнеі!»

Я думала:
якая тут вясна?
Не вылузацца ёй з каменнага палону.
Ажно гляджу... і з кажнага гранітнага звяна
смяецца ў твар яна вясновa і зялёна!

## МЕЛОДЫЯ

Нат места ноч прыцішыла...
Так гулка
мой крок звініць у ночнай цішыні.
Набраклі песнямі за дзень пляцы й завулкі,
ці мо душа мая?
Ліллёвы змрок звініць.
Адно я не злаўлю мелодыю мяккую,
што апляла мяне і пахне, як трава,
і свечкі каштаноў, і сіні бэз...
Такую
вясновую у месце не сарваць,
не стрэсці з галіны мястовых пыльных клёнаў,
з каменных ходзішчаў пад імі не падняць.
Мо з паплавоў сюды прыйшла яна зялёных,
адтуль, адкуль і я, і гэтая вясна?
Звініць мелодыя...
Калышуць цішу тоны,
пяе ўсё аб вясне ліллёвы змрок.
І гукі места ў ёй, непераможнай, тонуць.
Чуваць адно яе,
і мой упарты крок.

## ІЗНОЎ ВОСЕНЬ

Так, пэўна ж, праміне
усё:
    нябёсаў сінь,
і вецер, любы мне, й кругі на воднай роўні,
і колас поўны,
і сцябло гірсы,
патрэбнае ці не,
усё міне ўсяроўна...
Як выйдзеш дзе далей,
за места —
                зігацяць
яшчэ ў траве асот і чыстацелу зоркі,
ды кінулі пылець уцехаю жыцця
і сэрцы
        й шэрых вуліц столкі.
Зноў восень... Зноў гарыць
над кудрай каміноў
увечары агонь пагары крывяністай,
і людзі і муры
ў сцень туляцца ізноў,
і жутлыя, і сонныя ўсе чыста.
Я ім не памагу
ні сонца распаліць,
ні стрэсці з вейкаў сон.
Іду я раннем цьмяным
разблытваць той ланцуг,
                        што выкаваў калісь
нам на пакуту Кон,
дасяння непазнаны.

## СПЯКОТА

Сягоння, быццам збан,
                        выпальваецца ў печы
наш горад... Спеката — аж бела уваччу.
Маўляў кісель, трымціць паветра, брукі, плечы
замлелых камяніц...
                        а я так піць хачу.

Не варта, сапраўды:
ледзь, ледзь паспееш выпіць,
а смага зноў шчыпае і пячэ.
Чуваць вакол адно — ўсе сварацца на ліпень,
у сонца ані хто не ўскідвае вачэй.
А ў нас цяпер жыта хінуць калоссе,
дзічкі
на ўзмежках церпкі плод залоцяць,
у быллі
палуднічкі гудуць,
а вецер твар казыча,
і сонца п'юць усе, і людзі і палі.
Спрабую ж піць яго і тут,
гарачым сокам
нальюся ўся,
каб цешыцца і з ліп,
і з крыку кагарак над сіняю затокай,
скуль адплываюць у далечы караблі.

## ВУСЦІШ

Сівым сутункам ішла я... жыць.
Лісты шасцелі,
я йшла ўсцяж.
Ад іх жаўцелі гужы сцяжын,
ад іх ратунку ужо няма ш.

Здаецца, жоўцяй наліўся дзень,
рудая вусціш паўзе зусюль,
у кажным кусце...
Душу нідзе
ад смерці жоўтай я не ўтулю.

Ды, змяўшы шорах,
віхор узняў
дождж жоўтых зораў з маіх сцяжын.
Сатлелі дзесьці яны да дня,
я ж, я паўз места памкнула... жыць.

## АСЕННІЯ ЛІСТЫ

Як плойма вераб'ёў,
што шуганула ў сінь
ды хмараю рудой ізноў зямлю ускрыла —
яны ўзнімаюцца у свой асенні вырай,
каб ссыпацца й сканаць на леташнім лісці.

Але пакуль яны імкнулі ў вышу,
ў свет,
як палыменных слоў разгойданая нізка,
пазбыўшыся зямное цягі й ціску,
яны жылі, як з нас ніводзін не жыве.

Бо мы глядзім адно пад ногі,
як брыдзем
размытаю дажджом жыццёваю дарогай.
Не сніцца нам сысці з яе на ногаць,
хай знаем —
завядзе у продань ці нідзе.
Мінае дзень па дні...
Штагод — цяжэй ісці,
ужо не паляцём, каб навет мелі крылы...
І вось, маўляў лісцё, што зноў зямлю ускрыла,
сканаем недзе й мы,
не шугануўшы ў сінь!

# *Я Й ЖЫЦЦЁ*

## Я ЧАЛАВЕК

Я чалавек... Усё людское,
благое, добрае —
ўва мне.
І боль людскі мне сэрца кроіць,
а радасць — кроў жвавей жане.

Як хвоі ў засенях сасонных
зялёнай жменяю бяруць
і слоць, і сонца, й вецер з гоняў —
і я усё, усё бяру.

Шматкі мелодый, крыўды, соладзь
сустрэчаў лётных, зімаў золь,
і боль, і шум палёў, і голад,
і гнеў, вайстрэйшы за лязо.

Усё адзін акорд пявучы
хай — а зрадзіла...
Песні я
пляла,і стоячы над кручай,
і там, на цёмным дне жыцця.

І я не каюся, што, йдучы
мяжой жыццёвай нацянькі,
ірвала ў ячмянёх калючых
сабе на ўцеху васількі.

Хай іх няма, пялёсткаў сіня
даўно злінала, і ў пяскох
шляхоў забытых сяння стыне —
яны былі мае, і ўсё!

## ГАРЫ, ЗАХОД!

Няма нічога, што цвіло й жыло б аднойчы.
Няма такога, што гарэла б толькі тут.
Каханне ці вясна, з якімі сяння скончым —
ізноў, калі не ў нас —
у іншых зацвітуць.
Усё, што мелі мы,
паспеюць зноў загудзіць
нашчадкі, дні жыцця жнучы заместа нас.
Нічога новага няма і ўжо ж не будзе,
хай свет перашукаць ад берага да дна.
Але ці ж варта ў сцень затым сысці з дарогі,
што столькі ўжо дзядоў таптала цёплы пыл?
Было ўсё так ці не — не ведаю нічога,
чужою праўдай мне вачэй не засляпіць.
Гары ж, гары, заход,
як мо гарэў спрадвеку.
Я хараство тваё вітаю ўпершыню,
і ў чорны змрок раней не узніму павекаў,
пакуль сама ўсе сны, ўвесь чар не перасню!

## МОЙ СКАРБ

Мне лёс даў, можа, болей як каму.
Жыццё мне дорыць сны блізу на кажным кроку.
Што для адных
                    нуда і каламуць —
мяне пранізвае балюча і глыбока.
Ды я, маўляў скупы,
                    над скрыняй не дрыжу
і золата сваё пад ключам не трымаю.
Мой скарб і ў шуме веснавым дажджу,
і ў голасе галля, умаенага маем,
і ў колерах, якімі дагарае дзень,
і ў сініх ценях на зімовых сцежках...
У дробных радасцях,
                    будзённасці,
                              бядзе —
угледжу я усюды нешта.
Вось і сягоння. Слоць...
                    нанізваюць вянкі
бліскучых пацерак драты паміж слупамі,
рукамі мокрымі у шыбы б'юць сукі
сацьмелых ліп,
                    і цешыцца — не ў памяць.
А я стаю ужо гадзіну ля акна,
заклясці ў словы ймкнуся і мігценне
празрыстых кропляў, і мутны туман,
і ссутулелыя на бруку цені.
Мне хочацца навечна, назаўжды
няўхопны чар сланы расплесці з тайніц сяння.
Як той Тамаш Няверны,
                    зверадзіць
сусвету незагоеныя раны.

## НЯМА КАЛІ

Снег стаяў кагадзе,
ды ўсцяж блішчаць галіны
адценнем жутлага, старога серабра.
Усе ходзішчы ў вадзе,
і гэтак сіня, сіня
ўгары, дзе растае клубок ваўняны хмар.

Такую чысціню
і глыбіню нябёсаў
ці можа выспяваць найлепшы нават верш?
Я так люблю зямлю,
яе вясну і восень,
што ува мне яна й без слоў жыве.

Не ўціснеш у радкі
нязграбных літар песні,
лістом ненапісаным хай ляжыць.
Нябёсам сінь пакінь,
а песням — нівы песціць,
сам — праз жыццё шукай сцяжын.

Не бойся, не мінеш:
шырокія, вузкія,
парэзалі яны на крыж, на сто прасцяг.
Калісь — раней, пазней,
як торбы з плечаў скінем,
мо запляцём у верш красу жыцця.

А сяння нашы дні
ў сіло злавіла праца.
Гадзіны ймкнуць, імкнуць,
за імі ймкне рука...
І сіні, чысціні
у грукаце й гарачцы
шчарнелай хвабрыкі няма калі шукаць.

## ЗАЛАТОЕ

Шалее вецер...
плешчуць у далоні
і скачуць крыжачка й «Лявоніху» лісты.
Рудыя... Залатыя... у палоне
асенніх песняў,
пэўна ж, залатых.
І нешта і мяне ўзнімае закруціцца,
заплёўшы рукі — гнуткае галлё —
мяцеліцай асенняю над ніцай
імглою залатой пустых, рудых палёў.

Але зашмат, відаць,
я збаразніла сцежак
жыццёвых, не рудых, і ўжо ж, не залатых,
а шэрых ад штадзённасці і... рэшты.
Мне ў залатую высь не ўзняцца, як лісты.

## ГАДЗІННІК

Гадзіннік тахкае...
Мо сэрца нашай хаты
заклятае у ім?
І хаты, і маё?
Няёмка дыхаць з ім не ў тахт,
ніякавата
суцішыцца, маўчаць,
калі нясцішны ён.
Ды мне не хочацца спяшацца жыць сягоння.
Да шыбаў туліць твар згалелы лістапад,
і тчэцца верш, такі ж, як сцені чорных клёнаў
на запацелым шкле...
Што поўнач — неўздагад.
Гадзіннік тахкае...
Мо хто душу сусвету
ўсяго закляў у ім?
Няхай, мая — жыве.
Пакуль павесіць ноч на чорным небе ветах,
я кужалем сівым няўзнак датку мой верш.

## ПРАЎДА

Што, каб душу адчыніць
шчыра, дарэшты, наросцеж,
хай словы спалошчуць
з яе намулелыя дні,
почаў сатлелыя звенне,
сцені
сноў, што ні збыць іх, ні сніць.
Хай бы імкнула яна,

праўда, па вогкіх завулках,
па ходзішчах мулкіх,
дзе ходзіць, зблукаўшы, вясна,
кратала стрэчныя сэрцы,
што верыць
мо і умелі б, калі б не мана.
Толькі людская сям'я
сыдзе з дарогі ёй... Неяк
навет не ўзнімуцца вейкі
з праўдаю погляды сцяць.
Ці не таму мо паэты
свету
праўды не кажуць, як я?

## ДЗІЎЛЮСЯ Я САМА

Праробленае ўсё...
Я маю крыху часу.
Хоць гэта й дзіўна — часу для сябе.
Пакуль сутонне сіню дню пагасіць,
суцішуся й сягну ў душу як найглыбей.
А мо пайсці глядзець, як сонца сеці топіць
над шэрым плёсам хмар,
плысці з людзьмі ў туман?
Навошта?
Гоман, рух і вуліцы й натоўпы —
усё ўва мне. Іх жаль ці радасць — я сама.
Я ведаю усё, што не заўсёды й сніцца,
што ўсцяж жане людзей аднекуль ці кудысь.
Дзіўлюся я сама,
ці ёсць яшчэ крыніца,
з якое б я не чэрпала вады?
І часам, як цяпер, кажу я проста:
досыць,
што можа мне жыццё пад ногі йшчэ пасланць?
Ды дзень міне, і зноў імкну я ў золь і восень
шукаць крыніц, з якіх вады я не піла.

## МАЙМУ ЖЫЦЦЮ

Жыццё,
цябе я пакахала
яшчэ тады, калі не ўмела
цябе назваць, а дзіўным палам
тваім сагрэць малое цела.
Хадой хісткою і з жадою
я ў свет імкнула па дазнанні,
хоць «жыжа» плачам і бядою
мяне вітала,
як і сяння...

Хоць сінякі мне давялося
збіраць блізу на кожным кроку —
маўляў зялёнае калоссе,
няўзнак я налілася сокам.
І зацвіла так, як умела,
як ты надумала із мною.
Мая нядойшлая даспеласць
была мне тайніцай упойнай.

Міналі дні...
Гады у вырай
злялі клінам жураўліным.
На твой загад
глыбока, шчыра
ўрасла я ў бацькаўскі суглінак.
Ён падарыў мяне пахучай
жытнёвай лустаю і песняў
мяне научыў,
якіх не вучыць
ніхто, нідзе у местах цесных.

І так я стала... чалавекам.
Благім і добрым,
так, як трэба,
каб із пакораю навекі
ўзнімаць у сонечнае неба.
Заўмела плакаць і смяяцца
і над сабою
і над светам,
пазнала й пот спякотны працы
і ўсе захопленні паэты.

Магла, калі хачу, астынуць
ці разгарэцца зырка, ўзлётна,
вылузваць веліч з лушпавіння,
а з чынаў велічных — балота.
І дні лістала (што таіцца),
спіны не хілячы прад конам,
піла із кажнае крыніцы
удосыць чыстай і прадоннай,
бывала ўцехай і... журбою,
і нічыёй была, і нечай,—
заўсёды, ўсюды, ўсцяж табою
зачараваная навечна.

Жыццё,
не шмат ужо дарогі,
штораз пусцей, цямней наўкола.
Дык дай мне роднага парогу
даткнуць,
пакуль замкнецца кола!

## *Яно усцяж са мной*

### АЛЯРМ

Зноў загулі сірэны ўголас
прарэзлівай жудой.
Каб скінуць з плеч і каркаў сполах,
імкне натоўп перад сабой.

Адно жаданне гоніць статак
мужчын, дзяцей, жанок —
зарыцца, як краты, у сцяты
марозам ранічным пясок.

А ён прыняў бы ўсіх ахвоча,
нат і навек накрыў,
калі б на сплаканыя вочы
смерць рынула згары.

## ДВАЦЦАЦЬ

Тут рынула сцяна...
Брук змочаны слязьмі
пакрышаных даўно
ці толькі сяння шыбаў.
Яшчэ пажарышчы курэюць, не прагнаць
клубка пякучага у горле, і не змыць
набраклых ран са сцен сялібаў.

Яшчэ ўсё спіць, калі
хто мае дзе спачыць.
Адно і тут і там
спяшаюцца лапаты
груды пабітай цэглы распыліць:
казалі, сяння уначы
засыпаныя дваццаць з гэтай хаты.

## ПЛАЧ

Дзень згас... і чорная паводка
па шыю места заліла.
Плыве віць нанач гнёзды горад
пад бункеры, на змрочны пляц.
Ніхто не дбае, што над тынам
муроў не ўспыхнуў маладзік.
Ад дзён, калі глядзелі ў сіню —
мінула вечнасць,
не гады.
І толькі сполахі вагнішчаў,
што ноч распальваць пачала,
патрапяць раззваніць у цішы
чыйсь нечакана шчыры плач.

## НА ЭЛЕГІЙНЫ ЛАД

Вартуюць зрэбны змрок
счарнелыя руіны —
мінулых, жорсткіх дзён
нязжатае дабро,

хай нічыя рука
не ймкне разблытваць сіню,
у попеле шукаць
прысыпаных імён.
Няма ж каму гады
губляць на папялішчах:
бурлее, круціць вір
жыцця, ўсцяж малады,
нясыты навіны,
што успаміны нішчыць,
што песнямі звініць
над сеткай палявін.
Вартуюць цішыню
гурты руінаў чорных,
стаяць, маўляў крыжы
над сотнямі магіл.
Ды жаль на карані
завяў...
і пройдуць спорна
гады ці шмат сцяжын —
усё прысыпле пыл.

## МЕСЯЦ

Разліў крыху сівога срэбра
на дахі й брукі маладзік,
хай сяння рэчай непатрэбнай
і зраднай цемру верадзіць.

Валей сядзець у цёмным склепе,
у сцені сценямі блукаць.
Мо праплыве — і не зачэпіць —
гарой смяротная рака?

Мо не спатрэбіцца слязамі
гасіць раз'ятраны агонь,
мо йшчэ і заўтра дзень над намі
струной нацягнецца тугой?

Ды месяц смерці не баіцца
і не цураецца агня.
Закуты ў срэбра зброі рыцар —
вартуе места й нас да дня.

## МАЛАЧАЙ

У вокнах шыб няма.
Даўно няма і даху.
Асколкамі пакрышаны фасад.
Абапал, хай і май,
а дыхаецца пахам
гарэліны,
                няўцям, што дзесь — краса,
што дзесь цяпер цвіце
лілёвы бэз пад хатай,
і чыста вымыты буйной жарствой парог...
Парог?
          Няма...
гусцей затое латы,
ды чырваней гарыць сцяны разбіты рог...

А на рагу — гульня:
збіраючы аскепкі
пакрышанага шкла, каменьчыкі, вуглі,
малыя, што па нас
жыццё мо лепей злепяць —
дзятва будуе дом, які не спапяліць.
Спрачаюцца... крычаць,
і плешчуць у далоні,
і смехам саграюць астыглыя муры —
зялёны малачай,
што, вырaслы ў сутонні,
калісь вяснова ў сонцы загарыць!

## ІМКНІ, ЦЯГНІК

Ізноў памкнуў цягнік...
У новыя руіны,
што могілкамі мо не так даўно...
Няма што ў далані
зацiснуць на ўспаміны,
няма чаго, як скарб, схаваць на дно.
Гарыць, як корч, прасцяг...
Агонь і кроў на ўзвышшах,

з агню у полымя ўцякаюць цягнікі.
Зялезнай жменяй нас
таксама можа скрышыць
назаўтра смерць.
Ну, што ж...
Імкні, цягнік, імкні!

## ЛІСТ

Ён ёй прыслаў учора ліст:
— Капае ўсцяж...
журба старая.
Адно, што жоўтыя лісты
звіняць і кружацца над гаем...
А так... усё, як і было...
Папухлі рукі, есці мала,
ды фронт бліжэй.
І смех і злосць —
відаць, ізноў масты папаляць!
Але не час адно чакаць,
ці хутка смерць пяском прыгорне.
Імкне паводкаю рака
падзеяў, дзён...
Зноў будзе зорна.
А як яна? — Нуда, нуда...
Лепш дачытае ліст уранні.
Гады паспелі загайдаць
нат сэрца... што было — не ўстане.
А што галодны... І яна ж...
штадня пішчымныя лупіны.
(Нат і аб іх часамі сняць
пазначаныя «Остам» сінім)...
Гудуць... Ізноў гудуць гудкі,
і тупат ног аж б'ець у сцены.
Хутчэй
дабегчы б да слізкіх
і чорных нор, сагнуць калені,
і пахіліцца, і маўчаць,
аж не прамчыцца навальніца.

Як ён пісаў?
— не час, не час,
адно схіляцца і маліцца.—
А гул ужо над галавой,
ён увушшу, у сцерплым целе...
Гудуць чмялі... пяе жніво
над серпам маці,
жмені сцеле...
Там... на акопах... золь... слата...
Што?!
ўсё дрыжыць, пат зоры,
зоры...
І ўжо не ўдасца дачытаць
недачытанае учора.

## НА СЦЕЖЦЫ

Вакол усё зялёнае.
Не дзіва — чырвень.
Усё бурлее жыць,
цвісці, буяць.
Важкая ад начы бяссоннае,
спяшаючыся,
пырнік,
густую лебяду і... жах мінаю я.
Усё шалее — жыць.
Зялёным смехам
ляшчэўнікі заходзяцца, аж весела мінаць.
А ён... а ён ляжыць
на сцежцы шэрым вехцем.
Яшчэ адзін, каму вясна
не дацвіла.
Глядзіць у сонца твар...
Чарнее кроў над вухам...
І вочы ўжо не лашчаць неба, ні ляшчын.
На вуснах — мухі...
І даць веры цяжка,
што ўчора ліст чытаў ад маці
сын.

## ТАК ПРОСТА

Дымяць руіны,
дым грызе
павекі, й самі плачуць вочы.
Адно уцехай, балазе
што дзень устаў па гэткай ночы.
Заліў хтось ходзішчы вадой,
скрозь шкла насыпана, як лёду.
І ўсцяж стаіць натоўп —
кудой,
чаго ісці — не палагодзіць.
І ціха ўсё...
адно звініць
над папялішчам плач дзіцячы.
Відаць, каваўкам цагліны
дзіця дзе раніла, няйначай.
Іду... рассоўваю натоўп.
На грудзе цэглы чорнай — трое,
і штось, а можа, навет хто,
пад шэрай коўдраю старою.
Курэюць выкратні лам'я,
слязьмі людскія вочы студзяць.
Трыё заходзіцца...
шумяць,
як вераб'і на стрэшцы, людзі.
А рэч — за ўсё ў жыцці прасцей,
няма папраўдзе чым праймацца:
ратуючы з агню дзяцей,
насмерць згарэла маці.

## «АКЦЫЯ»

Гарэлі ў тыя дні не толькі што кляны —
скварлося на агні усё, на што ёсць слова.
І ранаў з гэтых дзён нялюдскіх і дзіўных
ніякаю замовай не замовіш...

Скідалі ў сутаргах з намоклага галля
апошнія лісты прысады ў золь і мокрадзь...
Як прыгаршчы лісця, іх кінулі на пляц,

і латы жоўтыя пайшлі лістамі ў скокі...
Выў вецер...
Але й ім казалі заспяваць,
і за часіну ўсе і пляскалі й спявалі:
прысеўшы на бруку, брахаў у самы твар
ім кулямёт загады сталяй.
Каб дагадзіць яму —
чырвоным языком
пачаў лізаць агонь бажніцу...
аж у неба
шугнулі з дымам Торы, талесы ускок, рыўком,
маўляў скакаць пайшлі у тахт із рэбэ.
А рэбэ, што ж, спяваў...
рыпелі, як жарства
пад пятамі скакух, і ўсе...
і толькі Ёсель,
хоць маці тузала яго: «Спявай»,—
біў пустку пясткамі, заходзіўся і трэсся.
Біў пясткамі й тады, калі апёк агнём
бізун дзіцячы твар,
калі асела маці
на брук снапом аўсяным,
калі ён
папоўз, маўляў шчанё, ў прыпол яе схавацца,
калі пайшлі здзіраць з дзявочых шый і рук
каралі гордыя і ўпартыя пярсцёнкі,
калі, як з крапяжа, паплыў з крывёй на брук
чыйсь енк прарэзлівы і тонкі,
калі усцешны шум змяшаўся увушшу
з пякучай роспачай,
апаў на сэрцы жудзяй...
Ён плакаў...
а вакол, здавалася, душу
ў апошняй песні выспяваюць людзі...
Так прычакалі змрок...
Папоўз асенні дзень
за восеці...
Тады — усім далі лапаты,
і зашуршэў, заплёхаў па вадзе
пясок важкі і макраваты.
Паслей — казалі збыць людзям апошні стыд,
і пачалі услед расці стагі апраткі,
аж пырснула святло на целаў сплёт густы,
а кулі пляскаць узяліся ў ладкі.

Гадзіны дзве брахаў у золкасць кулямёт,
ды заліла й яму ноч ляпу чорным лякам.
Спыніла лёт лісцё, сплыло на целаў сплёт,
і навет Ёсель сціх, ужо не плакаў.
І з-пад павек яго, хоць ён не знаў Хрыста,
глядзеў Хрыстос з тугой нянаскаю, дзівоснай
на тых, каму з пяску крывавага не ўстаць,
на катаў у крыві...
слату...
і восень...

## *Прыйдзе час і на песню*

### ХОЦЬ ВЯСНА

Паддалася,
не без бою,
сцюжа, збегла за мяжу.
Ужо зарой, ля вадапою
за вясною коні йржуць.
Тыдзень, два —
й на крыллі смелым
яе ластаўкі прымчаць.
Белай цвіляй замяцеліць,
загарыцца малачай,
задыміцца жоўтым пылам
лог, дзе пёраў залатых
нагубляе сонца, крылы
абтрасаючы з вады,
паплывуць чаўны хмурынаў
на нябёсных паплавох...
(Мо растае крыгай сіняй
Сум, што ў сэрцы дзесь залёг?)
Юр'я весела на выган
пугай статак пажане,
запяюць узноўку шчыглы —
не паэты —
аб вясне.
Запяюць,
аж гулам спеўным
наліецца ўся зямля.

Й толькі нашы песні, пэўна ж,
тут лазой не запыляць.
Ім не стане
ірдзяных ранняў
над расстаннямі сцяжын,
ціхіх плёсаў серабраных,
белых дзічак на мяжы...
Прагна сочачы вачыма
першы, шпаркі ключ гусей,
хоць вясна —
тугой нішчымнай
захлынёмся мы усе.
Ды няхай...
За год, за дваццаць,
але будуць у агні,
ў пазалоце нараджацца
і канаць —
і нашы дні!

## *Не здрадзім*

### О, ШЫПШЫНА МАЯ, БЕЛАРУСЬ!

О, Беларусь, мая шыпшына...
*У. Дубоўка*

Грае люты на струнах завей
далікатнае, смутнае «scherzo».
Пачакаю, аж зноў весялей
будзе трохі на сэрцы.
Аж затліцца ізноў у крыві
хваляванняў блакітны агеньчык,
аж і сцюжа, і дні без навін
шэры час свой ад'енчаць.
Аж ізноў баразной пабрыдуць
дні вясны у вадзе па калені,
аж мы скарбы пачуццяў і дум
зноў на словы разменім...
Цёплых слоў гэтых трэба усім
нашым часам суровым і збройным.
Што ж ты свету сягоння дасі,
як не песню, не мрою?

Як прымусіш паверыць сваіх,
што яшчэ расцвіце наша доля,
што ніць шчасця йшчэ будзем мы віць
пад крывіцкаю роднай століяй?

Грае люты на струнах суччa
далікатнае, смутнае «scherzo»...
Не, не буду чакаць, аж маўчаць
маё знудзіцца сэрца.
А удару па цягліцах струн
і з тугою, і з сілай нячутай:
«О, шыпшына мая, Беларусь,
маё шчасце й пакута!»

## ЖЫЛІ МЫ Й БУДЗЕМ ЖЫЦЬ

Калісь, бывала, ўпотайкі
асенні сухавей
жывою пазалотаю
крапіў з крапіла свет.
Засвеціць сонца — капае
яна, як мёд густы,
з лясоў у жоўтых лапінах,
з лагчынаў залатых.
А выйдзеш за аселіцу —
пад ногі ўсё гусцей
чырвоная мяцеліца
чырвоны снег мяце!
Цяпер —
стаптаны правілы:
слатою восень дзьме.
Вятры чужын расплавілі
нат восеньскую медзь,
ашчэрылі дні чорнымі
зубамі пажарышч,
жыццё з дарогі торнае
звялі у гушчары.
Ці ж дзіў, што шэрай снедзяю
паростае нат верш
і што і сам не ведаеш,
жывеш ці не жывеш?

Але дарма,
            йшчэ полымя
не згасла у крыві,
яшчэ рукамі голымі
мы шчасце ймкнём лавіць.
Хоць сяння з ім, няласкавым,
і йдзём мы на нажы,
хоць восень нас аплаквае —
жылі мы
        й будзем жыць!

*1944*

## КАЛІ...

Калі на клёнах залаталістых
дрыжаць апошнія лісты
і сівер сіліцца расхрыстаць
сівую восеньскую стынь,
калі віном старым крынічаць
каўшы мядзяныя лагчын
і кветкай дзіўнай, экзатычнай
канае сонца на суччы,
калі сівее з жалю й далеч
і межаў жоўтая трава —
тады,
        тады так смутак паліць,
што ўжо, здаецца, не стрываць!
І смажыць смага вусны, сэрца,
як дзень асенні,
                скончыць шлях...
Адно,
        ці нас утуліш смерцяй?
Ну, добра, смерць,
                а што пасля?
Хто ж, хай над ім гадоў завея
курган навее, ўзніме мур,—
засне з нас гэтак, што заўмее
Цябе забыцца, Беларусь?
Хто шчыра так памрэ, што згасіць
нязгаслы, палыменны зніч,
які калісь, а ўпаліць шчасцем
і наш працяг,
                і нашы дні!

*1946*

## *Ледзь красавік*

### ВЯСНА НА БРУКУ

Яе прынёс сюды нараніцы стары
ў калекім кошыку з далёкіх нейкіх ніваў,
паставіў пры муры, адкрыў... і закурыў
вясною шэры брук,
такой праўдзівай!
Па хвалі хваля біў людскі прыплыў у мур,
яна ж цвіла сабе і жаўцінёй і беляй.
І нават гэткія, што на душы — сем скур,
зіркалі на яе саромліва й нясмела.

А над мурамі ймкнуў гусіным клінам дзень,
пух белых балачын над вежамі развешваў...
Увіхаўся над вясной стары, як авадзень,
са звонам кідаючы ў рук барозны рэшту.

І стаяла вясна у закутку сцяны —
разнёс яе натоўп драбкамі сонца й неба.
І пад нагамі шпаркімі ужо не камяні,
а угіналася, як хлеб, мякая глеба.

### МАГНОЛІЯ

Цвіце магнолія...
мільёны матылёў,
бялейшыя за снег, трапечуць на галінах.
Замерла ў пешчах белых крыл галлё,
салодкай млоснасці на брук не скіне.
Ён чорны і брыдкі, як побач, зрэшты, ўсё,
ды б'юць, бы ў бубна дно, ў яго людскія ногі
на годзе год...
Аплёў, аблытаў, як драсён,
той гуд не толькі брук,
але й хаценні, змогу.
А ўсё-такі, за снягі бялейшая, усцяж,
ледзь красавік,
цвіце магнолія над мурам.

Зялезнай логікі адвечнага жыцця
нішто, відаць, што людскае — не збурыць.
Ну, а па мне — усё, як ёсць, і мае быць.
Маленства... вёсны... восені... магільнік...
Сяўба без жніваў... Жнівы без сяўбы...
Узвышшы ўсцешныя... Туга, якой не выліць...
Я дзякую табе за ўсіх,
                    за ўсё, мой кон,
хоць мо й нязвыклы ты ціхой людской падзякі.
Пайду... ды ведай —
                    рэшту сініх дзён
маіх дап'ю я ўсё ж із смакам!

## ЦВІЦІ, ВЯСНА

Заблытала вясна
у засеках антэн
крылля пругкую снасць —
не вырвацца з палону.
І вось —
        ужо цвіце
скрозь, жоўта, клёнаў сцень
і першыя пралескі у далонях...

Люблю я свет красы,
але не свет людзей,
дзе ў сусцігі касіць
удачу ймкнуць насполу
ўсе злыдні свету, дзе
і я — ўжо так ідзе —
палюю, хай няўдала, долю.
Адное з імі й я,
і на карку маім
павісла неўпрыцям
людское прагі змора,
і мне не збыць тугі,
у сінія лагі
ўгары
        не ўзняць вачэй...
                            бо сорам.

Ды не глядзі, цвіці
на ўсіх рагох, вясна,
у наквеці, ў лісці
ўрачыста і стасвечна.
Дай чар людскога дня
нам высмактаць да дна.
Мы знічкі жутлыя — і ўсё.
Ты ж —
Вечнасць.

## ВЕРА

Калі месяц вясняны зазвоніць
серабраным сярпом аб загон
мескіх дахаў,
калі у далоні
сакавік ёмка возьме яго
і пачне жаць зімовыя сходы,
жалі ў бабкі густыя стаўляць —
зноўку верыць захочацца кону,
хоць нам зводу ў яго не купляць.

Будзе гэтая вера, як іскра,
што пад прыскам, пад шызым, жыве,
што Далёкую робіць нам блізкай,
што надзеі ўзнімае наўзвей,
наўзвей-вецер гарэзны, імклівы,
вецер, сэрцы б ім сцерплыя дні,
разгайдаць неўзрунелыя нівы,
бубны выбітых шыб разбубніць.
І ўскрасіць,
хоць у крозах,
акрайчык
на застоллі у родным куце,
дзе збылі б мы, у пыл паклякаўшы,
ўрэшце боль свой нясцерпны —
хацець!

*Сакавік — красавік, 1954*

# *Аджытае*

**Марыльчын год**

## ВЯСНА

— Ой, вясна-красна,
што ты нам прынясла...

*Беларуская народная песня*

Ячменным асцюком у вочы коле дзень.
(Ці ж дзіва?
Ад Пакроў — няспорны морак хаты.)
Дзень гэткі залаты і ў сонцы, і ў вадзе,
і ў радасці, сцярожаю прыцятай:
здаецца, за парог —
і апячэ агнём
карэлы, шэры свет, прытрэсены саломай.
Ды — вецер веснавы качаецца кульнём
па вулцы, й нечы смех сам сыплецца ў далоні.

Часіна — й навакол вясёлы, босы гурт...
Мчаць трэскі-чаўнакі із пенай ручаінаў
туды, дзе вербы берагам кудысь бягуць
і з крыгамі ў нячэсаных чупрынах...

І гэткай зырчынёй расцвечаны й яны,
і стрэхі, й вераб'і, й дзятвы крыклівай зграя,
што, не стрываўшы шчаснасці вясны,
да хаты, плачучы, ідзе малая...

## ЛЕТА

— Ой, жала ж я да вечара,
Баліць мая сярэдзінка...

*Беларуская жніўная песня*

Маўляў той жытні сноп, уціснула спякота
пярэвяслам тугім расцяглы далягляд...
Кусае лыткі тонкія асот ласкотны:
і ў жменьку дробную уторкнуў серп Ілля.

Няспорна праца йдзе... Ірдзяняцца крывяна
малыя пальцы, твар, сярэдзіна смыліць,
і уваччу плывуць, куляючыся п'яна
ў плаўкой гарачыні, пясчаныя палі.

Да полудня — гады, а пахне луста хлеба
і квас у гладышы салодкі ўжо цяпер.
І мроіцца лука — рака ў зялёным зрэб'і
карузлых вербалоз і водарны аер...

Гарыць агнём лязо сярпа ў радкой саломе.
Кладуцца за плячмі снапы... снапы... снапы...
Пярэвяслам тугім уціснуўшы, палоніць
спякота далягляд замлелы і сляпы...

## ВОСЕНЬ

— Туман, туман па даліне...
*Беларуская народная песня*

Плыве пластамі дым... То ўпіліцца галін
падголеных асін у чорнай грудзе гнёздаў,
сініць аўсяння клін, дзе лежацца ляны,
аблытвае сцяблы... То поўзае ў барознах...

Пад кудрай на раллі зыркі трашчыць агонь.
Ды рады ці ж дасі падпаскам-падшывальцам?
Наклалі бульбы й ім, малым — «куды, чаго?»,
Самі ж — дык горнуць, дзьмухаючы ў пальцы.

Гарчыць, як чэмер, дым... Не згледзець
за слязьмі,
што ў попеле суцьмы руды асіннік тоне,
што й сонца прысак згас...
Знянацку: «На, вазьмі!»
І бульбіна — вялізная — ў далоні.

І ўзноўку ўцеха... смех... А рэха ўсё нясе
услед у туманы, ў сацьмелыя далечы,
скуль рунню, стулою, па расе
нячутна крочыць верасьнёвы вечар.

## ЗІМА

— Вароты скрыпяць,
марозы чуваць...
*Беларуская народная песня*

Расплецены снапы...
Праз шчыліны ў шчыце
крамнёваю стралой у ток цаляе сонца.
Мяцеліцай над ім мякінны пыл мяце,
і з цоканнем цапы салому тнуць і комчаць...

Так хочацца туды! Хусцінне цішыні
вісіць над галавой дзяцінай нізка, нізка.
Адно ўвесь дзень: акно, скуль тне паціху стынь
і згорклая, гаворкая калыска.

Прахухала было, узлезшы на услон,
у папарці зыркой прамерзлых шыб палонку.
Зайгралі сонца, снег, застыглы ў срэбры клён...
Ды ўслед занёс мароз усё лістоўем звонкім...

Ніжэй, ніжэй, ніжэй хінецца на брыжы
рукаўцаў твар...
І ўжо — яна не тут, а дзесьці...
Зноў звончаць ручаі... Аджытае ж ляжыць
пярэвяслам, расплеценым ля весніц.

## *Брамы*

Апоўначы манах пастукаў тройчы
у браму ціхую й святую...
*М. Сяднёў*

## НЯЁМКА МНЕ

Я —
брамаў не люблю,
ціхіх, ні гаманкіх,
хіба якая з іх —
наросцеж,
проста ў сонца.

Знайшла я ключ у ўспень,
прасцяг, надкі такі.
Не дам, аж будзе дзён
ліпець адно на донцы.

У брамах — стынь, сутонь.
Пад брамамі — калек
рыззё, нудзьга ды ныдзь.
За брамамі — спачынак.
Мне ж,
каб не згас агонь,
і собіла ж на лек
нягойны і дзіўны:
лічыць далей бачыны.

І вось, лічу...
Вятры, ўсе сінія вятры
расою уваччу
са мной зігцяць увесну.
А ў лістапад —
зірнуць, як я ды свет гарым,
асіннікі брыдуць,
дзе ад красы аж цесна.
Зрынаюць дні кунег,
дні працы
у ваду.
Ужо не ўзняць,
адно
душу кругамі плямяць.
Няёмка толькі мне,
што не дайду
я ўсё ніяк да ціхай брамы.

## АЛЬФА Й АМЕГА

Дзве прыступкі...
Брамы чорнай шулы...
На прыступцы —
пупышка цвіце ружовая —
дзіця.

Жменькай згортае з парогу
бруд, касулі...
Ды благія нешта з мескай брамай гулі,
часіна —
і слёзаў шчырых не прыцяць:
белы пальчык, парастачак чулы,
ушчаміла, злая, неўпрыцям.

А-ля брамы, ўмурзанай, як дзёгаць,
бома[1] сцень кудлаты на сцяне
абкідае сонца неахайным сцёгам.
Пляшка...
Твар — скурат...
У зморшчынах — кунега...
Весні цвет у снёным гэта сне...

Ззянь і сцень.
Там — альфа,
тут — амега,
Няўцямнага пачатак
і канец.

## САМОТНЫЯ

Галіны, у цвеце галіны,
запесцяць вас веснія ветры,
ўсё люляюць,
туляць да брам...
Ваш дотык пачуўшы,
і з нетры,
з брам стыні
выходзяць сцені.
Надзея на тварах сцертых.
— У імя Айца і Сына,
мо хтосьці прыпомніў? —
каленам
і сэрцам аж млосна...
— Хто там?

---

[1] Бом — постаць з нью-йоркскага дна. Невылечны бадзяга-алкаголік.

Скрозь моўкнасць.
Нікога.
Дый дзе б там?
Нізкія парогі, каб госці...
А ключ —
непатрэбны —
ў руках...
А ногі марудзяць чагосьці...
А вушы ўшываюцца ў цішу...
Не кратайце ж брамаў,
не ўзносце
далоняў, галіны у срэбры:
за брамамі крыўды калышуць
самотныя,
з вамі не ў тахт.

## *Прывіды*

Мне бацькаўшчынай цэлы свет,
Ад родных ніў я адвярнуўся...
Адно... не збыў яшчэ ўсіх бед:
Мне сняцца сны аб Беларусі!
*Я. Купала*

### ЗАМІЖ ПРАДМОВЫ

Зляцелі ў вырай мы, у новую айчыну
(мне ж «бацькаўшчынай цэлы свет!»).
Хто й гнёзд ужо навіў, а ўсё —
не збыць пачыну:
сусвет прынад для нас усцяж — мяжа ў траве
й паснулая над ёй бабулька-йгрушка,
якой маленства наша давялося гушкаць.
І сапраўды: імкнём, маўляў, кудысьці,
маем
зялёным, сёмушным нат рэдчас маім дні,
а гэта ж Бацькаўшчыну мы адно шукаем
у змерклай далечы, ў расцвілай блізіні...
І ловім водар ніў у цвілі мескай нетры,
шум баравых сасон у кажным цёплым ветры...

Дзівосы свету мы адно да іх умільна
раўнуем, сочачы із прагай цьмень:
— Зусім, як і у нас!
Вось так было і ў Вільні!
Вось гэткі ж клён калісь і ў Менску мне шумеў,
ледзь-ледзь драўляныя вакеніцы-павекі
расплюшчаць вокны ў свет,
дзе — межы і засекі...

## ВЕЖА

Бярозай белай вежа
над крыжам рвецца ўгору,
ў прастор, дзе сінь — насцежай.
Не ўвеціць — адарвецца
увомірг ад каменных
муроў, хай толькі вецер...
І хіляцца калены...
Не перад ёй, не гэтай —
прад гэткаю ж, за светам
падзетай... недзе ўчора...

## ЗАВУЛАК

Сцень — ад сцепаў да сценаў...
Скуль тут гэткі завулак?
Крок б'е ў бубен, а рэха не ўпросіць.
Боль пакорпаў цагляны
мур, у шчэрбах ён, ранах...
І — ужо успамінаў не здзену:
рэха, гэткае ж рэха старэчае чула
я, дзяўчынкаю, з коскай
радзенькаю,
мулкай,
прабягаючы вулкаю
Росай.

## ДАМОК

Дамок дзераўляны... Пад гонтай..
А побач, як бор, небасягі
каменнымі пнуцца камлямі.
Устала б з зямлі Пакагонта —
ізноў бы скапала ад смагі
па тым, што і сны ўжо не пляміць...
Дамкі... Небасягі — адно ёй,
зязюлі з зялёных гушчараў...
А мне —
зноў няма мне спакою:
я знала калісь на Папарах
дамок гэткі,
з гэткай страхою...

## САД

Бяжыць, як жэўжык, сцежка
ў кунежную зялёнасць,
хай недзе побач места
й расце, як цеста ў дзежцы...
На клёне, на агрэстах —
стазвонны рой пчаліны...
Сады гадоў дзіцячых,
навечна, без аддачы,
чаму ваш чар загінуў?

## УВЕСНУ

Расцягнула сонца кужаль залацісты
паміж струпамі антэнаў пруткіх.
Быццам кросны ў хаце ў Чэцвер Чысты,
зігацяць яны і ўтокам і асновай,
то звіняць цымбаламі, то дудкай,
маё сэрца, як чаўнок вясёлы, ловяць...
І так хочацца йшчэ раз, хоць раз, іскрысты
сіні лён сукаць і славіць спеўным словам
пах зямлі, бярозавага лісту,
зыркасць радасці няўгойнае, вясновай!

## УЗБЯРЭЖЖА

Срэбным пылам стыгне узбярэжжа
пад нагамі мора сіняга, ціхога...
сяння — сцяла яго цяжкая знямога,
заўтра — скіне стому,
раз'юрыцца,
ніцы
пас пяскоў затчэ мярэжай
белай пены,
будзе плакаць, кідацца, сварыцца,
зломы
скалаў біць — перш гнеўна, потым — лена,
ажно, зможаным асілкам-воем,
ніцма рынецца й замрэ, як нежывое...

. . . . . . . . . . . . . . . . .

Сінь рахманая... Зялёнае бязмежжа...
Срэбны пыл пяскоў...
                                        Мо гэта чары?
Дзесь шасціць чарот, мой слых кунежыць...
Мне здаецца... гэта ж Нарач,
Нарач!

## *Узноў*

...Зварачаецца вецер на кругі свае...

## ЖАЎЦЕЕ ЛІСТ

З гарчынёю, нічым нязменнаю,
бачу ўзноўку —
жаўцее ліст,
і з падковы нябёснай
жменяю,
зораў сыплюцца гуфналі.
Я спрабую рукой разжаленай
запыніць яе, восень:
                                        «не»!
Ды жаўцей адно пеніць вяршаліны

ветру восеньскага кіпень.
У вузлы павязаўшы цяглiцы,
з пальцаў рук настаўляю тын —
дый праз шчыліны ніткай цягнецца
павучынпаю
сум густы.
Б'ю у жоўтыя грудзі пясцяю,
аж дзіўлюся сабе сама —
ды адно серабрана засціцца
свет —
        асенні ўстае туман.
І рука
лістам жоўтым
падае...
Кіслай рошчынай пахне трава...
Восень, тайка мая непарадная,
што ж
давайма узноў сябраваць!

## ВОСЕНІ

Даруй, што цябе не бачу,
калі у вясне па грудзі,
лугамі брыду наўдачу:
узноў ты маёю будзеш.
На жарты ж і сіня сяння,
і ветраў зялёных зграя.
Міне ўсё — й далоняй шклянай
на шыбах ты ўзноў заграеш.

* * *

Хто ж мне, як не ты, разгарнула
зрудзелы папірус узлессяў,
дзе густа, як нітка на шпулю,
лягла лісту жоўтага песня?
Табою я толькі на свеце
сваю абнашу, залатую,
хай стрэчны настырлівы вецер
злым жартам са мною жартуе.

* * *

Ёсць дзіваў так шмат на свеце,
дзіўнейшых за ўсе дзівосы...
Мне ж
дзівам найбольшым —
вецце,
якое залоціць восень,
далоні чырвоных клёнаў
жывыя, людскія быццам,
асенніх асін калоны,
якім я магла б маліцца.

* * *

Дык як тут не жыць мне табою,
ледзь верасень
жоўтай журбою
на мескія ссыплецца брукі?
Я ж толькі лісток прыжаўцелы,
табе
без крыві і без цела,
вятрамі укінены ў рукі.

## ГЭТАК БУДЗЕШ ТЫ МНОЙ

Параслі, быццам хутрам рудым, узбярэжжы:
хмызнякі ды лазоўе,
і ўсё залатое...
Восень, восень, калі ж
напалам перарэжам
мы з табой і уцеху, і смутак упойны?
Гэтак будзеш ты мной,
з маёй смагай і жалем,
я ж табою
зыркою і перапялёстай.
Будуць людзі гукаць цябе проста
«Наталяй»,

а мяне клікаць «Восеняй»,
гэтак жа проста.
Ты пачуеш, як моцна цвікі убіваюць
варагі і свае-мне у цёплае цела,
я ж пазнаю,
як душыць імжака сівая
ліст па лісце на клёнах,
як ніцма іх сцеле.
І пачну я
табой
паміраць на галінах
звонка, шчыра, і жоўта, і зырка-чырвона,
а ты —
мной угарышся у вершах і чынах,
я — рудым пусталістам,
а ты — пустазвонам.
А мо, сэрцам змяняўшыся,
буду я: «восень,
што за ўсе залацей»,
ты ж — найбольшым паэтам.
Пахінуся табе недажатым калоссем,
ты — заплачаш мне песняй,
пачатай не гэтта...

## НЕ ПЕРШЫЯ

Зноў восень...
Свая ўжо...
Зноў журам загуслым
сівее вада, абляпіўшы прычалы...
Узноў, як ні трэш, праступаюць на хустцы
ўспамінаў
часіны, з якіх пачыналі.
Не першых
сюды нас кон з ветрам прыгушкаў,
выгнаннікаў з торбаю, сэрцам і кіем,
з прыдушанай мовай,
адзінай, што душы
адныя адным адчыняе.
Такія,
не першыя,

мы запынілі пагоню
натоўпу чужога за ўдачай і хлебам,
у ходзішча ўросшы,
з душой пад адхонам,
зляканай усмешкай...
Не першыя, дзе там!
Паўвеку таму, над густою вадою,
стаялі, як мы тут,
дзядзькі з-пад Налібак,
дзяўчаты з-пад Шчары грамадкай рудою
й дзівіліся шчыра нязнаным сялібам.
Раслі аж у неба камлі небасягаў,
на пядзю ніжэйшых, мо праўда, як сяння,—
ды ўсё ж недасяжных вачом і развагам
іх, гэткіх звычайных, жытнёвых, аўсяных,
што ўчора
нагбом, набрынялаю жменяй,
асот і куколь з каласамі зразалі,
рыпліваю сошкай гарнулі каменне
і роднаю песняй разгойдвалі далеч.
Трымцелі калені ад тыдняў пакуты
на хвалях,
няхоцькі слязіліся вочы.
Стаялі й сачылі,
як кагаркі скрутам
кідаюцца ў морак,
крыллё у ім мочаць.
Шарэлі карэлыя, ўбогія клункі
над першым сутоннем у новай айчыне,
і горкаю кагаркай плакалі думкі
па згубленай,
гэнай,
што з сэрцаў не скінеш...
А сяння зноў — мы...
А назаўтрае — мерка
яшчэ... і яшчэ (хто ж бадзягаў запыніць?)...
Аж хтосьці, калісьці,
апошні ўжо,
змеркам
прыльгне да сляпога,
апошняга тыну.

## АДВІТАННЕ

Вось і яшчэ адну восень
я адвітала, у цішы,
сэрцам і целам з камення.
Тутка па ёй не галосіць
ані прадонне, ні ўзвышшы,
ані суддзя наш найвышшы —
наша дзіўное сумленне.
Тут
залатую хаваюць
моўчкі, ледзь першы жаўтавы
ліст залунае над мурам,
зычаць нябожчыцы раю,
хрыплагалосна гугнавяць,
свечкі таненькія ставяць,
місы з сытою ды журам...
Плач ці не плач —
не паможаш,
клёнаў назад не адзенеш,
дзён залатых не ссукаеш,
сіверу не адва́рожыш,
сэрцаў людскіх не адменіш,
як ні выцягваеш жмені —
праўда ўжо скрозь такая.
Зраніш адно, навярэдзіш
пальцы, і пясці, і рукі
у неразумным змаганні.
Вось я
шнур пацерак з медзі
з карку й зняла без прынукі:
хай нас асенняй дакукай
не харашаць
і не раняць.

## ЧАС — НЕ ЧАС

Сіня. Сонца. Падсохлыя брукі.
Беспрычынныя стрэчных усмешкі.
Радасць
рупіць раскінуць рукі,
дзесь за светы падацца пешкі.

Цешаць
першыя пырскі зыркія
весніх крокусаў, пупышкі веццяя,
галубоў шчыры юр,
і такія
думкі
хоць іх
        рассып ты па свеце!
Дзе ні глянеш —
вясна,
ды якая!
Не сступіш —
папхне, перакіне!
Марны скверык — раскінуўся гаем,
неба латка — бязмежжам сінім!
Песцяць сэрца й худыя вазоны
й бруки ў белі паперкавай лускі,
і ўсё чыста —
бо вецер з Гудзону
сяння нейкі зусім беларускі!
Больш не хочацца быць
                                песімістам,
што ўсю людскую зведаў аблуду...
Асыпацца асеннім лістам
час — не час,
а яшчэ ж
        не буду!

## *Тэма вясна*

Вясна, вясна жаданая.
*Я. Колас*

### ВЫРАЙ

А вясны —
        ўсё няма і няма.
Увушшу звоняць белыя пчолы,
быццам
ім
сакавік пераймаць,

а не лозам
у мокрых пастолах.
У мурох, праўда, дзе і жаўцець
гэткім,
злітым вясновым гудам?
Мне тут
неба шматок найчасцей
на ўсе жалі бывае астудай.
Ды мінуў сакавік без яго,
адкаціўся яечкам чырвоным
дзень вялікі...
Хвальшывіць фагот
ветру
зноўку на прываконні.
Стогне сівер,
не-не, а пагляд
скасавурыць усё-ткі ўдалечы...
Ці не вырай мінуў далягляд
мчыць,
узняўшы вясну на плечы?
Мкні ж суладна,
ускіды крыл
ашчаджай,
першы госць пярэсты:
ў сэрцы ўбіўся,
як боль,
снежны пыл,
не разбі ж нам
вясну
над местам!

## СОН

Папырскаў крышку дождж,
ляны, вясновы, цёплы,
яшчэ й цяпер
галлё
ягоны чуе смак.
Вісела доўга на аднэй з галінаў
сонца,

ды перадумала
й зрывалася у ноч.
Бяруцца слацца моўчкі нанач
клёны,
не надта ўжо шумлівыя і ўдзень:
тут — не яны шумяць
лісцём, птушыным звонам,—
ні шчыгел, ні жаўна
сюды не заляціць.
Шуміць, гудзе, грыміць
вялізны молах —
горад,
нат найдзічэйшы джаз
такі не выб'е рытм.
І спаць,
прадаўшы ўжо
не толькі што
пшаніцу,
але й душу,—
не кожны тут дапне.
Сон тут —
маўляў той джаз:
парваны
і пачварны,
ціхім «андантэ» вейкі не спаўе.
Прахопішся —
крычаць каты на панадворку,
імчаць пажарнікі, грукочуць цягнікі...
А так хацелася б прысніць:
між яблык спелых
вісіць бляшаны ветаху ражок,
сінеюць азярцы туману на атаве,
сцюдзёна плюхаецца срэбра
у вядры...
А каміны
ужо сцяжкі ўзнімаюць дыму,
што пахне бульбаю й бяростай,
плывучы
насустрач цішыні перадусходняй...
Мамент —
і горлейкі ўзвіюцца паласкаць
расой салодкаю і звонкаю
жаўронкі!

Не цалавала рук
нікому я ў жыцці.
Табе ж,
мая зямля,
я цалавала б ногі
за цішу, за туман, за жаўрукоў,—
за ўсё,
чаму я ўжо, відаць,
не выйду
напярэймы.

## ПЕРШЫЯ КРАСКІ

Іх —
пазбірала я ўсе —
зернятка па зярнятку.
Але куды ж панясеш.
скарб гэты —
веснюю згадку?
Згаснуць у змрочных мурох
вочы іх сіняй дзіцячай,
нат не паспее пяро
слоў на паперы зыначыць.
Хай
п'юць усмак сяння ззянь —
дзіва ў рашчэліне мескай.
Наквець растрэсці
і звяць —
наканавана й пралескам...

## ДАБРАНАЧ!

Часіна́ —
і у сутонні дагарыць
сонца брыг,
пад ветразьмі, ў разгоне.
Ужо лічаць вочы —
раз —
дык зоры угары,

а раз —
зоры йшчэ зырчэйшыя,
ў Гудзоне...
Студзіць твар,
руды з гарачыні,
хвалі шэрае крылом
у доках
травень...
Упілілі пільна карані
караблі
ў ваду,
бы ў глебу травы...
Адбіваецца
каменьчыкам аб тын
іхных трумаў
плёхат
хваль прыплыву...
Адчыніўшы шырака раты,
узбярэжжы
дыхаюць хрыпліва.
Мітусяцца
зыркія агні
светлячкоў —
мо фараў, мо рэкламаў...
Не сумуе
аніхто
па дні,
што тугой
цімала сэрц напляміў.
Мо журбу з іх
змые ўрэшце ноч?
Што ж, дабранач!
Набрынялі вейкі...
Вартых снення сноў
не снілі мы даўно —
можа, сёння ўсё ж
прысніцца
нейкі?

## ТВАЁ ІМЯ

> Маці родная, маці краіна,
> Не усцішыцца гэтакі боль.
> *М. Багдановіч*

О, Беларусь,
о, Беларусь мая!
Імя Тваё — такі пякучы сымбаль болю!
Ды шчыра ўсцяж яго
багаслаўляю я:
і з ім я —
чалавек,
у долю і ў нядолю.
Пранізанае ім, маё жыццё брыдзе,
маўляў мяжой ціхой,
ярамі вуліц змрочных,
і не баліць мне, што вітае дзень
мяне чужою мовай,
а чужымі снамі — ночы...
Дзіўны ён, гэты боль,
і дзіўна лёгка з ім:
прысыпаўшы пяском друз прагі і зайздрасці,
ён
раннямі мяне ды мескай мітусні
няспынную кіпень
мяккой лагодай хрысціць.
Ён змеркамі з мяне пясціва ўмее зняць
важкую стому, кроў
зайскрыць узноў да працы,
зняверу, там, на дне,
даўкія крыўды дня
парваць,
каб ім і мне як разам не сыграцца.
І сны —
мне явай скрозь,
а сяння явы — сон,
ссыпаецца з душы лушпінне людскай звягі...
Імкліваю Вяллёй пяе сівы Гудзон,
Мурамі Вільні таюць небасягі...
І ўскласці я хачу на струны,
як Баян,
шнур пальцаў — лебядзёў,
і граць,
і граць з жадою,

О, Беларусь,
о, Беларусь мая,
паўз боль пякучы грацьТабе,
Табе,
Табою!

## У ГУШЧАРАХ

У гушчарах, затканых імглою,
шэрым змрокам, на золку, ў зару
ахвяруем Табе мы сабою
кожны дзень, кожны час, Беларусь.

І няма ў сэрцах жаху ні жалю,
мы адвагай змагарнай гарым:
не чужыя жануць нас удалеч,
але Ты нас вядзеш да зары.

І мы верым, яна разгарыцца,
ўстане зноў над краінаю дзень,
бо не стане змагар, не скарыцца
прад нягодай ніколі, нідзе.

Хмараў дым над галовамі тае,
вецер дыхае мятай, быллём.
Беларусь, Беларусь залатая,
За Цябе, за Цябе мы ідзём!

## КАБ НЕ МАЦІ...

Шмат на сцежках людскіх мітусні,
шмат няпраўды гаркое і болю.
Ад маленства ўжо — сэрцы ў агні,
ад маленства ўжо — крыўды нас колюць.

Ледзьве выцягнеш рукі ў жыццё —
ўсё не хлебам, каменьмі нам плаціць.
Не дало б яму рады дзіцё,
каб не неба, не сонца,
не маці.

Маці... Мама... як сціпла гучыць
гэта цёплае, цёплае слова,
ды ўсе жалі, ўсе жахі начы
перад ім пахіляюць галовы.

Маці! Колькі ж ты раз да зары
над схварэлымі намі сядзела,
сцень палёгкі сачыла ў твары,
грэла вуснамі сцерплае цела...

Колькі скрозь пагубляла ты слёз,
гэткіх чыстых, гарачых і шчырых,
калі гналі нас прага і лёс
ад цябе, з ветрам сінім у вырай!

Мама! Любая! Ты не крыўдуй
на нас, птушак няспынных, крылатых:
бо з ТВАІМ я імём іду
ў свет, СВАЕ гадаваць птушаняты!

# Вінцук Адважны

*Вінцук Адважны (Язэп Германовіч) нарадзіўся 4 сакавіка 1890 г. у Гальшанах. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю (1913), служыў ксяндзом на Дзісеншчыне і Слонімшчыне. Пераследаваўся польскімі ўладамі за беларускія настроі. Змушаны быў выехаць у Харбін. У 1948 г. быў арыштаваны кітайскай міліцыяй і перададзены савецкім уладам. Быў асуджаны на 25 гадоў прымусовых работ у папраўча-працоўных лагерах. Праз сем гадоў быў выпушчаны за мяжу. Жыў у Італіі, Англіі. Памёр 26 снежня 1978 г.*

*Друкавацца пачаў у 1922 г. Напісаў і выдаў кнігі: «Як Казюк сабраўся да споведзі» (1928), «Казюкова жанімства» (1929), «Як Ганула збіралася ў Аргентыну» (1930), «Адам і Анэлька» (1931), «Кітай — Сібір — Масква» (1962), «Байкі» (1973) і інш.*

## ХТО ЁН?

«Гультай за работу,
А мазоль за рукі!»
Шмат праліў ён поту,
Эх, дазнаў ён мукі!

Двойчы ў хату зайдзе,
Бродзіць ён пры рэчцы:
Месца там не знайдзе —
«Дзе ж тут мне падзецца?»

А ў паветры парыць,
На дварэ панура,—
Страшна сонца жарыць —
Мусіць, прыйдзе бура?

Бегчы трэ на поле —
Аж на сенажаці:
(«Эх ты, доля-доля!»)
Сена паскладаці...

Трэба ж граблі правіць,
Гладка падгаліцца.
«Мамка есці зварыць,
Пабягу памыцца!»

Чорны хмары бродзяць,
Хоць ты разарвіся!
Сену ж не зашкодзяць,
Бо бліны у місе...

Смачная салата —
Жаль было расстацца:
«Каб я жыў, дзяўчата,
Не мог адарвацца!»

Не дагрыз ён хлеба,
Склеіў папяроску,
Прыкурыў, як трэба,
Бег-пабег праз вёску!..

Ён да сена валіць —
Дух з яго аж прэцца:
Як пярун засмаліць,—
«Ах, як сэрца б'ецца!»

«Каб яно згарэла,
Хай яго там д'яблы!
Памяць адляцела —
Я ж забыўся грабляў!..

Хоць цягаў рукамі —
Хапаў сена хопам,—
Хоць скакаў часамі
Па лугу галопам,—

Але ўсё дарэмна,
Бо нячыста сіла,
(Злосць яе нікчэмна!),
Сена прамачыла...

«Верце мне, дзяўчаткі,
Што было б парою,
Каб прыпомніў татка
Граблі ўзяць з сабою!»

*1923*

## ЗЯЗЮЛЬКА

Спяваюць птушачкі прыгожа,
Зязюлька шчасце нам варожа:
— Ку-ку, ку-ку!

Каму на шчасце, па руку,
Каму на гора, на бяду:
— Ці скора замуж я пайду?
— Меців буду грошы я ці не?
— А жыць ці доўга мне?

— Калі ж то будзе? (Божа, дай!)
Наш вольны край?

Зязюлька скажа, будзь гатоў!
«За столькі — гэтулькі гадоў...»

*

Мо хто разумны тут рассудзе,
Ці шчасце нам без працы будзе?

*1931*

## ПЕРАПІСЬ У ВЁСЦЫ ЛУКОНІЦЫ 1921 г.

Хоць пішы бясконца
Ў нашае старонцы,
Беларусь святая —
Сэрцу дарагая!
Ранняю вясною,
Вольнаю парою,
Зноў спісак рабілі,
Ў палякі хрысцілі.
Панок нейкі старшы,
З сабой дзеўку ўзяўшы
І папераў многа,
Выбраліся ў дарогу.

Вось той пан на Прудзе
Крышку больш марудзе —
«Луконіца Велька»,
Пані «вучыцелька»
Чуць не абамлела:
Есці захацела:
«Трэба нам старацца —
Да ксяндза дабрацца!»
Чаму мала маюць,
Скоранька пытаюць:
Кожны з нас баіцца,
Каб не памыліцца.
Перш ад парасяці
Сталі пачынаці,
Пісалі цяляты,
Потым маму й тату.
У гэтакім паспеху
Шмат было і смеху;
Бабы, як авечкі,
Пачалі тут спрэчкі.
«Што мне твая вера!»
«Ты маўчы, халера!»
«Мая вера руска!»
«Твая ніўка вузка!»
Вось жа дзеўка тая
Сто разоў пытае,
Піша вельмі скора,
Дробненька гавора:
«Няхай кожны слуха,
Нех наставі уха:
Я вам муве пшеце,
А вы ніц не веце...»
Пан той хоць цярплівы,
Што аж людзям дзіва,
Ды тут не стрымаўся —
Ўзяў ды раскрычаўся.
Рылка і Махначы
Пісаў кожны іначай;
Латось — беларусам,
Як бы пад прымусам.
Шылка водзіў-модзіў,
Другу рэч заводзіў,
Ў вёсцы наймудрэйшы,
А пісаў — «тутэйшы».

«Пан Чуйкевіч які?
Ці то у палякі,
Ці у беларусы
Пісаць пана мусім?»
«Пішы, пан, як знаеш —
Болей панімаеш!»
Той, як гэта слыша,
У палякі піша.
«Ну, а пан Кудзелька,—
Кажа «вучыцелька»,—
З якога заводу,
З языка, народу?»
«Відзіш, проша пані,
Мы не знаем самі:
Гэта лепш чым тое?
Мусіць, дрэнь абое?!»
«Як, пан, смеш абражаць!
Трэба лепш уважаць,
Бо тут кужнэ слова
Естесь ужэндовэ».
Янка тут вялікі,
Той, што «без'языкі»,
Кажа: «Проша пана,
Можа, заўтра зрана?..
Бо я, так прызнацца,
Вельмі стаў баяцца:
Нашто пішаш статкі —
Можа, на падаткі?»
Янка тут варожа
І згадаць не можа:
Ці скацінку збольшыць,
Ці зямельку зменшыць?..
Як прыйшло да рэчы,
Крычыць жонцы з печы:
«Будзь паляк, як людзі,
Інакш — дрэнна будзе!»
Янка стаў круціцца —
Сам сябе баіцца:
Лжэ ён, аж капае
І канцы хавае.
А вось «паляк» новы —
Парабак Драздовы!
Прыламаўся ў войску
Гаварыць па-польску.

Тут прыгода нова:
Цялё Петрукова
Неяк памяшалі —
Ў палякі пісалі.

Ксёндз наш не замяўся —
«Беларус» пісаўся.
Ён не памыліўся,
Бо такім радзіўся.

Напісаўшы сыта,
Паскладалі квіты;
Рушылі ў дарогу,
Дзякуючы Богу.

Шчыра падлічалі
Тых, што запісалі,
Палякоў — ці трусаў —
Больш, як беларусаў.
Праўда ці трафунак,
Заўтра быў рахунак:
«Луконіца — вёска»
Праз ноч стала «польска»!
Вось жа, моцны Божа!
Хто нам тут паможа?
Бо мы бачым самі —
Бараны часамі...

*1933*

## ЗУБРЫ

Вайной калісь у чужамежы
Зубры ўступалі з Белавежы.
Пужаўся свет — іх брала дзіва:
Магутны карк і горб і грыва;

А голас звонкі, моцны ногі
Ды позірк зоркі, самаўладны,
А над усё — іх вострыя рогі —
Аж чуўся гоман там няскладны:

— Адкуль натоўп паважны гэты?
Ці мо з другой якой планеты
Ідуць да нас? Каб што якое
Не ўздумалі на нас ліхое?

Дый не! Зубры ад мамы й таты
Былі адвагай небагаты,
Аднак чамусьці між сабой
Рвануліся ў гарачы бой?!

Узнікла жудаснае дзіва:
Ці месяц кружыцца фальшыва,
Што аж завыла скрозь віхура —
Аж узнялася бура?!

І ўся прырода пасумнела,
І сонца яснае сцьмела,
Гатоў быў свет увесь здурыцца!
Зубры ж не перасталі біцца...

Няма больш сілы, ні красы:
Пахрыплі звонкі галасы,
Падбіліся, крываваць ногі,
Скрышыліся, як трэскі, рогі,
Дый аслабеў іх карк грубы,
Яшчэ трымаюцца ... гарбы.

Мы, беларусы, род зубровы,
Да працы ў дружбе ці гатовы?

Ці будзем ў сварцы траціць сілу,
Каб шчасце скінуць у магілу?

Здалёк свабода к нам ідзе:
Здабудзем волю ў грамадзе!

*1962*

## СВІННІ

Мы бачылі такіх свіней:
Яны ўсё елі, спалі —
(Не будзем раўнаваць іх да людзей) —
Нічога больш не знапі.

Любілі бульбу, цеста, брагу:
А да работы —
Ані ахвоты,
Ані пацягу!..
Так, дзень пачаўшы, елі-елі —
Скрозь ад нядзелі да нядзелі;
А елі смачна й ласа,
Бо... гадаваліся на мяса!

*

Мы тут не робім параўнання —
Малое толькі меркаванне,
Бо розніца на тым стаіць —
Не ўмеюць свінні лішне ліць!
Наш брат, як грошы запрацуе,
Усіх свіней ён закасуе!

## НАШ МЯДЗВЕДЗЬ

Мядзведзь жыў-быў у пушчы —
У Белавежы, ў гушчы:
Не быў разбойнік — злоснік,
Не быў і поснік.

Аб ім хадзілі весці:
Не мог ён, спаўшы, есці.
І байка выйшла там адна:
Глынуў ён нашча барана.
Дый зара праглынуў ізноў
Сем зайцаў, як бліноў!
І тут жа, гэтым знакам,
Ад голаду заплакаў...

А як пара настала,
Еў з салам сала;
А як у бочцы было дно,
Дык сала еў адно.
Заморскую сівуху
Ліў-піў ён колькі духу!
І мёд любіў і піва,
А працы не цярпеў, надзіва!

Так рэчкаю дабро лілося —
Аж у ліхі канец звялося!

Памёр мядзведзь! Быў як сухар —
Аж скура не пайшла ў тавар:
Чужынцы крышку пацягалі,
А ўрэшце ногі выцíралі...

*

І нашыя вось гэтак гультаі,
Што елі смачна і пілі,
Што марнавалі час і сілу —
Губілі так Айчыну мілу,—
Панеслі талент у магілу!..

*1963*

## КАТОК — МАМІН СЫНОК

Жыла ў гасподзе котка —
Абармотка,
А быў у коткі сын —
Пястун — адзін;
Дый так яго любіла —
Наўкол хадзіла!
А пат і мыцца не давала —
Сама лізала.
На вуліцу — ні крокам!
І толькі ў сад — пад вокам!

А каб не зраніў ножкі,
Дык абувала у панчошкі.
Каток раз выбег спазаранку
    На пагулянку.
А сонейка так міла свеціць —
    Гуляюць дзеці!

Сабакі раптам — скок!
Каток на дрэва — гоп!
Дый не ўтрымалі ножкі —
    Абутыя ў панчошкі...
Сабакі ў злосці як напалі,
    Уміг і разарвалі!

*

Так губіць чалавека
    Залішняя апека.

*1966*

## ЖАБЫ

1-я: — Кума, чаго так горла
    Ты цэлу ночку дзёрла?
2-я (скромна): — Спявала я,
    Так як магла —
    Аж салаўя
    Перамагла!
3-я (вясёла): — Гэй, музыка, раз-два —
    Ква-ква, ква-ква!

*

Эй, салавей! Між жабаў жывучы,
    Ты лепш маўчы!

*1967*

## САБАЧАЯ МОВА

Даўно было — (гісторыя дурная!),
А можа́, хто й не знае?

*

Запанавалі цюцькі ў лесе,
Дык у грамадскім інтарэсе
На з'ездзе кажуць: — Нам здаецца,
Што трудна ў лесе зразумецца,
Бо той мычыць,
А той пішчыць...

— Пачнём брахаць сабачай мовай —
Культурнай, ганаровай!

Давай звяры суцэльным строем
І пад сабачым там канвоем —
Хто з радасці, а хто з бяды —
Брахаць і выць на ўсе лады!

Цвярозы хто, а хто ў пахмеллі,
На пахаванні, на вяселлі —
Ад ранняе пасцелі —
Брахалі — аж пацелі!

Хто не брахаў, сабакі-камандзеры
Лупілі па каўнеры:
Закон сабачай тройкі
Рашучы быў і бойкі.

Паўстаў кірмаш смаргонскі,
Гадмідар бабілонскі —
Ажно лясная ўся гармонія
Зышла на какафонію!

Датуль сабакі ўсіх правакавалі,
Пакуль саміх з лясоў прагналі!..

*

Чужая мова, не іначай,
Нам — злосны брэх сабачы,
Калі нахабная апека
Муштруе чалавека!

*1968*

## «КУКУРУЗНІК»

Авечкі раз дзівіліся нямала:
— Ах, парсючок, скуль тваё сала?
Ці на курорце ад'ядаўся,
Ці ў Сінім моры ты купаўся?
А мо ля старшыні хадзіўшы,
Заслугу меў, чым дагадзіўшы? —
Ты ж быў худы, як качарга!..

Парсюк смяяўся: — Га-га-га!
Эх вы, авечкі-бараны,
Я ж не такі, як хто, дурны!
Тут справа — не ў заслузе,
А ў кукурузе...

*

Хто старшага злагодзіць,
Сам сыты ходзіць.

*1969*

## ДЗІВА

Асёл убачыў вярблюда,
Каню смяецца: — Вось брыда!
Няма ні формы, ані складу
І ані спераду, ні ззаду:
Такога, каб я жыў, не бачыў!

І шмат чаго асёл сабачыў...

Адкажа конь: — Ну, мы не знаем,
Каго мы лаем:
Вярблюд наш можа быць якраз
Сто раз
мудрэй ад нас!

— А быў бы пэўна прыгажэйшы,
Каб толькі вушы меў даўжэйшы,
Бо мы з кароткімі вушамі
Не можам стаць асламі!

Асёл казаў (салому глумаў):
— І я так думаў.

*

Смяяцца можна, розум меўшы
І на сябе перш паглядзеўшы.

# Алесь Смаленец

*Алесь Смаленец (Ружанец-Ружанцоў) нарадзіўся ў 1893 г. у Вязьме. Вучыўся на гістарычна-філасофскім факультэце Маскоўскага універсітэта, у Аляксееўскай вайсковай школе. Быў на фронце, ваяваў і на баку «белых» і ў Чырвонай Арміі. У 1920 г. выдаваў часопіс «Варта Бацькаўшчыны». З 1921 г. жыў у Коўне, працаваў бібліёграфам.*

*У 1944 г. выехаў у Германію. Жыў нейкі час у ЗША.*

*Памёр у 1966 г.*

## НА ФОРЦЕ

Спакой і ціш у яго мурах,
Жаўнераў не відаць у мундзірах,
Прабіт жаўнерамі моцны дах,
Вада стаіць у капанірах,
Суніцай параслі пакаты,
Гарэшнік буйны у равах,
Паміж кустоў ржавеюць краты...
Спакой і ціш у яго мурах.

## ПРАД АТАКАЙ

Ўжо празвінела трубкі рытурнэль.
Вушмі крануўшы, задрыжэлі коні.
На штандару чырвоны знак Пагоні
Яскрава свеціць... Трэснула шрапнель.
Прамення слонца заліваюць блоні.
Перад вачмі як быццам акварэль.
Мацней сціскаеш шаблю у далоні
І чуеш, як ляціць яшчэ шрапнель.

## ЗРАННЯ Ў АКОПАХ

Выш не крэсліць самалёт,
Маўчыць шпаркі кулямёт...
Зрання духата ў зямлянцы,
Йду прайсціся па дзялянцы.
Бомбакід глядзіць паважна,
Вартаўнік над ім адважна
Пазірае ў тарчы шчэрбу,
Бачыць зломаную вербу,

Два шкілеты паўспрухнеўшых,
Шмат ракетаў незгарэўшых,
Мінаў, бомбаў... Як іржышча —
Гэта чортава ігрышча.
А з варожага акопа
Выпнуў перыскоп высока,
Падазрэнна косіць вока,
Бачыць — вораг недалёка.
Спяць жаўнеры ў лісіх норах.
Можа, спіць яшчэ і вораг
І як наш жаўнер, так ён
Нейкі радасны сніць сон...

## НА СТАРОЙ ДЗЯЛЯНЦЫ

Куды ні глянь — гарматаў, мінаў шмат,
Акопы, рэйкі ды пячураў лісіх брамы,
На батарэі два лафеты без гармат —
Нямыя сведкі незабытнай драмы.
Адвіснуў дрот. Асыпаўся акоп.
Ў ягоным рве клубком вужакі ўюцца.
Няма людзей... ў чужыне земляробы...
Бог ведае, ці прыйдзецца вярнуцца.

## РАССТРЭЛ

*Ахвярую М. Гарэцкаму*

Мільгнула маланкай ў мазгу: «Я памру!»
Й часам думка ў крывавым віру...
І ў самлеўшае цела так смагла ўткнулі
Свае тварыкі гойстрыя кулі.

І ўпала яно. І пачуліся енкі
Каля цёмнай цаглянае сценкі.

Раптам згаслі ліхтарні...
Задыміў папяросай,
Моцна лаяўся нехта з матросаў...

На снягу чырванела крывавая пляма,
Зачынілась жыццёвая брама.

## ЖОНЦЫ

Ці ўбачу зноў маю любоў,
Ці загарыцца зноў каханне?
Здаецца, што астыла кроў,
Далёка адышло расстанне.

З бязлетнасці з табойраслі,
Плячо з плячом, рука з рукою,
Убожства шляхам разам йшлі,
Дарма чакалі супакою...

Вайной разбурана любоў...
Вайною знішчана каханне...
Ці ж дачакаю цябе зноў
Хоць на апошняе спатканне?

Мо, родная, там без мяне
Ў чужым краі закрыеш вочы?
Ці ж чуеш ты адтуль, ці не,
Як сэрца стыне, ные ўночы?..

*17 ліпеня 1921 г.*

## БУДКА 175

Паміж узгоркаў дзве сталёвых змейкі —
Упоперак іх крэпяць шпалаў рэйкі.
Па бакох высокія стаўбы...
Пераезд. Рагаткі тры са дроту,
Па сцянах сляды шрапнеляў, шроту,—
То сляды мінуўшай барацьбы...
Ой, калісьці тут звінелі пчолы,
Жвава кулямёт страляў вясёлы,
Змагалася ваяцкая сям'я...
А цяпер навокал спее збожжа,
Ля крыніцы чырванее рожа,
Бо крывёй напоена зямля...

# Алесь Змагар

*Алесь Змагар (Яцэвіч) нарадзіўся 1.10.1903 г. у сям'і валаснога фельчара на Случчыне. Скончыў Слуцкую гімназію. У 1920 г. браў удзел у Слуцкім паўстанні. Быў асуджаны на два гады няволі. Неадбыўшы пакарання, уцёк. Скончыў літаратурна-педагагічнае аддзяленне Мінскага педінстытута. Настаўнічаў у Радашковічах.*

*У 1944 г. эмігрыраваў у Аўстрыю. Жыў некаторы час у Францыі. Цяпер жыве ў ЗША.*

*Вершы пачаў пісаць рана. Выдаў зборнік вершаў «Да згоды» (Клійленд, 1962). Піша таксама прозу.*

## БЫВАЙ, РАДЗІМА

Імчыцца цягнік скрозь туманы балот;
Вагоны бягуць чарадою;
Адзаду застаўся купнік і чарот;
А сум?.. Сум няўмольна са мною.

Мінаюць загоны, мінаюць лясы,
Азёраў крыштальныя хвалі...
О, колькі змагання маўклівай красы
Палескія нетры схавалі!

*Цягнік, 1923*

## І НІЯК ЯЕ НЕ РАЗЛЮБІЦЬ

У валошках родная старонка,
Не магу тых кветак я забыць.
Пакахаў я выпадкова Тоньку,
І ніяк яе не разлюбіць.

Думаў я: ўвясну знайду другую,
Ды з вясны да восені адклаў.
Расплялала яна касу густую —
І з тых пор па ёй засумаваў.

Кожну ноч мне сніцца: за альтанкай
Руту-мяту рвём мы да зары...
Салаўіны пошчак сінім ранкам...
Дагараюць зоры-ліхтары...

Зноў сінеюць далі небасхілу,
Пах чаромхі сыплецца з галля,
Зноў хачу хадзіць я толькі з мілай,
Толькі з мілай слухаць салаўя.

Зацвіла радзімая старонка,
Не магу тых кветак я забыць...
Пакахаў я выпадкова Тоньку,
І ніяк яе не разлюбіць.

*1932*

## ШАПАЦІЦЦА

Шапаціцца восень залацістым лістам,
Валавяны хмары гоніць угары.
Паравоз імчыцца з дзікім смехам-свістам
Праз палі, балоты, цераз гушчары.

Кратае, казыча, хіліць вецер вецце,
Гойдае галінкі кашлатых сасён.
Палахліва сыпле жоўтае амецце
Залацісталісты амярцвелы клён.

Стужкамі удалеч распаўзліся сцежкі;
Журавоў у вырай плыве ланцужок;
Міла мне усё тут: імшары, алешнік,
Саламяны стрэшкі, мурагу стажок.

*Лістапад, 1943*

## ШТОДЗЕНЬ

Штодзень чыгункаю вурчаць-пяюць вагоны,
Імчаць няведама куды — удалячынь...
— О, дзікі лёс вайны! Знішчальнік ніў, загонаў!
Спыні свой страшны шал! Хоць момант адпачынь!

## НЕ ЗМАГУ

Жытнёвае поле — валошак краса!
Іскрыць на пялёстках слязінка-раса.
Ільняныя косы з-пад сініх вянкоў
Ў трымценні плывуць, не знаходзячы схоў.

Зялёныя шаты, шаўковая рунь,
І песенны звон, што разліўся угрунь,
І рэчка, і сад, і яловец, багун —
Забыць іх ніколі й нідзе не змагу.

*Васілішкі, 1944*

## І ГАДЫ МІНАЮЦЬ ЗА ГАДАМІ

І гады мінаюць за гадамі...
Палазамі Каляды рыпяць,
Закавала рэчку ланцугамі,
Замяло зямельку саванамі,
Ды калядак нешта не чуваць.

І у гэту сумную часіну
Пазірае Маці у акно:
Ўсё чакае, моліцца па сыну,
Ці жывы яшчэ, ці мо загінуў
Яе любы, родненькі сынок.

*Кліўленд, 1958*

## МРОІ

Восень шуршыць, расцярушвае лісцямі,
Сыпле іржою з бялёсых бяроз;
Зноў я імчуся сном-мроямі йскрыстымі
Ў край серабрыстага зрэб'я і кроз.

* * *

Куды б цябе лёс ні закінуў,
Якім бы ні джаліў асцём,
Сваю дарагую Краіну
Любіць мусіш больш за жыццё.

# Рыгор Крушына

*Рыгор Крушына (Казак) нарадзіўся 3 снежня 1907 г. на Случчыне.*

*У 1944 г. выехаў у Германію. Жыў нейкі час у ЗША.*

*Вершы пачаў пісаць рана. Друкаваўся з 1927 г. Выдаў кнігі паэзіі «Лебедзь чорная» (1947), «Вячорная лірыка» (1963), «Хвіліна роздуму» (1968), «Вясна ўвосень» (1972), «Дарогі» (1974), «Сны і мары» (1976).*

*Памёр у 1979 г.*

* * *

О, слова салодка-хмялёвае,
Схаванае ў думках маіх!
Яно мне абраз вымалёўвае,
Яно мне — святая святых.

Як песня ў царкве велікодная,
Яно урачыста пяе.
Прыроднае, моцнае, роднае
Жыве, паліць вусны мае.

І я на няўдачы жыццёвыя
Гукну веснавую пару.
І слова салодка-хмялёвае
Аж тройчы, як «свят» паўтару:
Беларусь!
Беларусь!
Беларусь!

## АПОШНЯЯ РОСТАНЬ

Сумны ўспамінаецца абразок.
Наша ростань. Раніца і вазок.
І суседзі сельскія, і радня,
і мой дзядзька з лейцамі ля каня.

Сена лугавое у вазку
пахне зялянінаю хмызняку.
І дармо пад ботамі снег хрумсціць,
чорны грак з турботамі ўжо ляціць.

Пачынае пукацца вербалоз.
У далёкім грукаце рух калёс.
Гора палыновае да мяне
новае, вясковае завіне.

Смагай боль выраствае. I ў бядзе
у апошняй ростані аж гудзе.
На хурманцы досвітак назнарок,
каб упіцца ўдосытак, цэдзіць сок.

Перадвесняй дыхаю, п'ю імжу.
Урачыстасць ціхая. I — кажу:
— Я вярнуся, родная, ў гэты край
у пару пагодную. Ты чакай...

Дзядзька лейцы кратае — рве каня.
Вее перад хатаю цеплыня.
Там ты з хусткай белаю у руцэ,
із слязой знямелаю на шчацэ.

## АДВЯЧОРКАМ

Горад смуткам ціспе мае плечы,
плача вецер. Горкі вецер свішча.
Адвячоркам чую голас нейчы
між руінаў там, дзе папялішча.

Гэта ціхі лямант беднай маці
па сынох, што гінуць дзесьці ў свеце,
па разбуранай вайною хаце,
па святыні, кінутай у смецце.

На дзядзінцы — чортава ігрышча,
А з выгнанцам ходзіць цень галечы.
Плача вецер. Горкі вецер свішча.
Горад смуткам ціспе мае плечы.

## ДА ЦЯБЕ, ДАРАГАЯ

Дзень нахмурыўся, плача і жаліцца.
Родзіць смутак. Сляза на акне.
Чую — маці пяшчотнымі пальцамі
Ціха, прывідна лашчыць мяне.

Сэрцу мірсціцца даўнае, роднае!
Толькі боль узрастае ўдвая:
За паўсветам, за далеччу воднаю
Ты гаруеш, матуля мая.

Душыць крыўда... Ніякімі лекамі
Не загоіцца смутак душы.
Заспявай нашы песні, як некалі,
І за сына малітву скажы.

Акіянскія горка-салоныя,
Перамераўшы мілі, вятры
Прынясуць твае словы ў зялёныя
На ўзбярэжжы сюды — гушчары.

І як толькі ізноў распагодзіцца,
Я паеду за горад і там,
У кляновых прысадах ваколіцы,
Тваё гора ссяку напалам.

На гадзіну пазбаўлюся негадзі
Адзіноцтва, тугі і турбот...
Паплывуць мае думкі, як лебедзі,
Да цябе, дарагая, на ўсход.

## УСЮДЫ ДАРОГІ

Усюды дарогі, дарогі, дарогі...
Бяздомны вандроўнік не мае прыпынку.
Чужыя пад'езды, чужыя парогі,
І голас уяўны: — Ці вернешся, сынку?

Дарогі каберцам ляглі на даліны,
На стэпы, пустэчы, на горныя лукі.
Дарогі даюць дарагія хвіліны
Шчаслівай сустрэчы і горкай разлукі.

Мой дух неспакойны, упарты, палётны
Імкнецца ў нязнаныя пушчы і нетры.
Вунь сцелюцца роўна асфальту палотны,
Тут — рэйкі чыгунак, там — трасы
ў паветры.

Я сёння ў Мадрыдзе, а заўтра ў Нью-Йорку.
Пакіну пачуцці па добрых краінах.
Ёсць песні на ўзмор'і, узлессі, узгорку,
Гучаць на пясках, на ссівелых руінах.

А ўсё ж наймілейшая песня, што зроду
Я чуў ад бацькоў, і я ў тым прызнаюся:
Яна не сціхае на вуснах народу
Маёй сэрцагрэйнай жывой Беларусі.

Не сціхне яна і ў далёкай дарозе.
Я буду спяваць, падбіраючы словы.
Мне цёпла ў паэзіі, холадна ў прозе
І горача ў гомане роднае мовы.

Па свеце праменнем кладуцца дарогі,
Расце хараство на зямлі і на моры.
І я ў падарожжы не маю знямогі,
У працы штодзённай не ведаю зморы.

Радкі на паперы — таксама дарогі,
На іх непрыкметна губляюцца сілы.
Парадак жыцця непахісны і строгі.
Дарога апошняя — шлях да магілы.

І згадка міжвольная: бацькава хата,
Гародчык з півоняй, гарошкам і макам.
Усё гэтак міла, так ласкі багата,
І слуцкая бэра прынаджвае смакам.

У сэрцы хаваючы жаль і трывогу,
Кажу суцяшальна сабе я самому:
— Бяду пераэкыў. Уцалеў, дзякуй Богу.
А можа, дарога спрастуе дадому.

## КАТРЫНКА

З білецікамі скрынка,
На скрынцы папугай.
Асіплая катрынка
Замоўкла, і няхай.

Яна ішла з журбою,
З птушынай буркатнёй.
А дзеці ўслед гурбою
Падскоквалі за ёй.

«Разлуку» напявала,
А добрая рука
Капейку апускала
У шапку жабрака.

І лёс усім з паўторам
Выцягваў папугай:
«Уцеха разам з горам,
Шляхі ў далёкі край».

Мы весела, забаўна
Смяяліся тады.
У роднай хаце спраўна,
Нямашака бяды...

Ды енчыла катрынка,
Стагнала недарма.
І чэрствая скарынка,
І слёзная зіма.

І край чужы, далёкі,
І ўцеха, і спадзеў.
Я сам — цяжкія крокі —
Сваю катрынку ўздзеў.

Праходжу бераг мора
І млявых піхтаў гай.
Няўжо разлуку й гора
Прарочыў папугай?

Няўжо і мне бадзяцца,
Не мець свайго кута?
Нярадасная праца,
І на душы слата.

І сонца смаліць люта,
На вуснах сохне соль.
З табой ідзе пакута
Ў спякоту, холад, золь.

Пакута — сэрцу мука,
Галосіць і яна:
— Разлука ты, разлука,
Чужая старана.

## У ЗАСМУЧАНЫХ ЭМОЦЫЯХ

Сабе дарогу песняй сцелючы,
Шукаю родныя мелодыі.
Уражанне з Нью-Йоркскай велічы
Расце, а лірай не валодае.

Не, не натхніць мяне шум вуліцы,
Сабвэю бразганне зялезнае!
Мур-камяніца ў неба сунецца,
Як тая вежа велічэзная.

Ад ста паверхаў вокны волата
Схапілі сонечнае полымя.
А ці ў душы маёй, як золата,
Зайграе іскрамі вясёлымі?

Туга па Бацькаўшчыне моцная,
Найбольшая ад гэтай велічы.
Іду ў засмучаных эмоцыях,
Сабе дарогу песняй сцелючы.

## ПАСЛЯ ПРАЦЫ

Халодным жвірам
Нікне думак жменя.
Пясок і цэгла.
Шум і мітусня.

Жыццё камечыцца
Паміж таго камення,
Фабрычным дымам
Копціцца штодня.
На голым урбанізме
Лірыка не можа
Прыгожа,
Пышна
Краскаю цвісці.
Дзе сінь, зяленіва —
Маё там падарожжа.
А пасля працы
Ў парк люблю зайсці.
Раскошны парк —
Мой адпачынак у Нью-Йорку
Ад пекла скрыгату,
Ад пылу і смяцця.
Цішком
Гарэшкамі
Гарэзную вавёрку
Я пачастую
Ўсцешна, як дзіця.
Дзівосным марай
Яву агарну:
Я ў лесе!
З куста звярок
Даверліва зірне.
Паўстануць дні маленства
З гоманам Палесся,
Да песняў абуджаючы мяне.
Пасля,
Увечары,
Калі ў пакоі ціха,
Як згасне дзённы грукат
За акном,—
Ізноў паэзія
Пачне співаць і дыхаць
У снох маіх
Каханнем,
Прыгаством.

## БЕЛАЯ НЯВІННАСЦЬ

Была вясна. Былі заручыны.
І каля весніцаў спатканні.
І ўсё было вязьмом закручана,
Пагляд, усмешка і прызнанні.

Язмін і дзеўчына. Нявінныя...
Салодка вохныя і ў белым.
Навошта гэтыя ўспаміны я
спяваю часам агрубелым?

Навошта мучыцца пачуццямі
высокіх чыстых парыванняў?
Маю душу закаламуцілі,
звягае старасць на выгнанні.

Стаптаць прыгожае і добрае,
сябе самога знеахвоціць.
Паўзе з закуцця, ўецца кобраю
нянавісць, чорнае страхоцце.

І разяўляе пашчу шырака,
і сык чуцён з багновай тхлані:
— Нам не патрэбна Ваша лірыка
пра вёсны, кветкі і каханне...

Дармо! Спяваю і не слухаю
пустых гамзатых ламантацый.
Хачу, падбіты завірухаю,
часінку радасна смяяцца.

Пайду ў мой кветнік, абмінаючы
балота, заразлі калючак.
Люблю я сонца, шыр і далечы,
люблю я слова так балюча.

Яго шліфую, перасоўваю
з радка ў радок дзеля парадку.
Ізноў гарыць півонь пунсовая,
цвітуць настуркі, мак і браткі.

Із гэтых кветак водар выстаяў
гаючы подых Беларусі.
Яна жыве, мая квяцістая,
у жалю матчыным, у скрусе.

Жаданы час надыдзе. Здзейсніцца.
Хай не са мной, а з маім сынам.
Стаяцьме зноў ля родных весніцаў
былая белая нявіннасць.

## ГЭТАК ЧАСТА...

Калі я адзін,
гэтак часта бывае,
з мінулых гадзін
Менск зазвоніць трамваем.
У гэту пару
так няўтульна ў пакоі.
Сабе і пяру
не даю супакою.
Крычыць аўтабус
і падземка грукоча.
І грукат угруз
у бяссонныя ночы.
У сэрцы ляжыць
неўгамоннае гора.
Не Менск, а чужы
хмарачэплівы горад.
Кладзецца на брук
пыл, як цвіль на скарынку.
І гусь, і вяпрук
нежывыя на рынку.
І смягне трава
ў глухім панадворку.
І нельга трываць,
як пачуеш гаворку
сваіх землякоў.
Мроя ўспыхне і сніцца:
палеская зноў
выбягае крыніца.
Кусты і блакіт —
зеляніна і неба.
Замовы ракіт
нáд суглінiстай глебай.
Балота. Трысцё.
І праз поле гасцінец...

Ну як пачуццё
заглушыць і адкінуць?
І хочу я, ледзь
не пазбаўлены веры,
у прышлае мець
незамкнёныя дзверы.

## ЗДАНЬ ВЯСНЫ

Восень точыцца тугой.
Дзе ж вясна былая?
Мне сляза густой імглой
Вочы засцілае.

Я скрозь вэлюм вадзяны
Бачу твар вясёлы.
Гэта ты — яе здань вясны...
Пахнуць мацыёлы.

На блакітны мокры змрок
Падае праменне.
У цябе, як назнарок,
Белае адзенне

Засвяцілася здалёк.
Я кажу Марыльцы:
— Ты ляціш, як матылёк.
Парасонік — крыльцы.

Гэта толькі здань вясны,
Вечар мацыёлаў,
Пах садовы і лясны,
Сны далёкіх сёлаў.

## НАСТАЛЬГІЯ

Сонца, мора і слова ласкавае —
І я чуюся моцным, здаровым.
Толькі мроя ў далёкае плавае,
Усміхаецца рэкам, дубровам.

І ля пушчы ўстае Белай вежаю,
Як маяк. Ці спакойна з гарэннем?
Можа, лёс пройдзе сцежкай мядзведжаю
І сваіх, дарагіх, не сустрэнем.

Я абвеяны цёплымі крозамі;
Я ў мінулым — на бацькавым полі.
І гамоняць дарогі бярозамі,
І смуткуюць сухія таполі.

Мроя-думка ў далёкае плавае,
Усміхаецца рэкам, дубровам.
Там, за той пагранічнай заставаю,
Праспяваць не даюць маім словам.

А няўжо вольны шлях перасечаны?
Пілігрымам да прошчы імкнуся,
Да сівых курганоў старасветчыны,
Да зямлі, што завуць Беларусяй.

## ЗГАДКА

Строгі горад, страшны Бабілён
Не згасіў гарачага натхнення.
Спомніў тую восень... Бабы лён
Білі і трапалі ў загуменні.

Жвавы рух дзявочых рук, грудзей
Ляскаталі пранікі і сэрцы.
Час ішоў, як добры чарадзей...
Чар былога замстаю не сцерці.

Сяння гумнаў сеннае цяпло
Захаваў я песняю сваёю.
Акіянам поле праплыло
І прапахла свежаю раллёю.

Мілы вобраз радасна узнік,
Бо заўсёды роднае наўвеце:
Хата, пуня, хлеўчык і дарнік,
Барана і збруя пад навецяй.

І твая усмешка, і твой спеў,
Свята маладосці і размовы.
Мне шкада, табе я не паспеў
Выказаць затоеныя словы.

## РОДНЫЯ ГУКІ

Зноў абуджаюцца родныя гукі,
Я не самотны — натхненне са мной.
Думка трывожная ў часе разлукі
Цягнецца звонкай іграной струной.

Слова, што ўладна і ладна ўплялося
Ў лёс мой, жыццё і пачуцці мае,—
Як на палёх пад вятрамі калоссе,
Бурнаю хваляю сёння ўстае.

Слова спявае. Палае.Чаруе.
Матчын запеў — несуцішны — у ім.
Я пазнаю гэту праўду старую.
Свет, цэлы свет б'ецца ў сэрцы маім.

Хочацца добрае ў песню укласці!
Я перажыў колькі светлых гадзін.
Слова мяне ратавала ў няшчасці
І суцяшала, што я не адзін.

Зноў я праходжу праз творчыя мукі,
І зацвітаю вішнёвай вясной.
І абуджаюцца родныя гукі...
Я не самотны, бо слова са мной.

## ПРЫСАДАМІ

Паклон дарожанькам бясконцым.
Прайду я трохі пехатой.
Прыемна пахне цветам, сонцам.
Лугі ў духмянасці густой.

А прыдарожныя таполі
Паклалі цені на траву.
Пшаніца ціха шэпча ў полі,
Што я валошкі не сарву.

Іду. Ніхто не зневажае,
Не ганьбіць лаянкай ніхто.
Спякота ўпартая, чужая,
З мяне здымае паліто.

Я не шукаю тут падтрымкі,
Сустрэчны вецер — песні сват
Бярэ мяне ў свае абдымкі
І цягне лёгка ў цень прысад.

І сяду я на белы камень,
Каб адпачыць, пасля ізноў
Ісці, ісці ў жывым блуканні
Да лепшых мрой, да лепшых сноў.

## А ТУТ ІНАКШ

У нас быў снег, калядны снег,
Завейны і пагодны.
Ляпілі дзеда. Санкі. Смех.
Сняжкі. І гоман родны.

І ў белых шапках хата й сад,
І снежныя натрусы
На ўсіх кустох. Вось акурат —
У палатне індусы.

А вецер дрэвы ў лесе трос,
Ігліцы хвояў шкрабаў,
І тонкае галлё бяроз,
І медзь дубоў і грабаў.

Ды матылькамі снег ляцеў
І падаў белы, белы...
А тут інакш. Тут сонца, спеў
І кіпарыс зямелы.

Ні снегу, ні завей няма,
Ні глебы з лісцем прэлым.
Стаіць зялёная зіма,
І толькі людзі ў белым.

## ПРЫДАРОЖНЫ КУСТ

Хіба я здарожаны,
Зморамы, знясілены?
Не!
Песняй патрывожаны,
Шэпча куст пахілены
Мне.

Вуснамі зялёнымі —
Шумнаю лістотаю
Куст
Шэпча мне з паклонамі:
— Захавай жа цнотаю
Густ.

Хай хутчэй мадэрнае,
А старое з плесняю
Хай!
Хараство нязмернае...
Дык заходзь ты з песняю
Ў гай —

У сасновы гай,
Як у родны край.

## ХАТНІ СЫР

Край малочны. Дабрыня!
Еў сыры я ў Амстэрдаме.
Хатні сыр ім не раўня,
А яго хацеў бы я...
Мы даўней рабілі самі.

У гліняных гладышох
Малако за дзень скісала.
А пад бэлькай у клінкох
Сыр бурштынам цвёрдым сох,
Ён не кроіўся, як сала.
Сыр крышылі секачом
На кавалкі, на драбочкі.
Той, галандскі, на вачох
Нарадзіўся галышом,—
Гэты выняты з сарочкі,
З палатнянага клінка.
Ён крыху саланаваты.
Клапатлівая рука
Прыкладала да сырка
Смак прыемны роднай хаты.

Што за сыр! Грызі грызьма!
Тут, шкада, яго няма.

* * *

Мастацкае слова,
Маўлянае міла —
Ад ліха замова,
Чароўная сіла.
А з роднае мовы —
Гаючае слова:

Як росы на травы,
Як сонца на пляжы,
Як позірк ласкавы.
Нядолю развяжа
Магутнае слова,
Уцешнае слова.

Я чую размову
І подых вясновы,
І цёплыя словы:
Бывайце здаровы!
...Кладзецца ў аснову
Мастацкае слова.

* * *

У Слуцку смачныя ігрушы!
Я гэтай згадкаю парушыў
Твой спакой і мой.

Бергамоты, сапяжанкі,
Маляванкі, і смалянкі,
І паненкі, і цукроўкі,
І вінёўкі, і хунтоўкі,
і яшчэ далікатэсы —
Бэры слуцкія, дзюшэсы
У красе нямой.

Ну, а яблыкі! Жытнёўкі,
І апорты, і мядоўкі,
І ранеты-наліванкі,
Манастыркі і цыганкі...
Ды антонаўкі якія!
Сакавітыя, важкія
Ў спелі залатой.

Прыгадаю я ўсё гэта,
Як прыгожы верш паэта,
Як твой першы пацалунак,
І апошні пачастунак,
І як вечар той.

* * *

Пад акном стокрылы клён,
Родны дом, як мілы сон.
Слёзы цісне успамін,
У грудзёх кляновы клін.

Не магу ўсхапіцца ўраз,
Чорны смутак закружыў.
На святы гляджу абраз...
О, Ісус мой на крыжы!

Божа, верыць памажы!
Цуд зрабі, зламі ўсё зло,
Каб дабро не ў міражы,
А ў мой край мяне вязло.

Каб жа там ды пад акном
Мне шумеў стокрылы клён.
Чую я: самотны, ён
Кліча нас у родны дом.

# Хведар Ільяшэвіч

*Хведар Ільяшэвіч нарадзіўся 17 сакавіка 1910 г. у Вільні ў сям'і паштальёна. Закончыў Віленскую беларускую гімназію, гістарычны факультэт Віленскага універсітэта. Абараніў дысертацыю «Друкарня дому Мамонічаў у Вільні (1572—1622)».*

*У час вайны быў рэдактарам газеты «Новая дарога» (Беласток).*

*У 1944 г. выехаў у Германію, дзе і загінуў у 1948 г. у аўтамабільнай аварыі.*

*Друкаваўся ў розных заходне-беларускіх выданнях: «Калоссі», «Маладой Беларусі» і ў інш. Выдаў тры кнігі сваіх вершаў, крытыкабіяграфічны нарыс «Ядвігін Ш.», зборнік апавяданняў пад псеўданімам М. Дальны.*

* * *

Даўгая астрожная ноч,
Здаецца, яна без канца,
І думак не ў моч перамоч —
Наўкол цішыня, цішыня...
Прыснілась мне вёска, рад хат...
І, змучаны працай цяжкой,
Я соладка піў арамат
Прасторных, радзімых палёў.
Над грэбляй (на схіле нябёс)
Чароўная зорка ўзышла...
Скрыпеў, запазніўшыся, воз...
Усюды звінела журба...
Цяпер у астрозе без сіл
Я ўспомніў мінулыя дні,
І ў сэрцы бунтарскі прыліў
Мне думку падаў аб жыцці...

*Лукішкі, 22.VI.1928*

* * *

Чуе сэрца, што не многа
Буду я на свеце жыць...
Хутка скончыцца дарога,
Засталось не шмат прайсці...
Я хацеў бы зноў радзіцца,
Зноў цярпець за родны край...
Каб мне сонейку маліцца —
Не хачу у светлы рай!
Як памру, у сіняй ночы
Загарацца дзве зары —
Гэта будуць мае вочы
Сумаваці па зямлі...

*22.VI. 1928*

* * *

Годзе песні пяяць аб нудзе!
Сэрца бунтам б'е у кажух...
Па краіне ідзе — гудзе
Весназвонны, магутны рух...
Песня!
Песня бунтарна-гулкая!
Вырвіся з бледных, спрагненых губ...
Грымні па бруку... вулкамі
Гулам тысячных труб!

*1929*

* * *

Хмары чорныя звіслі над намі —
Яшчэ ўчора гучаў Веснаход...
Гэй, сябры! Смела ў бой з перунамі!
Ўспыхне заўтра іншы ўсход!

Гэты цень, што спусціўся ад хмараў,
Згіне з першай касуляй святла!
І асвецяцца нашыя твары
Сонцаззяннем чароўнага дня.

*1929*

* * *

Беларусь ты мая расспяваная!
(Нібы ў песнях ты толькі і ёсць...)
Я прыходжу к табе, о, каханая,
Сын вясны, нібы новы госць...

Нашы песні — не песні: смутніцы —
Сытым выкіну я цераз плот;
Клічам тым, як вясной навальніцы,
Прывітаю я бедны народ...

Беларусь! Прыбірайся у краскі,
Ў песні бурнай і гучнай вясны!
Мы збудуем цябе, як у казцы,
Светлай, яснай, як нашыя сны!

* * *

Вуліцы! Вуліцы! Вуліцы!
Тыя, што давалі мне рытм...
Я хачу сягоння расчуліцца,
Бо ўспомніў вас, быццам міт.
Доўга вас не бачыў замкнёны,
Доўга марыў, марыў я;
Сніліся мне шумы і звоны,
Паводка электрычнага святла...

Сягоння быў шчасцем абліты я...
Шчасце — лебядзіны пух...
Бачыў вулкі, калі з паліцыяй
Йшоў па бруку, скаваны ў ланцуг.

*Лукішкі, 1929 г.*

* * *

Па вёсках Беларусі
сялянскі едзе воз...
На ім труна ў дзярузе,
ў труне той — поўна слёз...
Ляжыць на веку ліра —
ў ёй струнаў цэлы рад —
Галосяць яны шчыра
на нашаніўскі лад.
Выходзяць людзі гурмам
і жаласна глядзяць —
А гэты воз хаўтурны
здалёк усё чуваць...

* * *

Колерам ціхае роспачы
кветкі ў садзе ўміраюць —
Там — за акном — яны,
просячы сонца і свету —
пад ветрам
сумна у шыбы ўдараюць.
Чую я, чую, як жаласна
жаляцца кветкі прад смерцю...
Ўсё так цвіло і змагалася —
ласкамі лета сагрэтае —
каб у бяссіллі памерці.
Дзе вы, надзеі вясеннія,
дзе вы, вясны маёй кветкі?
Ветры навокал асеннія,
сэрца без свету — прывету
сумам агорнута гэткім...

* * *

Кладуцца па бруку і сценах
Вячэрнія фарбы гусцей.
З двароў — дзе заснулі ўжо цені —
Даносяцца крыкі дзяцей.
З акон хутка клікнуць іх маткі,
І ўсе яны пойдуць дамоў —
Напіўшыся цёплай гарбаткі,
Атуляцца казкамі сноў.
І будуць чароўныя феі
Сплятаць серабрыстую ніць,
А цёмных двароў чарадзеі
Збяруцца ім казку тварыць.
Праз горкія слёзы я бачу —
Як быццам у казачным сне:
На ноч туліць ласкай гарачай
Каханая мама мяне.

* * *

Зацвітай, родны край, зацвітай!
Гінуць годзе ў завеі і сцюжы!
Хай далінамі сонечны май
Ўспалымнее агнямі ружаў!
Ў тваіх песнях — нядолі іржа —
Уздыхні ж песняй новай, вясёлай!
Раздавайся юнацкі наш шаг
Па дарогах радзімых сёлаў!
З моцнай верай у лепшыя дні
Беларускую даль ускалосім —
Ў электрычным скупаем агні
Твае постаці цёмных вёсак.
І на шыбах заплеснеўшых хат
Сядзе радасць вясёлкай ірдзістай.
У паходны расходзьцеся тахт
Пераборы рукі цымбаліста!
Зацвітай, родны край, зацвітай,
Гінуць годзе ў завеі і сцюжы!
Хай далінамі сонечны май
Ўспалымнее агнямі ружаў!

*1936*

* * *

Цягнікі і станцыі —
У шыбы — сонца сполахі —
Родная краіна —
ты плывеш-плывеш —
Поле —
апяянае Купалам і Коласам —
Паясамі слуцкімі сцелецца ў бязмеж —
У гэтай далі сонечнай
Каласамі спелымі —
Сінім летнім вечарам ціха шапацець —
Па шляхох бярозы шэрацню замляцца
Падаючай зоркай —
бліснe семафор —
Вечар навявае сэнс дзіўной загадцы

У блакітным тумане пацеркамі зор —
Еду —
        еду —
                еду —
Цішыня навокал —
Толькі ў сэрцы п'яна —
                звонкі перапуд —
Толькі заграхоча —
                то замрэ — далёка —
Перагонка колаў — развясёлы груд.

* * *

Ноч ужо.
Я не сплю.
Не кладуся.
Белы месяц праплыў даўно
Ў мітуслівых дум завірусе,
Не засну я спакойным сном.
Ўспамінаю.
Розныя твары
Выплываюць з мінуўшчыны дна.
Часта мы аб нечым марым,
Што ў жыцці было...
                                як вясна.
Дні насталі ўжо вясеннія.
Ноччу — намаразі серабро,
Мо таму караблі — летуценні
Паплылі кудысь уразброд.
Раззвінелася сэрца трывогай.
Чую нейкі на вуліцы крок...
Як прыемна ў хвіліну знямогі
Лавіць з станцыі свіст — гудок.
Ноч ужо.
Я не сплю.
Не кладуся.
Белы месяц праплыў даўно.
Ў мітуслівых дум завірусе
Чую нейкі крык за акном.

*1935*

## РАСШУМЕЛІСЯ ВЕТРЫ...

Расшумеліся ветры на прасторы у полі,
На прасторы у полі, ў цёмным лесе-бары.
Разрываюцца хмары ў безбярэжжы — прыволлі,
Ў гэтай далі — бязмежжы балатоў, азярын.
На ўскалошаным полі, на прасторы шырокім
Упаду на зямлю я, упаду проста ніц,—
Паплыву ў хвалях шуму з-пад палёў беластоцкіх
Да дняпроўскіх лугоў, аж да слуцкіх пшаніц.
Мо мне вецер раскажа, як у гэтых зарэччах
Рассыпаў нехта слёзы і у змрок галасіў.
Мне так часта здаецца у жаўцеючы вечар,
Што каменне на полі — гэта жнеі без сіл.
Распляліся іх косы і апалі прыгожа,
Вецер з рук абамлелых не развеяў ім сны,
І яшчэ замірае спеў працяжны на пожні
З тых гадоў, калі ў жыце упалі яны.
Мо мне вецер раскажа, як у гэтых зарэччах
Беларуская доля зацвітала не раз,
Як адлівам пажараў над аўсамі, над грэчкай
Цёмнай ноччу займалася, палымнела зара.
Расшумеліся ветры на прасторы у полі,
На прасторы у полі, ў цёмным лесе-бары.
Зацвітала не раз беларуская доля
Ў гэтай далі бязмежнай балатоў, азярын.
Столькі раніцаў мглістых, столькі восеняў шэрых,
Ў нашых песнях іржавіць жаўталісцем сухім.
Галасамі вясёлымі з берага ў бераг
Скалыхнем аж да сіні веснавой небасхіл.
Трэба ў ветру парывах настроіць нам гуслі,
У жытох яго буйную волю скасіць.
З-пад палёў, дзе дым сцелюць Беласток і Супрасль,
Аж да слуцкіх пшаніцаў калоссе шуміць.

*13.VIII.1938*

## ДЗЕНЬ ПАВІС ШЭРАЙ ХУСТКАЙ

Дзень павіс шэрай хусткай па плоце —
ой, у полі мгляно, мгляно —
ў вёсцы нават ніхто не малоціць —
дождж іміжой шалясціць у акно.

Дзе ні глянь — адно возера белі,
быццам недзе мой край патануў...
Цяжка так неадрыўна кудзеліць —
выглядаць у тумане вясну.

Можа, хлопцы, не гэтак вам сумна
у няскошанай мерці глушы —
часам певень ці конь каля гумнаў
вас, буянаў, да слёз рассмяшыць.

Але мне не да смеху сягоння —
гэты дзень мне ўсё нешта чаўпе —
у барку, у прыборку зялёным
восень тчэ свае кросны цяпер.

Навучыцца б у вас, мае братцы,
замяніць ды у панцыр кажух!
Толькі сэрца не хоча суняцца,
а чаму? — я і сам не скажу.

## ЦЫМБАЛЫ

Тады — я памятаю — ў вуліцах аквечаных
ішлі ў сярмягах вы, ў святочны дзень якраз.
Ніхто не згатаваў вам гучнае сустрэчы,
ніхто не кінуў нават кветкаю у вас.
І з пальцаў вашых анясмеленых
Цымбалаў ураджайных хмель
і скрыпак сон рабінавы не ўспеніўся вяселлем
і не буяніў брук, як хлопцы ў сяле.
Віно вясковае ў струнах зачараваных
вы паняслі назад пад крык хрыплівых труб,
у беларускія шумлівыя дубровы,
дзе разлівае рэха нашых струн тугу.
Зарана вы прыйшлі. Над роднымі загонамі
не ссыпаўся яшчэ нядолі жоўты ліст,
яшчэ ўсё сумным тонам ў лесе у сасновым
хтось плача, як калісь...
Зарана вы прыйшлі.
Як пойдзем з тварамі сур'ёзнымі
ў расплаўленую песняй звонкай даль —
развесім сонца мы над кажнаю бярозай,

раззвонім струны аж да снежных Альп.
Ўрачыста панясём цымбалы мнагазвонныя,
затопім жудзь вякоў у пене струн,
і будуць слухаць з падпёртай галавою
усе народы нашую ігру.
Я памятаю, як цяпер — у вуліцах аквечаных
ніхто вас не спаткаў, не кінуў кветку нат...
Віно вясковае на пахудалых плечах
ў напеўныя дубровы вы паняслі назад.

## НЕХТА СТАЎ ЗА АКНОМ І МАЎЧЫЦЬ

За акном дробны дождж шалясціць.
І здаецца, што з клёнаў і ліпаў
ападаюць з журбою лісты
пад акорды асенніх іскрыпак.

Так хочацца верыць чамусь,
што сярпы ў палёх адзвінелі,
і жніўнёвая ўжо Беларусь
адцвіла у кустох счырванелых...

Мо таму абарваўся напеў,
і журбою туманяцца вочы...
Недаканчаны верш аб вясне —
недаснёныя сны апаўночы...

Нехта стаў за акном і маўчыць,
толькі дождж ціхі шорах рассыпаў.
Ападаюць з журбою лісты
пад акорды асенніх іскрыпак.

* * *

Ашалелы вецер на прасторы свішча,
строіць вецце дрэваў на мінор кляшторны.
А у сэрцы нешта холадна і ўсцішна,
і на вуснах толькі ўсмешкі сумнай горыч.

Доўга мне не спіцца унячы чамусьці,
слухаю вятругі дзікую кадрылю.
І здаецца, быццам ў непагоды вусціш
чую шопат цёткі маёй Даміпілі.

Ўкленкнуўшы, схіляе яна стан свой тонкі,
і шасцяць у хаце слоўныя санеты,
быццам Дамініля гортае балонкі
кнігі старадаўнай у пацёмках гэтых.

Доўга яна шэпча нейкія замовы,
адганяе страхі, памінае продкаў.
Заміраюць цені ў покуці сасновай,
засынаю ціха я пад шапот цёткі.

Ды ніяк не ўспомню тых замоваў складу,
што ў мінорах дрэваў шорахам уторацць.
Мо таму завяла непажатай радасць,
і на вуснах толькі ўсмешкі сумнай горыч.

## СЯБРАМ

Асенні шторм. Чужы мне лістапад.
Лісцё мяце паўночны вецер.
Маўкліва я сяджу.
Каб глянуў хто —
ахінуты ў анучыны жабрак.
. . . . . . . . . . . . . .

Дзе вы, сябры?
Я вам, няведамым сябрам,
даўно пішу, складаю гэты верш,
складаю днямі і начамі.
. . . . . . . . . . . . . .

Ніхто рукі не сцісне, не скажа
слова пацехі.
Ці згіну дзе ў дарозе —
ці замерзну як сабака,
завыўшы ў зорнасць неба?

...Пуста і холадна.
Дождж і вецер.
Ці чуеце вы мой голас?
Ціха. Ноч. Паўночны шторм.
. . . . . . . . . . . .

Але я упарты,
але я смяюся...
Усё для лепшай долі
нашай Беларусі.

# Уладзімір Дудзіцкі

*Уладзімір Дудзіцкі (Гуцька) нарадзіўся 8 студзеня 1911 г. на Чэрвеньшчыне. Вучыўся ў Мінскім педтэхнікуме. У 1933 г. быў арыштаваны, адбыў тры гады ў сталінскіх лагерах (Навасібірск, Марыінск) і год высылкі ў Казахстане.*

*У 1944 г. выехаў у Германію. Жыў некаторы час у ЗША, потым — у Венесуэле.*

*Вершы пачаў пісаць яшчэ да вайны. Друкаваўся ў часопісе «Новы шлях», у газетах «Раніца», «Новая дарога», «Голас вёскі» і ў эміграцкіх выданнях.*

## НА ПАРОЗЕ ТУРМЫ

Не ўкраў, не знявечыў нікога,
Толькі тое у думках было,
Каб пароду пакутнага скогат
Уняць лекамі дум і слоў.

Не ўняў, не суняў і не сцішыў...
Скогат іншага сэрца кране.
Заўтра, пэўна, вятры закалышуць
На чужыне нялюбай мяне.

## А РАТУНКУ НЕ БЫЛО Й НЯМА

Неба колер хмары ўслалі густа,
цемень ціспе долу...
Цішыня.
Белы свет змярцвеў
і стаўся пусткай
небывалай.
Рук не ў стане ўзняць.

Чую плач,
вар'яцкі, дзікі рогат,
а ратунку не было й няма...
За плячмі —
этапная дарога,
прад вачмі —
пякельная турма.

І бязлістая, сівая восень,
і пакутная, як пекла, ноч —
мне ў часіну гэтую здалося —
пазычаюць здраду праз акно.

Скамянела,
сцішылася сэрца.
Кроплі слёз...
Няўжо тут цярпення боль прарвецца,
Няўжо тут смерць сваю прыму?

## ПАКУЛЬ ПЕСНЯ ЯШЧЭ НЕ СПЕТА

Не пытайся, мой любы дружа,
Як жывецца у краі гэтым...
Спадзяюся як-небудзь здужаць
у няволі йшчэ гэта лета.

Смутак кволай душы, часіну,
што звязалі мне крыллі-рукі,
не заломіш на пень асіны,
хоць згінайся ад болю крукам.

Цела ные пякучым болем
і так месяц ужо каторы,
а штодня ўсё мацней і болей
зацiскаецца вузел гора.

Па-над пусткай паўночны вецер
не сціхае, шалее люта.
І здаецца: на цэлым свеце
Смех і радасць змагла пакута.

Ды няхай яно так ці йначай —
гэтым ліст мой цябе не здзівіць.
Я хацеў бы сяброў пабачыць,
што са мной па грыбы хадзілі.

Кажнай ночы ў снох бачу лета,
чую шумы палёў аўсяных,

імі гора і туга апеты,
імі ж сэрца жыве і сяння.

Не пытайся, мой любы дружа,
Як жывецца у краі гэтым...
Буду несці у сэрцы мужнасць,
пакуль песня яшчэ не спета.

## БЛАКІТ ВАЧЭЙ

Усмешкай сэрца мне параніў
Блакіт вачэй тваіх дзявочых.
Навошта сэрцу, скажы, раны...
Каханнем жыць якое хоча?

Блакіт вачэй тваіх дзявочых
Сустрэў дрыжаннем струнаў сэрца,
З тае пары і ўдзень і ўночы
Яно к грудзям тваім ірвецца,

Ірвецца, мкнецца да спагады,
Цяпла, знябытае дагэтуль,
Каб вечна дружба была й радасць
Сардэчнай шчырасцю сагрэта.

Таму і сэрца мне параніў
Блакіт вачэй, вачэй дзявочых.
Загояць, веру, сэрца раны
Каханне моцнае і вочы.

## ЖЫВІ

Час кароткі мне векам здаўся,
І табе — не жыццё, а мукі.
Дык жыві, як калісьці, слаўся...
Я ад сэрца пацісну рукі.

## ГАДЫ КРЫЛАТЫЯ

Гады крылатыя,
юнацкія гады,
як зыбкі цень, мільгнулі
і — не стала...
Гавораць мне,
што я немалады,
што ўжо даўно сустрэла мяне старасць;
што скроні бель абходзіць, серабрыць
смоль валасоў няпрошаная госця,
што і каханне ў сэрцы не гарыць,
калі няма у сэрцы маладосці;
што стар мой твар, і страчанай красы
не аднавіць, не стрэць яе вачыма...
Што дзесьці ёсць на свеце
нейкі сын
і што кахаю... сотую дзяўчыну...
Няхай сабе...
Я ж ведаю, сябры,
што ёсць мана
і праўда ёсць на свеце,
і калі тлее іскра, не гарыць,—
гатоў яе раздзьмухаць злоснік вецер.
Гады крылатыя,
юнацкія гады,
як зыбкі цень, мільгнулі
і — не стала.
...Ў жыцці не суджана быць двойчы маладым,
калі ў жыцці вандруе дзесьці старасць.

## НЕ ЗРАКУСЯ

Хіба шмат такіх вось нашых раніц
Ёсць дзе-небудзь у якой краіне?
І раса слязою ногі раніць
І сады цвітуць пад небам сінім.

У гаі альховым, каля млыну,
Улагодзіўшы ўчарашні клопат,
Дзіўны россып песняў салаўіных
Абуджае соннае балота.

Прачынаюцца двары і хаты;
І ўжо дзесьці каля вёскі нейкай
Хтосьці першы раз яшчэ пакратаў
Струны пастуховае жалейкі.

Ветрык спуджаны з кустоў вільготных
Выбег — лісцем зашасцеў нясмела.
Бабы б'юць кужэльныя палотны
На мурожным беразе аселіц.

Не, ніколі ні ў адной краіне
Не знайсці такіх цудоўных раніц.
Не зракуся іх і не пакіну,
Калі й сэрца моцна хто параніць.

## БЫЛА ВОСЕНЬ

Без прычыны не бывае гора,
Ані суму, ні слёз пякучых.
Прыгадаў я сягоння мора
І знаёмага берага кручы.

Была восень. Вятры шумелі.
Хвалі пену вады пляскалі.
Вастракрылыя чайкі з мелі
Узляталі на грані скалаў.

І здалося — прызнацца шчыра —
Мора любым такім і блізкім,
І нібыта з сівога віру
Твар калолі салёныя пырскі.

Але не... Мне у сне здалося:
Я ляжаў на вяршыні кручы.
Скалануўся — душа галосіць,
Выпіваючы боль разлучын...

Дома маці адну пакінуў
І яе, радасць сэрца,— Асю...
Вецер кідаў у вочы кпіны:
Не журыся — даўно зраклася.

Вось таму і згадаў я гора,
Кроплі буйныя слёз пякучых,
Цьмяна-сінія хвалі мора
І знаёмага берага кручы.

## ХАЙ ПЕНІЦЦА ВІНО

Стаіць пітва нявыпітага кубак,—
сам брагу п'ю...
хай пеніцца віно!
Не трапіць больш на высахлыя губы —
скажу:
другімі выпіта яно.
Мне кроплі слёз халоднае крыніцы
жывільнай стравай будуць напару;
прыйду,
укленчу долу,
каб напіцца,
Каб смага не змагла ні дум, ні рук.

## КАБ ХОЦЬ РАЗ УСМІХНУЛАСЯ ШЧАСЦЕ

Каб не рукі, а крылы магутныя меў,—
узмахнуў бы я крыламі... Вышай,
у надзем'е крутое,— як сэрцу наўме,—
дзе блакіт неба зорамі вышыт,
узляцеў бы і гора тугое зямлі
у бяздонне, раскрытае насцеж,
паміж хмараў набраклых у песнях разліў,
каб хоць раз усміхнулася шчасце;
каб у грудзі — да сэрца — з павевам вясны
уліліся гарачыя радасці хвалі,
каб мае расцвіталі ўсе найлепшыя сны,
што, прысніўшыся, спяць, як і спалі...
Ды не крылы, а цела нямыя кускі —
рукі — цяжка узняць і пакратаць,
і не цветам, а пылам зялезнай лускі
асыпаюць душу Марыінскія краты...

## ПЯКЕЛЬНЫ ДАР

У новы край, далёкі і нязнаны,
з пакункам дум — тугой набраклых мар —
нясу гадоў ліхіх пякельны дар —
скамененую горам немач раны.

Няўцешныя пейзажы і экраны:
змардаваны зямлі пакутны твар.
На тло крыжоў — глыбокі свет ахвяр —
мятуць віхры жарствы пясок каляны.

Губляецца ружовы небасхіл,
і пляміцца нябёс блакітны полаг.
У звівах хмар, над сумнішчам магіл,
калышацца агнёў трывожных сполах...

Нялёгкі шлях із цела па касці,
а мне ж ісці... Далёка шчэ ісці...

* * *

Не першы раз і не апошні, мусіць,
баліць душа, і рады не дасі.
Сніцёся мне вы, рэкі Беларусі,
і ты, журботная азёраў сінь.

Туманы вільгаці балотнай, дзе вы?
І рунь муроўная аселіц дзе?
Сатлеў пад стрэхамі ўчарашні невад
і човен гойдаецца на вадзе...

А з хаты прышлыя укралі восці.
Да слёз расчулены з такой бяды,
мой кот, прывучаны да рыбы, посціць
і часта нюхае мае сляды.

Збівае перш за сонца росы,
йдучы да рыбнага калісь карча...
Яму, дачуўся я, сягоння млосна,
і ён чамусьці перастаў бурчаць.

Ля вербаў моліцца мая уцеха
і плача, стомленая, ля ракі.
Няўжо бязвусае юнацтва смеху
не ўспеніць вёсламі і хваль пругкіх?

Няўжо ўпадзе яно на хвалі віру
і захлынецца непаўторны цвет?..
Сціскае грудзі мне бязбожны вырак,
і мой хістаецца, бы цень, шкілет.

Не першы раз і не апошні, мусіць,
баліць душа, і рады не дасі.
Сніцёся мне вы, рэкі Беларусі,
і ты, журботная азёраў сінь.

## АДМЕННАЯ ОДА

Твая слава не мной распечана,
Хоць сама ты мяне й пякла...
Пакідаю цябе, Нямеччына,
Спапялелая ўся датла.

Не смяюся над горкаю чашаю
І не плачу,— прабач...
Скажы,
Хто учора за спінаю нашаю
Нашай смерці каваў нажы?

Лашчыў сэрцы смяротным прысакам
На ўзвівах свае вясны,
Каб не смелі узняцца высака
Залатыя у песнях сны?

І пад сонцам,
Дзе мройна спелі шчэ
Наліўныя садоў дары,
Пакалечыў так зманнай веліччу
Свежы полыск людской зары?

І надзеі у грудзях матчыных
Хто зняважыў — на глум атрос?..
Нават мора такое спадчыны
Не прымае ў сваё нутро.

І цяпер, як апошнім дотыкам,
Вычуваю твой боль і сум,—
Над шпілямі халоднай готыкі
Вусны гнеў мой табе нясуць.

Дзе нядоля мая прытуліцца —
Не пытайся пакуль,— маўчы:
Да палацаў на родных вуліцах
Ты спаліла мае ключы...

## ДАТЫ І ІКСЫ

*Юрку Віцьбічу*

Пакідаючы попел, узялі адно:
лусту хлеба і пляшку кляновага соку.
І як змрокі палёў засланілі відно —
прыкацілася песня з дарогаў далёкіх...

Галасіла, расла, калаціла абшар
і стагнала ад крыўды над шчасцем разбітым...
Гэтак стогне, гавораць, зямная душа,
як планеты, бывае, злятаюць з арбітаў

і шчапаюцца напал, імчацца на згін
у халодным сусвету бяскрайнім разміне...
Дзе ж рунеюць шуканняў людскіх берагі?
Дзе шукальнікаў доля скупая пакіне?

На акрайцах зямель негасцінных, а мо...
пазяхаючых лавай дзікунскіх абтоках,
каб прыцьміла суровасць ганебным кляймом
лусту хлеба і пляшку кляновага соку?..

І прыспалі ў процьмах жахлівых гарбы
вастраспінных абвалаў, маўклівых, бы сфінксы,
жаўтатварыя цені рабоў і рабынь,
пакідаючы нашчадкам даты і іксы?..

Не гавораць вятры плачу тускнай зары,
што скрывавіла сэрца аб гострыя дзіды,
дзе спыняюцца сны: ля каралавых рыф
ці на грудзях шчаслівай у снох Атлантыды...

*Венесуэла, 31.2.1952*

## НІ МАНІСТАЎ, НІ ЗОРАЎ

Я адзін ля акна у суворай сяджу камяніцы,
а гадзіна другая начы,— ані шуму, ні шэлесту
лісця...
Толькі месяц, свавольнік, каб сіні нябеснай напіцца,
із-за хмаркі, вандроўніцы свету, імкнуўся употайкі
выйсці.

Я адзін ля акна. Каля сценаў зыбнуліся цені —
адзіноты і суму пакутнага звыклыя, блізкія горсці,—
расплыліся і зніклі у пругкім зялёным мігценні,
і ў нямой цішыні нетрывалыя нейчыя хруснулі косці...

*

Я ж адзін ля акна... Скамянелі у позіху сківіц —
сутарэнняў — набраклыя жаху смяротнага чорныя
мязі...
...«Да сустрэчы... Бывай... Не знішчальныя душы
людскія...
І ніколі й нідзе голас нашай крыві не памрэ
й не завязне».

Я ж адзін... Каля крат патанулі у мляўкасці стомы
нетрывалыя думак пякучых пярэстыя тонкія ніці...
І грымелі, як звон, у мурох словы дзіўныя:
«Хто мы?..» —
ды маўчалі муры, быццам гром той у сэрца іх стрэламі
выцяў.

*

...Расцвіталі сады. Вецер пошчакам скроні пакратаў:
на чаўнох залатых выплывалі асілкі з-за хваляў
агністых...

Частавалі і рукі сціскалі, бы роднаму брату,
і да ног дыямантаў цудоўных, як сонца, складалі
маністы...

На далонях заззяў невыказны, як сполах зарніцы,
цудадзейны агонь, потым полымем стаўся адразу
гарачым...

На калені упаў, каб той сіле хоць раз памаліцца,
але хорам хрустальны паўстаў і раптоўна жаданні
зыначыў...

*

За бяседным сталом заліваліся песнямі гуслі,—
не змаўкалі ад хмелю далёкіх заморскіх краінаў
музыкі.

А як роскат прыціх і у хораме змрокі вячэрнія
згуслі,—

адплывалі чаўны, асыпаючы зорамі след свой вялікі...
«Дзе ж вы, сёстры, браты, засмучоная бедная маці?..
Я ж з маленства такі з вамі шчыры і сэрцам вам заўжды
адданы...

Хіба ж мелі калі мо такое багацце ў хаце,
Якім сяння найменшы часцямі нязнанымі шчодра
убраны...»

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

...Зазвінелі замкі. Ні маністаў, ні зораў...
Прысуд і кайданы...

## ВУСНЫ І ПЕСНІ

Прачніцеся вусны і песні,
каб думак у сэрцы не сплесніць;

каб подых вятроў і рэклямаў
дарожкі вузенькай не спляміў,—

не гэтай, што топчам і полем,
тае, што шлюбуецца з болем,—

нясходжанай, з пахам чабору,
дзе вербы з жытамі гаворацць,

дзе сочыцца ў мякішы ночы
халодны рабінавы почат

і плачуць па восені руннай
завеяў журботныя струны...

Прачніцеся, вусны і песні,
каб думак у сэрцы не сплесніць.

*Венесуэла, 16.10.1949 г.*

## ДАЛЕЙ І ДАЛЕЙ

Хвалі ад берага — далей і далей...
Чым іх усцешацць туманныя далі?
Спыняць, расціснуць на спінах наплываў
дугаў тугія зялёныя грывы;
пенаю жоўтай на мелях затокаў
вецер прыгорне у краі далёкім;
буры сівыя глыбінь без'языкіх
век закалышуць на поўначы дзікай...
Лепей употай на пальмавай выспе,
пэрлавай заніззю рос было выспець,
кроплямі цёплымі — дожджыкам чыстым —
спорна разліцца над краем вячыстым,—
краем, што стогне і б'ецца у русе...
Гора ж і ім і маёй Беларусі...

*Карыбскае мора, 27.7.1950 г.*

## НЯПОСЛУХУ ДЗІВАЦКАГА САКРЭТ

Патоляй свет не лашчыў нас ніколі,
і прыкрым быў чужы ля хаты след.
«Ля родных стрэх шукайце, дзеці, волі»,—
пакінуты вучыў нас запавет.

А мы пайшлі-такі у белы свет
пад націскам нясцерпнай гідкай голі...
Як гнеў раба, сціскаецца ад болі
няпослуху дзівацкага сакрэт.

І ганьбіцца зямлі ружовы цвет,
знішчаецца на зыбкіх плынях золі...
Які ж пакінем дзецям запавет,
пакутнікі зняверания долі?

Паўторым нешанованы, а мо...
...Смяротнае зямлі чужой ярмо.

*Венесуэла, 25.3.1954 г.*

## ЛЯ БЕРАГОЎ КРЫВІЦКАЕ НЯМІГІ

Уецца шлях гразкою каляінай,
а часам камяністасцю ўстае.
Сціскаецца, суродзічы мае,
ад гневу голас песні сакалінай.

Бы грэшнік той, прад чорнаю гадзінай
малюся сонцу. Вельмі ж не стае
журботнае, азёрнае мае,
далёкае і блізкае — адзінай...

Калі ж, калі знітуюцца з Радзімай
пад сонцам дум спялюткіх невады?
Заплодненыя спадзевам, сады

ўсупор сышліся с постыняй азімай...
І крышацца ільдоў грымотных крыгі
ля берагоў крывіцкае Нямігі...

*Венесуэла, 25.3.1954 г.*

## КАВАЛАЧАК НЕБА

Да плямкі шкляной — акна —
Кавалачак сіні неба
прыліп і гаворыць: «На,
вазьмі, калі вельмі трэба...»

Не веру сабе. Маўчу.
Не чуў ад людзей ніколі,
каб нейкі калі хлапчук
святое дастаў рукою...

Ад дзіва у шпік касці
укленіўся раптам верад.
Памкнуўся было ісці,—
не дзверы,— каменны невад...

Кавалачак той, яшчэ
шчырэй каб яму аддацца,—
у бляску маіх вачэй
трывогу б душы намацаў...

«Я ж ведаю, хто і чый,—
ні заваду злосці дзікай.
Вазьмі ж мае, вязень, мячы
ды з Богам! Удачы вялікай...»

*Паўднёвая Амерыка, 1.10.1955 г.*

## ГРАХІ

Разышліся, як дарогі ў полі,—
супраць ветраў і вятром наўсціг.
Не спяшаліся, ішлі паволі —
вельмі ж не хацелася ісці.

Адплывалі хутары і вёскі
за прыцьмелы дымам далягляд...
Распластаная, пчаліным воскам
пахла беларуская зямля.

Сухатвары белы свет, няблізкі,
навашчыўшы поўсці жоўтай хіб,
сустракаў нас жованым агрызкам
неведзі за нашыя грахі...

*4.10.1955 г*

## ПРАКАЛОЛІСЯ ВОЧЫ ЖАЛЮ

Я нічога з сябе не выжаў,
а суседзі даўно зажалі...
На іржэўніку іхным — рыжым —
пракалоліся вочы жалю.

Не хварэю. Ці шмат, ці мала —
не свае ж, а чужыя копы.
Вось яны і пад сонцам вялым
пакаціліся б жоўтым снопам.

Не змаўчаў бы. «Прыемна, выжал,
што не маю да трупа жалю?
Не прапаў я,— без хлеба выжыў,
а вы — самі сябе зажалі...»

*4.11.1955*

## ШЛЯХ

Не ўлукаткі, а проста — напраскі,
адмерваючы вёрсты крокам спорным,
кладзецца шлях на жорасце хрусткім
перад вачыма зайздрасці супорнай...

Настойліва імкнуцца урачы,
а ён, каб з прытаптаным не спаткацца,
у сховінах рабінавай начы
глянцуе спрыт, што ў даўнасці намацаў.

*1955*

## НА СКРЫЖАВАННІ

На скрыжаванні — тры крыжы,
усе ад даўнасці сівыя;
над імі ў споласе дрыжыць
прамень зары... Журботна вые
вільготны подых. Ля ракі,
на камяністым плыткім плёсе,
вартуе, сеўшы, сцень ракіт
сівая, згорбленая восень.

Зыбае плынь луску ляшча,
затокі мшысты бераг мые,
і рэжа косамі плюшчай
чароту выгнутыя шыі;
і плачуць мройныя кусты
калін, нячэсаныя вербы,
што неўзабаве ўбор густы —
прыпынак ценявы, дзе звер быў,—
руды аголіць лістапад
і замяце у кут-зацішак,
ці мо ракі шумлівы спад
на хвалях век іх закалыша.

Хінецца, горбячы свой стан,
вятрамі высмактаны блёкат.
Сцякае з жоўтага ліста
каля карчоў бусліны клёкат...
І шэлест гнецца у лісці,
пачуўшы музы гэтай гукі;
размяк расчулены і сціх
ад стомы мляўкае ля сука.

Над полем вораным здалёк —
праз цвіль смугі ліпкой — аднекуль
бруіцца днёў самотных клёк —
адменны пах раслінных лекаў;
паволі сочыцца, ідзе
да міражоў, дзе светлацені
прадуць на восеньскай градзе
уток крылатых летуценняў...
І толькі зрэдзь яны адны,
нібы наструнены рукамі,
віхры пругкія — бегуны —

клубкамі коцяцца пад камень,
і вырываюцца адтуль,
і да крыжоў імкнуцца бліжай,—
крапаюць дрэва на ляту
і пыл на грывы свае ніжуць.

І пахне хмеліва зямлі,
і журавы на поўдзень з'хаты
нясуць, бы тыя караблі,
на крылах клопат свой багаты;
спакой азёрнае тугі
нясуць у край чужы і небыт,—
нялёгка безліч міль тугіх
адольваць зорным шляхам неба!
Мінаюць, шэрыя, папар
і рунь азіміны із болем:
да пуху іхняга прыпаў
знаёмы, родны водыр поля.
Мінаюць гомельскі блакіт
і накіп воблачнага цэду...
Паўдзённай спёкі воск плаўкі
плыве птушыным свежым следам.
Гаворацць шэрыя чужым,
што ў нас з вясной сябруе восень,
што на нябожчыцы-мяжы
палёў вятры цяпер галосяць,
і сведкі даўнасці жывой —
крыжы, бы тыя вартавыя,
стаяць маўкліва... Хмар сувой
даўно цяпло над імі веяў...

## ДЛЯ НЕСМЯРОТНАЙ БЕЛАРУСІ

(З паэмы «Маіх уяў ружовых ранкі»)

Ад болю ўсё яшчэ гудзе
разгневанае цела краю...
Жыве яно — не памірае:
употайкі цяпло грудзей
ягоных сцеліць травы поля;
і як ні смаж іх, ні палі —

праз скібы чорныя раллі
яны зірнуць-такі на волю;
крамянай свежасцю вясны
умыюцца. Расой валогі
спалошча мораку цвілога
зара усходу след квасны,
і усміхнецца поле хатам;
і як ні смаж іх, ні мары —
убачаць зноў гаспадары
сваіх клапотаў плён багаты.

І хмелем паху пульхны хлеб
змацуе пах акрас і варыў.
І сонца спогаднае хмары —
асенніх днёў жалобны крэп —
спатоліць, даўшы волю спору.
І як ні смаж іх, ні чарні —
праб'юцца спору карані
у грунт зямлі, знябыўшы морак,
напояць сочывам руды,
асмяглы, глейкі мякіш глебы;
і зашумяць у сінь, у неба
шыракалістыя сады,
налітыя крамяным воскам...
І як ні смаж іх, ні пячы —
яны — найлепшы супачын
гаспадару — тубыльцу вёскі.

І не спаружыцца з красы
краіны зводнік чалавека:
лугоў краса, гаі і рэкі,
азёры думныя, лясы —
найдаражэйшы скарб прыроды...
І як ні смаж яго, ні плюшч,
расціме й жыць для насалоды,
але ж не зверу, а людству,
бо звер, як быў, і будзе зверам...
І я не дам ніколі веры,
што мор надыдзе хараству!
Усё, жыве і жыць што мусіць,
што спеліць зорная асець,—
на хвалях прышласць прынясе
для несмяротнай Беларусі!

## ЧОРНАЯ КАРТА

*Самому сабе*

Як той колас у полі, адзін...
Падстаўляючы сонцу грудзі,
гавару сам сабе я: ідзі,
куды сэрца вядзе,— не зблудзіш.

Пратаптаў жа ці мала ужо
і дарогаў, і розных сцежак...
І хоць твар паблажэў і пажоўк,
але ж дышаш паветрам свежым...

Не цурайся. У маршы узваж
таямніцы і маршаў сагрэты...
І як кінуць у вочы: «Не наш»,—
значыць, след твой ля светлай мэты.

Нетрывалых мінуўшы, прастуй
супраць лютасці. Літасці досыць!
Няхай сіла крывую вярсту
разгінае на чэрапе лёсу...

Калі здзейсняцца мроі і сны,—
раскажы, неслухмяны, упарты,
як марудна з зубоў сатаны
вырывалася чорная карта...

*Венесуэла, 18.2.1955 г.*

## Я НЕ ВЕДАЮ, ДЗЕ ТЫ...

Я не ведаю, дзе ты,—
далёка ад дому ці блізка,
не гаворыць ніхто.
І калі я такое пачую?
На дарогах,
навасканых сонцам
і вельмі слізкіх,
як і лёс мой,
са мною начуе...

Прыглядаецца,
лушчыць
іскрыстыя зораў знічы
і плыве,
і малюе ля пальмаў
і сцені, і плямы...
Я сцішаю хаду,
я прыгадваю моцна
тваё аблічча
і вачэй глыбіню,—
на сівы апушчаюся камень...

. . . . . . . . . . . . . . .

Да зялёных азёр,
дзе пакінуў цябе я калісьці,
прылятаю на крылах балючых
змардаваных мрояў.
Вось і дом...
І крывая рабіна ў жалобе —
без лісця,
і чырвонае сонца
у хмарах над Лысай гарою...
Я маўчу.
Я да клямкі дзвярэй
дакрануцца баюся
і паклікаць...
Каго?
Цішыня —
ні бацькоў і ні любай...
Вецер прысак гумна раздзімае
і попел цярушыць
па-над сценем маім
ля апошняга ў вёсцы зруба...
Прад вачыма
на месіве глеістым
вуліцаў грузкіх,—
мерцвякі...
Пазіраюць у неба вачэй арбіты...
А цябе —
непаўторнай,
сінявокай мае Беларусі,
не знайшоў...
І жыву,
як той колас, вятрамі падбіты,

бо не ведаю, дзе ты,—
далёка ад дому ці блізка,
не гаворыць ніхто.
І калі ж я такое пачую?
На дарогах, наваскованых сонцам
і вельмі слізкіх,
толькі месяц смутны,
як і лёс мой,
са мною начуе...

*Венесуэла, 13.2.1955 г.*

# Янка Золак

*Янка Золак (Антон Даніловіч) нарадзіўся 1 лістапада 1912 г. у вёсцы Лучнікі на Случчыне ў сям'і селяніна. Скончыў сямігодку, потымаднагадовыя настаўніцкія курсы ў Рагачове. Працаваў настаўнікам, а заадно вучыўся ў Мінскім педвучылішчы і Аршанскім настаўніцкім інстытуце (завочна).*

*У 1944 г. выехаў у Германію. Цяпер жыве ў ЗША.*

*Вершы пачаў пісаць яшчэ ў школе. Друкаваўся ў «Газэце Случчыны», «Баранавіцкай газэце», у часопісе «Новы шлях». Выдаў два тамы сваёй паэзіі («Творы», т. 1, 1979 і т. 2, 1981).*

## МАЯ МАЛІТВА

О не дай, Бог, больш нікому
Гэткай чорнай долі,
Як таполі адзінокай,
Што расце у полі,
Што вятрыскі абвяваюць,
Гнуць і ломяць голле...
Хай бы лепей затанула
Гэтакая доля!

О не дай, Бог, больш нікому
Гэтакага здзеку,
Як вісіць над нашым краем
І над чалавекам!
Пакажы яму, о Божа,
Шлях да вызвалення,
Дай Ты сілу, дай Ты долю
І багаславенне!

*23.X.1941*

* * *

Я пасею песні
На радзімых гонях,
Можа, яны ўзыдуць,
З ветрам загамоняць;

Зашумяць, як жыта
Буйнае калоссем;
Загудуць мо ў небе
Спевам-сугалоссем;

Новаю пагудкай
Зазвіняць-заграюць
Пра жыццё і дзеі
Дарагога Краю.

Як узыдуць песні
На радзімых нівах,
Паляціць над светам
Голас іх шчаслівы;

Мо пачуюць гуд іх
У вяках народы
У праменнях сонца
Радасці і згоды.

Буду сеяць песні
На радзімых гонях,
Хай цвітуць, красуюць
І нуду прагоняць;

Хай ляцяць іх тоны,
Як у небе гусі,
І пяюць аб долі
Маці-Беларусі.

*6.VI.1942*

* * *

Часам стане сумна дужа...
Каб развеяць гэты сум,
Паплыву я, мілы дружа,
На чаўне шчаслівых дум.

Паплыву я у краіну,
Шчасця поўную й красы,
Каб спяваць, а сум свой кінуць
На сухія верасы.

Дык плыві са мною, дружа,
На чаўне шчаслівых дум;
Хай віхры над намі кружаць,
Разганяюць песняй сум!

*20.IX.1942*

## ПАРОША

Эх, дзянёк які харошы!
А паветра — нібы хмель...
Сёння выпала пароша,
І срабрыцца ўсюды бель.

Я іду... А песня птушкай
Вырываецца з грудзей;
Залатыя снегу стружкі
Робяць сэрца маладзей.

Эх, дзянёк які харошы!
Навакол іскрыцца бель.
Сёння выпала пароша,
Разліла ў паветры хмель.

*1.II.1943*

## ЖАЎРУК

Яшчэ сонца не ўстала з пасцелі,
Не прамыла расою вачэй,
А ўжо з неба дзівосныя трэлі
Раз-паразу ліюцца званчэй.

Ці аматар-музыка ў блакіце
Рассыпае званочкі ў прастор,
Ці то струны — чароўныя ніці,
Ці анёлаў спяваючых хор?

То не арфы цудоўнае гранне,
Не ігра чарадзеевых рук,—
Гэта ў небе, вітаючы ранне,
Распявае шчаслівы жаўрук.

*12.IV.1943*

## ГАДЫ ПРАМІНАЮЦЬ

Гады прамінаюць
віхраць у прасторы;
Адкуль ім звароту няма.
Які з іх шчаслівы,
няшчасны каторы,—
Не знае мо й доля сама.

А кожны з нас хоча
і шчасця, і волі,
І кожнаму хочацца жыць.
Ды толькі патрэбна
жаданую долю
У жорсткім змаганні здабыць.

Шчаслівую долю
не кожны знаходзіць:
Не кожны, хто хоча яе.
Жывым із змагання
мацнейшы выходзіць
І гімн перамозе пяе.

Гнілое, благое
і слабае духам
Загіне і згубіць сляды;
Змяцецца, як пыл
у часы завірухаў,
І новае ўстане тады.

Дык хай сабе годы
лятуць у прасторы,
Змяняючы крокі падзей.
Які з іх шчаслівы,
няшчасны каторы,—
Залежыць ад нас, ад людзей.

*1.VI.1943*

## МАЗАЛІ

На руках маіх шмат мазалёў...
Хіба ж іх я саромецца мушу?!
Гэта знак, што я ў целе нашу
беларускую чэсную душу.

*22.XI.1944*

## Я НЕ ПАДДАМСЯ ТРЫВОГАМ

Край мой! Я, скрыўджаны Богам,
Змушан пакінуць цябе.
Торбу уздзеўшы на плечы,
Сцежкай пакут чалавечых
(Долі цяжкой не пазбег),
Сумна паплёўся ў дарогу.

Сумна паплёўся ў дарогу,
Цяжкі свой крыж несучы.
Жаль непамерны разлукі
Скоўваў мне ногі і рукі,
Ціха шаптаў: «Адпачынь,
Ты не пазбудзеш трывогаў».

Хоць не пазбуду трывогаў,
Крочу ў нязнаную даль.
Крочу шукаць сваю долю
І у змаганні за волю —
Супраць бушуючых хваль —
Згінуць ці ўзяць перамогу.

Хоць я пакрыўджаны Богам,
Тварам не падаю ніц.
Горды, хоць часам пануры
Крочу праз буры-віхуры
З верай у лепшыя дні.
... Я не паддамся трывогам!

*1.I.1945*

* * *

Як шалёныя ў пене коні,
Пранеслася мая маладосць,
І цяпер маё сэрца палоніць
Ліхадзейная мачыха — злосць.

З маладосцю прайшло каханне,
І цяпер — толькі сум і туга.
Прада мной не жыццё, а бадзянне
Без дарог, без пуцін, наугад.

*2.11.1945*

## СЭРЦУ

Беднае сэрца, чаго ты жадаеш?
Беднае сэрца, куды ты імкнеш?
Часта журбою мяне спавіваеш,
Часта хвалюеш мяне.

Часта хвалюеш мяне ты да болю...
Што ж мне рабіць у нагодзе такой?
Чым я цябе, маё сэрца, здаволю,
Дзе я знайду супакой?

Дзе я знайду супакой на хвіліну?
Пэўна не тут, у чужой старане...
Можа, я разам з табой не загіну?
Ты на Радзіму імкнеш?

*16.11.1945*

## СУМ ПА РАДЗІМЕ

З краю роднага, з роднага дому,
У чужы і няведамы край
Мяне выгнаў мой лёс-пустадомак
Сумаваць і павольна ўміраць.

Я жыву і — здаецца — вясёлы
Па чужацкай вандрую зямлі,
Толькі сняцца мне нашыя сёлы,
Сняцца любыя сэрцу палі.

Сніцца мне: на вячорках дзявочых
Песні родныя срэбрам звіняць...
Слёзы горкія льюцца мне з вочаў,
Аніяк не магу іх суняць.

І тады я павольна згараю
У пявучай сардэчнай журбе!..
О, мой любы, гаротны мой Краю,
Як жа цяжка мне жыць без цябе!

*14.III.1945*

## КАМУ ПАСКАРДЖУСЯ

Каму паскарджуся, каму?
Свой сум пушчу на вецер,
Няхай ён цяжар маіх дум
Нясе па белым свеце.

Няхай нясе у родны край
Маю тугу па родных
І скажа: «Цяжка паміраць
На чужыне бязродным!»

*3.VI.1945*

## РАМАНС

Россыпам яркіх маністаў
Зорачкі ў небе гараць...
Шчыра каханнем агністым
Буду цябе абдараць.

Кожная зорачка рада
Вечна святло сваё ліць...
Хочу я смутак і радасць
Разам з табою дзяліць.

## ВАСІЛЁЧКІ

Васілёчкі, каханыя кветкі,—
родных ніваў аздоба-краса!
Вас ці ўбачу на родных палетках,
я не знаю напэўна і сам.

Мо ў далёкай, нязнанай краіне
дажыву мне прызначаны час;
ды куды мяне лёс ні закіне,
буду помніць заўсёды пра вас.

Буду сніць я Радзімы палеткі
і рачулку, дзе йскрыцца жарства,
васілёчкі, любімыя кветкі,—
сымбаль вечнай Красы-Хараства.

## СУСТРЭЧА З ЗЕМЛЯКОМ

Я іду палявою дарогай,
навакол палавеюць жыты.
З каласамі, як сябру старога,
васілёк сустракае: «Ці ж ты?»

Усміхаецца ласкава, шчыра,
падстаўляе мне вусны — «Цалуй!»
і душа расчыняецца шырай,—
хочаш — злуй на яго ці не злуй.

Прытуляю да вуснаў пяшчотна,
вочы цьмяніць расінка-сляза,
Тут і ты, васілёк, самотны,
А ці ж вернемся ў край свой назад?

*1949*

## ДВА КАЗЛЫ

**Байка**

Праз ручай на вузкай кладцы
два сустрэліся казлы.
Адзін з іх — як вол, упарты,
а другі — як д'ябал, злы.

— Уцякай з мае дарогі,—
крыкнуў першы варагу,—
бо табе зламлю я рогі!
— Гэта й я табе магу!

— Я ўзышоў на кладку першы!
— Ты ўзышоў, а я ўжо быў!
І счапіліся рагамі,
аж прастор стагнаў і выў.

---

Як не дойдуць да ладу,—
разам плюхнуцца ў ваду.

*14.IV.1951*

## НАД СЛУЧЧУ

Над Случчу нахіліўшыся,
вярбы дзве п'юць ваду;
як цёткі парадніўшыся,
гамонку-спеў вядуць.

Шапочуць ветру ласкава:
«Цалуй нас гарачэй!»

... Малюнкі ўспомню наскія,—
і ў сэрцы боль гарчэй.

*20.XII.1952*

## КРЫЛАТАЕ СЭРЦА

Як сонца ў зеніце,
Як зоры ў блакіце,
Як водарны вецер гаёў,—
Над роднай Краінай
Вітае няспынна
Крылатае сэрца маё.

Як гукі прадвесня,
Як жніўная песня,
Як срэбраны звон ручаёў,—
Смяецца, спявае
І горна рыдае
Крылатае сэрца маё.

Як пчолка, старанна
З палёў назбіраны,
Нясе мёд да родных вуллёў,—
Так роднаму Краю
Дабро прыспарае
Крылатае сэрца маё.

Як свечка ў алтары,
Што шчырай ахвярай
Палае для Бога агнём,—
Для роднага Краю
Паволі згарае
Крылатае сэрца маё.

Калі ж я ў чужыне
Спачну ў дамавіне,
Прыкрыты няроднай зямлёй,—
Свой Край не забудзе,
Вітаць над ім будзе
Крылатае сэрца маё.

*1.IV.1951—31.V.1954*

## ВЯТРЫСКА З РАДЗІМАЙ КРАІНЫ

Праз моры, праз шыр акіянаў,
праз гораў хрыбты, праз даліны
да нас прылятае, як госць наш чаканы,
вятрыска з радзімай краіны.

І подых ягоны, як дотык пяшчотны
матулі, у годах дзяцiных;
лагодзіць наш боль, суцяшае самотных
вятрыска з радзімай краіны.

*1961*

* * *

Залатой пшаніцаю
спелі мае крозы...
Не паспелі выспець —
сцялі іх марозы.

Сцялі іх марозы...
Сівер і завеі
патушылі ў сэрцы
кволыя надзеі.

Кволыя надзеі?..
Горкія ўспаміны
засталіся беднаму
ў цяжкія хвіліны.

Ў цяжкія хвіліны
думы мае, крозы
не паспелі выспець —
сцялі іх марозы.

*31.VIII.1963*

## ОДА МАЦІ

*Прысвячаю маме*

Хвала табе, жанчына-Маці,
Хвала і мой зямны паклон!
Бо ты, каб даць жыццю дзіцяці,
Сваё жыццё кладзеш-на кон.

Дзяцей ты песціш і гадуеш,
Каб іх людзьмі пусціць у свет,
Хоць мо не кожны з іх шануе
Цябе — жыцця зямнога цвет.

Быць можа, хто з іх, неудзячны,
Прынёс у косы твае снег;
Ад іх ты часам і паплачаш,
Але дзяцей не праклянеш.

Ты — жыццядайная крыніца,
Што жывіць нас із роду ў род.
Табою смела ганарыцца
І сем'янін твой і народ.

Не грэх тут будзе прыгадаці:
Табе пашану й Бог прынёс,
Бо праз цябе, людская Маці,
На свет прыйшоў Ісус Хрыстос.

Хвала ж табе, руплівай Маці!
Я прад табой хілю чало.
Каб не магла жыцця ты даці,—
На свеце й нас бы не было!

*10.V.1969*

## КАЛЯ РЭЧКІ ЛАНІ

Снежань... Холад і золь... На світанні
сонца з цемры ледзь промні выносіць...
Каля рэчкі — лагоднае Лані —
маладая случанка галосіць:

«Сонца, сонца, маё залатое,
пасланец паслухмяны Самога!
Ой, чаму ж нашым змучаным воям
не прыйшло своечасна з падмогай?
Ты чаму іх цяплом не акрыла,
не было для іх маткаю мілай;
чаму ворагаў іх не ссушыла
сваей грознай, агністаю сілай?»

Снежань... Сцюжа і золь... На світанні
вецер свежую гурбу тармосіць...
Каля рэчкі — лагоднае Лані —
маладая случанка галосіць:
«Вецер, вецер! Ты ўсюды на свеце.
Аблятаеш ты й нашы прасторы.
Ці ж не бачыў, як Случчыны дзеці
напаўнялі крывёю разоры?
Ты чаму іхніх ворагаў кулі
не развеяў па чыстаму полю?
Вецер, вецер! Былі то не гулі:
палеглі воі ў бітвах за волю».

Снежань... Холад і золь... На світанні
вецер лісце сарванае носіць...
Каля рэчкі — лагоднае Лані —
маладая случанка галосіць:
«Лістапад! Агаляў ты галіны,
шапкі з дрэваў зрываць быў ахвочы;
чаму ворагам нашай краіны
не засыпаў лістотаю вочы?
О спагадная маці-зямліца!
Змагароў супраць лютай навалы,
што палеглі, каб ёй не скарыцца,
ты ў улонні сваім пахавала».

Снежань... Холад і золь... На світанні
вецер снег ра́змятае, разносіць...
Каля рэчкі — лагоднае Лані —
маладая случанка галосіць:
«Лань, сястра мае роднае Случы!
Дзе мой бацька, і брат, і каханы?
Ты чаму ім вадою гаючай
не абмыла крывавыя раны?
Ты чаўны іх на хвалі пяшчотнай

дзесь загнала ў сцюдзёную зіму.
Як жа быць мне, дзяўчыне самотнай?
О, вярні іх, вярні на Радзіму?»

Снежань... Холад і золь... На світанні
вецер плача і літасці просіць...
Каля рэчкі — лагоднае Лані —
маладая случанка галосіць:
«О суседзі з заходу! Вы людзі?
Як нам зваць вас сваімі братамі,
калі вашыя сэрцы у грудзях
абраслі, мабыць, плесні кустамі.
Вы забралі нам зброю і волю,
нашых вояў у свет разагналі.
Каб такую жахлівую долю —
даў Бог — вы й вашы дзеці пазналі!»

Каля рэчкі — лагоднае Лані —
маладая случанка галосіць,
і яе галашэнні-літанні
вецер беламу свету разносіць.

*2.II.1981*

## НАША МОВА

**Акраверш**

Наша мова — бярозавік весні,
Аксаміт жаўруковае песні,
Шум гаёў, пушчы грознае голас,
Акавітай успоены колас,
Матак нашых пяшчоты адвеку,
Отмуць-вір у азёрах і рэках,
Васілёк сінявокі у збожжы,
Агняцвет нашай сілы, дар Божы.

*16.II.1981*

# МАЯ БЕЛАРУСЬ

Беларусь для мяне —
мая родная маці,
што ў залочаны
восені цвет
у сялянскай
з лучынаю хаце
нарадзіла мяне
на свет.

Беларусь для мяне —
гэта
шчырая вера,
гэта
сэрца сыноўнага стук.
Беларусь для мяне —
гэта
звонкая лера
і цымбалаў
раскацісты гук.

Беларусь для мяне —
гэта
белыя зімы
і вясновы
бурлівы разліў;
васількі
у жытох гаманлівых,
водар бэраў,
антонавак, сліў.

Беларусь для мяне —
гэта
восень з кастрыцай,
верацёнаў гудзенне,
красён перастук;
кужаль,
вытканы мамай,
сястрыцай,
гэта плёны ад працы
мазолістых рук.
Беларусь для мяне —
гэта
слуцкія ткаллі,

што
прыгожыя ткуць паясы;
гэта
рэк і азёраў
срабрыстыя хвалі,
Белавежская пушча
і Пінска лясы.

Беларусь для мяне —
гэта нафта Палесся
і капальні
калійнае солі;
гэта
спевы птушыныя
ў лесе
і палеткаў шырокіх
прыволле.

Беларусь для мяне —
Каліноўскі,
Скарына,
Багушэвіч,
Купала
і сотні такіх,
каго
гора-бяда не скарыла,
хто ніколі
не зрокся сваіх.

Беларусь для мяне —
гэта
спеўная лера
і крынічка,
што з лесу бяжыць;
у свой край
непахісная вера,
што ён жыў,
і жыве,
й будзе жыць.

*1983 г*

## МАЦІ МАЯ — БЕЛАРУСЬ

Белая, светлая, чыстая,
Мой галасісты жаўрук!
Ты — мая доля вячыстая,
Маці мая — Беларусь.

Летняй улевай купаная,—
Першага снегу бялей.
Толькі адна ты каханая,
Цэлага свету мілей.

Свежай расою абмытая,
Многа ты ведала й скрух.
Сынам сваім не забытая
Маці мая — Беларусь.

Доля твая не згалелая,
Ты яшчэ ўбачыш зару,
Светлая, чыстая, белая
Маці мая — Беларусь!

*1985*

## НА ЧУЖЫНЕ

Тут доля мая дагарае,
І сэрца не мае спачыну.
Ці ўбачу цябе, дарагая,
Каханая змалку, Айчына?!

Я тут каратаю бязвінны
Бясконцыя хмарныя тыдні.
За што, за якія правіны
Мяне сюды выгналі злыдні?

Каму я стаў поперак горла,
Каму перабег я дарогу?
О, як жа балюча, як горка
Развітвацца з родным парогам!

*1990*

# Уладзімір Клішэвіч

Уладзімір Клішэвіч нарадзіўся ў вёсцы Краснадворцы на Случчыне 27 лютага 1914 г. Скончыў Старобінскую сямігодку, потым педагагічныя курсы ў Слуцку, працаваў настаўнікам. У 1933 г. паступіў у Мінскі педагагічны інстытут, які, аднак, закончыць не ўдалося: у 1936 г. быў арыштаваны і высланы на Калыму.

У 1940 г. У. Клішэвіча разам з іншымі арыштаванымі былымі студэнтамі прывезлі ў Мінск на перагляд справы, дзе яго заспела вайна. Апынуўшыся на волі, працаваў у рэдакцыі «Газэты Случчыны», якая выдавалася ў час акупацыі. Склаў і выдаў зборнік паэзіі «Песняры Случчыны», у які ўвайшлі як творы яго самога, так і іншых паэтаў.

У 1944 г. выехаў у Германію, потым — у ЗША. За мяжою выдаў зборнік вершаў «Далячынь» (Саут Рывэр, 1964), паэму «Васіль Каліна» (Лондан, 1965). У 1973 г. у Мінску ў бібліятэчцы газеты «Голас Радзімы» выйшла кніга яго паэзіі «Сняцца сны мне залатыя». Двойчы прыязджаў у СССР.

Памёр у 1978 г.

## ЗВАНЫ

Чаму так клічуць хараша яны,
На вежы цэркаўнай забытыя званы?
Вячэрні час. Марозная зіма,
Гуляючых людзей на вуліцы няма...
Ізноў званы... Душы гудзе адказ:
Звіняць званы ужо апошні раз.

*1931*

## ВАСІЛЁК

Я іду дарогай, дзе красуюць нівы,
Каласамі збожжа шле паклон здалёк.
Пакланіўся нізка ад душы шчаслівы
У калоссі дымным сіні васілёк.

Прамільгнула думка аб зялёным лесе,
У якім я змалку гадаваўся, рос.
І хадзіў дарогай пад акорды песняў,
Што краналі сэрца і душу да слёз.

Усміхайся, любы, покуль вочы свецяць,
І цябе шчаслівым я не назаву,
Пражывеш нядоўга ты на белым свеце,
Покуль серп халодны зніме галаву.

Эх, балюча бачыць залатую восень,
А яшчэ балючай, што прыйшла зіма.
Нарадзіцца з сэрцам, мабыць, давялося,
А цяпер паслухаў — дык яго няма...

*Мінская турма, ліпень, 1937*

## ЖУРАЎЛІ

У блакіце восені з крыкам паплылі,
Родны край пакінуўшы, сумна жураўлі.

Сонца ў срэбра глянула позняе расы,
Ціха аддаляюцца птушак галасы.

Галасы даносяцца ўсё радзей, радзей.
Патанулі крыллі іх у сіняй вадзе.

Вядуць гоман з водамі асака, чарот.
Туманамі сцелецца сінява балот.

Я стаю і думаю, а на сэрцы сум.
Ой, куды я цяжкае гора панясу?

Вербы з болем журацца, гледзячы ў ваду.
Вецер жоўтай замеццю з поўначы падуў.

У блакіце восені з крыкам паплылі,
Родны край пакінуўшы, сумна жураўлі.

*Мінская турма, жнівень, 1937*

## ГУСІ

Праляцелі гусі па-над цёмным борам,
Смутак заранілі ў сінія прасторы.

Праляцелі гусі па-над чыстым полем...
Дзе ты, маё шчасце? Дзе ты, мая доля?

Ой, вазьміце, гусі, з сабой на хвіліну,
Бо ў мурох я гэтых без пары загіну.

Запытаў у іх я аб сабе нясмела:
— Ці не разам з вамі шчасце паляцела?

Не сказалі слова, замаўчалі самі.
Гаманілі сумна сосны з верасамі...

*Мінская турма, верасень, 1937*

* * *

Мне ў няволі жыццё надаела,
Смерць прыму, як збаўленне ад мук.
Лепей сам на душу сваю й цела
Налажу пальцы скованых рук.

Шчасце людзям даецца на свеце
Вельмі рана, і толькі раз.
Тое шчасце прызначана дзецям;
Няма шчасця дзіцячага ў нас.

Час крылатаю птушкай імчыцца.
Ой, куды вы, гады, леціцё?
Я хацеў бы ізноў нарадзіцца,
Каб пабыць хоць часіну дзіцём.

Без пары маладосць адляцела.
Не заві ты яе, не заві!
Як душа разлучылася з целам,
З гэтых дзён маё сэрца ў крыві.

Пей жа, вецер, халоднай Сібіры!
Пей, праклятая й ты, Калыма!
Душу з сэрцам ніхто не памірыць,
Калі болей душы ўжо няма.

Непатрэбна нічога мне болей...
Досыць плакаць і годзе спяваць!
Я хацеў бы, каб толькі на волі,
На Радзіме сваёй паміраць.

Лёс хай зараз памерці прымусіць —
На калені не стану прад ім.
Маю веру ў жыццё Беларусі
Не адыме у сэрцы маім.

Час ляціць... і шалёная сіла
Мяне гоніць на смерць з даўніх пор,
Я ўжо проста стаю над магілай,
Бо сягоння душою памёр.

Коні скачуць над белаю пенай,
Капытоў чую д'ябальскі стук...
Лепей сам на душу сваю й цела
Налажу пальцы скованых рук.

*Калыма, прыіск Верхні Ат-Урах.*
*Студзень, 1939 г.*

## ЛІСТ З СІБІРЫ

Напісаў бы я многа аб долі
І сваёй і знаёмых сваіх.
Толькі ліст мой не дойдзе ніколі,
Каб сказаць табе слова аб іх.

Я нявольнікам край свой пакінуў...
Боль трывожны душы не уціх,
Ды таму, што Радзіму Краіну
Сэрцам болей любіў за другіх.

Завязлі мяне надта далёка,
Дзе мароз, ды па пояс снягі,
Дзе стракоча зімою сарока,
Дзе надзьмута лятае снягір.

Край чужы і халодны бясконца
Прытуліў шмат да чорных грудзей
Тых, хто кінуў паўдзённае сонца,
Хто к жыццю меў хоць каплю надзей.

Адусюль тут прыгнаныя людзі:
Беларус, украінец, якут...
Кожны з іх аб надзеях забудзе,
Напаткаўшы магілу вось тут.

Толькі бура начамі завые,
І заплачуць ад болю снягі —
Устаюць мерцвякі, як жывыя,
Каб парваць на сабе ланцугі.

А як толькі пачне жаласлівы
Вецер песню спяваць на галлі —
Ўспамінаю я родныя нівы
І прыбраныя ў кветкі палі.

Прыгадаю цябе. Засумую...
На зямлю упадуць каплі слёз...
Не знайсці мне радзіму другую
Даражэй тэй, дзе змалку узрос...

## АДКАЗ

Твае лісты з Сібіры атрымала,
І цяжка мне даваць на іх адказ.
І многа слоў, і слоў занадта мала,
Каб перадаць, якое гора ў нас.

Ты знік, мой сын, і нават болей года
Я ведаць не магла пра твой суровы лёс.
Чакаючы штодня твайго дамоў прыходу,
Я мора праліла з вачэй гарачых слёз.

Каб ведаў ты, ў якім я зараз горы,
І слоў няма пра гора расказаць.
Ніхто цяпер са мною не гаворыць,
Ніхто не зойдзе ў хату пагуляць.

Як толькі ў нас цябе, мой сын, не стала —
Перанясці я не магла бяды,
Бо хутка брата ГПУ забрала
І выслала бог ведае куды.

Не зразумець нікому гэтай страты.
Каго б знайсці, хто б мне сыноў вярнуў?!
Як адпраўляць было мне вас із хаты —
Лягчэй жывой лажыцца у труну.

Ой, не сустрэну вас, саколікі, нідзе я!
За што цярпець мне гэткую бяду?
Прапала ўся цяпер мая надзея,
Нідзе я вас, сыночкі, не знайду.

Чаму нясці такое гора маці?!
Ды што аб ім магу сказаць каму...
Не хваціць сіл, мой дарагі, не хваціць,
Каб гору там дапамагчы твайму.

І як мне быць? Якой дарогай крочыць? —
Цяпер ужо не ведаю й сама...
Па вас, сыны, я выплакала вочы,
І нават слёз больш у мяне няма.

## ТРЫЯЛЕТ

Гады згубіў я маладыя,
Яны не вернуцца ніколі.
Дзесь на чужым, далёкім полі
Гады згубіў я маладыя.

Хай мару я аб лепшай долі,
Хай сняцца дні мне залатыя,
Гады згубіў я маладыя,
Яны не вернуцца ніколі.
*19.II.1942*

* * *

Ой, чаму ў вас, тужлівыя ліпы,
Песня суму заўсёды адна?
Няхай я кубак роспачы выпіў,
Праглынуўшы атруту да дна...

Няхай я з акалелай душою
Вечна восень у сэрцы нашу,
Каб знайсці хоць хвіліну спакою
І парадаваць гэтым душу.

Мне сібірскія сняцца завеі,
Сніцца мне чорных дзён Калыма,—
Край, дзе людзі губляюць надзеі,
Край, дзе людзям ратунку няма...

Толькі ўбачу, як золата свеціць,—
Паўстае мёртвых целаў гара,
Паўстаюць іх галодныя дзеці
І крывёй на метале гараць.

Хто малюнкі знішчэння забудзе!
На ратунак жыццё не заві...
Страшным робіцца золата людзям,
Што гарыць пералівам крыві.

Не сумуйце, асеннія ліпы,
Калі радасць мая не відна...
Кубак роспачы ўчора я выпіў,
Праглынуўшы атруту да дна.

## КАНЦОНА

Каторы час я аб канцоне мару:
А што, калі крануцца да яе?
Няўжо яна, ад лёгкага удару,
Цудоўней сэрцу песню запяе?
О, гукі дзіўныя! Яны да майго вуха
Нясуць душэўнае гармоніі красу,
А песні гэткія патрэбна сэрцам слухаць.

*23.VII.1942*

## АКТАВА

Бяры сваё, але трымай надзею
І вер, што ты народжаны, каб жыць.
Ніколі ў полі краскі не радзеюць,
Калі над імі вецер прабяжыць.

Любі жыццё, любі яго завею...
У сэрцы сум яны тваім развеюць
І скажуць так: «Далёка не хадзіце,
Бо шчасце тут, у нашым спелым жыце».

*13.IX.1942*

* * *

Слёзы ліліся з вачэй на чужыне,
Плакаў самотны бядак.
Думаў заўсёды аб роднай краіне —
Слёзы ліліся з вачэй.

Кроўю аплакаў свой лёс у няволі.
Сэрцам пракляў ланцугі.
Выйсця не бачачы з пекла ніколі,
Кроўю аплакаў свой лёс.

Слёзы ліліся з вачэй адзінокіх,
Плакаў забыты усімі.
Думаў заўсёды пра край свой далёкі —
Слёзы ліліся з вачэй.

*1942*

* * *

Прамінуць учора дзён суровых слякаць
Па дарозе слізкай я ніяк не змог,
Вось таму я змушан песнямі аплакаць
Горкія няўдачы пройдзеных дарог.

Выйду рана з дому. Абніму каліну,
Раскажу ёй ціха аб сваёй бядзе.
Што далёка дзесьці маладосць пакінуў,
Што яе ніколі не знайду нідзе.

Не кажы, каліна, аб маім ты горы;
Не хачу, каб чулі родныя палі.
Няхай вецер з імі аб другім гаворыць,
Толькі мне хай сэрца аднаму баліць.

*15.III.1943*

## ЖЫЦЦЁ

Ноч адышла. Паказалася сонца —
Мы сустракаем шчаслівыя дзень.
Холад прайшоў, і вясна наступіла,
Глянеш — і цёплае лета прайшло...

Так і жыццё чалавека праходзіць:
Быў маладым, раптам старасць спаткала,
Толькі паспееш назад азірнуцца...
Скажаш: «Не ўбачыў, як хутка пражыў...»

*Ліпень, 1943*

## ВЕЧАР

Сонца схавалася ў светлыя захаду хмары,
Толькі мячамі праменняў яркі гарыць небасхіл
Дзесьці далёка дзявочыя звонкія песні
Рэхам даносяцца к цёмнаму лесу з палёў.

Скончыў і працу сваю селянін на балоце:
З граблямі бабы, мужчыны з касамі
Шнурам гусіным дахаты ідуць.
Там, па дарозе, павольна ступаючы крокам,

Цягнуцца ў вёску сытых чароды кароў.
Зелень навокал пакрыла багатую землю.
Лісцямі дрэвы і збожжа калоссем, гнучыся
ад ветру,
Шлюць прывітанне людзям і жывёле.
*9.VII.1943*

* * *

Цэлы вечар думаю без мэты,
Цэлы вечар думак не збяру,
Ці таму, што сад цяпер раздзеты
У глухую позную пару?

Ці таму, што плача ціха восень
На парогах лужамі вады,
Ці таму, што дзікія галосяць
Вокал хатаў ветрам халады?

*14.IX.1943*

## ВЕК НАШ СТРАШНЫ

Век наш страшны і суровы,
Што дае ён людзям зямлі?
Толькі падаюць з плеч галовы,
Толькі рэкі крыві паплылі.

Косіць Молах людзей ашалелы,
Тых, што ўчора жывымі былі.
І валяюцца мёртвыя целы
На палетках нямое зямлі.

*3.X.1943*

* * *

Быў і я маладым калісьці,
Толькі хутка прабеглі гады.
Сыпле вецер пажоўклыя лісці
У восеньскія лужы вады.

За акном цемната і макрота.
Плача вецер у голлі бяроз.
Так і хочацца клікнуць: — Хто там
Песню суму з сабою прынёс?

Восень меддзю услала дарогу,
Свой адзначыўшы ціхі прыход.
Таму сэрца маё трывогу
Спатыкае ў трыццаты год.

І цяпер я збіраюся плысці,
Не пытаючы болей куды.
Сыпле вецер пажоўклыя лісці
У асеннія лужы вады.

*4.X.1943*

* * *

Лямпа гарыць на стале,
Навокал трывога і ціш.
Момант бязмерна душою гарыш,
Раптам жадаеш зусім акалець.

Хутка праносіцца час,
Свет мае лямпы патух,
Толькі жывучасці дух
Дзесьці ў сэрцы не згас.

Хутка не стане і нас,
Так як і тых, што жылі
Коратка так на зямлі.
Вечным застанецца — час.

*Слуцак, 5 студзеня 1944 г.*

## ТРЫПЦІХ

Устала сонца рана над ракою,
П'юць срэбра водаў ціха прамяні.
Зямля прачнулася ад соннага спакою,
Высока ў небе жаўранак звініць.

П'юць срэбра водаў ціха прамяні,
Гарыць рака агністым пералівам,
Высока ў небе жаўранак звініць
Сваёю ранняй песняю шчаслівай.

Гарыць рака агністым пералівам,
І новы дзень — жыцця святы прыход —
Сваёю дзіўнай песняю шчаслівай
Зямля спаткала сонечны усход.

*22.II.1944*

* * *

Ад жаху кроў у маіх жылах стыне.
Куды мяне нячыстая нясла?
Лягчэй было павіснуць на асіне,
Чым быць падобным на асла.

Здавалася мне, тут іначай,
Уклад жыцця людзей другі.
Ну, а цяпер душа крывёю плача,
Спаткаўшы новыя няволі ланцугі.

Тут здзек бязбожна чыніцца над намі,
Канец яго, здаецца, невідзён...
Загоны панскія залітыя слязамі —
Навокал чуецца цяжкі праклён.

Абшарпаны. Спіною свеціш голай...
Працуеш за вала не менш.
Ты у вачох гаспадара — жывёла,
Не чалавек, а толькі унтэрмэнш.

*Морунген, 22.IX.1944 г.*

* * *

Лягу спаць, толькі мне не спіцца,
ўецца дум залатая ніць.
Срэбных словаў жывая крыніца
ў галаве маёй ноччу звініць.

Яна ў звоне сваім захавала
маладосці бурлівай вясну.
І журчаць словы песняю хваляў,
прабуджаючы сэрцы ад сну.

Я адчую тады сябе горда,
калі словы мае з-пад пяра
адгукнуцца магутным акордам,
звонам чыстага серабра.

А цяпер мне начамі не спіцца.
Так і хочацца з прагнасцю піць
срэбных слоў залатую крыніцу,
што так гучна, пяшчотна звініць.

*1.XI.1944*

## ВОЗЕРА

Стаіць, як вока, возера вады,
А лес кругом выцягваецца ў неба.
Распісана у розныя сляды
На мокрым беразе жывёлай глеба.

Уважліва у возера зірні!
Бязмежная адлегласць прад табою;
Як зорнай ноччу свецяцца агні,
Тады душа прыходзіць да спакою.

Прыйшоў і я да возера быццяя,
Каб паглядзець у глыбіню, напіцца.
Тут зоры дзіўным светам зіхацяць.

У люстра возера сцякае таямніца.
Пазнанне ў глыбіні магчыма,
Тады далёкае бліжэй перад вачыма.

## РАЗВАГІ

Гляджу, як Нэкар пеніцца імкліва,
Бяжыць удалячынь, няведама куды.
У хвалях мутнае халоднае вады
Агні дамоў калышуцца маўкліва.

Далёка цягнуцца абапал яго горы.
На берагох стаяць руіны-гарады.
І сведка жудасцяў, прыбыламу сюды,
Жахлівай мовай аб вайне гаворыць.

А я стаю і думаю ў трывозе:
Ляжыць руінаў дзікая пячаць
На чалавекам пройдзенай дарозе.

А словы мудрасці адно гучаць
Над цемраю у цяжкай перамозе:
Хто меч падняў, той згінуў ад мяча.

*Вюртэмберг, 1.III.1946 г.*

* * *

Навошта я пішу, хто мае ў тым патрэбу?
Марную час, сцякае кроў чарнілам.
Рука галоднага працягваецца к хлебу,
рука багатага у кашальку застыла.

Каго ж тады мае радкі цікавяць?
Каму? Навошта? Эх, пустыя словы...
Глянь ад мяне, як ад чумы, уцякаюць
карыснага жыцця галовы.

Ім хлеб давай, а не узлёты дум.
Не накарміць галоднага радкамі...
Бывайце, я ад вас іду,
кідайце на мяне апошні камень.

Такіх я спатыкаў не раз.
Ад войстрых слоў я на зямлю не падаў.
Паэты пішуць не для вас —
двуногіх і халодных гадаў.

*4.II.1948*

## У ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ

Мне хочацца зараз крыху адпачыць,
Я чую, што зморны целам.
Праз цяжкія мукі бяззорнай начы
Так хутка жыццё праляцела!

Назад азірнуўся — прапалі сляды,
Няма нават чым пахваліцца.
Куды я спяшаўся? Спяшаю куды?
А выбіла болей за трыццаць.

І сумна і прыкра на сэрцы маім.
Жыццё на зямлі — таямніца.
Усе мы жывыя над кручай стаім,
Прад смерцю павінны скарыцца.

Мне хочацца зараз крыху адпачыць,
Я чую, што змораны целам.
Праз цяжкія мукі бяззорнай начы
Так хутка жыццё праляцела!

*27 лютага 1948 г.*

* * *

Хочаш,плач ці душыся ад смеху —
Не ўцячэш ад праклятай бяды.
На апошні паўстанак заехаў,
Болей ехаць няма куды.

Ад утомы і коні сталі.
Хмары, цемра, няма дарог.
Глянуў я у туманныя далі,
Камень цяжка на сэрца лёг.

Не стрымаць ні сарказму, ні смеху,
Многа поўзаў туды і сюды.
На апошні паўстанак заехаў —
Болей ехаць няма куды.

*29.II.1948*

* * *

Змаўкаю я, знікае голас слова,
Не па маёй, не па чужой віне.
Здаецца мне, што муза выпадкова
Была часовай госцяй у мяне.

Вось так яно ці мала што бывае...
Эх, не злічыць мне падарожных віз!
Жыцця майго ламаная крывая
Спускаецца абрывіста наніз.

*9.II.1949*

* * *

Дзе толькі не стагналі мы!
Я з болем часта ўспамінаю
І воды мутнай Калымы,
І хвалі сіняга Дунаю.

Перада мной стаяць дамы,
Высока цягнучыся ў неба.
Чаго ні спрабавалі мы,
Каб толькі мець кавалак хлеба!

Бязлітаснасць жыцця зямлі!
Ты слова добрага не варта,
Каб на страшэнным караблі
Трымацца так цябе упарта.

*5.VII.1949*

## ГРЭЦЫЯ

Вялікая там творчасць мастака,
Дзе формай змест апрануты умела.
Так эйліна калісьці скульптара рука
Тварыла прыгажосць людского цела.

Нас раздзяляюць з Грэцыяй вякі,
А мы ўсё ходзім к эйлінам у госці.
І вучацца у іх нашчадкаў мастакі
Тварэнню вечнай прыгажосці.

## СМЕРЦЬ САКРАТА

На тварах вучняў невымерны жах —
Жыцця настаўніка палічаны хвіліны.
Трымае кубак ён з атрутай у руках,
Бясстрашны між сяброў Сакрат адзіны.
Атрута выпіта, і рот засмаг...
Нязломны дух у ім, пагляд арліны,
Развага мудрасці ў яго вачах,
У словах генія бязмежныя глыбіны.
Апошнія мудрэц прамовіў словы,
І вочы зачыніліся яго навек.
Спакойна адышоў у вечнасць чалавек.
Схіліліся пакорліва сяброў галовы —
Была вялікаю, трагічнай стратай
Для чалавецтва смерць Сакрата.

*25 ліпеня 1950 г., Бруклін*

## РЫМ

Магутны Рым у прошлым велічава
ішоў за Грэцыяй далёка ззаду.
Стварыў нашчадкам ён класічнасць права,
класічна сам прыйшоў да заняпаду.

*1950*

## ЧАС

Згарае сонца ліпеньскай спякотай,
Нічога не парушыць голас цішыні,
Нястрымна час мяняецца употай,
І так за днямі прабягаюць дні.

Кранула ліст на дрэвах пазалотай,
Гарыць каштан прывабна у агні.
Кіпіць штодзень нябачная работа,
Усё змяняецца, куды ні загляні.

Высока воблакі плывуць па-над зямлёю,
Дарогам іх няма канца і краю,
Не ведаюць яны ў жыцці сваім спакою.

І дзень і ноч трывожныя спяшаюць...
Глытае час жыццё патокамі ракі,
У вечнасць падаюць гады, вякі.

*27.VII.1950*

## ЗАХАД СОНЦА

Дзень у цяжкай стоме к ночы адыходзіў,
Не шумелі лісцем белыя сады.
Дагарала квола сонца на заходзе,
Патанула ціха ў возеры вады.
Заціхала песня галасоў дзявочых.
Рэхам праляцела звонка у бары.
Выступала ў чорным каралева ночы,
Запаліўшы ў небе ясны бляск зары.
Сумна адзываўся толькі белы лебедзь
Песняй развітальнай у вячэрні час,
Было цёмна ўсюды, было светла ў небе,
Калі дзень апошні непаўторна згас.
З гэтым днём у вечнасць адышло нямала...
Неяк непрыкметна раптам дня не стала.

*13 жніўня 1950 г., Нью-Йорк*

* * *

Што на свеце людскія ахвяры...
Да ўсяго на зямлі я прывык.
Голас мой у духовай Сахары —
прадсмяротны апошні крык.

Мне ўсё роўна, куды ні ідзем мы,
над усім стаўлю кропку адну.
Чую, мне пахавальнік знаёмы
забівае цвікі у труну.

Што з таго, што калісьці я марыў,
безнадзейна мой промень знік.
Голас мой у духовай Сахары —
прадсмяротны апошні крык.

*1952*

* * *

Цішыня над вадою нямая,
Цішыня — цішыні.
Неба зорамі ў воду сплывае
З вышыні.

Крыллі думак мяне высока
Нясуць угару.
Сам тады я, як вольны сокал,
Зоркай гару.

І ў такую святую хвіліну
Цішыні
Мне не хочацца ўжо пакінуць
Вышыні.

*Каліфорнія, студзень, 1954 г.*

## ЧАЛАВЕК

Думкай смелай сягаючы ў неба,
І чаго толькі ён не прыдбаў.
Ўсё стварыў для сваіх патрэбаў,
Ўсё стварыў для сваіх забаў.

Гэты свет я заву толькі раем,
Хоць у ім нават пекла ёсць.
Шкода мне, што мы ўсе паміраем,
А народжаны — толькі госць.

*Каліфорнія, 1954*

## У ВЫРАЙ

Ой, упала зорачка згары ўніз,
а двурогі месячык над ракою звіс.

Гусі ў лузе шэпчуцца ля вады.
Павяваюць з поўначы халады.

Туманамі сцелюцца паплавы.
Ў небе адгукнуліся журавы.

Адлятаюць госцікі ды ад нас
у старонку цёплую на зімовы час.

Ой, упала зорачка згары ўніз,
а двурогі месячык над вадой павіс.

*Каліфорнія, 1954*

* * *

З табою мы заўсёды неразлучна
шагаем у бяздоннай ночы.
Сугучна мы ідзем ці не сугучна,
а ўсё ж мы йдзем, а ўсё ж мы крочым.

Вялікі шлях прайшлі цярнёвы,
і падалі, і паднімаліся нанова,
то горда йшлі, узняўшы ўверх галовы,
то ціха крочылі — без слова.

І ты, мой верш, мой верны дружа,
ты быў адзінай мне апорай —
ці я згінаўся перад сцюжай,
ці быў засмучаны ад гора.

Ў тварэнні вольнасці вялікай
прыходжу толькі да спакою:
тады я цар, тады ўладыка,
зямля — нішто перада мною.

Зямнога рабства ланцугі
скідаю я з сябе самога.
І ў свет чароўны, ў свет другі
мне адчыняецца дарога.

О, дзіўны верш, о верш красы —
паэзіі ўсяе аснова —
вясёлкі колерам рассып
ўсю прыгажосць на сілу словаў.

*Каліфорнія, снежань, 1954*

## БЕЛАЯ КВЕТКА

Белая кветка шыпшыны завяла,
Лісцікі вецер сарваў і раскідаў.
Адны з іх павіслі на голачках дзідаў,
Звалілася іншых на зямлю нямала.

Вецер і сонца над імі сваволіць,
Цёмная ноч закалдоўвае цішу.
Кветкі галоўкамі больш не калышуць,
Ім не падняцца ўжо болей ніколі.

Чорны узор на ёй смерць малявала,
Можа, спажытак галодных акрыдаў?
Лісцікі вецер сарваў і раскідаў,
Белая кветка шыпшыны завяла.

*11 чэрвеня 1955 г. Каліфорнія*

## ЗАЛАТАЯ ВОСЕНЬ

Вісяць на дрэвах залатыя лісці,
Ад спелых яблык пах прыемны мёду.
Буслы да выраю збіраюцца плысці,
Крыламі плаўна плешчуць неба воду.

Пакрыліся шаўковістым узорам
У павуцінні нітак поле, сенажаць.
Як маякі на беразе ля мора,
Стагі маўклівыя разгублена стаяць.

Згасае сонца ў цёплы дзень асенні,
Плывуць ад воблакаў зямлёю цені,
У сэрцы губячы трывожныя сляды.

Пара асенняя праходзіць залатая,
Каліна полымем чырвоная шугае,
У сонцы ласкавым купаюцца сады.

## СЦЯГАЧ

Прыгадваю — дух замірае.
Балюча — маўчы не маўчы.
Была у нас вёска старая,
А звалі яе Сцегачы.

Закляццем павейвала нейкім,
І свет адмысловы такі:
Жылі там удовы, калекі,
А болей за ўсё — прымакі.

Валіліся з неба няшчасці,
Спакою людзям не было.
У тых, што няма чаго красці,
Гарэла штотыдня сяло.

А бедным ніхто не паможа,
Бяда за бядою ідзе,
І градам як вылупіць збожжа,
Што рукі да неба ўзвядзеш.

Сябе прыгадаў я самога,
Бяры хоць ад болю заплач.
Плыве сцегачовых дарога,
А я — самы большы Сцягач.

*25.XII.1958*

## ДАНТЭ

Не быў ты грэшнік, ні святы,
Бяда маршчынай твар пасекла,
І на шляху выгнанца ты
Зямное бачыў толькі пекла.

*5.IV.1959*

## ФАНТАЗІЯ

Слова да слова — і думкі мяцеліцай
Круцяцца, плаваюць, сцелюцца.

Віхар сцюдзёны, то віхар гарачы
Праносіцца з піскам, гігіканнем, плачам.

Усё абрываецца. Мора пустэчы
Носіцца прыкра ў мазгу чалавечым.

Словы і думкі ў няведамасць гінуць.
Страшна! Як страшна ў такую хвіліну!

## СМУТАК ПА РАДЗІМЕ

Эх ты, песня, чароўная песня,
Без Радзімы табе не ўваскрэснуць.
Не бурліць мне вясёлай крыніцай —
Толькі сумам магу падзяліцца.

Людзі радасць на сум не мяняюць.
А што зробіш, як доля такая?
Азіраюся неяк нясмела —
Як ты, песня мая, пасівела.

Грукаціш ты, мой лёс безгалосы,
Як па грэблі драўлянай калёсы.
Душу лечаць адны успаміны...
Вось што значыць жыццё без Радзімы.

## РОДНЫ КРАЙ

Родны край! Як забыць пра раўніну,
Пра багатых палеткаў красу?
Як заўсёды, яны свайму сыну
Прывітанне з Радзімы нясуць.

Ціха гнецца на ветры калоссе,
Мяккі подых шуміць у траве.
Гэта музыку хвалі разносяць,
Плаўна радасці песня плыве.

Яе доўга працягвае рэха
У гадзіну вячэрняй пары,
Бестурботнаю песняй і смехам
Адгукаецца ў сінім бары.

Кожны дзень я трывожна згараю,
Памірыцца з жыццём не магу,
Толькі вы, успаміны аб краю,
Разганяеце ў сэрцы тугу.

* * *

Шумяць ад ветру кіпарысы ўсцяж,
І тоне погляд ў яркай неба сіні.
Мне вецер шэпча: «Адпачні, прыляж,
Няхай душа ад роспачы астыне!»

І бачыць роднае журботны чалавек:
Шумяць бары, вядуць размову гоні;
Азёраў люстры, стужкі срэбных рэк
І ціхія прываблівыя тоні.

О, як прыемна марыць у цішы!
Плывуць, плывуць чароўныя ўспаміны.
Нясу Радзімы вобраз у душы
І так да скону несці не пакіну.

## МАЦІ-БЕЛАРУСЬ

Яшчэ цябе, краіна дарагая,
Як маці родную, да сэрца прытулю,
Пакуль мне смерць адходную заграе
Перад адходам вечным у зямлю.

*10.III.1964*

* * *

З дрэва гук праляціць аднатонна,
Аж самому не верыцца мне:
На чужыне як каркне варона —
Маю душу да дна скалане.

Чорны птах адгукнецца часова,
Сэрца гора агнём прыпячэ.
Я з жыццём не вітаюся словам,
А маўклівым паглядам вачэй.

## КОНЬ

Сам худы, змардавана-санлівы,
Цяжка крочыш з нагі на нагу.
Сніш ты часта зялёныя нівы,
Веснавую касьбу мурагу.

На каменным і брудным бруку,
Ўсё працуючы дзень пры дні,
Надаела табе праз муку
Пад дажджом і пад спёкай гніць.

Я вітаю цябе, вітаю,
У вачах тваіх бачу слязу.
Я таксама няшчасце глытаю,
Свой цяжар непамерны вязу.

Толькі доля мая другая,
Хоць аднолькава цяжка нам:
Гаспадар цябе ў воз запрагае,
Я ж сябе запрагаю сам.

## ПАПЯРЭДЖАННЕ

Так хочацца вам глянуць за мяжу?
На слова не паверыце — я гэтага баюся.
Адно я вам па шчырасці скажу:
Не паддавайцеся мане, спакусе.

Адсюль як моцы ёсць крычу:
Маёй памылкі вы не паўтарыце!
Нам гэты свет зусім не па плячу!
Няма чаму дзівіцца ў гэтым свеце.

Жыцця шляхі на выснаў прывялі:
— Хай б'е пярун, хай крэсляць бліскавіцы,
Трымайцеся вы роднае зямлі,
Як дзеці матчынай трымаюцца спадніцы.

## НА ЧУЖЫНЕ

Калі б сюды буслы ляталі,
Калі б тут ластаўкі жылі,
Мы б крыху меней сумавалі
За морам на чужой зямлі.

Калі б пабачыў дзе на полі
Кароны пышныя дубоў,
Калі б аднойчы ў наваколлі
Зазеляпеў Радзімы бор,

Калі б трашчалі тут сарокі,
Спяваў вясною салавей,
Тады б і гэты край далёкі
Рабіўся крышачку мілей.

Ды іх няма. Жыццё няміла.
Што мне з таго — калі б ды каб...
Дарма патрачаны ўсе сілы,
Я на чужыне вечны раб.

* * *

Кідай, паэт,— а то душа астыне —
    Ты край чужы!
Пра горкі лёс далёка на чужыне
    Ты раскажы.
Я сам свае над галавою цені
    Пераламлю.
Ты апусціся цвёрда на калені,
    Цалуй зямлю.
Калі цябе хто-небудзь запытае,
    Скажы яму:
— Радзімы-маці кветка дарагая —
    Мяжа ўсяму.

## ТРЫЯЛЕТ

Жыццю падзяку пасылаем,
Хоць на зямлі мы толькі госці.
За дні мінулай маладосці
Жыццю падзяку пасылаем.

Гады ідуць. Адходзіць хтосьці...
Цвіце другіх юнацтва маем.
Жыццю падзяку пасылаем,
Хоць на зямлі мы толькі госці.

## СТАРАСЦЬ НА ЧУЖЫНЕ

Не рад ты ні сонцу, ні дому.
Як страшная доля такая!
Калі не патрэбны нікому,
Ніхто цябе больш не чакае.

* * *

Ніхто ў мяне маці
З душы не адніме,
Натхнення багацце
Маё на Радзіме.

Дарогай чужою
Не крочу ў спакусе,
Я ў песні душою
Табе адгукнуся.

* * *

Ты не пытай аб лёсе
І дзе што не збылося,
Чытай па твару рысах,
Як я душою высах.

* * *

Як гублялася ў цемры дарога!
Завірухай яе занясло.
Не хапала і сіл у жывога
Выліць душу ў горычы слоў.

Цяжкі лёд пад далонямі хруснуў.
Хмары зніклі ў паветры, як дым.
Засвяцілася радасць на вуснах —
Гэта мёртвы падняўся жывым.

* * *

Віхры смерці ляцелі ў абдымкі,
Сам не ведаю нават адкуль.
У душы адпраўляў я памінкі
Па сабе з пацалункамі куль.

Шмат чаго паспытаць давялося
На сваім невясёлым вяку.
Нават пушчы ад болю галосяць,
Калі іх пад карэнне сякуць.

Скалясіў я і сушу, і воды,
Адпакутаваў шчырай душой.
Не да густу мне Захаду подых,
Я тут шчасця нідзе не знайшоў.

* * *

Запавет на чужыне такі
Ад бацькоў пераходзіць к дзецям:
Іншаземныя маякі
Тваю ноч не асвецяць.

ЛОС-АНДЖЭЛЕС

Каміны цыбукі як узнімуць,
Цемрай горад закрыюць увесь.
І збіраецца гэтулькі дыму —
Хоць сякеру ў паветры павесь.

* * *

Дарогі мяне прывялі
Да мілай і роднай зямлі.

Ды толькі й гады ўжо не тыя,
Бо пасмы на скронях сівыя.

Як хутка, найлепшы мой госць,
Пабегла ў нябыт маладосць.

Пазаду крывая дарога —
Гарбатая мудрасць старога.

Між родных і блізкіх людзей
Раблюся і я маладзей.

## МІНСК

Свет праменняў над роднай сталіцай,
Я прыйшоў да цябе пакланіцца.

За вялічча тваё і адвагу
Аддаю свайго сэрца прысягу.

Ад дзядоў і да вольных унукаў
Сэрца пульс новым рытмам застукаў.

Жыць табою — жывою крыніцай,
Пакуль сэрца адмовіцца біцца.

## ХАТЫНЬ

Полымя іх папаліла,
Клубіўся над вёскаю дым.
Страшэнная мёртвых магіла —
Вайны напамінак жывым.

Сонца з высокае сіні
Пакуты асвечвае іх.
Званы раздаюцца Хатыні,
Як чорнае вечнасці міг.

## СЯБРАМ

Свежасць думак не завяне,
Аж пакуль я не памру.
Вам сардэчнае вітанне,
Аднадумцам па пяру.

Падніму вышэй я чарку
За сталом паміж сяброў,
Каб крумкач крыві не каркаў,
Атам смерці не зароў.

Ад крыві зямля прамокла —
Войны страшныя былі.
Усё зрабі, каб меч Дамокла
Не пужаў людзей зямлі.

Кроч дарогай чыстай белі,
Свае рукі к міру гні,
Каб жывыя не гарэлі
У раздзьмуханым агні.

Свежасць думак не завяне
І тады, як я памру.
Вам сардэчнае вітанне,
Аднадумцам па пяру.

# Масей Сяднёў

*Масей Сяднёў нарадзіўся 1 верасня 1913 г. у вёсцы Мокрае на Магілёўшчыне (Касцюковіцкі раён). Вучыўся ў Саматэвіцкай сямігодцы, Мсціслаўскім педтэхнікуме, у Мінскім педінстытуце. У 1936 г. быў арыштаваны і высланы на Калыму, дзе прабыў пяць гадоў у сталінскіх лагерах. Перад самай Вялікай Айчыннай вайной быў прывезены ў Мінск на перагляд справы. З прыходам нямецка-фашысцкіх захопнікаў М. Сяднёў апынуўся на волі. Вярнуўся ў в. Мокрае да бацькоў, працаваў на гаспадарцы. У 1943 г. выехаў у Беласток, потым у Берлін. Жыў у Германіі, пасля перасяліўся ў ЗША, дзе жыве і цяпер.*

*Вершы пачаў пісаць яшчэ ў школе. Друкаваўся ў часопісах «Полымя», «Беларуская работніца і сялянка», газетах «Савецкая Беларусь», «Літаратура і мастацтва», «Чырвоная змена», а ў вайну — і ў часопісе «Новы шлях», газетах «Раніца», «Новая дарога», «Беларускі работнік» і інш. У Беластоку падрыхтаваў да друку зборнік вершаў «Ад сына твайго, Беларусь», які быў набраны ў Кёнігсбергу, але згарэў там у пажары. Выдаў кнігі паэзіі «У акіяне ночы» (Рэгенсбург, 1946), «На край святла» (Міхельсдорф, 1947), «Спадзяванні» (Рэгенсбург, 1947), «Цень Янкі Купалы» (Ватэнштат, 1947), «Ля ціхай брамы» (Нью-Йорк, 1956), «Патушаныя зоры» (Мюнхен — Нью-Йорк, 1975), «Ачышчэнне агнём» (Глен Коў — Нью-Йорк. 1986), «А часу больш, чым вечнасць» (Глен Коў — Нью-Йорк, 1989), а таксама раманы «Раман Корзюк» (Нью-Йорк — Мюнхен, 1985), «І той дзень надышоў» (Глен Коў — Нью-Йорк, 1987).*

*У маі 1990 г. М. Сяднёў наведаў Савецкую Беларусь. Часопісы «Маладосць», «Полымя», газеты «Літаратура і мастацтва», «Знамя юности» змясцілі на сваіх старонках яго вершы.*

* * *

То ўскрэсне, то запаліцца, то згасне,
то заімжыць...
Гляджу цяпер назад і бачу ясна —
не ўмеў я жыць.

Ад часу, калі пугай яшчэ ляскаў
і ў полі рос,
глядзеў я з незямною ласкай
у глыбіню нябёс.

І там тануў мой зрок і сам я.
І я і статак — як плылі.
Здавалася — нябёсы ёсць таксама
і на зямлі.

Ды на зямлі было ўсё зямное
і не было нябёс.
Сцярог мяне, стаяў за мною
зямны мой лёс.

Ён так падбаў і ўсё так з'ісціў,
зямны мой лёс,
што ўжо пабачыць, як калісьці,
я не магу нябёс.

## ПАСТУШКА

Ціхі захад у лагчынах
сонца тушыць.
Гоніць статак на спачынак
свой пастушка.

Жыта коласам багатым
даспявае.
Падганяе яна статак
і спявае.

Спеў ліецца і па полю,
і па рэчцы.
Кіне яна хуткі погляд,
усміхнецца.

Асядае пыл на плечы
і на косы.
У траву халодны вечар
роніць росы.

Яркнуць радасцяй нязнанай
яе вочы:
— Сенажаці, лес, паляны,
добрай ночы!

*в. Мокрае.*
*1933*

## АДЗІНСТВА ХАРАСТВА

Свет разнастайны і багаты. Многа
у ім і з'яў, і фарбаў, і прымет.
Але ў бліскапні сонца агнявога
адзінствам хараства чаруе свет.

Растуць зялёным морам травы,
пасля дажджоў такая цішыня!
І сонца вогненная слава
нясе ў руках паходню дня.

Як мудрасць звечная стагоддзяў,
яно нам асвятляе шлях.
Зажмурыш вочы на выгодзе —
і свет звініць тады ў вушах.

Зямля імчыць. І ные цела.
З зямлёй плывеш у забыцці.
Мая душа яшчэ не мела
такога шчасця у жыцці.

Нібы радзіўся зноў ты. Яснасць,
і глыбіня нябёс, і пышны цвет.
Гатоў ад радасці рукамі ўспляснуць —
адзінствам харaства так вабіць свет.

*1935*

## ХВАЛА ВЯСНЕ, ДАЖДЖУ І ГРОМУ

Вясенні цёплы дзень. Палі,
у ціхім дрэмлючы спакоі,
глядзяцца ў неба: — Дождж, палі!
Сыдзі блакітнаю ракою!

Яшчэ ад самае зімы
з густой мы плесняй, ілам, глеем.
Нас асвяжы ты і абмый —
мы ўзрасцем, зазеляпеем.

У гэты кволы, сонны дзень
усе паказваюць прыметы:
згінацца цяжка і гудзець
ад ураджаю будзе лета.

Гарачыня... І абнялі
зусім раптоўна неба хмары.
Яны панура наплылі —
маланка ўміг і гром ударыў.

І лінуў дождж, і зашумеў,
забулькаталі ручаіны.
Забілі кроплі ў голле дрэў,
запахла горкая рабіна.

Яснее поле ад уцех...
Сей, дождж, залочаныя стрэлы!
Густая рунь жытоў расце
і зелянее на свет цэлы.

І дзень такі глыбокі стаў —
санлівая зляцела стома.
Хвала зямлі, хвала жытам,
хвала вясне, дажджу і грому.

## ЖАДАННЕ

Я ляжаў на зямлі і хацеў, каб дажджы
на мяне светлым ліўнем лілі.
Вада неба, і цела, і твар палашчы! —
Я не ўстану з зямлі.

Так прыемна мне. Пара, як дым,
ад мяне клубам валіцца у траву.
Льецца дождж як з вядра. У раку маладым
з ручаямі сплыву.

Пасля сонца наступнага парай з ракі
паднімуся я ў неба... Пракоціцца гром —
і на поле, на рэкі, кусты, лазнякі
упаду я дажджом.

*в. Мокрае.*
*1932*

## СОСНЫ

Са ўсіх сіл намагаліся сосны шумець —
мне хацелі паведаць быліну вякоў.
Я маўкліва стаяў, я хацеў зразумець
іх даўгую аповесць без слоў.

Сосны вецемківалі, вяршыняй траслі
і скідалі кару, нібы медзь.
Я ж маўкліва стаяў — чалавек на зямлі,—
іхнай мовы ніяк я не мог зразумець.

Сосны дыхалі цяжка асілкам-камлём,
пашчапацца на трэскі хацелі яны:
не знаёмы мы з іхнім стагоднім жыццём,—
спіць быліна сівой старыны.

*в. Мокрае*

## У ДАРОЗЕ

Падае снег апаўночы,
ліпне на голлі ялін.
Дрэмле маўклівая змрочнасць
ціхіх далін.

Падае снег. Пасцілае
ночцы пасцель на начлег.
Белае поле без краю —
снег і снег.

Поўніцца радасцяй сэрца,
шчасцем нязнаных уцех.
Што гэты снег!
Мне здаецца —
тае ад сэрца снег.

Сэрца маё весяліцца,
б'ецца гарачы ў ім смех.
Сэрцу майму толькі сніцца
белы апоўначы снег.

## ХУТЧЭЙ, ЗАРА!

Хутчэй, зара! Хутчэй, зара!
Нямая цемень — на згiноту!
Ты не прынесла мне дабра,
мая начная адзiнота.

Узвiйся, дзень! Вядзi хутчэй
мяне да радаснага дому!
Я не магу забыць вачэй,
такiх прынадных i знаёмых.

Прэч, адзiнота ночы! Я
табе ў дар песень не прынашу —
душа заходзiцца мая
па незабыўнай i харошай.

Узвiйся ж, дзень! Вядзi хутчэй
мяне да радаснага дому!
Я не магу забыць вачэй,
такiх прынадных i знаёмых.

## НЕ I ТАК

Я нясмела ў яе i засмучана
запытаў, цi кахаеш мяне?
Яна кiнула ў вочы балючае,
ганарлiвае: не!

Бедаваў, гараваў па ёй колькi я!
Завязалася кашка вясной на сасне —
запытаўся яшчэ ў яе. Колкае,
тое самае: не!

Стаў хадзiць танцаваць на зарэчча я —
час ляцiць, завiрухай iмкне.
Зноў спытаўся ў яе. Прымiрэнчае:
— Я не ведаю... не.

Стаў хадзiць да другое i лiпнуць я.
Весялюся, спяваю, лайдак.
Цi кахаеш, скажы? Са слязамi i ўсхлiпамi
адказала мне: так.

## МАЁ ХУЛІГАНСТВА

Ларыёнаў сын?
Хлапец няшкодны —
пазайздросціць могуць
іншыя такому.
Ад маленства басаногага, лагодны,
ён вады не замуціў нікому.

Яго свет —
бацькоўская ў хаце лава.
Свайго носу ўсюды ён не ткае.
Адным словам — добры хлопец.
Слава
пра мяне ў сяле ішла такая.

Так і рос.
Дзеля таго, што бацька
мой не быў ні знатным, ні багатым —
не гуляў я ў расфарбованыя цацкі,
а ў палёх накручваў я хвасты цялятам.

Я на кожным дрэве крыжык нейкі высек.
Падпаясваўся вяроўкай туга.
Каб хаваліся ў блакітнай высі,
кідаў я каменьчыкі із пугі...

Тыя дні мінулі
хутка, нечакана.
Прараслі ля рэчкі ніцаю лазою.
Там калісьці, сном закалыханы,
напаіў я вочы чыстаю расою.

Увабраўся ў сілу.
Але, зашчаслівы,
калі ноч за хатай змрок замесіць,
ад пачуццяў хмельнага наплыву
кідаў я каменьчыкі у месяц.

Вось тады, у змрок бялявай ночы,
да мяне прыйшла адна паненка
і сказала, глянуўшы мне ў вочы:
— Гэта ж хуліганства, даражэнькі...

Напаіла пахам рук сваіх васковых,
абдала валос прыбоем п'яным.
З тае ночы у глушы вясковай
стаў я непапраўным хуліганам.

І цяпер, каб быць ізноў шчаслівым,
толькі ноч за хатай змрок замесіць,
ад пачуццяў хмельнага наплыву
хочацца кідаць каменьчыкі у месяц.

## З НАРОДНАГА ЛАДУ

**(вяселле)**

Пры смяху і жарце
спірт-гарэлку жарце!

Хай пячэ і шчыміць
бабе і мужчыне.

Пусціліся ў скокі
бабы як сарокі.

Выбірай каторую
хочаш катэгорыю:
тонкую хіслявую,
моцную ці млявую.

Блісне як зарніцаю
іншая спадніцаю.

Адна вабіць песнямі
а другая — персямі.

— Вы, мужчыны, не глядзіце,—
кажуць бабы,— на спадніцы!

— Засвяціце вы штанамі,—
кажуць бабы,— паміж намі!

— Ні бяды ні згубы
цалаваць у губы.
— Ціха і ўвішна,
абы толькі выйшла!

## ЖЫЦЦЁ

Добра жыць на свеце бесклапотным
і не мецьніякіх пудных спраў,
выйсці ў поле, нахадзіцца, потым
зваліцца ў зелень цёплых траў.

Сонцу ледзь зажмураныя вочы
падстаўляць і чуць яго цяпло.
І тады і верыць нат не хочаш,
што з душы зямное адплыло.

Цешышся сабою і ўсім светам,
разамлеласць спешчаную п'еш.
Мімаволі робішся паэтам,
сам сабою наплывае верш.

...Светлае заносіць лёгкім дымам,
дум няўтомных зноў снуецца ніць.
Бесклапотным быць нам немагчыма,
немагчыма на зямлі не жыць.

## СНЕГАПАД

Развітаўся з табой назаўсёды як быццам я —
горда і смела.
У завулках завеямі злосна круціла зіма.
Да цябе я не йшоў, хоць і сэрца хацела —
я чакаў, покуль ты не паклічаш сама.

Цэлы тыдзень у хату маю ветры лютыя білі.
Кожны дзень я ішоў да цябе і вяртаўся назад.
Але раптам спакой лёг на цэлыя мілі,
і уночы пачаўся лагодны, як пух, снегапад.

Раніцою было невымоўна ўсё бела.
Як размочаны цукар, сінявата-халодная гасла імгла.
Чысціні дакрануцца нага нічыя не пасмела,
толькі сцежка адна да парога твайго пралягла.

## ПРОСЬБА

Пабудзь ганчаром на хвіліну —
не вельмі вялікі тут дар.
Паслухай мяне ты, дзяўчыну,—
нядрэннае слова: ганчар.

Наладзь мне гаршчочак во гэты
(яна яго круціць ў руках).
Усё ўмець павінны паэты —
і ўсмешка мільгнула ў губах.

Не ўмееш? Ну, значыцца, смачнай
не будзеш і кашы ты есць.
І мець к табе будзе няўдзячнасць
мой бацька — твой будучы цесць.

Ён скажа: пяро — гэта мала,
трымай лепш тапор ты як след.
А слава была і прапала,
гультай ты, пястун, дармаед.

Пабудзь ганчаром на хвіліну —
не вельмі вялікі тут дар.
Паслухай мяне ты, дзяўчыну,—
нядрэннае слова: ганчар.

*в. Мокрае*

## ДОМІК У МІНСКУ

Драўляны дом, блакітны дом!
Маіх найлепшых мар прытулак!
Ці так жа ўсё сваім акном
глядзіш на вузенькі завулак?

Ці шчасцем ты сваім багат,
ці шашаль сцены твае губіць?
Ці так жа ўсё зялёны сад
тваю ідылію галубіць?

Скажы ты мне, скажы ты мне,
дзе зараз тая, што начамі
малілася сваёй вясне —
такая... з сінімі вачамі?

Ці ёй цяпер, як і тады,
ад нечага ўсё сумна, цяжка?
Як пражывае малады
свой век прыгожая манашка?

Што з ёй цяпер? Свой ціхі сум
яна ў вачох па мне ці носіць?
Гаротнасць цяжкіх яе дум
каго развеяць яна просіць?

Драўляны дом, пястуй свой сон,
гадуй у садзе свой спачынак!
Ты мар найлепшых пантэон,
адзіны дум маіх прыпынак.

## МАЛЕНСТВА

Што калісь жыло і што пела,
яшчэ раз ты, памяць, кранi!
Прайшлі, як дажджы адзвінелі,
маленства глыбокія дні.

Прайшлі над маёй галавою,
як сонца ідзе на вясне.
І толькі іскрой залатою
вы ў снох мільгніцё без мяне.

О, дуб на сівым на кургане,
і сосны адвечных палян!
Я помню, у вас закаханы,
ад радасці новай быў п'ян.

О, дзень мой, дагледжаны дзедам,
былое вярнуцца прымусь!
Усё, што узнаў я, што зведаў,
завецца цяпер Беларусь.

Я мог весяліцца і плакаць...
Ўзвіхрыся, мой горды скакун!
За рэчку, на сочную мякаць,
я зноў паганю мой табун.

У поле, у пушчы, у высь я
начным засвішчу салаўём.
Нявіннасць, нявіннасць, вярніся!
Вярніся маленства маё!

*в. Мокрае*

## РАЗВІТАННЕ З ЛЕТАМ

Яшчэ зямля ў зяленіве жыве
і сонцам жнівеньскім яшчэ сагрэта,
ды бачу я па смуглай сіняве —
канчаецца раптоўна лета.

Нішто да сонца так вясёла не імкне,
і глыбіня нябёс ужо не тая...
Там, на радзіме, ціха без мяне
апошнім цветам краскі адцвітаюць.

Не давялося мне ў палёх пажыць,
пачуць, як сок зямлі ўпіваюць травы.
Злавіць, замёршы сэрцам ніць
яшчэ нязведанай праявы.

Не давялося мне... Ды што казаць,
мне шмат чаго ў жыцці не давялося.
І толькі сніцца мне азёраў гладзь
ды недаслуханы напеў калосся.

Яшчэ зямля ў зяленіве жыве
і сонцам жнівеньскім яшчэ сагрэта,
ды бачу я па смуглай сіняве —
канчаецца раптоўна лета.

## ПРАДЧУВАННЕ

Больш у полі я не заначую,
кіну я зялёную бярлогу:
у аддалях цёмнай пушчы чую
сэрцам я асеннюю трывогу.

На зямлю і лісце не апала,
і палі жывуць так, як і ўчора.
Як раней, сягоння сонца ўстала,
як раней свяцілі — свецяць зоры.

Знаю я — і лета не загіне:
прывязуць яго сяляне ў гумны.
І не ляжа дзень у дамавіну —
ён згарыць у золаце, задумны.

Але ў полі я не заначую,
кіну я зялёную бярлогу:
у аддалях, цёмнай пушчы чую
сэрцам я асеннюю трывогу.

*в. Мокрае*

# *Патушаныя зоры*

## ЖАХ

Параніла сябе густая ноч
на ледзяных нажах.
Турма. Як бляск вар'яцкіх воч,
у вокнах б'ецца жах.

Нібы атручаны чумой,
маўчыць турэмны двор.
У гэтай вусцішы нямой
я ледзь ад страху не памёр.

Цялячы крык упаў на брук
і — лужына крыві.
І нейчы голас: — Пальцы рук
сціскай мацней, даві!

Заплакаў двор за гэты грэх,
крывёю — капяжы.
Яны, сцякаючы са стрэх,
застылі у нажы.

А думаў я, што гэта ноч
параніла сябе на ледзяных нажах —
турма. Як бляск вар'яцкіх воч,
у вокнах б'ецца жах.

*Мінск, турма*

## УНОЧЫ

Толькі я лягу і вочы зажмуру,
толькі растану у начнай цішы,
пад здрыгі таемныя муру
песня снуецца ў душы.

Просіцца песня на волю —
У неспазнаны шчэ свет.
Песня мая, ты не мучайся болей —
волі не мае твой ціхі паэт.

Не заляцець табе птушкай за краты,
колькі ні бíся гарачым крылом:
у сутарэнні, галубка мая ты,
разам з табою памром.

*Мінск, турма*

* * *

Жудка. Цемень мне сэрца гняце.
Аніяк не магу я заплюшчыць воч:
як у чорную яму, ў густой цемнаце,
імчацца трамваі у ноч.

Мне здаецца, што з рэек пазбеглі яны
і, б'ючыся на трэскі, у пекла ляцяць.
Насядаюць адзін на адзін, як званы,
і ніякай іх сіле на гэтым шляху не суняць.

Дык хутчэй жа, хутчэй жа нясецеся вы!
Каб стрымоўвалі вас — не хачу! —
У нямое прадонне, на скрут галавы,
я са звонам такім жа лячу.

*Мінск, турма*

* * *

Затуманілася даль,
не відаць лясоў амаль —
дождж. На сэрцы тлее жаль.

Дрэвы мокрыя ў садах
голле звесілі на дах,—
пад страху забіўся птах.

Многа дзірак у страсе —
мокне птушка пакрысе,
смутак сэрца моцна ссе.

А дождж б'е усё званчэй,
і адна аднэй хутчэй
слёзы капаюць з вачэй.

*Мінск, турма*

* * *

Хадзіў я ў пустыні і ціхім і сумным
і злосна няволю сваю праклінаў.
Здавалася лішнім, зусім неразумным
усё, што на свеце любіў я і знаў.

І сам я сабе быў не рады, і мары
мае маладосці, і сноў маіх боль
былі мне цяпер — нібы зманлівасць чараў,
нібы весялосці начной алкаголь.

Цікавасць — сястра маіх год адзвінелых —
прапала, і міма халодных вачэй
праходзіць у фарбах усё анямелых,
знікае, як сон адзінокіх начэй.

Не хочацца жыць, а памерці — шчэ болей,
жывеш на зямлі і не знаеш зачым.
Чаму ж не хапае адвагі і волі
сябе задушыць у гушчары лясным?

*Калыма*

## ЗМАНЛІВАСЦЬ

Сядзела ты ў чорным за чорнаю кнігай
і моўчкі чытала, а я
сачыў за тваім кажным мігам
і ціха шаптаў: «Каралеўна мая...»

Ад чорнае кнігі прыгожых вачэй,
самотных падняць не магла ты.
— Канчайце чытаць, каралеўна, хутчэй
і пойдзем у сад наш, цудоўны, багаты.

— Чакай ты. Аб шчасці тваім і сваім,
аб нашым загубленым шчасці,
павінна узнаць я, каб нам, маладым,
ў жыцці не было больш напасцяў.

— І пойдзем з табою тады мы у сад,
як гэтую кнігу я ўсю дачытаю.
Жыццё наша болей не пойдзе на спад,
вясна наша будзе ўсягды маладая.

— І будзе у цвецені сад наш бялець,
раіцца ў ім будуць вясёлыя пчолы.
Мы ж будзем з табою ў абдымках гарэць
і піць асалоду жыцця, нібы пчолы.

Прачнуўся. Са мной каралеўны няма.
І толькі са мной каралеўна-няволя.
Ды стукае ў сцены марозам зіма,
гуляе па беламу, чыстаму полю.

*Калыма*

## ЖЫЦЦЁ

Чырвоны ліст жыцця апаў,
хістаецца, як цень, шкілет.
Прайшоў пачуццяў маіх пал,
знік вобразаў таемны свет.

Ім я валодаў, ён трымаў
мяне ў палоне чар сваіх.
Як шум дажджоў, як шэлест траў,
адхваляваў ён і заціх.

Парою толькі ў цяжкім сне,
як дум маркотных не зглушу,
ён бліскавіцай мільгане,
параніць змёрлую душу

і кане зноў у небыццё,
і шкода робіцца надзей.
Свайго,— гаворыць мне жыццё,—
не дасягаў ніхто з людзей.

*Калыма*

* * *

Хацеў бы ўзяць цяпер я посах,
пайсці далінамі, лясамі.
Хадзіць, забыўшы ўсё, па росах
хацеў бы я да смерці самай.

Я б там не быў, дзе вецер свішча —
зайшоў бы ў ціхасць Белавежы.
Сядзеў бы там каля агнішча,
да горла б там было мне ежы.

І са звярынаю ганнёю
дзяліў бы ўсе мае прыгоды.
Я б захапляўся дзіўнаю ігрою
непаміраючай прыроды.

Знайшоў бы я заспакаенне,
ад хаосу аддзелены зямнога.
Другое б я пазнаў вучэнне —
вучэнне не хацець нічога.

## ТАВАРЫШОМ

Таварышы далёкія мае!
Я п'ю штодня атруту зелля:
мне супакою не дае
цудоўны час мінулага вяселля.

Варушыцца ў вачох імкліва муць —
то вобразы знаёмыя мільгаюць.
Нябожчыкамі дні ўстаюць,
мяне настойліва, як цені, абступаюць.

Завуць мяне ў мінулае адплыць,
упіцца хмельнасцяй юнацтва.
Завуць спакусліва яшчэ пажыць
хвілінамі кахання і мастацтва.

Але дарма варушыцеся вы —
турмы я скуты кайданамі.
Цяжкім схіленнем галавы
я развітаюся навекі з вамі.

Таварышы, гуляйце без мяне,
няхай бяжыць ваш час вяселля.
Пра ўсё забыць каб хоць у сне,
я буду піць атруту зелля.

*Мінск, турма*

# КРЫВІЧОМ

Нібы дзеці забітых ваўчых,
не спазнаўшыся добра з гняздом,
па дарогах мы ходзім чужых
і не знаем, дзе хата, наш дом.

Старадаўны разбураны быт,
дом раскідан, адвечны курган
ваш рыдлёўкай бязбожна разрыт
і развеян спакою туман.

Вашы косці іржа праз гады
у балотах забруджаных есць.
Вашай славы стаптаны сляды
і спаганена вашая чэсць.

Ваша імя святое цяпер
вырываюць з крывёю ў жывых.
І смяецца у вус крыважэр
над ахвярамі ўчынкаў сваіх.

Заімшэлыя скрозь дзірваны,
б'юць крыніцы ключом вашы ледзь.
На руінах сівой старыны
здох апошні вялізны мядзведзь.

Паліняў, у задуме стаіць
край адвечнай, жывой пекнаты.
Аб вас гутарка ў свет не бяжыць,
закаціўся ваш век залаты.

Адзвінеўшы, ў імгле ён заціх.
Глум нясцерпны і гвалт і кірмаш.
У няволі сярод чужых
паміpae патомак ваш.

*Калыма*

## ЗДРАЙЦАМ

Я вашу знаў ману, ліслівасць,
усім вам, здрайцам, знаў цану,
але дарыў вам дум імклівасць
і згадкі я пра даўніну.

Усе былі вы ў захапленні,
мяне ўзнімалі да нябёс.
То вы маўчалі ўсе, як цені,
то рагаталі вы да слёз.

А нада мною чорнай плямай
звісала здрада і паўзла:
нарыхтавалі вы мне яму,
паборнікі нікчэмнасці і зла.

Упаў... Чаго вы ўсе хацелі,
ніхто падумаць з вас не ўмеў —
вы ўсе ад злосці вар'яцелі,
што розум я і сэрца меў.

Чакайце ж вы, сляпыя совы,
не смейцеся, што я ў мурах.
Як перуном, адзіным словам
вас разнясу я ў пух і прах.

*Мінск, турма*

* * *

Мусіць, больш не маючы нічога,
маці мне мая дала жалейку.
Ды пачуўся голас духу злога:
— Згінеш ты, Масей, не за капейку.

Граць пачаў я думку сваю, мару,
гадаваць я песню-дабрадзейку,
ажно каркнула, нагнаўшы хмару:
— Згінеш ты, Масей, не за капейку.

Захапіўся песняй я сваёю,
падкаваў я рыфмай чарадзейку.
Толькі ж грымнула над галавою:
— Згінеш ты, Масей, не за капейку.

Я ў няволі. Маці, мая маці,
ну, нашто дала ты мне жалейку?
Маёй песні болей не ўзвівацца —
згінуў, згінуў я не за капейку.

*Новасібірск, канцлагер*

## МАІМ БАЦЬКОМ

Родныя, не плачце пры ўспаміне —
не загіне ваш бяздомны сын:
я прыйду з далёкай чужыны,
змучаны выгнаннем, на спачын.

Утаю я сэрца свайго раны,
абаб'ю з адзення пыл дарог.
Усхвалёваны душою, стану
на даўно пакінуты парог.

Долі падуладжаны жабрачай,
зведаўшы і сцюжу і самум,
з радасці і з гора я заплачу
і усіх вас, родных, абніму.

Я прыйду да ціхіх да сялібаў,
мне з маленства блізкіх, я прыйду,
я знайду хаціну нашу з ліпай,
толькі вас я, мусіць, не знайду.

Вось затым я часта-часта плачу
і схіляю долу галаву.
Долі падуладжаны жабрачай,
на зямлі жыву і не жыву.

*Новасібірск*

## ДА ПЕСНЯЎ

Нашто вас, песні, я складаю,
згасаючы ў нямой цішы?
Нікога сёння я не маю,
пагаварыць каб ад душы.

Я скуты ў цёмным сутарэнні,
я загараюся агнём,
ды думы ўсе і ўсе імкненні
тут робяцца дарэмным тлом.

Так кожны дзень бяссільна б'юся,
у галаве — страшэнны тлум...
Ніхто з радзімай Беларусі
не прачытае маіх дум.

*Мінск, турма*

# *На маршрутах*

## ІНВАЛІД

На вуліцы снуе ў клапотах дня народ,
густым і плаўкім сонцам вуліца заліта.
На вуліцы шырокай — там, дзе пераход —
закалыхалася няўпэўненая постаць інваліда.

Ён быў на ўсіх франтох задымленай вайны —
прайшоў і з славаю героя нараспашку.
Глядзеў не раз у твар самога сатаны,—
цяпер праз вуліцу прайсці яму занадта цяжка.

Спыніўся той, другі — яму глядзяць услед.
А ён як бы усё трапечацца на месцы.
І я гатоў быў хоць у свет
падняць яго і на сабе панесці.

Я за яго душой сваёю гас,
спагада у крыві агнём пякучым тлела.
З дакорам ён глядзеў на нас —
журботна і нясмела.

## УСЦЕШАНЫЯ ГЕНІІ

Бамбілі ноч усю Берлін.
Ад дыму душна было ў скверы.
Мы згінулі б, напэўна, як адзін,
каб у збаўленне не было ў нас веры.

Багі нас берaглі, калі,
не дачакаўшыся адбою,
мы выпаўзалі з-пад зямлі,
каб не памерці пад зямлёю.

А там, праз вуліцу дамы
рассыпаліся грудай цэглы.
Якая праўда! Радваліся мы,
што там не мы палеглі.

...Ды раніцай зноў сонца і цяпло.
Лічылі мы, каго не стала.
І толькі геніі, схіляючы чало,
нам кланяліся з п'едэсталаў.

## З «ГІСТАРЫЧНЫХ ДАТАЎ»

Вецер сцягі над рэйхстагам чысціў.
Варта надзейная: спі, не...
Моцна стаяў рэйхстаг калісьці
на гітлераўскай спіне.

З неба, сінеючага патопу,
арлы яго — страх зямлі —
у кволае цемя Еўропы,
падаючы, дзяўблі.

Заакіянскі свет дзівіўся —
паволі ён плыў на караблёх.
І гітлераўскіх дывізій
цень хмуры на зямлю лёг.

І сіняе неба над намі
кавалкамі бомбаў ляцела.
Еўропа — старая дама —
упала бяскроўным целам.

. . . . . . . . . . .

І вецер сцягі не чысціць,
і варце ўсё роўна: спі, не...
Цяжка стаяў рэйхстаг калісьці
на нашай спіне.

## ЦЯЖКІ АДКАЗ

Гора вучыць таксама.
Задуменны пагляд:
— Мама,
чаму тата не едзе назад?

Цягнікі грукацелі
міма нас.
Я расла у пасцелі
доўгі час.

І магчыма, што тату
міма нашае хаты
правязла вайна,
ты ж казала — благая яна.

Сустракаць на паўстанак
я хаджу часта ў сне.
Ды там зала пустая
цішынёю пужае мяне.

Хтось акенца адчыніць,—
такі страшны, бляды:
— Ты чаго зноў, дзяўчынка,
завітала сюды?

— Сустракаць свайго бацьку —
ён не ехаў з вайны,
хоць у сне я ўжо чула багацька,
як аб ім б'юць на цэрквах званы.

Гавару я заўсёды, што выслю —
так не ўцяміла б век-вякоў.
Вы адтуль, магчыма, наўмысля
не пушчаеце цягнікоў?

— Не палохайся — не аблаю.
І слязы не пушчай ціхама.
Ты не ведаеш хіба, малая,
што адтуль цягнікоў няма.

Гора вучыць таксама.
Задуменны пагляд:
— Мама,
ці прыедзе наш тата назад?

Так ніколі, ні разу
не ўзнімала вачэй,
не прасіла адказу
як збаўлення хутчэй.

## СТРАХ

Не бойся — гэта нехта грукнуў,
а у душы тваёй падняўся страх
і выцягнуў няведамыя рукі,
каб ухапіцца за цябе, маленькая сястра.

Вось так мяне за шыю абнімі,
не прыслухоўвайся, што робіцца там,
за сцяною.
Ты прырастаеш да мяне грудзьмі,
ды чуеш страх спіною.

А страх, малая,— гэта толькі страх
і у сапраўднасці нямашка страху.
Засні, маленькая, твой страх
...ад страху.

*1953*

## ВАЙНА ЦІШЫНІ

Пад нагамі рыпяць ступені.
Кола выкацілі у сад.
Дом, утраціўшы сілу счаплення,
апушчаецца на фасад.

Павяртаючыся, абмінулі
гаманкія дарогі млын —
заімшэлы, сівы, аб мінулым
насцярожаны успамін.

Сустракалася ўсюды вайна са мною,
бачыў я і руіны руін.
Але тут — цішыня вайною
дзень і ноч наступала на млын.

## НА СПЫНКУ

Прайсці, мінуць і не заўважыць
і толькі сум у сэрцы зберагчы.
Хіба не просяць душы вашы
цяпер спачынку уначы?

На вуліцу другую крута
вунь павярнуў дрыготліва трамвай.
Дарэмна я крычаў: «Кандуктар!
Хоць на часінку затрымай!»

Застаўся я на перасядцы
і не сагрэюся ў плашчы.
І досвіткі ўжо не прысняцца
на гэтым беразе начы.

Пагасла мігаценне ў высі
і хмары пачалі дажджыць...
Таму, хто ў сённяшнім спыніўся,
да заўтрашняга не дажыць...

## ЖАБРАКУ

Як сон няжданы наяву,
стаіш, схіліўшыся ты каля брамы.
Падняўшы горда галаву,
праходзяць паўз цябе паны і дамы.

Анучы на табе — не паліто,
яны ўсе знатныя уборам.
Не даў табе нічога з іх ніхто —
спыніцца ля цябе ім сорам.

Як быццам тут не чалавек,
а камень нечакана вырас.
«От і дае ж прырода недарэк —
не чалавек, а чалавечы выраз».

Нічога дзіўнага! Яны б
прайшлі і бацьку свайго міма,
прайшлі б, як непатрэбны грыб
праходзяць, не спыніўшыся вачыма.

Прабач, жабрача, ім. Як ты,
з табой я стану каля брамы,
каб весялей было табе. «Браты»,
падумаюць паны і дамы.

## ПРАГА

Мінуў чужых я колькі гарадоў —
дарожная на вуснах запяклася смага.
Не знала ты яшчэ маіх слядоў,
абраная наўмысна мною Прага.

Ад готыкі суровай стыгне кроў,
яна не песціць, а пужае
і ўночы забірае ціхасць сноў, —
ты ж, Прага, для мяне не так чужая.

Табе вядомы роду майго лёс,
ты і сама зіхціш у промнях яго славы.
Я крыўду да людзей чужых прывёз,
каб утапіць яе ў тваёй Валтаве.

Я ўспамінаю край свой — гора, жудзь,—
тваё разглядваючы сцэны.
Над ім хмурынкі лёгкія плывуць
у накіпе празрыста-белай пены.

І песню я табе сваю пяю,
і слаўлю я цябе, зямлі чужой сталіца,
што даўніну прыпомніла маю,
што майго краю неба ў зорках сніцца.

## ДАРОЖНЫЯ ЎРАЖАННІ

Я з дымнага гораду выехаў сяння
пачуць, што вясною гаворыць зямля.
Забыўшы на стрэчы і сум развітання,
я польнай дарогай ішоў спакваля.

Я самы свабодны на свеце — чатыры
аднолькава вабяць мяне стараны.
Я самы багаты, гаворачы шчыра —
кішэняў не маюць мае штаны.

Нідзе і нікому я больш не належу,
як выбіты ветрам гусіны пух.
Пузаты памешчык за дзесяць галежаў
патрапіць запрэгчы мяне у плуг.

Глядзеце — працуюць, нібы тыя коні,
счарнелыя, быццам зямля, парабкі.
Адчуў я калянасць іх моцных далоняў
кволым хрустам свае рукі.

Гавораць, у Чэхіі добра. Не знаю —
пазнаць не прыйшлося мне ўсіх уцех.
Ды толькі скажу я сабе і краю —
як добра, што я не чэх.

*Прага*

* * *

Вёрсты шлях мой далёкі пакрылі,
боль у сэрцы маім,
што гадамі насіў, не заціх.
Нібы птушка пярынкі з крылляў,
разгубляў я па свеце
самых родных і дарагіх.

Як ляцець мне у свет шырокі?
Белы цвет мае песні
не дажджом — капытамі прыбіт.
Абяссіленай і адзінокай,
яна падае з плачам
на чужы і халодны граніт.

Паляту, паляту на радзіму,
маёй песні вандроўнай
лёгкі пух абраню.
Мо яна пранясецца не міма,
а на сонечным полі
заваражыць праменняў гульню.

*Берлін*

## СНЕЖАНЬ

Каляндар лістае месяц снежань.
На маёй радзіме, пэўна, снег.
Вечароў не п'юць дзяўчаты свежасць,
хлопцы ў полі кінулі начлег.

Снег засыпаў вуліцы і поле —
не знайсці табе слядоў маіх.
У хвіліну цяжкую ніколі
не глядзець табе цяпер на іх.

Снежань выбеліў усё на свеце,
заляпляе бель пагляд вачэй.
Бела ўсё і сонцам усё свеціць,
ды душа твая чарней начэй.

Каляндар, гартай лагодны снежань,
белую пасцель начам сцялі.
Разлівай успененую свежасць —
я забыт не ўсімі на зямлі.

## МАЙМУ НАЧНОМУ СЯБРУ

Месяц, мой сябра самотнасці, ці ж
ніколі ў жыцці ты, як людзі, не плакаў?
Круглаю мордай на ўсё ты глядзіш,
неба начнога вясёлы гуляка.

Праходзіш табе накановаы круг
дакладна, размерана — кропка ад кропкі.
На нашу зямлю — мітусліва-спалоханы рух —
глядзіш, як на месца людской салатопкі.

І я быў таксама calісьці, як ты —
у полі, на вуліцы жыў я начамі.
Напіўшыся ўволю тваёй пекнаты,
на ўсходзе зару адмыкаў залатымі ключамі.

Прайшло тое хутка — свавольнасць і пал,—
разводзіць дарэмна па часе рукамі.
У золаце зорак сябе ты купаў,
а я піў вільготнасць крывёю апырсканых
камер.

І сёння ты — хлопец маўклівай начы,
а я да цябе вось з адною мальбою:
туманам клубіцца ў лагох навучы,
да сонца не спаць мне з табою.

*Берлін, 1944*

* * *

Я хачу, каб мне жыццё, нягоды
не схілялі нізка галаву.
Але ў час глухое непагоды
сам не знаю, да чаго я дажыву.

Валачуся толькі я па свеце,
марыць я пра лепшае адвык —
патушыла полымя ў паэце
холаднасць няўмольная ўладык.

Я цяпер шукаю ўжо другога —
каб аддацца ласцы нейчых рук
і, нібы за пазухай у Бога,
зноў забыцца ад балесных мук.

...У цябе — звычайную такую —
я па вушы самыя уліп.
Сніцца мне: цэцэрукі такуюць,
пахне цветам зацвіцелых ліп.

## НАД МОРАМ

— Што з табой і што ты робіш, Валя?
Ці жывеш ты дзе на свеце белым?
Пырснула у вочы пенай хваля,
адплыла назад у шуме смелым.

— Ці жыве у сэрцы тваім сіла,
што злучала нас, як вера ў Бога? —
Хлюпнула у бераг і ступні абмыла,
толькі не сказала мне нічога.

Сум няўтольны маю я па той дзяўчыне,
што за морам дзесьці, у пацёмках шэрых.
Я зраблюся, мора, як само ты, сінім,
толькі выкінь, мора, на другі свой бераг.

## З НЕДАСЛАНЫХ ЛІСТОЎ

### I

Тут не такая, Ліда, старана —
жыццё маё ідзе зусім няўдала.
Таму вось толькі ты адна
паэзіяй маёй завaладала.

Самотнасцяй туманю галаву
і сэрца цешу стрэчаю зімовай.
А мне гавораць — так жыву,
што не знаёмы я з тутэйшай мовай.

Яно, напэўна, так. Але
заўсёды людзі могуць памыліцца.
Не кожны можа у імгле
свяціць агністаю зарніцай.

Мне люба гаварыць з табою. Зноў
я вечароў разбіў глухую змову.
Як насалоду дзіўных сноў,
ты разумееш маю мову.

Цікавых, знаю, будзе шмат,
каб прачытаць ім слова ў слова.
Зрабіўшы здзіўлены пагляд,
скажы ім толькі: ад Сяднёва.

### II

Няма куды пайсці — чужая змова.
Прыемна думаць мне, што ёсць на свеце ты.
Каб перажыць усё яшчэ нанова,
Гартаю зноў я недасланыя лісты.

Жывуць яны маім нутром і свецяць
блакітным небам леташняй вясны.
Іх не для славы я друкую у газеце —
на пошукі цябе няхай ідуць яны.

Нясуць табе цяпло майго дыхання,
сагрэтага наплывам пачуцця.
Тут, на зямлі, без ласкі і кахання,
скажу — няма сапраўднага жыцця.

Мне за сябе не сорамна. Ніколі
чужому звычаю я не складаў хвалы.
Нібы праз сон, у першараднай ролі
твой вобраз мне смяецца і з імглы.

...Па рэчцы плавае гусак з гусыняй,
знайшоўшы дружбу мірную ў трысці.
Усё тамілася у нейкай мляўкай сіні —
нікуды больш нам не хацелася ісці.

Мне гэтае прыйшло само, да слова,
прыйшло таму, што ёсць на свеце ты.
Каб перажыць усё яшчэ нанова,
пішу сягоння гэтыя лісты.

III

Хацеў я напісаць табе даўно,
але ўсё нейк часу не хапала.
Жыву сярод чужых. Пішу адно,
але і з пісаніны толку мала.

Усё не так укладваецца ў верш,
і крытык лае, кажа, што пагана.
Самім сабой, як хочаш, не жывеш,
старая не залечваецца рана.

Атрутай дзён яна гнаіцца зноў,
зноў па-ранейшаму і сумна і балесне.
Жыве наплывам чорных сноў
мая няспраўджаная песня.

З пацёмак вечароў, гарачых і густых,
шукаю я да прахалоды выйсця.
Ды не дайсці мне да крыніцаў тых,
з якіх мы, прагныя, пілі калісьці.

Засмягласць не праходзіць губ
і вольна не злятае слова.
Пісаць сягоння больш я не магу.—
З пашанай да цябе.
Бывай здарова.

## РАЗВІТАННЕ

Ну, нашто, ну нашто сваё сэрца я мучаю? —
Я па ўсім цяпер бачу, што ты — не мая.
Грае восень у полі нам песню разлучынаў —
гэта знаеш і ты, гэта знаю і я.

Самым тонкім, празрыстым, нібы павалокаю,
зацягнуліся лужыны ўночы лядком.
Тваё сэрца цяпер — таямніца глыбокая,
але я без сумлеву яе назаву халадком.

Не глядзеўшы мне ў вочы, нібы вінаватая,
ты маю абыякава, хутка пускаеш руку.
І зусім несвядома, ўсягды зухаватая,
чаравічкам ты водзіш сваім па пяску.

Недарэчы гаворыш ты мне, што ўжо выпілі
сок зямлі вераснёвых начэй халады,
а зіма — ледзяное дыханне —
бязлітасным кіпенем
хутка спыніць у рэках цячэнне вады.

Дык нашто, дык нашто сваё сэрца я мучаю?
Я па ўсім цяпер бачу, што ты не мая.
Але ў тое, што песню разлучынаў
грае восень для нас — не хацеў бы
услухвацца я.

## СІНІЯ ВОЧЫ

Свісток —
і ў вагоне жаўнер,
і на пероне сінія вочы
рукою махаюць — туга і давер
у зграбнай пастаці дзявочай.

О, гэтыя вочы і гэта пастаць
з чароўнай усмешкаю весняй!
Далей бы не ехаць, навекі тут стаць
хаценнем, паглядам і песняй.

Ды ўвоміг рвануўся цягнік,
ударыла пылам і ветрам.
Як бы і не было яго — знік,
грукочучы гулка у нетрах.

Праз вокны глядзеў на палі
жаўнер, і як быццам уночы,
нічога не бачыў — цвілі і плылі
толькі пастаць і сінія вочы...

*1960*

## ХУСЦІНКІ

Сягоння дзень мілейшы за ўсе дні —
узяў кавалачак маленькі мыла,
хусцінкі дзве я выняў з кішані,
што на дарогу ты мне падарыла.

Празрысты і сцюдзёны вадапад
іх пенай белаю адмыў ад бруду.
У чысціні, нібы увесну сад,
на памяць іх трымаць я буду.

Ты мне сказала: — Беражы
Заўсёды гэтыя хусцінкі:
яны, як тыя міражы,
узбудзяць думкі ў час спачынку...

На сонцы забяліліся яны —
(ручэй каціла срэбная навала)
і я адчуў пад подыхам вясны —
усё я меў, цябе мне не ставала.

Я ўзяў хусцінкі — і ў ваду...
Па камянёх вада іх несла і круціла.
А я стаяў пад чарам сумных дум,
ад іх вачэй адняць не меў я сілы.

## ДАРОГІ

Ператоптана, зведана ўсё як быццам
і прывычна ўсё, як паверхня стала.
Ды ніяк, хоць ты што, не прабіцца
мне на тую дарогу, што сюды завяла.

Не сустрэў на шляху я сваім нікога,
мо таму, што я сам сустрэцца не мог —
маючы ў свеце многа дарогаў,
я заблытаўся ў сетцы дарог.

І дарогі маёй канцы абое,
нібы ворагі душацца — смерць не міне:
адзін п'е з нашых рэк-вадапою,
а другі смагай мучыць мяне.

...Лёля, ты як нашае сіняе лета,
у сэрцы маім туманы пасеш.
Трымценне, цяплом сагрэтае,
забытая памяць, ты зноў устаеш.

Што было і што ёсць — ніяк не адрозню,
захацелася шчасця ізноў у жыцці.
Танцуе мая маладосць на дарогах,
не хоча ніяк адысці.

* * *

Я думаў, што гарэць, нібы на ветры, мне даволі —
ляжыць гадоў маіх на вуснах горкі прысмак.
Я думаў, што як вогнішча пакінутае ў полі,
душу маю пакрыў халодны попел-прысак.

Я думаў, досвед мой мяне научыў і сцішыў —
сваёй усхваляванасцяй не назаляць нікому.
Так караблі у прыстані, сыходзячы з узвышшаў,
знаходзяць цішыню і радасную ўтому.

Дык не ж! Ізноў згарае дзень мой кажны.
Ніхто, напэўна, з блізкіх не заценіў
на твары маім холад і няўважнасць,
на гастрыні пяра — душы смяротнае трымценне.

Шляхоў зямных ізноў перамагаю змору,
рука сама сабе прысуд пакутны піша.
Так караблі і з прыстані ізноў ідуць у мора —
іх вабіць смерць у бездані, а не спакой і ціша.

## РАМАН

...І раптам перада мною
ідзе яна,— што са мной? —
такою зямною
на гэтай зямлі зямной.

Забыўся я, хто я і дзе я.
І бачыў цябе я калі?
Як быццам гэта падзея
сталася не на зямлі.

У гэтакім вось настроі
услед — ад вугла і да вугла —
іду за табою — стройнай —
куды б ты ні павяла.

## КЛЯШТАР

Да кляштару замкнута брама:
«Забараняецца ўваход».
Яна ж дазволу і не брала —
размаляваны рот.

З пярэдняй кішані дастала
ёй паслухмяныя ключы.
Паходкай царсцвеннаю, аднастайнай
за брамай знікла уначы.

Глядзеў услед яшчэ ёй доўга —
дрыжэла ў галаве імгла.
Шкада — не быў я тым бульдогам,
з якім ты ў браму увайшла.

*Заўльгаў, 1948*

## СТРЫМАНАСЦЬ

За горадам усюды быў я з Вамі,
прыпынкаў нашых знаю я мясціны:
і дол, усланы кветак дыванамі,
і скалаў старадаўныя руіны.

Нідзе мы не стаялі болей за хвіліны —
цягнула нас нязведаная сіла.
Вы ўсё былі цнатліваю дзяўчынай,
таемнасцяй вачэй мяне манілі.

Так цэлы дзень прайшоў. А мы
расстраціць не маглі саромлівага палу.
З далін дыхнула холадам зімы —
пайшлі дахаты мы маўкліва і памалу.

*Прага, 1.4.45 г.*

## НА ПЛЯЖЫ

На ўсю энергію свяціла сонца. Дзень,
расплаўлены, жывою лавай ліўся
і занімаў прастор, шырокі на ўвесь свет,
каб людзі радаснымі на зямлі былі ўсе.

І пляж кішэў людзьмі. Як дохлыя, яны
ляжалі у пяску гарачых хвалях,
салодкай стомаю знывалі ціха
і — голыя — нічога не хавалі.

Пілі, разлёгшыся, усёй істотай сонца
і непрыкметна для сябе усё жаўцелі.
А потым у ваду яны ляслі,
спяшаючыся, бронзавыя целы.

І здаравелі. Род жаночы
хваліўся грацыяй перад вачыма.
Мы разумелі іх, і нам
усё было магчыма.

Жылі і радаваліся ўсе жыццю.
Дзівоснай казкаю плылі за хвіляй хвілі.
Развітвалася сонца. Спаць ішло.
А людзі яму скласць хвалу забылі.

## АСЛЕПЛЕНАСЦЬ

Баялася ты ўвечары ісці адна.
Не знаю як — пайшоў і я з табою.
Забылася адзін, адна
і толькі засталося блізкае: абое.

Над галавою неба зорнае ішло.
Успыхнуўшы, пагасла й неба.
Глядзелі нібы ў цёмнае мы шкло,
і болей не было зямлі і неба.

І свет не быў ужо для нас,
а самі мы былі асобным светам,
што ткаўся звабліва для нас,
як перад першым шчэ паэтам.

А беспрасветная аслепленасць плыла,
несупярэчлівыя ліплі рукі...
Навошта ж прахалодаю імгла
гарачыя нам цалавала рукі?

## СУМ

Хліпнуў агонь — лягла.
Застаўся адзін я ў свеце.
Месяц вырваўся з-за вугла —
надзьмуты, свеціць.

Да паўнаты напіўся,
ціхі, як кароўе вока —
жоўтая пыса,
прабіраецца бокам.

Выгнаны мы ў чужыну —
ён прыйшоў па небе за мною.
Як кот выгінае спіну
з ласкай зямною.

Горка сябе над зямлёю паднёс:
«Галодныя, як сыр намажце!..»
У сіняе мора нябёс
плыве, як на мачце.

* * *

Едзеш ты. Ці ж магчыма? —
Дождж, імгла і вятры.
Вочы некуды міма —
абатры.

Засталася часіна —
памаўчым...
Вочы сінія —
дым.

* * *

Будзь мне ты ўсім. Мае дарогі
канчаюцца — ля ног тваіх ляглі.
Зрабіць усё ты можаш, толькі
усё зрабі ты для мяне.

Я прысвячу табе жыцця майго астатак —
нікога я не меў, каму б даверыў лёс я свой.
Шукаю ўсё і не знаходжу — пэўна,
няма на свеце больш сваяцтва душ.

Няўжо я памыліўся, калі цябе за лепшую абраў?
Чаму ж маўчыш? — Я прад табою,
па-за табой не будзе ўжо мяне.

Скацілася сляза з вачэй тваіх журботных.
Ты думаеш. Скажы мне, што?

## ЯК МАЛІТВА

Прайшла і не заўважыла як быццам.
Праходзь, я не злуюся — Бог з табой.
Калі б я мог, я мог бы заступіцца
прад Небам за цябе з найбольшаю мальбой.

З мальбою ціхаю, пяшчотнаю, дзіцячай,
што шэпчуць мае вусны уначы.
Яны, дрыготкія, няўдачаў
не ўмеюць стрымана перамагчы.

Не знаеш ты, якая асалода
мне думаць пра цябе у часе саматы.
Шапчу малітвы я, і шкода:
іх чуе Бог, але не чуеш ты.

А што, калі б Ён мог іх здзейсніць...
І ноч усю, праз сон, праз цішь,
у глыбіні душы шчымлівай песняй,
як звон затонуты, ты ўсё звініш.

## МАЛЕНЬКАЯ ПРОСЬБА

Магчыма, хутка я памру
і ты забудзеш пра мяне.
І сон пра шчасную пару,
магчыма, хутка праміне.

Скажы, калі мы йшчэ жывём,
што ты часінку хоць адну
нахілішся сваім чалом —
я нават мёртвым уздыхну.

Мая душа на свеце тым
даступіцца к дабру.
Тады аб нашым аб зямным
навек у песнях я замру.

## ВЕЧАР

Іду і, як радасць, нясу сваё гора,
дотыкам ног скарынку снягоў ламлю.
Нібы із штыхоў, сцякае святло із зораў,
іголкамі холаду коліць зямлю.

Застыўшы на ўзлёце, песня замоўкла.
На ўсё я сказаць мог і так і не.
І шчасце чужое із цёплых вокнаў
на вуліцах цёмных агнямі лавіла мяне.

Я белыя плямы агнёў спалохана пераступаю
і ночы сябе аддаю на давер.
Мне сніцца краіна у снох залатая,
што вокнамі свеціцца ў вечар цяпер.

Іду і, як радасць, нясу сваё гора,
дотыкам ног скарынку снягоў ламлю.
Нібы із штыхоў, сцякае святло із зораў,
іголкамі холаду коліць зямлю.

* * *

Даўно агні патухлі ў вокнах.
Ўсёй мітусні наперакор,
спакойна месяц мёртвым вокам
глядзіць на наш спакойны двор.

Тады мае прыходзяць думы,
як нанач з мора караблі
прыходзяць, стомленыя тлумам,
і сняць пра цішыню зямлі.

Я дзень пражыў, і я спакойны,
і хочацца сказаць мне зноў:
мой лёс і будучыя войны
маіх не патрывожаць сноў.

Як будучыня, нейкая дзяўчына
стаяла, гордая сабой, ў акне.
Глядзела сумнымі крыху вачыма
і усміхалася... магчыма, і не мне.

Даўно паснулі ўсе, як камні,
а мне не сніцца. Што ж,
мне сніцца, як яна рукамі
з акна лавіла дождж.

## РАДАСЦЬ

Я сёння поўны радасцяй. Баюся,
што, нарастаючы, яна ў цішы
пральецца смуткам нечаканым
за край душы.

Было ж не раз — надыдзе і захопіць,
на лёгкіх крыллях несучы,
а потым згасне таямніча,
як свечка ўначы.

Яе кароткае дыханне,
як мілы, але рэдкі госць.
І нам здаецца — радасць
на свеце ёсць.

## ВОСЕНЬ

Мокрая раніца восені сумнай
у парку сцякае кроплямі рос
з ліп, што глядзяцца задумна
на лісце, што вецер атрос.

Дворнік мятлою на тратуары
з любасцяй іх у закутак замёў —
полымя жоўтых пажараў,
кучу гарачых вуглёў.

Ты не сціскай на мятле сваіх пальцаў —
рана наступнага дня
зноўку тут будзе валяцца
лісце — кавалкі агня.

*Берлін*

## СОН

Невядома — хто знае — што падружыцца з намі —
першы раз на чужыне ноч цвіла мая снамі.

Ішоў я па загонах і маленькім і босым
і ў празрыстых вачох нёс ліпнёвыя росы.

Пастухі забаўлялі кароў на жалейцы,—
малако тады ў вымя, кажуць, цёплае льецца.

Пастухі весялілі зялёныя далі,
ды цяпер, як калісьці, мяне не віталі.

Не пачуў пра сябе я ні гуку, ні зыку —
яны, пэўна, забылі земляка і музыку.

Маё сэрца зайшлося ад раптоўнага болю,—
я пайшоў да сялібаў па знаёмаму полю.

Мая родная хата мяне доўга чакала,
а прыйшоў — тое месца зусім пуставала.

Так прайшоўся я ў сне па зямлі Беларусі —
гэта значыць, напэўна, я туды не вярнуся.

## АДЗІНОЦТВА

На вуліцы — хоць ты збірай іголкі:
павіс між небам і зямлёю месяц.
У горадзе чужым шукаў цябе і гойкаў,
хоць ведаў, што пляцы нічога не абвесцяць

Яны сваё да позняе начы таптлі,
і я для іх — дзівак незразумелы.
Шукаў узімку веснавых праталін,
адступам для мяне быў... мост згарэлы.

Спяшаліся дахаты ўсе па двое
і, сумнага, мяне збівалі з тратуару.
І я, паніклы галавою,
ішоў... із месяцам у пару.

## РАЗБІТАЕ ЛЁТНІШЧА

Калісьці смерць яны з сабой насілі
і раздавалі нам, людзям зямлі,
а сёння задрамалі у бяссіллі,
паветраныя караблі.

Ім нецікава на зямлі, ім трэба
нясці на ўсе канцы жыццё і смерць...
І кажная часціна сніць пра неба,
і кажная часціна хоча узляцець.

Зламанае крыло апошнім ўзмахам
перамагло сябе і ўпала ў сны.
Над лётнішчам падбітым птахам
яшчэ вітае дух вайны.

І думаецца мне — калісьці раніцою
прачнуся я і ўжо не будзе іх:
у неба ўзнімуцца яны сям'ёю,
забраўшы цяжка раненых сваіх.

Ды непрабудным сном яны ўжо дрэмлюць,
паветраныя караблі —
глыбока ўрэзаліся ў зямлю,
каб не падняцца болей ад зямлі.

## ЗНЯВЕРА

Ах, стаміўся я... Досыць... Досыць...
Не падманеш мяне нічым...
Толькі зоры маёй маладосці
яшчэ падаюць уначы.

І цяпер мне глядзець балюча —
на зямлі толькі попел іх.
Хто агнём іх, такім палючым,
так бязлітасна папаліў...

Ты адзінай на свеце цэлым
усміхалася мне здаля...
Лепш бы ў пекла ты паляцела,
зненавіджаная зямля.

Табе мотанна і цесна.
Тваё цемя дзяўбуць згары.
Дык выходзьце з паходнай песняй —
я чакаць не магу, змагары!

## ДАЛЁКАЕ

Цяпер тое ўсё далёка,
як звон за хатай калосся.
Пісаліся вершы лёгка,
калі мне цяжка жылося.

Жывецца цяпер не лепей,
а можа, яшчэ і горай —
вясёлым зіхценнем у небе
не свецяцца зоры.

Для песні радок здабываю
няўпэўнена, рэдка, скупа.
Аблаюць яшчэ — бывае —
яе паасобку ці ўкупе.

І болю, і гневу, і смутку —
агонь тлее ў слове, як прыску.
Застаўся ад песень тых хутка
на вуснах гаркавы прысмак.

Усё ўжо цяпер вядома,—
калісьці такі ахвочы,
цяпер не выходжу з дому,
толькі калі — уночы.

Зноў паглядзець на зоры,
далёкія тыя...
Толькі ж яны не гавораць,
свецяцца — не залатыя.

*1959*

## ВІДЗЕННЕ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

Як толькі песняю сваёй зайдуся —
і Бацькаўшчына ў сэрца хлыне мне,
і лёгка робіцца ў начной задусе,
і быццам не наяве, а ў сне.

Здалёк чалом ківае мне як быццам —
няўцешліваму сыну ў чужыне.
Іду, як праз туман, хачу прабіцца,
ды сам не ведаю, ці гэта я, ці не.

Спыняюся, чакаю — ды няма прывету,
Спяшаюся — хоць ногі коляць хмызнякі...
Бо што мілей выгнанніку-паэту,
чым вобраз твой — далёкі і блізкі?

*1959*

* * *

Цяпер я ў неба болей закаханы
і бег хмурынак разумею болей, чым калі.
Гляджу у неба я — і зажываюць раны,
што атрымаў я на пакутлівай зямлі.

Гляджу — і турбавацца больш не трэба,
злагоджвае усё у сэрцы сінява.
Ды вось бяда: пачнеш глядзець у неба —
закружыцца адразу галава.

*1959—1960*

## БОЛЬ

Памалюся за вас. За мяне
ці ж вы можаце памаліцца?..
А з-за дрэў, нібы сполах, зірне
белакаменная званіца.

І схаваецца зноў. А боль —
быццам я на крыжы распяты.
Памаліцца за іх дазволь —
бачыш, як глядзяць вачаняты?

Яны моляць, і сінь вачэй
іхных смокча высокае неба.
Ты пашлі ім спакой начэй —
можа, болей чым нават хлеба.

Заслужылі ў цябе яны
міласэрную ласку.
Дык зрабі, я малю, іх сны,
іх жыццё як міраж і як казку.

*1959*

* * *

Тут жылі мы і болей не будзем тут жыць —
мала месца для нас, а йшчэ меней — спагады.
Вараннё за акном не спыняе кружыць —
то падымецца ўгору, то ідзе зноў да спаду.

Б'е крыламі трывогу, разварушвае жаль,
што у сэрцы і так, не сціхаючы, шчыміць.
Той кавалачак неба, за акном што ляжаў,
палыхнуў развітальна цяпер прад вачыма.

І здавалася мне — найдрабнейшая рэч
лезла ў рукі: «Глядзі, не забудзь нічога».
Апусціўся ў руках мой паходны меч —
як да вечнасці, так — да парога.

Не набралася б, можа, зашмат і дабра,
каб не гэта бясконца дарога.
Колькі мог я панесці — усё забраў,
пакідаючы толькі сябе самога.

## СУЦЭЛЬНАСЦЬ

Недаспаў я колькі ўжо начэй —
хоць бы сцішыцца мне на часінку:
дзве душы ў маёй душы аднэй
між сабой змагаюцца бесперапынку.

У змаганні дзве душы мае
не прыходзілі яшчэ да згоды.
Ні адна з тых душ не выйграе,
толькі прайграю я сам заўсёды.

Часам нават за сталом адным
мы сядзім ужо аднэй сям'ёю.
Толькі ж напаследак, як з чужым,
разыходжуся я сам з сабою.

То люблю я неба сіняву,
то я лаюся бесперапынку...
Гэтак вось сябе я і зжыву —
сам перад сабой на паядынку.

*1959*

## ЗАЛАТОЕ ШУГАННЕ

Мне спаць уночы не даюць
цяжкія самалёты:
страшэнна рэжуць муць
начную сваім лётам.

Куды і што нясуць яны?
І дзе яны яшчэ кружылі?
Я чую дрож сцяны,
як дрож у собскіх жылах.

А як бы я хацеў цішы,
калі не ўдзень, ды хоць бы ўночы —
даўно ўжо у маёй душы
не сніўся сон прарочы.

Лятуць ніжэй і ў вышыні.
Агні патушаць і засвецяць.
Лятуць... Лятуць...
                                І цішыні
няма на цэлым свеце.

І ў сполаху імкнуць далоў,
як самагубцы, з неба зоры —
шуганне залатых галоў
пад рэха гулкае матораў.

*1959*

## УНАЧЫ

Уночы чуюся пэўней,
нейк сцішней пад аховай ночы —
душа ўспрымае свет паўней
і да жыцця я больш ахвочы.

Вунь хмары з праблескам святла
над безданню імчацца строма.
І я тулюся да вугла,
баюся аглушыцца громам.

Ды ціш і ноч. Спакой залёг.
На ўсіх пляцох і вуліцах нікога.
І здэцца, на зямлі мы двох:
я сам і Валадарства Бога.

*1968*

## БАЛАДА

Чакаю. Прыйдзі. Вярніся.
Не йдзеш ты. Не чуеш. Няма.
У вокнах нідзе не блісне.
Сцюдзёна. Марозна. Зіма.

І месяц і хмары на небе.
Паснулі дамы, як капцы.
Ды ўсё-ткі чамусьці мне лепей
на гэтым бязлюдным пляцы.

Вунь кінуўся цень з балкону.
Пабегла фіранка ў акне.
І буду я думаць да скону,
што ты адчыняла мне.

Я цэлую ноч тут прабуду
з таполямі на пляцы,
паверыўшы ў тое цуда,
што сталася на пляцы.

*1968*

* * *

Прыглядаюся, каб не разбіцца,
вобмацкам хаджу я, спакваля:
некуды уніз, не па арбіце,
падае з-пад ног маіх зямля.

Страшна, і не можна пагадзіцца —
на заходзе, як настане цішыня,
у крывавай вогненнай мядніцы
плавіць Бог увесь здабытак дня.

На зямлі не людзі — чалавекі —
тупаем і б'ёмся век-вяком:
тонкім, нібы шкло, навекі
неба нас накрыла каўпаком.

Грэшныя ў непаслухмянстве душы,
не хацелі б мы зямлёю тлець:
падаем, рукамі ўзмахнуўшы,
каб усё-ткі ў неба ўзляцець.

## НА ЗАХОДЗЕ СОНЦА

Як быццам з неба яны злезлі —
святыя пасланцы:
для продажу, за агароджаю зялезнай,
паселі помнікі, як мудрацы,

Чакаючы, калі і хто іх купіць:
— Не бойцеся, глядзеце, выбірайце!
Даволі швэндацца вам купай,
здрайцы!

— Спалохаліся, га? Пабеглі, як чужыя,
ад нашай гутаркі хаўтурнай.
Помнікі, услед выцягваючы шыі,
гугнявілі:
— Йшчэ вернецеся, дурні!

— Мы злосці й болю вам не чынім —
пасланыя мы з высі...
Ага, застаўся вось адзін хлапчына —
хадзі бліжэй і не трусіся!

Я скамянеў ад д'яблаў гэтых нізкіх,
і лысіна ў расе ўся.
І помнік, скочыўшы, халодны, слізкі,
на плечы мае ўссеўся.

— Нясі,— дыхнуў каменным целам
і ашчаперыў рукі...

. . . . . . . . . . . . . . . .

А сонца на заходзе крывянела
ад катавання й мукі.

*Заўльгаў, 1948*

## АНЁЛ

Упершыню пабачыў гэта быццам:
над вуліцай — вось зваліцца на дол —
высока на слупе у золаце зіхціцца,
злятаючы да нас, Анёл.

У постаці маўклівай і балеснай,
Збавіцель наш і Спас,
Ён з вышыні той паднябеснай
крыламі атуляе нас.

Працягвае да нас анельскія Ён рукі,
і нам здаецца на зямлі —
Ён выстаўляе свае рукі,
каб мы Яго адтуль знялі.

І Ён сумуе сумам чалавечым,
і, здэцца, не збаяўся б Ён ані
плашмя ударыцца, абы не вечна
зіхцець у золкай вышыні.

*1968*

# *Як спажытак штодзённы*

* * *

Баюся тых дарог,
што я прайшоў аднойчы:
яны з напрамкаў трох —
ад сцюж, ад зор, ад ночы.

Пад'юджвалі ісці
паіць вадой гнаявай.
Я ж не прыпомню, ці
было хоць што наяве.

І славячы камлі
хваін і пух гусіны,
ішоў я па зямлі,
нібы у небе сінім.

І цвіў на градах мак,
і піў ваду я з лосем,
аж покуль цела ўсмак
муроў не напілося.

Таго ўсяго няма —
лёс нахлусіў паганы...
Кудысь у глухамань
качу зямлю нагамі.

## СТОМЛЕНАСЦЬ

Стаміўся жыць я на высокай ноце.
Было ж калісьці ўсё звычайна, проста:
піў яйкі чаек на балоце,
лупіў нажом бяросту.

У полі, за чародамі авечак,
рос нібы збожжа й травы
і патураў натуры чалавечай
без асаблівага на тое права.

Цяпер калішніх слоў звычайных
шукаю, як слядоў зацёртых.
Ды не збудзіць іх — як маўчання
на могільніку мёртвых.

## ВЫГНАНЕЦ

— Адкуль жа будзеш?
— З Украіны...
— А я сама з Беларусі...
— І маці й бацька мой загінуў...
— Загінулі й мае усі.

Сустрэліся й пайшлі маліцца...
За пазухаю хатнія лісты.
А я маўчаў усё — як быццам
сястрой маёй была не ты.

Пайшоў сабе далей з нічым я,
і у вадзе — ледзь-ледзь мільгне —
вялі паўз берага лагчыны
мой вобраз, незнаёмы мне.

*Заўльгаў, 1948*

* * *

Вось і ноч. Як даўней — нікога.
Толькі чую ўжо — край зямлі.
Каб не бачыць шчасця зямнога,
адплылі назад караблі.

Перавозілі й будуць везці —
акіян глухі і нямы.
Стаў я кропкаю зноў на тым месцы,
што Зямлёю назвалі мы.

За спіною маёю горад,
здэцца, рыецца у зямлю.
Як спажытак штодзённы, гора
я за пазухаю тулю.

Пад'язджаюць. Бяруць. Адвозяць.
Толькі я, у цяплынь, у цішу,
захінаюся, як на марозе,
прастудзіць баючыся душу.

Апусцела паволі прыстань —
што сказаць і куды пайсці?
Толькі неба маланкі хрысцяць,
як сто тысяч год у жыцці.

## МАЛІТВА

На коміне фабрычным сонца дагарае,
а мне дахаты йсці ці хутка?
Пад карканне варон — крыклівай зграі —
шапчу малітвы я ціхутка.

Каб шчасце у кутку маім вялося,
як птушка ценькая пад ветлым дахам,
каб хлеб і соль былі, а ўвосень
вятры не білі акяніцамі з размаху.

Каб сцерпець абыякавасць чужыны,
суродзічаў пыхлівых холад думны,
патрыятычную іх сліну,
парадны тупат тлумны.

Каб пры канцы шляхоў маіх далёкіх,
што не ўкладаюцца ні ў вёрсты і ні ў мілі,
не помнячы грахоў і крыўдаў лёгкіх,
прыхільныя багі мяне багаславілі.

## АКІЯН

Аб табе я меў думку не тую,
калі сніў пра цябе здаля.
Дзень і ноч ты ад злосці лютуеш,
праклінаеш сябе, што ты не зямля.

І ўсё пляжыць цябе адчай зняверы,
зелянееш ад роспачы ты.
Хвалі дыбяцца і, як пантэры,
з пенай кідаюцца на барты.

Пасланца зямлі — карабель не раструшчыш
і на дне прыспаць не змагчы.
Паднімаешся к небу — зялёны грузчык,—
аднаму табе страшна сярод начы.

Ты жывеш, як і мы, падманам:
так прывабна усё, што не ўзяць рукой.
Бунтавацца не хочаш ты акіянам,
мы ж не хочам кружыцца — зямлёй.

## СМУТАК

Нядзеля, а свята
няма у душы.
А смутку багата,
як ілу ў кашы.

Зярно launcher

Зярно ператрэцца,
і будзе мука.
А смутак у сэрцы —
як спеў жаўрука:

калышацца, смокча
і жалем звініць.
Душу, як драбочак,
ён хоча разбіць

на тысячу звонкіх
тужлівых званкоў,
і сыпкіх і ломкіх,
як іскры з падкоў.

Каб радасці болей
і ўцехі не меў,
ад смутку і болю
журыўся, нямеў...

Як быццам араты,
ўсё сыпліць із рук...
І падае раптам
з нябёсаў жаўрук...

...Ды зноўку засмокча,
жальбой зазвініць.
Душу, як драбочак,
зноў цягне, як ніць.

Угору і ўгору,
вышэй і вышэй...
Гавора й гавора —
цішэй і цішэй.

*1961*

## У ПУШЧЫ

Плюскоча уночы дождж ахвочы,
а ты ад салаты астыг.
Падскочаць на ўзбоччы, лапочуць,
лятуць, як пласты, лісты.

А пушча у гушчы ўсё нешта трушчыць —
памры на кары без пары.
— Расплюшчым пад плюшчам цябе,
невідушчы,—
памры без пары,— крычаць ведзьмары.

## ВОКАМГНЕННЕ

Любіць віцца бліскавіца,
іскраў з крэсіва накрэсіць.
Навальніцай асляпіцца,
як завесяць хмары месяц,
і упіцца, чарам быццам,
у час воўчы хто не схоча? —
Ля капліцы абпаліцца
і у ночы ўтапіць вочы.

## КАВАЛКІ ХО̌ЛАДУ

Маланкай неба Бог хвастаў,
караў зямлю суровым прыгаво̌рам.
Каб зноў у іншым вобразе паўстаць,
з вышыняў падалі ў прадонне горы.

Свет белы, як туманам, дождж замгліў,
апошні дзень, нібы тапелец, кануў.
Па ўсёй паверхні пераможанай зямлі
пайшлі разгневаныя акіяны.

Бог кропляю блакітнай сцёк,
свайго прысуду не адменьваў —

у цесных долах за жыццё
разыгрываўся бой каменняў.
Не йшлі яны ў бязвыхадны рукаў,
як людзі йдуць з паднятымі рукамі,
а кажны камень выхаду шукаў,
праходзячы праз іншы камень.

. . . . . . . . . . . . . . .

Спаўзлі ў даліну згаслыя яны
у нерухомым стройным стылі —
як быццам тут не камяні —
кавалкі холаду застылі.

## ВЯСНА

Тут ні палёў табе і ні лясоў, ні гаю,
тут перспектыва іншая і тон:
прастор — наколькі толькі вока дасягае —
замураваны у зялеза і бетон.

І тут і там, здаецца без патрэбы,
натоўпы небаскробаў — прывідаў жывых —
стаяць, высока ўрэзаўшыся ў неба,
як помнікі майстром, што збудавалі іх.

І ўсюды там, дзе чалавеку незаезна —
вышэй птушыных чорных зграй —
масты ўзняліся радугай зялезнай,
гігантамі сягнуўшы з краю і на край...

Бетон... Пясок... Ды што я? Пахне, мусіць,
на дошкі зрэзаная на двары сасна...
Сакавіковы дзень, і дзіву я даюся —
вылазіць із бетону й каменю вясна.

*1960*

## БЕЛАРУСЬ

Нясмелы, думаю часцей употай,
мой дух заўсёды думкаю аднэй прыбіт:
ці, неразумная, не знаеш яшчэ, хто ты,
ці ты няспраўджаны яшчэ вякамі міт.

Я знаю — знойдуцца, што абгавораць,
а можа, й праклянуць, ды ўсё дарма —
табе аднэй пажалюся я горам:
мне сумна, што ты ёсць, смяротэльна —
што няма.

Другія славу сабе хутка лепяць,
а твой папар не ўзнятым шчэ ляжыць.
Было б не нараджацца табе лепей,
чым, парадзіўшыся, не жыць.

Спяць акіяну твайго воды,
як сон, варочаецца ймгла.
Нашто ж, скажы, між Захадам і Ўсходам
вачыма сінімі ты прарасла?

## ЗЯЛЁНАЯ ВЕЛІЧ

Гнеўнай славаю мы не паўсталі,
не для нас былі вякі —
заляглі мы нямымі пластамі
невядома на час які.

Туманом набіраліся далі,
гралі музыку камары,
ды зялёную веліч гайдалі
сосны гонкія угары.

Ліплі ў нашыя грудзі пікі
і лічылі смяротны час.
Толькі наш герой вялікі
не паклікаў на бітву нас.

На канцох не было нашай стражы,
нас тапталі, глумілі, клялі...
Я хачу, каб у нас былі нашы
імператары і каралі.

## ЛЯ ЦІХАЙ БРАМЫ

Я —
брамаў не люблю...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

У брамах стынь, сутонь.
Пад брамамі — калек рыззё, нудзьга ды ныдзь.

*Н. Арсеннева*

Нам асуджаць усіх і ўсё не нова.
Прыемна долю гушкаць сібарыткай.
Не знаем мы, якога слова
сягоння хочацца душы пад світкай.

Пад гул літаўраў, бубнаў, лютняў
вядзём мы Бацькаўшчыну ўвесну, ўвосень.
А душ сваіх, як сытых трутняў,
на людзі паказаць мы баімося.

...А можа б, лепей не казаць: не варта —
няўпрыкмець, як пузыр дражджаны,
страшная нараджаецца пагарда
у нас, саміх вякамі пагарджаных.

Сяброў я страціў усіх чыста,
былых прыхільнікаў, прынамсі.
Бо не хаджу я на ўрачыстасць
у саматканай апранасе.

Аб Беларусь мы языкі шчасалі,
бяссільныя, мы любім дужых —
душа заходзіцца часамі
па грэшных і маленькіх душах.

Як цяжка жыць журбою чалавечай!
Шкада ўсяго нам — не душы забранай...
За ўсіх здаровых, за калек і ўвечных
я намалюся зноў ля ціхай брамы.

*1955*

## ПАТРЫЁТЫ

Я не любіў ніколі патрыётаў,
бязгрэшных, новых фарысеяў.
Як зерне после абмалоту,
іх душы я на сіце дзён прасеяў.

Куслівая і здрадлівая заедзь,
каўчэг уратаваны ноеў,
яны сягонняшняе славяць,
да ўчарашняга павярнуўшыся спіною.

Я вызнаў іх, геройскіх і адданых —
ад іх ушчункаў бегаў апантаны.
І Бацькаўшчына на этапах дальніх
званіла і ў мае кайданы.

Ды ўсё тады было мне нова,
хоць і стаяў, як на гарачым прыску.
Маім тады адзіным словам
было: і ныне і прысна.

Даруйце — не збярог для вас я
іпакшых дум і слова.
Калі свяча мая пагасла,
я запалю яе нанова.

* * *

Занадта ўсё да сэрца я прымаў —
нішто не зменіцца ні заўтра і ніколі.
Дарэмна ў свеце маіх зманлівых уяў
я неба маляваў у змрочны колер.

Нашто таіцца — крышку дапяклі
мана сяброў і кплівы смех няздараў.
Без ветразяў мае стаялі караблі —
уздыхі іхныя яны вятром раздалі.

Сягоння ў сонечную цішыню
блакітным мігаценнем дзень спавіты...
А можа, гэта толькі ўсё яшчэ я сню
і вогкая вясна яшчэ не прарасла
з-пад плітаў?

## ПАЛІТЫЧНАЯ ЭЛЕГІЯ

Нашто пайшоў за вамі я дарогаю цярністай
з узлётам дум і захапленнем юнака?
Як я цягнуўся ўвесь да вас душою прамяністай,
так у галоднага да хлеба цягнецца рука.

Я забываў на ўсё. Прайшлі гады няўдала.
У вёсцы без мяне вадой шумела гаць.
У полі пастуховая жалейка сумавала.
Я забываў пра ўсё, чаго ніколі нельга забываць.

Крывавых катаў час узвысіў над народам —
у сутарэнні жар душы мае не гас.
З краіны той, дзе ўсё пакрыта лёдам,
прынёс я жар душы — прынёс для вас.

А вы? А вы? Я праклінаю вас бясконца!
Стаю адзін, схіліўшы сумнае чало.
Вы толькі грэліся на тых праменнях сонца,
што вам насустрач вогненна ішло.

* * *

Я з вамі быў і мог, як вы,
з усіх любіць сябе самога.
Схіленнем важным галавы
не выказаць паважнага нічога.

Я з вамі быў. Ды з вамі йшоўшы, пакрысе
цяжкой рабілася мая дарога:
такога, як і сам, як вы усе,
маленькага, нікчэмнага я нёс у сэрцы бога.

І я пайшоў ад вас. І незямнога
пазнаў святла я ззянне за гарамі,
адчуў я іншага у сэрцы сваім Бога...
Прабачце мне, што быў я з вамі.

## БУДУЧЫНЯ

*Эмігрантам*

Якая ты — не знаю я. Стаміўся,
чакаючы цябе... Не муч...
У неразгаданае б'юцца крылы-мыслі —
спыняе лёт іх вогкая, цяжкая муць.

Пладзіцца пакідаюць гусі вырай,
лятуць назад — у сіні свет...
— Скажы, паэт — прарок даўнейшы, шчыры,
што будзе?
— Гм-м... Адказу не дае паэт.

— Што будзе — лепей ведаеце самі.
Змяшаеце мяне з гразёю напалам,
калі скажу, што дзесьці за гарамі,
за марамі
без надпісу пастavяць крыжык вам.

* * *

Няздзейсненых слоў ужо годзе
і думку слюнявіць пры чарцы.
Як цяжка што-небудзь даводзіць,
як лёгка спрачацца!

Аб лёсе мы толькі мяркуем.
Свае ж прывучылі мы сэрцы
хадзіць па здабычу цяжкую
на сіле кароткіх інерцый.

А мэта — як грозная бомба:
гатова вось-вось разарвацца.
І пушыць нас, быццам ад бобу,
ад слоў і ад мляўкае працы.

А Бацькаўшчына і Радзіма —
смачная і даўкая костка —
і сёння шчэ кадзіць кадзілам
з святочна убраных падмосткаў.

## ЖЫВЫ ЎСПАМІН

Засумаваў я па табе, радзіма,
па недаступнай па тваёй красе.
Кудысьці адыходзіш ты ўсё міма
і забываешся, даруй мне, пакрысе.

Цябе я пакідаў, я думаў, ненадоўга —
праз месяц, праз другі вярнуся зноў.
Але цягнік далей мяне ўсё тоўхаў:
як назнарок — назад не йшоў.

Я чуў — варочалася глуха
зацятаю вайной зямля.
У мітусліва-неспакойным руху,
што мне рабіць — падчас не ведаў я.

Агнём твае мігалі вейкі
у суцемках за рысаю зямной.
Ты, хрысцячы мяне агнём, навекі
развітвалася сполахам са мной.

І сумаваў, і плакаў я, і верыў,
і гневаўся — іду без бітвы так.
Дармо, што я не быў жаўнерам,
я сэрцам вычуваў гарачыню атак...

Я пакідаў цябе да хуткага спаткання
і не збіраўся ў дарогу назусім...
Цяпер шкадую, што на развітанне
«Бывайце» не сказаў усім...

*1960*

## З НОВЫМ ГОДАМ

Шлях — ад роднага парогу.
Развітанне — дзве рукі.
Невядомая дарога,—
З Новым годам, землякі!

Перад намі толькі неба —
сіняе на ўсе бакі.
Болей нам, відаць, не трэба,—
з Новым годам, землякі!

Караблі сцягі палошчуць —
той такі, а той такі.
Слава Богу, сядзімо шчэ,—
з Новым годам, землякі!

Тупацелі нават крышку —
збіліся ў хадзе цвікі.
Вып'ем з гора па кілішку
з Новым годам, землякі!

Пра братоў, сясцёр распяцце
і пра лёс наш, пра які...
не, не буду ўспамінаць я,—
з Новым годам, землякі!

Не без Бога чалавекі —
пад зямлёю мерцвякі.
Так вітаюцца спрадвеку,—
з Новым годам, землякі!

*Міхельсдорф, 1949*

## МАЛАДЫМ

Я не супраць і месяца й зорак —
іх п'янное святло я піў.
На цяпло закаханых гаворак
яны сыпалі вогненны пыл.

Не былі для мяне яны хлебам,
а былі — як далёкія караблі.
Я хацеў паздымаць іх з неба,
каб гарэлі яны на зямлі.

Уначы мы свой край асвячалі,
ды у цемры густой ён гас.
І піхалі людзі з ключамі
за зялезныя краты нас.

Не зніжайце вы лёту крылляў
і не трацце вачэй сінявы:
там, дзе мы ўпадзём без сілаў,
там павінны падняцца вы.

## СУРОДЗІЧЫ МАЕ...

Суродзічы мае... Ды голас мой
пачуеце вы, шчыры і адданы?
Як жораў, кружыць ён над галаю зямной,
бяссільна звонячы у вашыя кайданы.

...Цяпер тут ноч, і я пішу ўцішы,
захоплены свабодай выяўлення —
пра ўсё, што выспела ў маёй душы
і што згаджаецца з маім сумленнем.

Вядомыя мне вашы думы й сны,
як бы рассталіся мы толькі ўчора...
Я чую тут шчэ пах сасны,
і багуну, і шышак, і чабору.

Палянаў водыр мляўкі і пчалы
бзумлівы гуд на сонечным пакосе...
Ну, як не складаць свае хвалы
аб тым, чым раз дыхнуць мне давялося?

...Цяпер тут ноч. Ды голас мой
ці чуеце вы, шчыры і адданы?
Як жораў, кружыць ён над галаю зямной,
бяссільна звонячы у вашыя кайданы.

*1960*

## *Слова*

* * *

Мяне чакае небыццё,
забыт я буду светам.
Ідзі ж па-іншаму жыццё,
я мог бы быць паэтам.

Блакітнай яркасцяй
і свежасцяй, як пасля грому,
мой верш хвалюецца, жыве
на зло сабе самому.

Жыве адзін сваім жыццём,
нікому не вядомым.
З маім здружыўшыся нутром,
начуе толькі дома.

На час маўклівы і глухі,
ён знае, дзе танцуюць чэрці.
Сышліся ўсе яго шляхі
у пункце гібелі і смерці.

Але ў час буры і слаты,
калі імгла гусцее ночы,
падоўгу, з жартам, як браты,
глядзім адзін другому ў вочы.

І не палохае нас час —
на ўсё кладзем свае прыметы.
І цікавей яшчэ для нас,
што невядомыя мы свету.

*Мінск, турма*

## НАРАДЖЭННЕ ПЕСНІ

Пасля дажджоў аднэй вясны
была цудоўная пагода.
Глыбокія тварыла сны
аб сваім будучым прырода.

Зямля і цеплыня начэй
з вільготнасцяй адзіным сталі.
І непрыкметна для вачэй
у садзе ружы падрасталі.

Цвіла вясна навокал нас.
Тады, у момант расцвітання,
маёй пакутнай песні час
паклаў пачатак існавання.

І песня ўзнала ўсё, што ёсць...
Ёй, калі росы ў травах стылі,
спяваючы пра маладосць,
дзяўчаты голас падарылі.

Я сэрца й розум ёй аддаў,
сябе ўсяго і беззвароту,
каб з ёй над светам я вітаў,
гарэў адвагаю узлётаў

і ёю жыў. Няхай
мне з ёй не будзе развітання!
Агнём нястомным палыхай,
маё гарачае дыханне!

## СІНІЯ ВОЧЫ

Як цяжка да аматараў сягоння не належыць
і не запэцкаць ног чужою тваннню.
О, як бы я хацеў рассунуць межы
майго зямнога існавання!

Праз вашу тоўшчу цёмную прабрацца,
як прабіраецца праз хмары бліскавіца
і ў тысячы градацый
яшчэ й яшчэ раз нарадзіцца.

І вось з вачыма сінімі у ранні росным
раскрыўся васілёк на перавале...
А людзі йшлі і пазіралі скоса:
адны маліліся, а іншыя — плявалі.

* * *

Часта думаў я і думаю над гэтым,
і няма віны тут нічыей.
Каб не называўся я паэтам,
мне жыццё было б куды лягчэй.

Каб хадзіў у полі я за плугам
і бярог свой дзедаўскі парог,
я не быў бы сёння валацугай
бітвамі адзначаных дарог.

Закаваны стражаю і ў латах
брудных, зневажаючых да слёз,
маладосць сваю я па этапах
гордую, вясёлую пранёс.

Яна яркімі сваймі вачыма
прашумела шумам буйных траў.
Нат магчымае было мне немагчымым,
лёгкае я толькі з боем браў.

Дык навошта ж стаўся я паэтам?
Ліха ж маёй беднай галаве!
Неяк дзіўна ўсё на свеце гэтым:
нарадзіўшыся, не ўсё жыве.

## ВЁСЦЫ

Прыйшоўшы ў горад ад зямлі,
Не змог ніяк я ў ім ужыцца.
Як сына, вёска, прытулі
пад стрэхі саламяныя чужынца!

Даволі я стаптаў дарог...
Не, болей я цябе не кіну!
Няхай адзін дзядоўнік і мурог,
няхай адна прагорклая мякіна!

Ці ж я на ёй такой не ўзрос?
Пад шум дажджоў, глухі і немы,
затое жоўты мне авёс
прашапацеў свае паэмы.

Тугу, мой сціплы верш, адкінь!
Заўсёды сніся маладое!
Каб верш злячыць, я строф радкі
паіў вячэрнім сырадоем.

І ў свет яму шлях не разрыт,—
глядзяцца ў вочы яму зоркі
і адбіваюць строгі рытм
з дзяўчат найлепшыя танцоркі.

Я, адарваны ад зямлі,
нідзе ніяк не змог ужыцца.
Як сына, вёска, прытулі
пад стрэхі саламяныя чужынца!

*Беласток*

## Я НЕ ПАЭТ

Я не паэт, калі душы маёй малітваў
не шэпча ў грозныя часы народ.
Я не паэт, калі рашчуленыя рытмы
не плавяць абыякавасці лёд.

Я не паэт — не ўзнёсся я над часам,
наш век не задрамаў у радкох маіх паэм.
Я не сказаў, адкінуўшы прыкрасы,
куды на хвалях мора мы плывем.

Я не паэт. Мяне нашчадак неахайны
разрэжа нажам папалам
і гляне: «Пеў ён аб каханні
і не пакінуў ён нічога нам».

А я, дзівак, убіў сабе у галаў,
што знаны я, што я паэт.
Таго ж не знаў, што ціхі я і кволы,
капціў закончаны другімі свет.

* * *

Звычайны я. Я славы не прыдбаў —
я толькі кропля ў акіяне.
Мяне сярод клапотаў і забаў
ніхто з патомкаў не памяне.

Я ціха дзень за днём жыву,
самотны я і нецікавы.
Іду адзін, схіліўшы галаву,
і міма воплескаў, і міма славы.

І скажа не адзін: «Яшчэ адна,
глядзеце, выпаўзла аблуда
і голас падае, адроддзе дна,
і кпіць над нашым самасудам».

Дарэмна вы сказалі гэта —
з вас кожны сёння злосцяй дыша.
Хоць ціхі я, ды ўзлёт паэта
за вас, высокіх, многа вышай.

І мне б магло нясціся «брава»,
і мне б маглі зайграць музыкі.
Ды што мне гэтакая слава! —
я сам сабе адзін вялікі.

## СЛЕДАМ ЗА ПЕСНЯЙ

Каму ўсе радасці жыцця,
лірычных песень згукі,—
не для пацехі й забыцця —
мне песня дадзена для мукі.

Турэмшчыкі аднойчы на зары
забачылі яе: ад мукі —
стаіць, пакорлівая, на двары
і ззаду звязаныя рукі.

Хацела стуль яна ўцячы —
і рвалася з-за крат акордам.
Але на допыце ўначы —
лірычную — пабілі морду.

Дапытваліся цэлы год,
гнілым кармілі шчаўем.
Ганяла, і балеў жывот,
але, каб выйсці — не пушчалі.

На суд павезлі — чысты змор,—
на лаўцы седзячы, яна самлела:
за здраду Бацькаўшчыне пракурор
патрабаваў расстрэлу.

Пакутавала яна, калі
без мяккага пад бокам
галодную пад лаўкаю вязлі
ад Мінска да Ўладзівастока.

А там зноў шчасце — як каму.
І хоцькі ці няхоцькі,
яна плыла на Калыму
Японскім і Ахоцкім.

Страшэнна за дарогу падвяло,
і без харчоў і сілы
яна — хоць лезь ты у сіло —
на шахце тачкі поўныя вазіла.

Дармо: хоць білі у цішы
і пхалі нанач у задуху —
не выбілі з яе душы
і песеннага духу.

Ці йна была на Калыме,
ці ў камеры вільготнай, цеснай,
ці смерць была ў яе наўме —
яна была заўсёды песняй.

*1960*

## МАЙМУ ВЕРШУ

...Ды ты усё яшчэ жывеш,
хоць ліхалецце, хоць пагроза.
А я паспеў, пакутны верш,
цябе ўжо прамяняць на прозу.

Радкі мае, я клікаў вас,
і, паслухмяныя, ішлі вы.
І доўга мой лірычны сказ
яшчэ не стыгнуў, варушлівы.

Зарэў, адсвечваўся душой
маёй, то сумнай, то узнёслай,
вячэрняй таямнічаю цішой,
чаканай, млоснай.

Цвіценнем белых ліп
і голасам пяшчотным маці.
Аж покуль на цамэнце не ахрып
у строгім каземаце.

Аж покуль косткамі сваймі
у падзямеллі ты не хруснуў...
Ад малку, ад гадоў сямі,
са мной не кідаў ты хаўрусу.

Па Калыме і па вайне
і я і ты ішлі балесне.
І толькі па маёй віне
не ўсё ўпісалі мы у песню.

Але і так жыццём дыхнуць
на холад часу мае словы.
Бо холад той і лёд раскуць
яны заўжды былі гатовы.

Што б.ні было, ты ўсё жывеш,
тугі, нацэлены і порсткі.
Імкні ж, імкні ж, мой сябра верш,
хоць пакрысе, хоць па напёрстку.

Не супыняйся на дарозе,
хоць і крываўіцца ўсё рана.
На неразмераную прозу
мяняць цябе яшчэ зарана.

*8.9.1962*

* * *

Але і так жыццём дыхнуць
на холад часу мае словы.
Бо холад той і лёд раскуць
яны заўжды былі гатовы.

Што б ні было, ты ўсё жывеш,
тугі, нацэлены і порсткі.
Імкні ж, імкні ж, мой сябра верш,
хоць пакрысе, хоць па напёрстку.

Не супыняйся на дарозе,
хоць і крываві́цца ўсё рана.
На неразмераную прозу
мяняць цябе яшчэ зарана.

*8.9.1962*

## ЭЛЕГІЙНАЕ

Прылёг на сонцы я у сасняку,
падклаўшы пад шчаку руку.
За колькі год прыслухаўся да цішыні,
ды ў сэрцы не пачуў нічога я, ані,—
як бы хто налажыў пячатку,—
ні ўзруху радаснага ўглыбіні,
ні вершу новага імгненнага пачатку.
Не закранула мова цішыні
у сэрцы радаснай струны.
Вятруга раптам наляцеў здаля,
і утрапёная зямля
дыхнула холадам, нібы з труны.
Закалаціліся сасонкі угары,
нібы спрасонку на зары.
Тугой завыў увесь сасняк
і я не мог сябе ніяк
угаварыць, што то не скон,
што гэта толькі плача ён —
звычайна, як здавён.

## ПРОСТЫМІ СЛОВАМІ

Хочацца верш пачаць
самымі простымі словамі —
кашуляй з майго пляча,
шышкамі яловымі.

Бульбай і жытам густым,
закаханымі яе вачыма,
тленам, хатаю і ўсім тым,
без чаго жыць ніяк немагчыма.

Адарваўся калі ад грыў,
ад хвашчу, асакі на балоце,
я самога сябе марыў
на высокай ноце.

Да прыгожага рваўся, абы
не курэлі вершы лучынай.
Нават тыя словы забыў,
якіх маці вучыла.

А таго не ведаў ніяк,
што натхненнае слова проста
нараджаецца няўзнак
і свярбіць, як кароста.

На сцяжынцы зямной,
як маленства, нанова,
падружыся са мной
шчэ нікім не ўжытае слова.

## ЗАЙЗДРАСЦЬ

Я да славы чужое зусім не зайздросны,
але справы зрачыся не хацеў бы німала.
Я хацеў бы хоць так уваскроснуць,
як Максім Багдановіч, Колас, Купала.

Да багацця зямнога я не зайздросны,
хоць хацеў бы займець сваю хату,
каб над ёю шумелі сосны,
гналі спёку ценем кашлатым.

Да чужой маладосці я не зайздросны,
хоць хацеў маладзейшым бы стацца,
каб усё ж і ў наступныя вёсны
захапляцца зграбнай пастацяй.

Незвычайны міне мяне хтосьці,
страпянуся адразу я, млосны —
Да жывога ўсяго й прыгажосці
я страшэнна зайздросны.

*1962*

## *На спынку*

### НЕ ЯВАЙ, А ВЕЧНЫМ СНОМ

Канчаецца ўжо маршрут,
а мне шчэ далёка дадому...
На станцыі колькі мінут
паравоз выдыхае стому

і зноў у дарогу, далей,
да невядомага спынку...
Хіснуліся ззаду канцы алей,
і мы ўжо адкінуліся на спінку.

Чужога вялікага места рух
застаўся прыгожай уявай.
Ад грукату колаў ужо аглух,
а памяць аб ім шчэ яскравей:

жаночая стройнасць, вітрыны, дамы
і на падваконніках краскі,
развітванні, стрэчы... І толькі мы —
без стрэчы ў дарозе траскай.

І здрыгваешся суздром —
калісьці, на нейкім спынку,
не явай, а вечным сном
адкінемся мы на спінку.

## АДЧУВАННЕ НАЧЫ

Голле б'е з размаху
па сцяне.
Дробны дождж па даху
сыпане.
Уначы ў пацёмку страшна мне.
Вецер злы на ганку
бахае дзвярмі.
Капае у банку
дождж слязьмі.
Мокра — што ты толькі ні вазьмі.
Цicнуцца баракі,
шэрыя ў імгле.
Людзі-небаракі
спяць. А на стале,
міг — і маю свечку дождж залье.

* * *

Я кажны дзень паміраю
і ўсё жыву.
Веру у прышласць маю
і ў сіняву.

І спадзяюся: возьмуць
ангелы, мяне ў рай...
— Трасіся на возе
і не памірай,

трэба шчэ доўга ехаць,
дый цяжка папасць у рай,—
гавораць мне ангелы нехаця,—
лепей не памірай!

## АДЗІНОТА

**(з Рыльке)**

Адзінота святая мая, беражы
свае скарбы усе, міражы
прамінулых часоў, такіх слаўных!
О, святая мая адзінота, ты
залатыя дзверы свае саматы
замыкай ад усіх цікаўных.

## «ЖЫЖА»

Па вечарох, рвучыся з каленяў маці,
маленькім, я цягнуўся да «жыжы».
А «жыжа» — гэта была лучына,
што гарэла у нашай хаце.

— Сядзі спакойна,— гаварыла маці,—
і не рвіся, а то «жыжа» куся.

Я ж не слухаўся маці
і рукамі цапаў «жыжу» —
найпрыгажэйшую рэч у нашай хаце.

І праўду, прыгожая жыжа кусала балюча,
і з тых пор зваць пачаў я жыжу *кусяй.*

Злез з каленяў я матчыных. Свет,
што заззяў за нашаю хатай,
пацягнуў мяне, як тая *жыжа*,
і пайшоў я у свет, недасяжны, далёкі.
Ён усімі сваімі фарбамі і колерамі
граў у сэрцы маім — і словы мае,
як маленне, ішлі насустрач свету.

І яшчэ я пазнаў у тым свеце нешта,
што рабіла яго яшчэ больш прыгожым,
гэтым нешта былі самі людзі —
найцікавейшыя рэчы у свеце.

Як да самай прывабнай *жыжы*,
пацягнуўся я да людзей — стварэнняў
міласэрных, і ціхіх, і Боскіх.
І пра іх я пяяў у вершах лірычных
і — юнак — палымнеў самым чыстым да іх
каханнем.

Толькі як я шкадую, што ўжо маці болей
не было у дарозе са мною,
і яна, калі йшоў я да гэтай *жыжы*,
як раней, не сказала мне — *куся*!

## СЯСТРЫ

*Дар'і*

I

Часамі і плачу і каюся,
а даль дажджамі імжыць...
Мне трэба казка якаясь,
каб мог я жыць.

Сэрца смыліць успамінамі.
І як мінулы успомніш час,
бомбамі, кулямі, мінамі
той узрываецца час.

І быццам з-за пераправы,
жывыя, нібы іртуць,
сумныя і яскравыя,
вочы твае цвітуць.

Мінулае, звон затопуты,
каб голас твой не заціх,
я ўсё шчэ масты пантонныя
кладу на рэках тваіх.

Нібы пад кулямі, употай,
пад стрэламі залатымі дажджу,
і радасны і самотны,
па тых мастох у сне я хаджу.

Што ж? Я не плачу й не каюся,
адно толькі даль імжыць...
Мне трэба казка якаясь,
каб мог я жыць.

II

Сястра мая, даўно цябе не бачыў —
ад самага крывавага жніўя.
Балюча мне за ўсе мае няўдачы,
за ўсе мае грахі, што аплаціў не я.

Калі б не я, усё было б іначай,
я стаўся усяму віной:
жыццё сваё і ваша перайначыў,
і ўсё пайшло не тою старaной.

Яшчэ баі ішлі далёка,
а ўжо ў перадсмяротны час
страшней вайны аднекуль з боку
наш лёс пасоўваўся на нас.

Адно другога ўсё трагічней,
і страшна — гора без турбот
збываў я песняю лірычнай,
замест каб стаць на эшафот.

* * *

Усё ізноў як і было —
дні вымераны цягнікамі.
Гляджу ў задымленае шкло,
на падваконніку апёршыся рукамі.

Няма ні хаты, ні турбот
і выдаткаваны актывы.
Ды ўсё ж прыемна ехаць напярод
да конта разагрэтага лакаматыву.

Усё ізноў як і было.
Не ведаю, куды і еду.
Утупіўся ў вагона шкло,
каб не глядзець
на непрыемнага суседа.

Усё ізноў як і было —
дні вымераны цягнікамі.
Акно і сажаю, і дымам занясло,
Нічога не відно й не віцерці рукамі.

## ГАЛУБІНАЕ СЭРЦА

На дошчачцы вузенечкай —
не зваліцца ўніз абы —
пад страхою рана-рана
чысцілі свае забы

шызанькія — дзюбка ў дзюбку —
галубочак і галубка.
І міжсобку гаманілі,
што зрабіць ім трэба сяння.

«Крыле намачу я, абрасяню,
а злятаю на прасянне.
Можа, як зярнятак назбіраю —
цяжка жыць і нам у бедным краю» —

Так, усеўшыся на лубцы,
галубок сказаў сваёй галубцы.

«Трэ ляцець — пустая лубка»,—
уздыхнула бедная галубка.

Бо ж ляжаць на сэрцы маткі
шчэ маленькія галубяняткі:
вочкі — кропелькі блакітныя,
дзюбкі — просячыя рощікі.

«Дык ляці ж, прыдбай што-кольвек,
даражэнькі мой саколік,—
і на развітанне
па птушынаму галубка
галубочка дзюбнула у дзюбку: —
Ранняя дарога — добрая пара,
хай табе ні пуху, ні пяра!»

Галубочак пырх — і патануў у небе.
А галубка засталася з дзеткамі малымі.

Доўга ці нядоўга блукаў галубок,
колькі раз зірнуў ён у той бок,
дзе яго чакалі, галубка,—
невядома тое нам было —
памяць тую пылам замяло.

Там чакаюць яго ў хатцы —
галубку пара вяртацца.
Слава ж Богу цэлы, жывы,
ён нясе для іх спажывы —
усяго што толькі трэба.

Галубочак зноў вітаў у небе.

Прыляцеў — не трэ спажывы:
перабіты ўсе, нежывы.
Перакуленая лубка —
з галавой ад'едзенай галубка,
вечным сном галубяняткі
пазаснулі каля маткі.
Хтосьці злы, драпежны, дзікі
выпіў кроў, і ўсе вантробы
палажыў на лыкі
для жалобы.

Высока ў небе лётаў галубок
тры дні. Маркотны, ціхі, без яды,
як сірата.
Хаваўся ён за сінявой
і падаў галавой,
біў прах зямлі,
чапляўся за шпілі

і зноў у неба ўзлятаў
і доўга-доўга там вітаў:
здавалася, ён пакідаў зямлю —
прасянне, рэчку і раллю.

Тым часам людзі над ракой,
у неба ткаючы рукой,
паказвалі адзін другому галубка,
што ўзнімаўся ўсё вышэй — і так высокі —
за сіня-белыя аблокі.
Ледзь-ледзь відаць — і менш і менш,—
пакуль зрабіўся кропкай
у глыбіні нябёсаў —
сонечнай і топкай.
Яшчэ часінка, міг — замёрлі ўсе:
на дол цвярды, як ток,
з нябёсаў, крылле склаўшы,
ўніз галавою падаў галубок.

Чым сэрца раз жыло,
успомніў ці аднойчы...
Ляжыць у пыле галубок,
заплюшчыўшы сівыя вочы.

Крылле — як патрапаныя рукавы,
і толькі дзюбка — цвярдзей мінералу.
Паволі, гарачае ад крыві,
галубінае сэрца ўмірала.

Сяння на аўсянні,
заўтра на прасянні
скок! скок! —
прамільгнуў у памяці галубок.

Было шкода людзям галубка,
малога дзіцяці быццам,
і міжвольна сама рука
цягнулася перахрысціцца.

*1953*

## *Ачышчэнне агнём*

### ЖАЛЕЙКА

> Я зноў заснуўшую было жалейку
> Бяру і пробую ў ёй галасоў:
> Ці хопіць светлых, звонкіх думак-слоў,
> Ці гладка пойдзе песня-дабрадзейка?
>
> *Янка Купала*

Спрабую зноў крануць маю жалейку
пасля бясплодных столькіх год...
У час выгнанніцкі яна была мне лекам
і вызначала думак маіх ход.

Я з ёю йшоў сібірскімі шляхамі,
туліў запазухай ад сцюж на Калыме.
Дзяліўся з ёю згадкамі і снамі —
і з ёю было цёпла мне.

І нат калі да скону было мала,
калі здавалася, што не сцярплю пакут,
што не загінуў я, ты думы высылала
у родны мой, бацькоўскі кут.

Прайшлі гады... Не знаю, як ішлі вы.
Ды толькі доўга, у чужой мне старане,
не дакранаўся струн тваіх чуллівых —
і ты пакінула мяне.

...Баюся зноў крануць сваю жалейку,
як быццам перад ёю у нечым вінават.
У сполаху й трывозе нейкай
настройваю душу я на ранейшы лад.

*Красавік, 1983*
*Баварыя*

## АДЧУВАННЕ ЎЗЛЁТУ

Зноў горы-волаты ўзялі мяне ў абдымкі.
Самотны й радасны, я разглядаюся вакол.
Ахутаныя лёгкай дымкай
стаяць, нязрушаныя, яны спакон вякоў.

Рвучыся у бязмежжа, на прастор,
як быццам маючы у тым патрэбу,
ялінкі, ўзбегшы знізу на вяршыні гор,
свабодныя, адтуль шлюць прывітанне небу.

Але не мне... Застаўся я ў даліне.
Мне не ўзляцець на ўзвышша, як яны.
Аб той, што ўзнімаўся я, вяршыне
мне толькі сняцца сны.

Ды ўсё ж, падхоплены раптоўнай сілай
невядомай,
адкінуўшы, нібы цяжар той, самату,
здавалася — у нейкі момант
я на вяршыні зноў, як калісь, узляту.

*Красавік, 1983*
*Баварыя*

## МАЛІТВА

Усунь агонь Сваімі Ты пярстамі
ў маю душу! Пазбаў ад небыцця!
У свеце Слова перастала
быць словам Божым адкрыцця.

Сярод маны, бязбожнасці суцэльнай —
калі крычыць яно ўсё галасней —
атруты поўнае смяротэльнай,
за атам мо яно страшней.

Бесперастанку і без спыну,
нібы напаснік ў ночны час,
дзень кожны, кожную гадзіну
яно маной страляе ў нас.

У вопратцы прыгожа-новай —
як быццам найпякнейшая яна —
у слова залатой аснове
звіла сабе гняздо мана.

Пад грому бліскавічныя удары —
каб сціхла яно ў сённяшнім быцці —
у горане усепрашчэння й кары
ачысці вогневам яго і асвяці!

Пашлі мне сілу — пад Тваёй аховай
ад пустазелля ніву прапалоць,
каб ажыло нанова слова
як дзеянне, як адкрыццё, як плоць.

*Сакавік, 1984*
*Глен Коў*

## ПАЭТ

Паэту трэба йшчэ й уменне —
яно крыніца для яго другая.
Я не чакаю божага натхнення —
у працы я сябе перамагаю.

Варушыцца няяснае ўяўленне,
і цесна мне, нібы ў якой задусе.
Прыходзіць да мяне натхненне,
калі — свабодны — я за стол саджуся.

Упэўнены, сабе я пачынаю верыць,
заходзяцца гарачай хваляй грудзі.
Радкі паспешліва кладуцца на паперу,
ды я не ведаю яшчэ, ці з іх што будзе.

Аж покуль думкаю імгненнай, яснай
цябе тваё тварэнне не азорыць.
І ты ў хвіліне гэтай шчаснай
сягаеш, радасны, да зораў.

Цяпер ты сам сабе і ўсё далёка,
увесь ты — чуйнасць і імкненне.
І скончыў ты, і табе лёгка,
і верыш ты у Божае натхненне.

*Студзень, 1984*
*Глен Коў*

## ЗВАЛЬНЕННЕ ПАЭТА

Ну што каму да твайго слова?
Якая ў ім карысць? — мо запытаюць.
Старое ты спяваеш зноў нанова —
не ўцяміў, што цяпер пара не тая.

Якая каму справа да тваіх пачуццяў?
Нутро сваё ты выварачваеш дарэмна.
Не патрабуем тонкіх мы тваіх сугуччаў —
час іншы ў нашых душах дрэмле.

Скрыжалі іншыя на скалах выбіў
час гневу нашага і утрапення.
Ён выбухне, як помсты выбух,
памножаны на атам нецярпення.

А ты сквіліш, сабою падагрэты,
усё затушаваць імкнешся ты і згладзіць.
Час скрэсліў вас, вяльможныя паэты,
як непатрэбных больш на вашай заспакоенай
пасадзе.

*Красавік, 1984*
*Глен Коў*

* * *

Не дасягнуць, не ўзяць, не разгадаць:
што мела быць — хіба ўжо адбылося.
Як толькі ў вершах сум свой спавядаць —
нічога болей мне не засталося.

Жыву высокаю журбой,
тугой па тым, што не збылося.
Як толькі быць незадаволеным сабой —
нічога болей мне не засталося.

Адмецены віхурай часу, я
з эпохай нашаю не зрօсся.
Як толькі жыць сваім маленькім «я» —
нічога болей мне не засталося.

Без радасці, кахання жыць
сумней, чым адцвітанне ўвосень.
Як толькі век свой завяршыць —
нічога болей мне не засталося.

*Красавік, 1984*
*Глен Коў*

## НОЧЧУ НА БАЛКОНЕ

У небе рухаецца зорны карагод,
пераліваецца, дрыжыць мігценне.
Маўклівы, я сачу сусвету ход,
сумуючы па нечым, у здзіўленні.

Сяджу адзін. Сусвету пусціня
глядзіць сляпымі на мяне вачыма.
Яе ніякай сіле не суняць,
прасіць ратунку немагчыма.

І ў нейкім сполаху глухім
пытаюся ў сябе я, дзе я —
у новым свеце ці старым
і ці якаясь ёсць яшчэ надзея?

Дзень прамінуў і іншы праміне.
Заблуканы я ў свеце.
Ніхто тут не даходзіць да мяне —
сяджу як бы на новай я планеце.

*Ліпень, 1983*
*Глен Коў*

## НАДЗЕЯ

Захоплены, я кожны дзень
сябе радкамі выкладаю,
хачу уваскрасіць, што ў самаце
мяне трывожыла гадамі.

Сяджу, гібею, каб радком
натхненне пераліць у форму.
Калісьці, можа, радаком
ён цеплынёй душу агорне.

І, можа, ўведаюць яны,
чым жыў паэта іх нязнаны,
пра ўзнёсласць дум, пра сны,
пра ўсе яго заганы.

Ды толькі ён хацеў ва ўсім
быць колькі можна дасканалым.
Напоспех у жыцці сваім
прымаў з вялікім жалем.

Хвалююся, сумую і пішу,
натхненне пераводжу ў форму.
А мо калісь чыюсь душу
кране мой верш нерукатворны.

*Кастрычнік, 1983*
*Глен Коў*

* * *

Жыву цяпер я ў цёплай хаце.
Не дзьмуць мне сіверы ні ўдзень ні уначы.
Пасля таго, як я яго патраціў,
пачаў сваё жыццё я берагчы.

Малолася яно, бы ў млыне,
на жорсткім камені — мука.
Як шквал, кудысьці час адхлынуў —
з парогамі грымлівымі рака.

Хаджу павольней. Нікуды не рвуся.
Мой хлеб надзёнпы ў мяне ёсць.
Ды ўсё ў сібірскай завірусе
ад холаду мая танцуе маладосць.

Баюся — недзе абарвецца
жыццё на нейкім стыку год
і ціха спыненае сэрца
больш не памкнецца наперад.

*Лістапад, 1983*
*Глен Коў*

## ЛАМПАДКА

Гарыць лампадка тут і дзень і ноч,
і кожны раз я, пасля працы,
завітваю сюды, апроч
калі сюды я не магу дабрацца.

Такая ціхасць тут і лагада
у гэтай чуйнай і малой каплічцы!
Хачу тут вечнасці паклон аддаць
і суму на часінку хоць пазбыцца.

Успомніць тых, якіх ужо няма,
пра самых блізкіх, пра сябе самога.
Слязіну пусціш ціхама
без крыўды на нікога.

Глядзіш, лампадка свеціць як —
дрыготка, таямніча,
бы нейкі хоча выдаць табе знак,
шапоча табе нешта, кліча.

І ты стаіш, і свеціцца яна,
як краска жоўтая у ліпні.
Баішся толькі, што яна —
адзін мамент — і можа хліпнуць.

*Чэрвень, 1983*
*Глен Коў*

## ГРЭШНАЯ ДУША

Быццё як скончу сваё я —
ад думкі я такой згараю,—
я ведаю, душа мая
не трапіць, грэшная, у царства раю.

Вялікі грэх ёсць у мяне,
і я жыву ў штодзённай скрусе.
Я спавядацца прад людзьмі — о не! —
за гэты грэх баюся.

Ці можа зняць яго рука чыя?
Ці адкуплю яго цаной якою?
Не хочу ў ім прызнацца я
нат прад самім сабою.

Празрыста-лёгкая ад саматы
блукаць пачне душа мая ў сусвеце.
Я ведаю, што не захочаш Ты
яе, бяздомную, прывеціць.

Ды, грэшная, наколькі сіл стае,
яна ўсё будзе у Тваёй арбіце.
І вечна у харомы светлыя Твае,
як матылёк, яна ўсё будзе біцца.

*Люты, 1984*
*Глен Коў*

## БЕЗНА

Бясконца дождж цярусіць,
дзень пухне ад слаты.
У роспачы і скрусе
не ведаеш, хто ты.

З вышы няма сігналаў.
Без сілы і агню,
як быццам ты загнаны
кудысьці ў пусціню.

Пытанне ў недаўменні
стаўляеш, бы ў лато,
ці боскае стварэнне,
ці ты ніхто?

Стаіш ты перад безнай,
хвалюйся ты ці не —
цябе у час балесны,
бязлітасная, праглыне.

*Верасень, 1983*
*Глен Коў*

* * *

Я нездаволены самім сабой:
не маючы, апроч сябе, нікога,
здружыўшыся з сваёй журбой,
жыву я для сябе самога.

У гэтай спадарожніцы маёй
адзінае знаходжу суцяшэнне.
Хоць радасць зазнаю у ёй
я толькі на адно імгненне.

Зноў аддаюся я ў палон
маёй самотнасці няўцешнай.
І да мяне яна, як і здавён,
вяртаецца пакутнай песняй.

Я вызвалюся із саматы —
мяне такая ўзносіць перамога.
І здэцца — я жыву тады
не толькі для сябе самога.

*Студзень, 1984*
*Глен Коў*

## СЯСТРЫ ДАР'І

Гаварылі мне, дзесьці ты
бабылём адна жывеш.
Не даходзяць мае лісты,
прысвячу табе хоць бы верш.

Твайго гора, твае бяды
я рукамі не развяду.
І мае прайшлі гады
на парожнім хаду.

Нібы пену тую прыбой,
параскідала доля нас.
Не пабачуся я з табой —
мой і твой ужо блізіцца час.

Праліла ты крыніцы слёз,
не пабачыла свету ў жыцці.
За бяду, што я вам прынёс,
калі можаш, сястра, прасці.

*Жнівень, 1983*
*Глен Коў*

## СЯСТРА

І сталася. І адышла ты.
Нябёсы узялі цябе ад нас
у светла-праведную хату,
і для цябе свет гэты згас.

Пакінула ты ў ім пакуты,
і ў іншым свеце будзе ўжо лягчэй
спачыць свабоднаю, раскутай
пад светлым позіркам Яго вачэй.

Забудзеш мо аб сваім горы,
аб днёх, што шчасцем не цвілі.
Засвецяць табе сонца, зоры,
што не свяцілі на зямлі.

Ды ты зямное не забудзеш,
і святлінёю сваіх воч
усё, турботная, ты будзеш
глядзець адтуль і дзень і ноч.

Ці усё тут, што ты пакідала
не горай, чым яно было.
І вечна будзе йсці з аддаляў
твае журбы і дабрыні святло.

*Лістапад, 1983*
*Глен Коў*

* * *

І ўсё я нечага чакаю,
і ўсё на нешта спадзяюся.
Мо прыйдзе навіна якая,
што страпянуцца мяне змусіць.

Што нехта гэтакі цікавы
на маім з'явіцца парозе.
І гэтай нечаканай з'явай
душу згібелую адродзіць.

І пойдзе ўсё тады іначай,
і я пачну жыццё нанова.
І большаю тады удачай
зайскрыцца маё слова.

І скажа нехта мне: «Пакінь ты
свой сум. Са мной не бойся».
І мне у глыбіні блакітнай
адчыняцца тады нябёсы.

І буду я тады ў тым часе
адхуканы цудоўным лекам.
І у жыцці маім тым шчасным
я іншым буду чалавекам.

Ды гэта толькі ўсё малюе
мая нястомная уява.
Ды гэтым толькі і жыву я —
на гэта ёсць мая управа.

*Жнівень, 1984*
*Глен Коў*

## ПАТАЕМНАЕ

Усё як бы на месца і звычайна,
ды недзе ў тайнікох душы,
не ведаю чаму, апошнім часам
пачаў я турбавацца за сябе.

Чамусьці думаю: здрадліва,
на нейкай невядомай глыбіні,
мяне падсцерагае нешта,
з чым справіцца я не змагу.

І трэба хутка мне, напэўна,
расстацца з тым, што так люблю,
што больш за ўсё на свеце гэтым
мяне і вабіла і вяло.

Дасюль яшчэ аб гэтым я не думаў,
і не было наяве ці у сне,
каб нейкая загадкавая сіла
штось патаемнае шаптала мне.

Не хочацца у гэтым мне прызнацца,
і болей, чым калі раней,
любуюся я ў захапленні
усім, чаго дасюль не заўважаў.

Блакітным чымсьці, незвычайным,
чаго я зведаць не паспеў,
якойсьці зваблівай уявай
хацеў бы я сябе завараджыць.

Не думаць і не турбавацца,
а ўсё далей, далей ісці,
аж покуль Хтосьці не пакліча
у запаветны свет мяне.

*Жнівень, 1983.*
*Глен Коў*

## ТАЯМНІЦА

Клён за акном стаіць па леце,
яшчэ зялёна-жоўты і вячыст.
Ніяк я не магу прыкмеціць
той міг, як адрываецца з галінкі ліст.

У цішыні здрыгнуўся, ветлы,
і ўжо у руху бачыш ты яго.
Як быццам хтосьці непрыкметна
пярстамі дакрануўся да яго.

Не ўбачыў я, як ліст адрынуў,
як страпянуўся у цішы.
Загадкавы той міг адрыву
як сполах варухнуўся у душы.

Як нейкі дух дыхнуў і сціхнуў.
І здрыгваўся я ўсёй душой,
што гэты дух мне непасцігны
у таямнічасці сваёй.

*Кастрычнік, 1983*
*Глен Коў*

## МОРА Ў ПАХОДЗЕ

Спакойна-лёгкае перад тым
(з гладдзю сіняю вод)
узнятае ветрам крутым,
сабралася мора ў паход.

Як на рэдут які,
хвалі, у шуме сваім,
зладжаныя, як палкі,
коцяцца строем адным.

І ўжо іх ніяк не суняць
руху іхнага да жыцця.
Яны радуюцца, шумяць,
што ўзняліся із небыцця.

Спяшаюцца колькі моцы стае,
падганяючы сёстраў сваіх.
Духу ім паддае
мора высокі уздых.

Плешчуць, пырскаюць змагары,
і не ведаюць шчэ пра тую жудзь,
што, як дзьмуць перастануць вятры,
яны, сцішаныя, памруць.

*Люты, 1984*
*Глен Коў*

## АКІЯН І НЕБА

Вялікай караю, непаслухмяны,
у моманце якімсьці уразлівым,
калісьці небам быў ён пакараны
і на зямлі пакінуты ў сваім разліве.

Ваду ганяе акіян сваю і пеніць —
уздыхі чуем мы яго глухія.
У непадатлівасці, адшчапенец,
зрабіўся ён асобнаю стыхіяй.

Людской нагой незатаптаны,—
такая у яго патрэба —
раз'юшаны і апантаны,
ён помстай пырскае у неба.

Як ні ўзнімаецца ён плёсам
і як ні прагне бунтавацца,
сваёю хваляй да нябёсаў
усё ж не можа ён узняцца.

І неба ад пачатку, ад вякоў,
з усёю пераможнасцяй сваёю,
ахутаўшы яго з усіх бакоў,
схіляецца над ім блакітнай вышынёю.

*Студзень, 1984*
*Глен Коў*

## СКАРГА ХВАЛЯЎ

У задуме, адзін-адзінокі
выйшаў сёння я на затоку.

Я ішоў, за маімі плячамі
узнімаліся чайкі, крычалі

і з усёю сваёю сілай
як па страце якой галасілі.

А паўзбоку лагодныя хвалі
бераг, сінія, цалавалі.

Іхны пошум ціхі, гаварлівы
маіх ног датыкаўся прылівам.

Хвалі слаліся гібкай пасцеляй,
мне сказаць яны быццам хацелі:

«Бераг хвалямі мы хвалюем,
нібы вусны, бераг цалуем,

але ён праз увесь наш век
застаецца халодным, не-чалавек.

«Падступаемся да яго мы бліжэй,
языкамі сваімі ліжам,

абдымаем яго мы ласкай
і пяшчотаю наскай,

але ён праз увесь наш век
застаецца халодным, не-чалавек.

«Уначы яму ціха шэпчам
аб прыгожым такім нечым.

Тулімся усёю істотай сваёю,
але ён да нас — скалою.

Набяжыць адна з нас, другая
і, ударыўшыся, адбягае

Зноў назад, у сіняе мора
ад такога гора».

Слухаў я. За маімі ж плячамі
узнімаліся чайкі, крычалі

і з усёю сваёю сілай
як аб страце якой галасілі.

*Лістапад, 1983*
*Глен Коў*

## РАСПЯТЫ ХРЫСТОС

Трывогай адазвалася сягоння:
як можа чалавек вякамі
глядзець на распасцёртыя далоні,
прабітыя наскрозь цвікамі?

Праходзіць міма з лёгкім сэрцам?
А Ён, як быццам нейкі Найміт,
распяты на крыжы, праз цэлыя сталецці
усё крывавіцца прад намі.

Зірнеце толькі на пакуты
і на цярпенні ў твары Божым:
цвікамі да крыжа прыкуты,
ні рук, ні ног Ён вызваліць не можа.

Як самы вінаваты з вінаватых,
пакут не можа збыцца Ён нязмерных,
Ён, што лячыў сляпых і беснаватых,
Ён, што ўскрос із мертвых.

...Прыйшоў я да Цябе сягоння
не дакранацца ран Тваіх рукамі,
а ціха цалаваць Твае далоні,
прабітыя наскрозь цвікамі.

*Лістапад, 1983*
*Глен Коў*

## 70

Мне 70. Хацеў бы я,
каб гэта быў не я.
Не я, а іншы хтосьці,
а я ўсяго — пабочным госцем.
Няхай усе прамовы і ўсе тосты
прымаў бы на сябе той «хтосьці».
Я толькі прывітаў бы Ягамосцю,
як і належыцца запрошанаму госцю.
З усмешкаю — дыпламатычны ход —
падцягваў бы яму і я: «Сто год».

*Глен Коў*

# *Санеты*

## АРФЕЙ

Арфей — паэт, і сваім словам
умее свет заваражыць.
Спяваць на ліры азначае б ы ц ь,
зноў нарадзіцца ў слове новым,
жывым заўсёды, адмысловым.
Захоплены пясняркай сілай,
ён сваёй песняй лёгкакрылай
вітанне шле палям, лясам, дубровам.

І слухаюць яго абшары,
святлеюць, як ад нейкіх чараў.
Такое музыкі яшчэ не чулі
загоны нашыя ў журбе вялікай.
Прыйшоў да іх з душою чулай
пясняр Арфей — Сымон Музыка.

*Снежань, 1983*
*Глен Коў*

## ЛЕБЕДЗЬ

Ступае й падае на лёдзе ён.
Хоць лапы прымярзаюць — хоча плысці.
Шукае з немачы ён выйсця,
ды возера ўзяло яго у ледзяны палон.

Сячэ паветра ўзмахам крыл,
крыламі б'е ён снег і размятае.
Ды сіла ўжо ў яго не тая —
з сваіх ён выбіўся ўжо сіл.

Ён марыў тут, калі была вясна,
калі у мройнасці плылі яго часіны.
Калі ўсміхалася яму яна,

не думаў ён пра хату, пра павець,
і ў марах не стварыў краіны,
куды б ад сцюжы мог ён заляцець.

*Снежань, 1983*
*Глен Коў*

## ЖАНОЧАЯ ПРОСЬБА

Ты паглядзі, які прыгожы свет!
І паглядзі ты на прыгожых нас!
Чаму ў вачох тваіх агонь пагас,
прыціхлы наш паэт?

Заўсёды стрыманым ты быў, але,
спакушаны, ішоў за намі ты.
Ты маладзеў ад нашай пекнаты,
і не было задумы на чале.

Мы жыць не можам без тваіх
узвышаных, натхненных слоў.
Пяяў ты нас. Цяпер заціх.

Пакінутых, нас паглынае муць.
Настрой ты ліру сваю зноў
і вечна з намі будзь.

*Снежань, 1983*
*Глен Коў*

## СВЯТЛО І ЗМРОК

> На сонца заглядзеўся я —
> мне сонца асляпіла вочы.
> *Максім Багдановіч*

Святло мяне павекі паланіла,
што йшло ад сонца, і за ім ў дагонцы,
заваблены ягонаю агністай сілай,
я ўсё жыццё ішоў насустрач сонцу.

Змрок вочы мае коліць, раніць,
я цемры змалку йшчэ баяўся.
І калі сонца узнімалася уранні,
святлом істота напаўнялася мая ўся.

Ішоў насустрач дню, што мне прыносіў
цяпло, і радваўся, захоплены, душою,
яму ўсё падстаўляючы зажмураныя вочы.

Ды наступіла непрыкметна знекуль восень,
і калі некалі насустрач дню ішоў я —
іду цяпер, ссутулены, насустрач ночы.

*Красавік, 1984*
*Глен Коў*

## *Уяўленне*

Усё палымней і яскравей —
ніяк не згасіць іх, ані —
зіхцяць у маёй уяве
далёкага места агні.

## ВЕНЕЦЫЯ

*Валерыі Філіп*

Галубоў галубіная сварка.
Колькі іх, галубіных чубоў!
На плошчы Святога Марка
карміла ты з рук галубоў.

Шызыя, яны аблятали,
шызыю, цябе вакол.
Узнімаліся і злятали
на калені твае і на дол.

Не, не есці яны прасілі —
хоць ёсць звычай у іх такі,—
ім хацелася з усёй сілы
твае толькі дакрануцца рукі.

Яны лётаюць верхам і нізам,
колькі моцы у іх стае...
Як той голуб хацеў бы, шызы,
я злятаць на калені твае.

І з прыручанасцяю хатняй,
нібы голуб які,
па-галубінаму, далікатна
браць зярняты з твае рукі.

*Верасень, 1983*
*Глен Коў*

## МАЯ LORELEI

Ich weiss nicht, was soll es bedeuten
dass ich so traurig bin.
*H. Heine*[1]

Ёсць месца такое ў лесе,
з ім можа зраўняцца рай.
Там, на Палессі,
жыве мая Лёрэляй.

Як тая казуля
між сініх азёр,
у зрэбнай кашулі —
палескі узор.

---

[1] Я не ведаю,
Чаму я такі журботны.
*Г. Гейне*

Як нас разлучыла ліха
таму ужо колькі год,
над Прыпяцяй плаўнаю, ціхай
гарыць задуменны заход.

Гадаючы ўсё аб нечым,
на бераг, дзе бору край,
самотная, кожны вечар
прыходзіць мая Лёрэляй.

Сама не свая такая,
як бы на якую бяду,
яна мяне ўсё гукае —
а мо да яе я прыйду.

Стаіць у прасторы сінім
і моліцца ўсім святым,
ды голас яе бяссільны
вяртаецца рэхам пустым.

Рака пачынае хліпаць,
хвалямі біцца ў край.
Баюся, што кінецца ў Прыпяць
мая Лёрэляй.

*Кастрычнік, 1983*
*Глен Коў*

## ТЫ

Ты ў сне прыходзіш да мяне,
ды толькі несапраўдная якаясь.
Зірнуўшы строга на мяне,
ты некуды няўцям знікаеш.

Я чулы да твае хады,
і хоць у гэта цяжка даць мне веры,
здалося сёння, што ты сапраўды
пастукалася ў мае дзверы.

Пахопіста наніз я збег,
каб адчыніць табе мае затворы,
ды не было ужо цябе —
і толькі на парог злятали зоры.

Глядзеў яшчэ я доўга у акно
на рух загадкавы сусвету
і думаў: можа, ты калі
прамчышся прада мной каметай.

*Ліпень, 1983*
*Глен Коў*

* * *

Я з вандраванняў толькі што вярнууся,
Расчараваны, зноў імкнуся ўжо назад:
у неспакойнай, пачуццёвай завірусе
усё ў мяне ідзе не ў лад.

Канца пакутаў не відно мне —
мне іншая ўсё сніцца далячынь,
дзе мог бы я знайсці, бяздомны,
сабе прытулак і спачын.

Там руху шмат, святла і бляску,
там стройнасць, звабнасць, прыгажосць,
там дыша ўсё надзейнай ласкай,
душы там адпачынак ёсць.

І верыцца — адтуль калісьці,
пасланы ёю, зніч мільгне.
І тое радаснае прыйсце
найбольшай асалодай будзе мне.

*Кастрычнік, 1983*
*Глен Коў*

* * *

Ты падабаешся ўсё мне,
ды болей да цябе я не імкнуся:
ў душы маёй, як на струне,
ты адзвінела назаўсёды, мусіць.

Штось згасла ў вобразе тваім,
што так мяне і чараваў і вабіў.
Каб я не думаў пра цябе, не сніў —
хвіліны не было такое, мабыць.

Цяпер не той душы мае парыў,
ён не ўзбуджае пламню асалоды.
А мо цябе я сам стварыў
і ты была такой, як ёсць, заўсёды?

Не, не — цябе я ўсё люблю,
кагосьці мне любіць — патрэба.
Люблю цяпер цябе я, як зямлю,—
калісьці я любіў цябе, як неба.

*Кастрычнік, 1983*
*Глен Коў*

* * *

Душа маркоціцца мая,
як бы закляты я ў кляцьбе:
пра што б ні думаў я —
вяртаюся я да цябе.

Сцюдзёна, пусціня вакол,
у свеце ты адзін.
Спадае ліст на дол,
на вечны свой спачын.

Іду, пажоўклыя тапчу,
на сэрцы тлее жаль.
Зірну — і уваччу
імгліцца даль.

Каб у пустэльні гэтай ты
дзесь не была,
зацьміла б свет
                слаты
непераможная імгла.

Душа маркоціцца мая,
як бы закляты я ў кляцьбе:
пра што б ні думаў я —
вяртаюся я да цябе.

*Кастрычнік, 1983*
*Глен Коў*

## НА ПАЛЯВАННІ

На ўзлессі лісце жоўтае ільсніцца.
Там зважліва, каб не параніцца,
ляжыць, скруціўшыся, лісіца
на выгрыве халоднай раніцай.

Ляжыць і паляўнічых не баіцца,
як на далоні — вось яна!
Сапраўдная лісіца
позняй восеняй.

Я падыходжу з стрэльбай блізка
і ўжо гатовы цэліцца —
ляжыць, спакойная, з прыгожым пыскам
з хвастом — нібы гарачая мяцеліца.

Падумаў я: «Ну, вось жа годзе —
аддасца стрэлам там, за гумнамі,
глядзіцца на мяне, нібы з стагоддзяў,
і вывучае, вумная.

Відаць, дазналася, як быў я блізка,
што я не ўмею цэліцца:
ляжыць, спакойная, з прыгожым пыскам,
з хвастом — нібы мяцеліца.

*Кастрычнік, 1983*
*Глен Коў*

## *Прароцтва сівілаў*

> Са мной не было сівілы,
> і як набягала імгла,
> Мусіць, яна заблудзіла
> і ў час прыйсці не змагла.

## ПРАРОЦТВА СІВІЛАЎ

Я не ведаю, якая сіла
У маіх сівілаў.
Але толькі мае сівілы
мяне ссівілі.

Трапіў я да іх, як у нерат —
яны ўсё прадказалі наперад:
і калі я і як нараджуся,
У якім кутку Беларусі
у якім нат адзенні
і што будзе пасля нараджэння.

І калі я прыйшоў на свет гэты,
яны поруч сядзелі, старыя кабеты.
І, спагадныя, на картах расклалі
мой жыццёвы шлях да найменшай дэталі.
І ў пялёнках, яшчэ сваёю спіною
вычуваў я, што будзе са мною.

Клалі лёс мой сівілы на шалі,
зелле нейкае мяшалі.

Усё чыста збылося, што яны прадказалі.

Ах, мае вы сівілы,
вы мяне ссівілі:
з нейкай сілаю незямною
прадказалі, што будзе са мною.

Слоў хвалы для вас у мяне не стае,
больш люблю вас, багіняў чымся.
Прадраклі вы ўсе беды мае,
толькі як не сказалі ад іх ўберагчыся.

*Снежань, 1983*
*Глен Коў*

## АЙЧЫНА

Я апынуўся зноў на беразе другім,
што стаўся мне айчынаю адзінай.
Я прысягнуў яму жыццём маім
і песняю маёю лебядзінай.

Я здабываў цябе за пядзяй пядзь.
Ты цвёрдаю навукаю мяне вучыла.
Не лёгка мне было цябе прыняць,
яшчэ цяжэй — назваць сваёй айчынай.

Бо іншая, бацькоўская мая
бесперастанку біла ў маё сэрца.
«Пакінуў лёгка Бацькаўшчыну я»,—
мо скажа хто. Не верце!

Лячыўся ад яе, як толькі мог.
Праз сон яе не раз я клікаў.
Яна і сёння дзесь у тайніках
ляжыць пакутаю вялікай.

Яна мне залацісцей усіх брам.
Я свята верыў у яе і веру.
Калі я гэты бераг і абраў,
не значыць, што забыў я іншы бераг.

...Я апынуўся зноў на беразе другім,
што стаўся мне радзімаю адзінай.
Я прысягнуў яму жыццём маім
і песняю маёю лебядзінай.

*Нью-Йорк,*
*травень, 1983*

## ЧУЖЫНА

Усё роўна — іду я, ці еду —
не застанецца тут майго следу:
буду змыты чужою хваляй,
нада мною што запанавала.

Я аглушаны чужою гаворкай,
незразумелаю, агорклай.
Як непатрэбную якую,
зразумець ужо не спрабую.
І што б дзе хто ні галёкаў,
застаецца яна далёкай.
Бы з сабою у змове,
думаю толькі ў сваёй роднай мове.
У душы маёй не слабее,
цэлы свет створыў з яе я.
І сяджу я ў гэтым свеце,
як на іншай планеце.
Між людскога прыбою
застаюся самім сабою.
У самоце такой пякельнай
існую, нібы паралельна:
свет ідзе дарогай сваёю,
я таксама — сваёю.

Свет праносіцца міма
прад маімі вачыма.
У шматфарбным такім —
сузіральнік я толькі ў ім.

*Люты, 1984*
*Глен Коў*

## СУЧАСНАЯ БАЛАДА

Напаўразбураная хатка ў лесе.
Жыве ў ёй маці з малым дзіцем.
Над хаткай дуб галлё сваё развесіў,
баронячы яе і ўдзень і ўпрыцем.

Туды ніхто не заязджае,
ніякая туды не йдзе дарога.
І ўсё чакае у адчаі
матуля з дзіцем дапамогі.

Нібы прадвесце цяжкае якое,
што можа хоць адкуль узяцца,
апоўначы, пужаючы паўколле,
разносіцца па лесе плач дзіцяці.

На момант у акенцы бліснe
спалохана няўцям агеньчык.
І шэпчацца трывожна лісце,
і чутна — нехта плача, енчыць.

Кладуць арэхі на парозе
хаціны жвавыя вавёркі:
спагадныя, клапоцяцца аб дапамозе —
ім блізкі лёс матулін горкі.

Няўвагу свет сваё пацвердзіў
да хаткі матчынай, што ледзь трывае.
І толькі дуб, нібы далоні міласэрдзя,
сваё галлё над ёй трымае.

*Ліпень, 1983*
*Глен Коў*

## АТАМ

Над чалавецтвам сіратлівай хатай
навіс наморшчана-пануры атам.

Стаіць у света уваччу ён,
свет нюхам яго сваім чуе.

Замёр, стаіўшыся. Баіцца
у вогнішчы ягоным спапяліцца.

Скавала сіла атаму нямая.
Свет рукі ў неба узнімае.

Ды што, якая ў тым патрэба,
калі глядзіцца атам з неба.

Наморшчаны, маўклівы, хмуры,
гатовы выбухнуць віхурай.

Над светам грэшным, вінаватым
запанаваў няўмольны атам.

*Жнівень, 1983*
*Глен Коў*

## АДЗІНОКАЯ МАЦІ

Дзіцё йшчэ корміцца грудзьмі,
паўгодзіка яму без мала,
а маці ўжо, глядзі,
ягонае жыццё застрахавала.

Ад усяго, назаўсягды,
і нават ад самое смерці,
каб праз усе яго гады
прадчасна не магло яно памерці.

Так думае яна ў душы,
і з вечара да ранку,
праз ноч усю, ў цішы
калыша калыханку.

Не зводзіць ўсё з яго вачэй
і нешта яму бае.
І каб занадта не крычэў,
цыцку у роцік пхае.

І не дап'е, і не даесць,
і ўсё чагось баіцца.
На ім сышоўся свет увесь,
і іншага няма як быццам.

Як убярэцца у гады,
ці выйдзе ён у людзі?
І як памру, тады
што без мяне з ім будзе?

Ну, а сама? Сама
яна сябе ў страхоўку не ўключыла.
Страхоўкі для яе няма,
яна змагаецца сама,
наколькі хопіць сілаў.

*Ліпень, 1983*
*Глен Коў*

## «DEAD END»

Жыву я ў багатым пасёлку,
наладжана ўсё тут як след.
Пайсці я хачу па зёлкі,
ды бачу я ўсюды «Dead end».

«Dead end» — гэта значыць дарога
канчаецца, ходу няма.
Зірнуўшы на знак гэты строгі,
іду я назад ціхама.

Ды мне не сядзіцца у хаце —
дарогаю іншай іду пад абед.
Ды зноў — як якое закляцце —
трывожнае бачу «Dead end».

Хаджу я вось так у сумлеве,
не дапамог і сусед.
Направа іду ці налева —
усюды мігціцца «Dead end».

*Чэрвень, 1983*
*Глен Коў*

## ПРА ВУСНЫ Ў ІДАЛАЎ

У вуснах ёсць прыгажосць,
калі на іх не ляжыць пячаць...
У ідалаў вусны ёсць,
але яны маўчаць.

Нібы за грэх які,—
ці мо гэта гнеў сатаны?
Надзьмутыя, праз вякі
маўкліва стаяць яны.

З абліччам нейкіх святых,
якіх не пусцілі ў храм,
нешта, што мучыць іх,
сказаць яны хочуць нам.

Ды скінуць іхная Ягамосць
з вуснаў не можа пячаць.
У ідалаў вусны ёсць,
але яны маўчаць.

Не зварухнуцца ані,
і праз увесь свой час,
бездапаможныя, яны
з сумам глядзяць на нас.

Схіляюцца чалом сваім —
быць ці не быць?..
Хочацца ім, нямым,
з намі загаварыць.

*Люты, 1984*
*Глен Коў*

## БЯГУН

Па вуліцы бяжыць старэнькі чалавечак,
ён практыкуецца у безе.
Ён думае, што гэтым сябе лечыць,
і ўсё бяжыць — аж колькі яму ўлезе.

Пагляд яго няпэўны і трывожны,
яму займае дыхавіцу.
Ён агаліў сябе наколькі толькі можна,
хоць там ужо няма чым пахваліцца.

Матляецца і кулачкі сціскае,
ад поту выцірае лобік.
І апаноўвае журба якаясь
увесь ягоны воблік.

Пот залівае яму вочы,
ды, не зважаючы на пот і працу,
бяжыць натужна, як быццам хоча
у маладосць прарвацца.

Ды ёсць у свеце рубяжы,
адлівы ёсць і ёсць прылівы.
З якой ты моцай ні бяжы,
няма туды прарыву.

*Травень, 1983*
*Глен Коў*

## БУДУЮЦЬ ДОМ...

Будуюць за маім акном
для некага новы дом.

Не разглядаючы які,
у дошкі б'юць цвікі.

У будаўнікоў
шмат у зубах цвікоў.

Бяруць іх рукамі
і забіваюць малаткамі.

Для наводкі падстаўляць палец —
і ўсё пяраць, і пяраць, і пяраць.

Пільнуюць, каб нішто не зляцела —
убіваюць цвікі у драўлянае цела.

Разразаюць яго прывычна
пілою электрычнай.

Хоць бы адпачылі трошкі —
забіваюць цвікі у дошкі.

Ні канца, ні спыну —
быццам мне будуюць дамавіну.

*Травень, 1983*
*Глен Коў*

## АДКАЗ НА ЗАПРАШЭННЕ

Прыслалі ў хату звесткі нам,
з усімі дадзенымі аб пагосце —
відаць, як новым жыхарам —
дзе мы злажыць маглі б таксама свае косці.

І помнікі у розную цану
нам прапануюцца пры гэтым.
Якую хочаш выбірай труну —
у кожнай будзеш ты дагледжаным, прыгрэтым.

Што будуць адпяванне і званы.
што можна пры жыцці замовіць дамавіну,
што будуць нават там яны
служыць табе у кожную часіну.

І шлюць мне найпадданейшы прывет.
Падумаць, сапраўды спакуслівыя ўмовы.
Ды ўсё ж разважыўшы як след,
прыняць я іх не быў гатовы.

Сабраў маршчыны на сваім ілбе
і напісаў такое я тым часам:
«Трымайце гэта ўсё вы пры сабе —
я не збіраюся ўміраць тымчасам».

*Ліпень, 1983*
*Глен Коў*

## Памяць

У свет, дзе, занядбаныя, спачылі вы,
іду да вас і я — ступенька за ступеняй.
Як вінаваты ў чым, з схіленнем галавы
аплакваю я вашае пакутнае успенне.

## ВОСЕНЬ

Цяпер на бацькаўшчыне ўжо марозы
кладуць узор на ранішнім лядку.
Падпаленыя восеняй бярозы,
усцяж гараць на бальшаку.

Мне, босаму, не страшна, што я босы —
скачу па маразянай траўцы шчэ валей.
Здаецца мне — як гляну на бярозы,
ад полымя мне іхнага цяплей.

У полі бацьку я ў падмозе,
гляджу жывёлу, бульбіны цяку.
І ўсё гляджу чамусьці, як бярозы
гараць на нашым бальшаку.

Я восеняй жыву ў трывозе,
забудуся ды зноў кране:
падпаленыя восеняй бярозы
гарaць пякучай ранай у мяне.

*Верасень, 1983*
*Глен Коў*

## ПОМНІК СЛАВЫ

Я збудаваў бы помнік для свайго народу,
каб ён стаяў, нязрушаны, у вякох,
каб чалавечаму ён роду
аб славе яго сведчыць мог.

Узняўшы над галавою цемрашалаў,
каб ён зіхцеў із роду ў род.
Ты заслужыў на гонар і пашану,
малы — вялікі мой народ.

Абвіты світкаю і лыкам,
з-пад гнёту, глуму, з-пад акоў,
у дзень сягонняшні — малы, вялікі —
прабіўся ты з імглы вякоў.

Тваю зямлю укрылі сваім прыскам
твае пакутныя сыны.
Пагляд твой засцяць абеліскі,
Хатыні ў сэрца б'юць званы.

Для будучыні новых пакаленняў,
як найвялікшы дар,
пакуты, кроў і доўгае цярпенне
ты ўсклаў на свой алтар.

Імём сваім ты радуйся і слаўся
і узыходзь на новыя ты рубяжы.
Усім, хто у цябе ў даўгу застаўся,
рахунак свой ты пакажы.

*Жнівень, 1983*
*Глен Коў*

## БЕЛАРУСКІМ ПАЭТАМ

Хіба ніхто не запярэчыць гэта,
пра гэта ведае ўжо немаўля:
была ад веку на музыкаў і паэтаў
не беднай беларуская зямля.

Таксама ведама: звялося іх нямала,
у беспрасветнай згінула начы.
Нам талентаў хіба хапала —
не ўмелі толькі іх мы зберагчы.

Траслі мы толькі лахманамі
і даць паэтам не маглі прыкрас.
Суседам звабленыя, а не намі,
яны пайшлі ад нас.

Пакорлівых, абдораных, нас бралі
вяльможы і правадыры.
Сярод чужой, заносліваe зграі
служылі мы ні пры адным двары.

А хто застаўся — плакаў, а не біўся,
ішоў пакорліва ў турэмныя муры,
і ў нас, абрабаваных, засталіся
не духу волаты, а толькі песняры.

Мы заплацілі дорага за гэту здраду —
за намі пусткаю ляглі вякі.
І наш няпрыяцель зазначыць рады,
што бедны мы народ такі.

Не бедны мы. Нам не хапае гарту.
За іншых мы, магчыма, багацей.
Адно бяда: у барацьбе упартай
народ наш страціў шмат сваіх дзяцей.

Збылі мы страту гэту жалем,
радком пакутлівым сваім.
Ды слова праведнага не сказалі
і вінаватымі мы засталіся перад ім.

Пасля вялікіх нашых заваёваў
на трон усселася мана:
паэтам засталася толькі мова,
але адмерці, кажуць, мусіць і яна.

Паэты беларускія, дужэйце!
Вы спраглых душ валадары.
Прыкмецяць вас на цэлым свеце,
калі не будзеце служыць вы пры двары.

*Кастрычнік, 1983*
*Глен Коў*

## БЕЛАРУСЬ

### 1. МАКРАНСКАЯ ЗЯМЛЯ

Я нарадзіўся ў вёсцы беднай,
на пескавата-глiністай зямлі.
Не ведаю, чаму, бясхлебнай,
ёй Мокрае назоў далі.

Хоць трэ сказаць — нябёсы з высі
улетку, як над нейкаю чужой,
над ёй залеваю ліліся,
а ўвосень — засланялі ўсю імжой.

І гэтак Мокрае макрэла,
не высыхала праз свой век.
І пад страхой здзіравай, закарэлы,
нядбала жыў макранскі чалавек.

Спачыну ў будні і ні ў святы
не ведала мая сям'я.
Малым, далей як за тры хаты
не адыходзіўся ад нашай я.

Калі падрос, мне берасцянку
і пугу бацька уручыў.
За статкам, доўгую, ад ранку
яе я ледзьве валачыў.

На берасцянцы ў смутку, горы,
хто толькі слухаў — ўсім наўздзіў —
засмучаныя нашыя прасторы
я нечуванай музыкай будзіў.

Канчаўся свет мой нашым тынам,
як матчын на стале абрус.
Не ведаў я, што ёсць краіна
з назовам нейкім: Беларусь.

Хто б як мяне дзе ні прывеціў,
як ні заманьваў хто здаля,
мне даражэйшаю была на свеце
мая макранская зямля.

## 2. ШКОЛА

У Мокрым я пайшоў у школу
і з «Букварем» у першы клас.
(Па-руску я у нашым коле
чытаў ляпей за ўсіх якраз).

Настаўніца па нейкім часе
прыносіць нам, як нейкі дар,
яшчэ у тым жа першым класе
ўжо не «Буквар», а «Лемантар».

І ў нейкім радасным здзіўленні,
ёй пазіраючы у твар,
пыталіся мы ў недаўменні:
«А што такое лемантар?»

І глянула яна нясмела,
задумліва наморшчыўшы чало:
сказаць сама яна не ўмела,
што азначаць яно магло.

Такіх не разумеў я словаў:
аловак, крэйда і абрус.
Ды нейкім радасным і новым
было мне слова: беларус.

Яго старанна я выводзіў
і ў хаце крэйдай на сцяне.
У нашым непісьменным шчэ прыходзе
зайздросцілі як грамацею мне.

На памяць вершы ўсе дазвання
я вывучыў з «Лемантара».
І думаў я ў тым часе раннім,
што ўжо пісаць самому мне пара.

Ці то у класе, ці на сходцы —
як наступаў душы парыў —
у нашай школе сямігодцы
я беларускімі паэтамі трызніў.

І сам у ёй я слыў паэтам,
і быў, скажу, нянадта рад,
калі сталічныя газеты
вярталі вершы мне назад.

І вось сядаю я на поезд —
я думаў — у сталіцы, там,
усё на лад хіба што пойдзе,
калі туды паеду сам.

### 3. СТАЛІЦА

Сталіца — мачыха, не маці —
мяне не надта прыняла.
Ляпей сядзеў бы ў сваёй хаце,
трымаўся роднага вугла.

Ды ўжо цяпер было мне позна.
Свой сум у сэрцы я тулю.
Прыпамінаў не раз я слёзна
сваю Макранскую зямлю.

Някормлены і несагрэты,
я станавіўся ўсё цішэй.
Ды ідэал сялянскага паэты
быў для мяне за ўсё вышэй.

Вось Дом пісьменніка. Памалу
іду я, уступаючы усім.
Дзівак, славутага Купалу
хацеў пабачыць я жывым.

У інстытуце я вучуся,
не так вучуся, як пішу.
У пачуццёвай завірусе
выкладваю сваю душу.

Там-сям бяруць мяне да друку,
ды дня таго не праміне,
каб нехта не сказаў з дакукай —
няма сучаснасці ў мяне.

Журботныя ў мяне матывы
і згадак шмат пра Беларусь...
Макранскія прыпамінаў я нівы
і матчын на стале абрус.

Тужыў па іх тугою сына,
душой туды імкнуўся я:
была мне нейкаю чужынай
сталіца родная мая.

Ды ў ёй я сніў, і ў ёй я марыў
пра долю лепшую ў жыцці.
І на любую на ахвяру
гатоў, упарты, быў ісці.

Збіраліся мы з сябрукамі
у каго-небудзь заўсягды.
Былі мы ўсе цецерукамі
не чулі што свае бяды.

І з нейкім болем невядомым,
адданыя ў сваёй кляцьбе,
чыталі мы адзін аднаму,
што мы пісалі для сябе.

У інстытуце нас ячэйкай
з няпрыяцелеў хтось назваў.
Жылі мы ўсе ў трывозе нейкай
сярод штодзённых дум і спраў.

У Дом пісьменніка заходзіў
з сваімі вершамі не раз.
Расчулены, з сабой не ў згодзе,
спалоханы, душой я гас.

Там шмат каго ўжо не ставала,
той «воран» тут — схапіў, панёс.
Сумленне беларускае, Купала
дрыжэў за свой пясьнярскі лёс.

Маліўся зорцы я вячорнай —
а мо як-небудзь праміне.
Ды ў трыццаць шостым ходам чорным
забраў той «воран» і мяне.

### 4. У ПАДЗЯМЕЛЛІ

Запаленыя, згаслі зоры
і пра мяне загінуў слых.
Смуціліся макранскія прасторы,
што больш не прыязджаю я да іх.

Руйнуюся душою ў падзямеллі,
У памяці пішу мае радкі.
Ад страху сцены анямелі,
і толькі будзяць іх турэмныя замкі.

На допыт першы выклікаюць.
Іду. Трымаюся сцяны.
Пытаюся: «Віна якая?»
А следчы: «Покуль без віны».

Ды вочы ён нахмурна звузіў,
сказаў — як глянуў з-пад зарніц,
што Беларусь я ад Саюзу
хацеў з сябрамі аддзяліць,

што ў інстытуце нейкай групы,
нацдэмаўскай я кіраўнік,
што да вучобы я не рупны,
антысаветчык, а не бальшавік,

што на пісьменніка я хворы,
што псіхалогія кулацкая мая,
што забароненыя творы
чытаў і распаўсюджваў я

сярод настаўніцкае гушчы
у Амсціслаўскім райана
упадніцкія творы Пушчы
і «Матчын дар» Алеся Гаруна.

Прыжмурваў следчы свае вочы,
змушаў прызнацца у віне.
Праз цэлы год і кожнай ночы
кваліў на допытах мяне.

Нарэшце я ў судзе Вярхоўным
і чую — ўсё ідзе на звод.
Разгляд быў справы павярхоўны,
прысуд жа круглы — дзесяць год.

Настырны пракурор плявузгаў —
не браў яго у тым сумлеў,
што Беларусь я ад Саюзу
усё-ткі аддзяліць хацеў.

### 5. РАЗВІТАННЕ З БЕЛАРУССЯЙ

Макранская мая ты вёска! —
аловак, крэйда і абрус.
Нарэшце зведаў я, што ёсцька
асобная краіна — Беларусь.

Бывай! Бывай! Грукочуць колы.
Вядуць яны ў сібірскі край.
Макранскія бывайце долы!
Сталіца родная, бывай!

На заклік твой, на покліч родны
прайшоў з вясковай я глушы
і ў гэтым выбары свабодным
не шкадаваў свае душы.

У беларускім руху новым
і мой пачаць хацеў я спеў
і матчыным прыгожым словам
уславіць я цябе хацеў.

У краі ледзяным якута,
што поўначай сваёй дадзеў,
нявольнік, зморапы, закуты,
у бок я твой, сумуючы, глядзеў.

На працы ў падзямельных сховах,
у дзень і у начной цішы —
усюды маё трапяткое слова
снавалася з мае душы.

Як мне цябе, радзіма, не хапала!
Якою я згараў журбой!
Пазнаў цябе я надта мала —
я жыў найбольш па-за табой.

Не зажываюць па табе ўсё раны.
На гонях бацькаўскіх прастыў мой след.
Нядоляю і сіверамі гнаны,
у пошуках цябе пайшоў я ў свет.

*Лістапад, 1983*
*Глен Коў*

## КРОСНЫ

*Памяці маці маёй прысвячаю*

...Не спачыне і не прыляжа:
перад Вялікаднем, у час посны,
за зіму напраўшы пражы,
маці ткала кросны.

З апаўночы да раніцы,
пакуль не праясніцца —
каб было на сарочку і на світку,
усю Піліпаўку за прасніцай
выцягвалася на нітку.

Яшчэ былі мы ў пасцелі,
сну там было йшчэ не годзе,
а яна ўжо за кудзеляй —
нітку выводзіць.

Трэба ж паспець да раніцы —
днём будзе праца іншая.
З бацькам яна радзіцца,
заўсёды увішная.

Як бы чмель які ўсё адно,
ці струна якая,
чулі мы ў сне, яе верацяно
у руках яе спявае.

Раніцою глядзелі, як яна,
схіліўшыся набок,
пражу з верацяна
зматвала на клубок.

Матляўся на столі сцень
ад матчынай рукі.
Досвіткам кожны дзень
раслі клубкі.

Як дар найбольшы які,
дбайна клала іх у куток.
Былі там клубкі
на аснову і ўток.

І з тых вось клубкоў —
бегатні было не мала —
у парожняй пуні на калкох
кросны маці снавала.

Ды такімі яшчэ іх не кінеш,
трэба потам яшчэ абліваццa:
каб былі яны мяккімі,
пранікамі пярылі на лаўцы.

Потым яна праз два ніты
прапушчала канцы асновы,
каб увесь гэты фонд залаты
для навою быў гатовы.

Клопату не абярэшся —
асцярожна, памалу,
кросны, нарэшце,
на навой навівала.

Болю як бы не чутно,
як бы ускрослай,
радая, ткаць палатно
садзілася за кросны.

Нітка стане якая тугой
і парвецца — яе вяжы.
То аднэй, то другой нагой
наступала на панажы.

Слізкі, смоўж маўляў,
з пражаю на ўток,
направа і налева слізгаў
у разяўленым зеве чаўнок.

Хадзілі рукі яе
то ў адзін, то ў другі бок.
Цэлы дзень — колькі сілы стае —
ганяе яна чаўнок.

Адпусціць навой, разаўе,
і было нам відно:
бы з-пад курыцы — з-пад яе
выходзіла палатно.

Зморанасці на твары цень —
сядзіць жа, сагнутая ў крук.
Наткаўшыся за цэлы дзень,
не чула ад набілак рук.

Ночы такой не міне,
каб, як і наяву,
палатно і ў сне
не йшло праз галаву.

Заставалася яшчэ адно:
пакуль чалавек жыве,
суровае палатно
выбеліць на мураве.

Баліць ці не баліць,
вясёлай ці ў журбе,
палотны бяліць
насіла на сабе.

Нібыта ў якой журбе —
ці доўга йшчэ будзеш жыць —
спяшалася сабе
кашулю на смерць пашыць

з працы і руплівасці сваёй,
з чаго жыве чалавек,
з таго палатна і з пражы той,
што прала яна свой цэлы век.

*Сакавік, 1984*
*Глен Коў*

## ПАМЯЦЬ

...Той звычай у памяці я збярог,
што ў нас панаваў у хаце:
як есці — за стол садзіліся мы ўшасцёх:
чэцвёра нас, дзяцей, бацька і маці.

Міска з стравою стаўлялася ў цэнтры стала,
напагатове ляжалі лыжкі перад кожным.
Часіна гэтая заўсёды ў нас была
нейкаю такою урачыста-трывожнай.

Урачыстай — бо важны момант быў
бо прывучаны мы былі да парадку,
а трывожнай — бо, шчасныя, мы
пазіралі на бацьку усё ж украдкай.

Сядзелі ціха, як набраўшы ў рот вады,
грудзі свае на брыж стала апершы.
За лыжкі мы браліся толькі тады,
калі бацька ўжо ўзяўся за сваю першым.

Навыперадкі, адзін за аднаго хутчэй,—
хоць бацька не любіў нас бачыць такімі,—
дружна сілялі мы з міскі адпэй
драўлянымі лыжкамі сваімі.

І калі хто ў спеху з нас, малых,
несучы, разліваў з лыжкі страву,
бацька, нічога не гаворачы ўслых,
папераджаў таго позіркам больш, чым яскравым.

Маці сядзела каля яго маўчком,
запярэчыць яго яна ні ў чым не смела:
трымаць дысцыпліну за сталом —
гэта было бацькава дзела.

Сваім чуйным дзіцячым нутром
мы добра разумелі позірк яго кідкі.
Перахрысціўшы буханку нажом,
наразаў ён сам для нас хлеба скібкі.

Навучаў: вось як трэ нам, маўляў,
абыходзіцца з хлебам, спадзяваўся —
ўвагу звернем.
Хлеб, як самае дарагое на свеце, шанаваў,
на таку ён ганяўся з мятлою за кожным зернем.

Узнімалася маці дастойна з-за стала
і прыносіла нам на другое штосьці.
Дзеля нас яна хутчэй не ела б і не піла,
каб толькі не пакінуць галодным з нас кагосьці.

Перакідваўся словам з нас той ці той
у нашым сямейным гуртку адналітым.
Задаволеныя і ўціхамiраныя ядой,
мы вылазілі з-за стала пасля ціхай малітвы.

Хвіліну спачыўшы, вяртаўся бацька да спраў,
на працу — хто мог што — усіх нас клікаў.
І дня з нас ніколі ніхто не прагуляў:
праца была для нас усіх — Яе Вялікасць.

Днямі шчасця ці нягодаў якіх,
як вулей для пчол, была для нас наша хата.
Пасля будняў працоўных, цяжкіх
святам вялікім было для нас кожнае свята.

Як бацька яго і дзед у старыну,
святам, ідучы мяжою,
бацька аглядаў на палетках сваіх збажыну,
задаволены ўсім і самім сабою.

Маленькае, сваё вялося шчасце ў нас,
заробленае у цярпенні, гарце і поце.
Каб у душах нашых агеньчык яго не гас,
засланялі яго ад вятроў мы штомоцы.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Як сумна мне цяпер, што з нас, шасцёх,
у свеце гэтым трое засталося.
У нашых некалі пакінутых вуглох
галосіць толькі вецер роспачна увосень.

У свет, дзе, занядбаныя, спачылі вы,
іду да вас і я — ступеня за ступеняй.
Як вінаваты ў чым, з схіленнем галавы
аплакваю я вашае пакутнае успенне.

*Сакавік, 1984*
*Глен Коў*

## АГОНЬ

*Зоі Юр'евай*

Праз усе малыя годы,
пакуль не выпадзе снег,
хлапчукамі, у кожную пагоду,
мы вадзілі коні на начлег.

Апранутыя у армякі суконныя,
на ўвесь час мы аддаваліся дню.
Не было такога, каб увосень на полі
з коньмі
мы былі без агню.

Агонь у нас, прастарэк,
не зводзіўся ніколі:
без агню ты не чалавек,
без агню ты не конюх.

Для канюховага шчасця,
канюхам, нам змалку,
каб агонь раскласці,
давалі запалкі.

Ляпей, чымся ў якую калатню,
мы мелі звычку —
як у прыгожую гульню,
гуляць у сярнічкі.

Нібы тую пстрычку,
на сваю галаву,
запускалі сярнічку
у сухую траву:

мы глядзелі, як долам сухім,
як бы за нечым наўздагон,
паглынаючы ўсё на шляху сваім,
бег агонь,

пахопіста, віхрыста,
клубком, з падскокам,
шыпеў агніста,
каціўся бокам.

Поўніліся мы відовішчам тым,
дзівіліся богу агня, што яго усчаў.
Агонь для нас быў нечым святым —
душы нашыя прычашчаў.

Распальвалі яго мы ўначы,
каб цемра не лезла на нас.
І не палохалі нас сычы,
пакуль агонь не гас.

Лежачы на мурожнай пасцелі,
нібы на цуд які,
задуменна глядзелі
на пакрытыя попелам вугалькі.

І зноў падкідалі
смалякі, карчы,
каб цемра не наступала,
каб нам было весялей уначы.

Дзівіліся мы, як капала
на агні суччо з хмызнякоў.
Агнём мы адганялі
ад коней ваўкоў.

Баяліся яны, калі
іх агартала сутонь
і задаволеныя былі,
калі бачылі агонь.

А найгорай малым: ім капцы —
аддаюць яны яшчэ дань матчынаму малаку.
Яны, сасунцы,
нічога зрабіць не могуць ваўку.

Учуўшы ваўкоў ганню,
у трывожны час,
яны прыходзілі да агню
і клаліся каля нас.

...Шукае ўсю ноч агонь,
каб агонь не знік,
водсветы кідае на аблонь
агонь-вартаўнік.

Світае. Гарадь смалякі,
і каб дахаты ехаць цяплей было,
мы забіралі у армякі
ад вогнішча нашага цяпло.

Запарошваюцца сляды —
можа, згасне агонь, перастане бліскаць?
От жа не! — калі вернемся зноў сюды,
агонь будзе — у прыску.

*Люты, 1984*
*Глен Коў*

## СКАЗ ПРА НАШУ КАБЫЛУ

...все мы немножко лошади,
каждый из нас по-своему лошадь.
*У. Маякоўскі*

Успамінаю і цяпер я часта,
як наша кабыла, высахлая, нібы вобла,
наравістая і кусастая,
не хацела станавіцца ў аглоблі.

Коцяцца градам поту кроплі —
бяссільны ты з сваім загадам:
глыбей каб стала ў аглоблі,
ніяк не папхнеш яе задам.

Вылазіць з аглобляў, шкура,
знарок аглаблю перастугае —
так ці інакш цябе абдурыць
морда яе тупая.

Возішся з ёю такою,
усякая грозьба твая пустая,
што ні рабі ты з ёю —
як след у аглоблі не паставіш.

Асабліва калі забачыць,
што нагружаны ўкоптар твае калёсы,
кусацца пачынае, кляча, —
не хоча мірыцца з сваім лёсам.

Быццам разумеючы штосьці,
на паклажу глядзіць з тугою.
Валтузячыся, у злосці
ёй давалі пад бок дугою.

Перамагала чалавечая адвага —
здавалася яна, нарэшце:
паклажу на калёсах, бедалага,
мусіла яна ўсё-такі везці.

Ды зноў, дзе цяжэй для калёс —
на пяску, у гразі, на балоце —
замест каб цягнуць воз,
спынялася па сваёй ахвоце.

Глядзіць на бакі — злазь,
іншага няма ратунку:
уехалі колы ў гразь
па самыя ўтулкі.

Як ты яе ні валтузь,
колькі ні грэй ёй спіну,
не пойдзе, пакуль груз
не скінеш на палавіну.

Ловіш у полі — убрыкне,
сядзеш вярхом — скіне.
Старога вераб'я, гаварылі мне,
не зловіш на мякіне.

Выкіне штосьці — тут я тут —
на кожным дарогі адцінку.
Наш вясковы люд
называў гэта зацінкай.

Зацінку у конях людзі клялі,
пры куплі яе не ўгледзіш.
Зацінка — гэта калі
ты хочаш, а не паедзеш.

Зацінка — бяда ў жыцці,
пры зацінцы нямашка ладу:
калі ёй наперад трэба ісці,
яна адступае задам.

Кабылу у нас адкупіў сусед,
казаў, што ён выганіць з яе зацінку.
Выюхціць яе як след,
а не — прадасць на рынку.

І вось ён пачаў выганяць
зацінку з нашай кабылы —
біць яе і ганяць,
пусціўшы ў ход кнут, граблі і вілы.

Як воз дзе не возьме яна,
не выцягне з багны,
тросся, як сатана,
да помсты прагны.

Ускіпеўшы сваім нутром,
стоячы сам на сушы,
сцёбаў яе кнутом,
загрузлую ў твані па вушы.

Адпрогшы, колькі моцы стае,
каб ніхто не бачыў, пазіраючы наўкола,
прывязаную да дрэва, яе
біў ён колам.

Рэбры худыя лічыў
на бакох яе парыжэлых.
Не маючы змогі вырвацца, уцячы,
усім сваім целам яна дрыжэла.

Як у апантанасці якой,
напаследак яшчэ патрапіў
у раз'юшанасці сваёй
кулакамі расквасіць ёй храпу.

Задаволіўшы характар свой,
адвязаў ён яе ў міжчасе —
матала яна галавой,
знямоглая, ледзь пллялася.

Знараддзем тым ці тым
навучаў ён яе бесперапынку.
Спосабам сваім крутым
выганяў з яе зацінку.

Аднойчы па вуліцы раніцой,
не шкадуючы сіл німала,
гнаў яе трусцой
бязлітасны паганяла.

Маці насустрач ішла якраз,
зірнула на кабылу сваю з жалем
тая раптам павярнула да нас
і перад варотамі заіржала.

Ад злосці сусед наш пацеў —
кабыла ад нас ісці не хацела:
у аглоблях і хамуце
тыхкала сваім целам.

Доўга не думаючы, бацька мой
адчыніў ёй вароты.
Пагладзіў яе далонёй,
вітаючы з паваротам.

З якою ласкай і смуткам якім
глядзела — сказаць немагчыма!
Што робіцца ў нутры тваім,
можна сказаць толькі вачыма.

Бацька счышчаў усякі мут
з бакоў яе мокрых і ўлеглых.
І як скінуў з яе хамут,
яна ў нашу канюшню ратавацца пабегла.

Не быў да яе бацька глух —
аўсом карміў, пакідаў на папасе
і ў барану ці ў плуг
запрагаць не хапаўся.

Зажылі яе бакі —
не тузалі ж, не білі.
І глядзі — праз месяц які
ажыла наша кабыла.

Перад тым як запрэгчы, пагладзіў рукой —
не глядзела яна на яго з падлоб'я:
без зацінкі хаця якой
паслухмяна стала ў аглоблі.

Як бы вас хто чым ні даняў,
не забывайце і на часінку —
ні ў чалавека, ні ў каня
нельга выганяць зацінку.

*Сакавік, 1984*
*Глен Коў*

## БАБУЛЬКА

І цяпер не забыўся я,
як з торбай, бярозавым кіем
хадзіла бабулька мая
Богу маліцца ў Кіеў.

У адзенні вясковым, з палатна —
ці сонца паліць, ці дождж хвошча —
ішла несупынна: хацела яна
пабачыць святыя мошчы.

Думала,— як і належыцца быць,
усё ж яна Гасподняя часцінка,—
на споведзі душу адкрыць
і мошчам тым прычасціцца.

Скароміны не брала ў рот —
пастом сябе марыла:
зрабілася — як збіралася ў паход —
нейкай ценькай птушкаю легкакрылай.

Бабулькі шкада было мне
(бачу яе як сягоння):
здавалася, вецер дуне —
і яе, як былінку, пагоніць,

Першы раз на вяку —
ашчаджала ж нямала —
сярэбранікі у вузялку
за пазухай яна трымала.

Набыткам сваім тым
расплаціцца лічыла шчасцем,
абавязкам святым —
за малітвы і за прычасце.

Ішла ад сяла да сяла
дарогаю гразкай ці сыпкай.
Босая, пакуль дайшла,
набіла сабе цыпкі.

Папраўляючы свае рызманы,
усё не пераставала хапацца.
І толькі, калі з Кіева
пачула званы
абулася ў лапці.

Не шкадавала ног сваіх —
ішла па зямлі, ледзь адталай.
За плячыма ўсю дарогу несла іх –
баялася, каб не стаптала.

Ад рана і да пазна —
не так, як іншыя лярвы —
ішла памаліцца яна
у Кіеўска-Пячорскай лаўры.

Праз век свой увесь ціхі
заўсёды хацела
адмаліць свае грахі,
якіх яна не мела.

Хісталася, як ад хвашча —
пост даканаў, нябогу.
Мой дзед яе не пушчаў
у такую дарогу.

Месяц ці болей брыла,
дзе як даводзілася — начавала.
Дзе б яна ні была —
дзівілася волі яе нечуванай.

У твары не скарга, а спакой,
хоць непагадзь залівала слатою.
Ужо ў дарозе гэтай цяжкой
была яна святою.

Рыхтуючыся, ці раз,
за ціхай застольнай бяседай,
«Пайду памалюся й за вас»,—
казала яна майму дзеду.

Дарыла калекам, пасціла сама,
жыла на двары пастаялым.
Перад іконамі усіма,
молячыся, на каленях стаяла.

У царкве ад ладану — сінява,
святло ціхасці было над усімі.
У бабулькі закружылася галава
на споведзі у айца Засімы.

Нейкі страх яе нібы сцяў:
«Што сказаць, не ведаю, шчэ мне?»
У святога яна айца
атрымала грахоў адпушчэнне.

На двары паломнікаў гамана —
яны вочы бабульцы мазоляць, засцяць.
Радасная і светлая, яна
разгавелася пасля прычасця.

Не спала бадай давідна.
Прыбрала сваю камору.
Як нанова народжаная, яна
хацела ісці ўжо двору.

Там свінні і парсюкі,
каровы, куры, авечкі —
скарб невялікі такі,
клопат яе вечны.

Аднак захацелася ёй
пабыць яшчэ дзянёчак,
пажыць Божаю светлінёй,
паглядзецца іконам у вочы.

Хацела святасць — аснову асноў —
узяць з сабою дадому:
ці ўбачыць калі яна зноў
Гасподні прастол — невядома?

Лёгкім заснула сном,
і ёй ужо сніцца:
Нехта нябёсным святлом
асіяў яе быццам.

«Пад добрай цяпер ты аховай,
твая адышлася бяда ўся»
і з такой незвычайнай вымовай
«Ці табе добра?» — пытаўся.

І хоць была нібы наяву,
ды па сарамлівасці вясковай,
я не магла Яму
сказаць ані слова.

Дахаты, прачнуўшыся раніцой,
збіралася яна ўвішна.
У сон верыла свой:
з ёй гаварыў Усявышні.

Цяжкое усё адлягло,
але, да ўсяго такой чулай,
бегла двору, ў сяло —
пад нагамі зямлі не чула.

Мала думала пра спачын —
турбавалася за дзеда:
возіцца там ён адзін
і, напэўна, сядзіць без абеда.

Дзед у думках слаў ёй паклон,
чакаў доўга яе, сумаваў нямала.
Баяўся за старую ён:
крый Ты, Божа, мо дзе прапала.

І не толькі ён слаў ёй паклон.
Памаліўшыся Богу,
у тузе не раз выходзіў ён
сустракаць яе на дарогу.

Ды яе ўсё не было,
і вяртаўся дахаты ён моўчкі.
Цягаў у нясцерпнасці за сталом
барады засмяглае клочча.

Ды ў нядзелю, у дзень святы,
да яго прыбеглі дзеці:
— Бабка вашая йдзе праз Масты!
— Дзедку! Дзедку! Вунь там, паглядзеце!

Праз поле Масты сапраўды
ішла яна знаёмаю сцежкай,
нягледзячы на старыя гады —
радасная, з далікатнай усмешкай.

Гаварылі дзеду наперабой:
— Паглядзеце! Хутчэй! Вунь, тая!
І спішна шапталіся між сабой:
«Вярнулася, святая!»

*Люты, 1984*
*Глен Коў*

## МАЯ МУЗЫКА

Зайздрошчу я музыкам, што ўмеюць
на чымсь зайграць:
на скрыпцы, на гармоніку ці нават
на бубне біць у тахт.

Як заварожаны, я слухаю
іграние іхнае, не чуючы сябе,
дарэшты пераможаны
усемагутным рытмам.

Калісьці хлапчуком, учуўшы, як пілікне
на скрыпцы наш сусед, увомірг
на голас музыкі
я з хаты выбягаў.

Бывала, на вяселле ці ігрышча,
куды, малых нас, не пушчалі,
прасіўся я у бацькі,
каб ён узяў мяне з сабою.

Там, як музыкі заціхалі,
распараныя бабы і мужчыны,
каб не спынялася вяселле,
у лыжкі і качулкі білі.

І стоячы у крузе паміж імі,
відаць, для большага імпэту,
нібы у бубен, у заслонку
мой бацька калаціў штомоцы.

Настаўнік музыкі у школе нашай
ламаў мяне, як толькі мог,
ды не выходзіла ў мяне нічога,
як я ні спрабаваў.

І кінуў ён мяне, і засталіся
вялікай таямніцай для мяне
кручкі на пяцілінейцы,
што нотамі завуцца.

Затое ўмеў я на трубе
без цяжкасцяў мелодыі,
што сам я выдумляў,
выводзіць.

Каровы, калі быў я пастухом,
на берасцяную маю жалейку,
ішлі і жаласна рыкалі.

Вясною на начлезе камары
сваю нудлівую мне песню гралі.
Вакол мяне ва ўсіх балотах
скварліся ноч усю курапы.

І стоены, ляжаўшы на спіне,
у неба зорнае я ўглядаўся.
Здавалася — зямлі, і неба, і сусвет
у музыку адну зліліся.

А сонца, узнімаючыся раніцою
над полем, над усім бліскотна,
як полымем,
гарачай музыкай шугала.

Яшчэ была даступнай музыкаю для мяне
на золаку ў гумне увосень малацьба,
калі цапамі на таку
мы жыта ўсёй сям'ёю малацілі.

Хваліў мяне мой бацька і казаў,
што гэту музыку я добра ўцяміў.
Я не збіваўся з рытму, нат калі
не ў тры цапы, а у чатыры гокалі мы зладна.

Хаджу цяпер я часта на канцэрт
і дзіва: тое, што я чую,
здаецца часта мне
нязносным дысанансам —
мелодыкі няма і паламаны рытм.

Але сяджу, не ведаю сябе,
што гэтага мастацтва я не разумею.
Пляскаць з усімі адначасна
баюся я ў фінале не патрапіць.

Але найгорш, калі у оперы пачнуць
спяваць у твар адзін аднаму.
Мне сорамна на іх глядзець
за фальш і іхнюю ненатуральнасць.

Але дарма — усе ўстаюць,
апроч мяне, бясконца плешчуць.
Відаць, курапін спеў мне не дае
узняцца да Бетховена і Баха.

*Жнівень, 1983*
*Глен Кой*

## *А часу больш, чым вечнасць*

### ЗАМАЛА ЧАСУ

Быў малады і думаў, што ў мяне
наперадзе ёсць часу больш, чым вечнасць,
што час не скончыцца, не праміне —
бяздумна жыў я і бяспечна.

Маёю школаю былі загон, папас,
і розум мой не біўся над загадкаю сляпою.
Я верыў — прыйдзе мой жаданы час
і станецца, што мае быць, самім сабою.

Не ведаю, ці сталася яно, ці не,
а толькі я пайшоў дарогаю сваёю,
а толькі йсці нялёгка было мне
дарогаю сваёю тою.

Усё адкладваў я на потым, на пазней
і не спяшаўся здзейсніцца радкамі.
Яны губляліся, адвольныя, у сне,
ды зноў прасіліся ў мяне начамі.

Іх запісаць не давялося мне
у той, што жыў я, паняверцы.
Я думаў — гора праміне,
і зберагу я іх у маім сэрцы.

Ды час прайшоў — я не заўважыў як...
Відно цяпер мне без прыкрасаў:
таго, што я хацеў, я не зраблю ніяк —
страшэнна мала засталося ў мяне часу.

*1988*

* * *

З вітком гадоў ступаю ўсё цяжэй,
як бы ўзбіраюся я на гару.
З вітком гадоў раблюся ўсё цішэй,
не палымнею сэрцам, не гару.

Іду, ўзбіраюся. І за спіной
увесь набытак свой нясу.
Нічога не пакінуў за сабой —
усё узяў: няўдачы, роспач, сум.

Нясу ў душы сваёй адбітак з'яў,
і следу свайго не пакінуў на сяўбе.
Адважны, змораны, з сабой яшчэ я ўзяў
найбольш і цяжкі цяжар — сябе.

І найсвяцейшае, што я нашу,
што выбраў я з усіх праяў,
жывіла, наталяла што душу —
я неразлучнае са мною слова ўзяў.

. . . . . . . . . . . . . . .

Ну вось я й на гары. Ляжыць
увесь мізэрны мой набытак, што я нёс.
І думаю: ці варта гэтым было жыць?
І стала мне шкада сябе да слёз.

*1988*

## СЭРЦА

Жывеш нядоўга, чалавек,
перажыві ж у момант век.
*М. Багдановіч*

Я вінаваты прад табою, сэрца,
што, неразумны, я цябе не шкадаваў,
няшчадна выдаткоўваў і змушаў
работаць на мяне беспярастанку.
Заўсёды паслухмяным ты было —
ішло на кожнае маё хаценне

і не пыталася, ці ўсё я ўрахаваў
і ўзважыў розумам халодным
і ці хаценне вартае выдаткаў.
У згодзе ты было са мной заўсёды.
У засляпленні жудасным маім
я дабрынёй надужываў тваёю,
і хутка надвярэдзіў я цябе.
Яшчэ малым, за статкам нашым
у полі лётаў я стралою.

З хлапцамі вёскі нашай беднай
гуляў, гарэзны, я наперагонкі.
Каб выйграў я, ты наддавала мне
як найшпарчэйшага ўсё ходу.
У жарсці жаркай я й не чуў,
як ты збівалася з свайго рытму.
Я згадваю яшчэ, як на гумне
у некалькі цапоў мы малацілі —
дзіцячае, ты хутка знемагала
ад доўгай і паспешнай калатні,
ды ажывала зноў, абы не спасаваць,
абы з дарослымі быць нараўне.

Мне не забыць: з такіх, як я,
хтось птушаня з гнязда цягнуў
і з дрэва вобземлю скідаў яго
і тут жа, кволае, яно ўмірала.
Ды не адно: ад болю й смутку
з ім заадно і маё сэрца памірала.

А як падрос, з усіх маіх пакутаў
зазнала маё неразважлівае сэрца
кахання найбалесныя пакуты.
Было усё тут: роспач, захапленне, мукі
і радасць нез'яснёная, што мне
шчаслівыя часіны даравала.
Ды зноў: знянацку ўжаліла цябе
неміласэрная гадзюка-здрада.

Выдаткі ўсё гэта былі
нязмерныя для майго сэрца.
Але не ўсё, не ўсё яшчэ... Чакай,
наперадзе чакае нас з табой
удар бязлітасны, смяротны.

Няждана, ціхай сапаю, халодна,
яны прыйшлі, па сходках крадучыся,
заснулага, мяне з пасцелі узнялі
і павялі начнымі вуліцамі, каты,
каб спратаць у глыбокім сутарэнні.

Змарнелае, ты кожнае начы
жахалася ад бразгацення
замкоў турэмных у дзвярох,
дрыжэла, замірала — мо й цябе
паклічуць, возьмуць, павядуць.
Закутае, ад страху халадзела ты,
і толькі лекамі адзінымі табе былі
мае няўцешлівыя слёзы.

. . . . . . . . . . . . . . .

Выдаткі ўсё гэта былі
нязмерныя для майго сэрца.

. . . . . . . . . . . . . .

Цяпер спачынь. Цябе я вызваляю
ад непамернае мае нагрузкі.
Служыла мне ты неадступна
на ўсіх маіх, такіх цяжкіх,
жыццёвых пуцявінах.

Спачынь, і мне даруй, што́ я цябе
не надта шкадаваў, кваліў, нягодны.
Я ведаю, хацела для мяне ты
найбольшых поспехаў і ўдачаў.
І калі я чаго не дасягнуў —
віна мая, а не твая,
маё спакутванае сэрца.

. . . . . . . . . . . . . . .

Спачынь. Спачынь. Спачыну й я.
Сыду. І толькі шкода мне,
што застанешся ты без усялякае
маёй узнагароды і ў скрусе па табе
я даўжніком тваім навекі застануся.
Даруй. Даруй.

*1988*

## БЕЛЫЯ ВОБЛАКІ

У штодзённай жыццёвай патрэбе
зямным я абцяжаны тлом.
А белыя воблакі ў небе
празрыстым набухлі святлом.

Даняў мяне клопат аб хлебе
і засціць мне вочы муць.
А белыя воблакі ў небе
у райскую прыстань плывуць.

Абы захацеў хто, наклепе
мяне, бедалагу,— о жудзь!
А белыя воблакі ў небе
спакойна плывуць.

Сыду я ўжо хутка ў небыць,
забуду, што значыць быць.
А белыя воблакі ў небе
ўсё будуць плыць і плыць.

*1988*

## НА ЧУЖЫХ ЗАГОНАХ

Я закаханы ў загоны
чужой стараны.
Сняцца яшчэ сягоння
яны.

Ішоў я за Ёю ўдагонку,
яна не зважала ані.
Знікла ў па-восеньску звонкай
далечыні.

Хараство яе постаці зграбнай
забыць хачу.
Ды ўсё паўстае прывабнай
яна ўваччу.

Ідзе па загонах у сонцы,
і смеласці не стае,
жаданую бясконца,
гукнуць яе.

Не сваёю хадою, здэцца,
за Ёю іду ціхама.
Думаў — яна агляпецца
сама.

Пабачу Яе ці хутка
на тых на загонах-палёх?
Вобраз Яе, як смутак,
на сэрцы лёг.

* * *

У адзіноце блукаў я,
у свет невядомы брыў.
Доўга цябе шукаў я,
марыў і сніў.

І ў той мары жывой, неаслабнай,—
не то яваю, не то маной —
такою жадана-прывабнай
паўстала ты прада мной.

У думках люляў цябе, песціў,
сябе не кваліў турботай зямпой.
Ты стала маёю песняй,
ратункам і доляй маёй.

Без цябе, я знаю, не жыць мне,
для мяне ты — як прыгожы зман,
як васільковая блакітнасць у жыце
і як незагойнасць ран.

І калі мне ўжо ўсё адасніцца,
не падняцца з пацёмкаў начы,
будзеш вогнікам свяціцца
для мяне ты ў той начы.

*1988*

* * *

На чужых на загонах
з ёй сустрэўся сягоння:

погляд Мадонны ўсё роўна,
задуменна-чароўны.

Стаіць прада мною
на зямлі — незямною.

У апратцы сіня-нябеснай,
быццам прыйшла з маёй песні,

што складаў пра яе, закаханы,
на жыццё і на смерць ёй аддадзены.

Рады я. Гаварыць ахвочы,
а яна — долу вочы.

Не зварухнуцца вейкі,
быццам застыла навекі.

Ужо й час наступае вячэрні,
а я ўсё ў засмучэнні

на маю гляджу Мадонну,
такі сумны, бяздомны.

*1988*

## ГОРА

Забылася мора пра гора —
спакойная, сіняя гладзь.
А я не магу свайго гора
і смутку свайго суняць.

Спакоем, лагодаю, цішай
дыхае мора ў цішы.
А я не магу суцішыць
болю ў маёй душы.

Забылася мора пра штормы,
што білі ў яго карму.
Разлог яго ў далеч прасторны —
краю няма яму.

Забылася мора пра гора,
адпачывае, спіць.
А я ўсё пытаюся ў мора,
як з горам маім мне быць.

*1988*

* * *

Бяжыць вада, віруе,
мне гаворыць, не памру я.

«Злаўлю плотку і ярша я»,—
вада суцяшае.

*1988*

## ХВАЛІ НА МОРЫ

Хвалі свае не спыняюць хады —
плывуць, ды не знаюць куды.
У розныя б'юць берагі —
то ў адзін, то ў другі,
не маючы нічога наўме —
адкуль вецер падзьме.
Ідуць то туды, то сюды —
вечны рух вады.

*1988*

* * *

Безліч разоў качка дае нырца,
каб дастаць сабе з дна спажыву.
Але гэта ёй не заўсёды ўдаецца.

Безліч разоў я заглядваю ў сваю душу,
каб адшукаць у ёй сапраўднае слова.
Але гэта рэдка калі мне ўдаецца.

*1988*

## ВОСЕНЬ

Дрэвы — дружныя брацця —
без асцярогі
асыпаюць сваё багацце
сабе пад ногі.

Урону — вер ці не вер —
не шкадуюць яны німала:
ім, аголеным, цяпер
лягчэй стала.

Асыпаюцца дрэвы ў цішы
да пары свае весняй.
Кожны раз лёгка мне на душы,
калі я асыпаюся песняй.

*1988*

* * *

На дрэве, як маністы,
акрываніліся лісткі барвіста.
Між імі свеціцца неба просінь —
восень.

*1988*

## ЗАЖУРЫЛАСЯ ВОСЕНЬ...

Зажурылася восень па мне, што не йду ў поле
да яе ў адведкі. Не распальваю агонь і не
пяку бульбу.
Не бегаю босым па сцюдзёных лужынах.
Не йду ў лес паслухаць цішыню.
Пытаецца восень, чаму яна не чуе, як іржуць мае коні.
Чаму, як яны скрэбліся, не пакінулі свае поўсці
на дрэвах?
Чаму не бягуць гулкім долам яны,
распусціўшы грывы?
Часта я плачу па табе дажджом-слязьмі,
выю ветрам,
схіляюся да цябе засохлаю былінкай,
журуся смуткам-туманом дзень і ноч па табе, што ўмеў
падслухаць мяне сэрцам і пад маёю пушчаю забыцца,
адгукніся, небарака!
Дзе ты?

*1988*

## ВОСЕНЬ АДМАЛАЦІЛАСЯ

Ад ранку і да вечара восень малаціла на гумнах —
цапы хадзілі па галовах снапоў,
выбівалі з іх зерне.
Абмалочанае зерне яна ссоўвала ў кучу,
садзілася на калодачку і лапатачкай веяла —
аддзяляла зернейка ад мякіны.
Чыстае, як золата, ссыпала яго ў мяшкі
і клікала гаспадара:
«Забірай! Пячы новы хлеб! Застанецца яшчэ табе
і на семя, і на емя. Я адмалацілася».
І павесіла цапы на бэльку
да наступнай малацьбы.

*1988*

## ВОСЕНЬ — ГАСПАДЫНЯ

У нашым агародзе восень ссекла капусту.
Засталіся толькі адны пні-качарыжкі.
Выкапала бульбу, буракі, моркаўку.
Марозам уначы прыхапіла цыбулю, часнок, рэдзьку,
што маці яшчэ не паспела выбраць.
Дагледзела, упарадкавала ўсё, як добрая гаспадыня.
І непрыкметна пакінула наш агарод.
Перабралася ў недалёкую пушчу,
каб перасядзець там зіму.
За ўсю ейную работу ёй ніхто, аднак, не падзякаваў.

*1988*

* * *

Восень — гэта калі рэжуць авечак.
На мяса і на кажухі. Авечкі ўжо ад'еліся,
адгуляліся — тлустыя.
Асабліва ідуць у ход бараны:
ад іх не чакаюць прыплоду.

*1988*

## ПАВУЦІНКІ

Сонца ўзнялося на ўсю сваю восеньскую вышыню,
і, спакойнае, затапіла сваім святлом
усю неабмежную прастору.
Дрэмлюць у ціішнасці сады,
пунсавеюць, наліваюцца ў іх антонаўкі.
А ў полі, з паднябесся, лятуць на зямлю,
як запаволеныя стрэлы,
бялюткія павуцінкі.
Людзі кажуць, што гэта бабіна лета.
Не — гэта нам пасланне з невядомага свету.

*1988*

## ЛІСТАПАД

...І хоць болем палымнеюць грудзі,
і хоць хутка я іду да спаду —
радасць, успаміны ў сэрцы будзяць
жоўтыя завеі лістападу.

Мірсціцца, як вецер на узлессі
золата ганяў віхрамі.
Поўнілася сэрца маё песняй
і не ведаў, дзе я —
на зямлі ці ў храме.

Паскідалі лісце сваё клёны,
сыпнулі бярозы поўнай жменяй.
У золата асенняе ўлюбёны,
ў золаце стаяў я па калені.

Грае у душы вячыстасць клёнаў,
лістапада восеньская замець,
О, мая асенняя ўлюбёнасць!
О, мая нязгасная ты памяць!

*1988*

## ДРЭВЫ Ў ПАРКУ

Адсвяціла сонца сваё,
і нікога ў парку не засталося.
Згасла праменняў вастрыё,
напусціла сутункаў восень.

Людзі пайшлі ўсе проч,
і, авеяныя журбою,
засталіся дрэвы на ноч
самі з сабою.

Не адны вы такія ў жыцці —
не дзялюся ні з кім і я снамі.
Мне няма куды ісці —
застануся я з вамі.

*1988*

* * *

Стаміліся пад вечар дрэвы ў парку,
задумаліся ў сваёй сцішнасці,
быццам перад нечым вялікім,
што вось-вось мае наступіць.
А што мае наступіць,
яны й не ведаюць
Стаяць, пакорлівыя.

*1988*

* * *

Пад вечар дрэвы сцішыліся ў парку гэтак,
быццам яны хацелі падслухаць,
якая песня пра іх нараджаецца на маіх вуснах.

*1988*

* * *

Аголелыя ў парку дрэвы
стаяць ціха, без павеву.

Толькі голлем ківаюць: «Мы
ўжо гатовыя да зімы».

*1988*

## СКАРГА БЯСКРЫЛЫХ, ЦІ ЯК КРЫЛАТЫЯ ДАПАМАГЛІ БЯСКРЫЛЫМ

(казка для дзяцей)

Было гэта на птушыным балі —
на яго бяскрылыя прыкалдыбалі.

Валюхаючыся — як умелі —
між крылатых, нешчаслівыя, паселі.

І птушынаю скорагаворкай
сталі скардзіцца на лёс свой горкі:

«Нам жыццё зрабілася нямілым,
нам, нягеглым і пастылым.

Шчыплем на балоце толькі лотаць.
Гора наша — мы не ўмеем лётаць.

Плаваем між купін і чароту —
мы пазбаўленыя лёту.

Наша пер'е глей і гразь пакрылі —
анямелі нашы крылы.

Сёстры нашыя і брацця,
памажэце нам узняцца!

Шчыплем на балоце толькі лотаць.
Гора наша — мы не ўмеем лётаць».

Цэлаю сям'ёю ўзнятыя,
над бяскрылымі ўскружыліся крылатыя:

«Гэй, суродзічы нашы балесныя,
ці ж не вабяць вас далі нябесныя?

Узніміце свае дзюбы, паглядзіце,
як мы патанаем у блакіце».

І як васількі у жыце,
патанулі ў блакіце.

Кружачыся, як той жораў,
даляцелі аж да зораў,

і, вярнуўшыся адтуль, дазорцы,
прышпілілі кожнаму бяскрыламу па зорцы.

Цэлаю сям'ёй, заўзятыя,
над бяскрылымі кружылі ўсё крылатыя.

Усміхаліся бяскрылым, называлі іх мілымі —
і бяскрылыя... замахалі крыламі.

Узрадваліся бяскрылыя бясконца,
заглядзеліся ў неба блакітнае ваконца.

Над паплавамі, над хатамі
шуганулі ў неба бяскрылыя з крылатымі.

*1986*

* * *

У думках я часта бываю цяпер у Менску,
сустракаюся з беларускімі пісьменнікамі,
гаманю з імі, каб даведацца,
ці яны перабудаваліся.

Я ўсё чакаю, калі мяне запросяць у Менск
прачытаць свае вершы.
Я пераканаў бы менскую публіку —
сваю, мясцовую, і прыезджую —
што на беларускай мове існуе сапраўдная паэзія.

*1988*

* * *

Я цэлае сваё жыццё аддаў слову.
Дзеля яго пакутваў за кратамі.
На алтар слова склаў ахвяры.
І як жа балюча ўсведамляць,
што яно цяпер непатрэбнае.
Яго зракліся браты-беларусы.
О ты, маё неспазнанае слова,
навошта я мучыўся табою?

*1988*

# Міхась Кавыль

*Міхась Кавыль (Язэп Лешчанка) нарадзіўся 1 лістапада 1915 г. на Случчыне (в. Покаршаў) у сялянскай сям'і. Вучыўся ў Грэскай сямігодцы, у Мінскім педтэхнікуме. У 1933 г. быў арыштаваны «за прыналежнасць да Саюза вызвалення Беларусі» і высланы на тры гады ў сталінскія лагеры (чацвёртае аддзяленне Дальлага). У канцы кастрычніка 1935 г. быў датэрмінова вызвалены «за ўдарную працу і добрыя паводзіны».*

*Жыў у Варонежы, вучыўся на літаратурным факультэце педінстытута, працаваў настаўнікам.*

*У 1941 г. прызваны ў Чырвоную Армію, ваяваў на Украінскім фронце. У 1942 г. трапіў у палон.*

*У 1944 г. выехаў у Германію. Цяпер жыве ў ЗША.*

*Вершы пачаў пісаць яшчэ ў школе. Друкуецца з 1929 г. Пад псеўданімам Язэп Маёвы яго творы друкаваліся ў газетах «Піянер Беларусі», «Беларуская вёска», у часопісе «Маладняк». Выдаў кнігі паэзіі: «Ростань» (1947), «Пад зорамі белымі» (1954), «Першая рана» (1960), «Цяжкія думы» (1961), «Міжагнёўе» (1990).*

* * *

Я ішоў па краі прадоння,
Я ступаў на збутлелыя скалы...
Здані з радасці білі ў далоні,
Злыдзень зубы нячыстыя скаліў.

Не баяўся я смерці, а неяк
Затрымаўся ля самай магілы:
Над прадоннем, мярлогаю змея,
Матылёк праляцеў белакрылы...

## АДЗІН, АДЗІН

Адзін, адзін.
Наўкол халодны мур.
Маўклівыя тырчаць у вокнах рэбры кратаў.
Прамень забег украдкай у турму
І струны кволыя маёй душы пакратаў.

Баліць душа. Пажаліцца каму?
Каму сказаць, што ты не вінаваты?

Адзін, адзін.
Наўкол халодны мур.
Ды чорныя тырчаць у вокнах рэбры кратаў...

*1933 г., Менск*

## ПОМНІШ, МАМА?

Помніш, мама, той горад вялікі?
Белы дом з вартавымі... астрог?
Па пабачанні ты чаравікі
Мне зняла з сваіх змучаных ног...

Вартавы панукаў: «Поскорее!..»
Развіталіся мужна, без слёз.
А назаўтра туды, дзе не грэе
Улетку сонца, цягнік нас павёз...

Шмат нас тут і малых і вялікіх,
Шмат хто холад падужаць не змог...
І, калі б не твае чаравікі,
Я таксама... застаўся б без ног...

Вартавыя крычаць: «Поскорее!..»
Пераношу ўсё мужна, без слёз,
Ой, калі ж мяне сонца сагрэе
Ў тым краі, дзе радзіўся і рос?!

*1934 г., Сяданлаг. Далёкі Усход*

## У ВІР ГАЛАВОЮ

Перанёс я прыгодаў нямала,
Упіваўся рамантыкай бою,
А цяпер, як казаў Купала,
Засталося — у вір галавою.

Хай падымуць мяне аптымісты
На калючыя дзіды сатыры...
Адкажу — а ні крыкам, ні свістам
Не стрымаць жураўліны вырай.

Жураўлёў каб пазбавіць палёту,
Жураўліных маленечкіх місій —
Жыць яны загубілі б ахвоту
І каменнем зваліліся б з высі.

Перанёс я прыгодаў нямала,
Упіваўся рамантыкай бою,
А цяпер, як казаў Купала,
Засталося — у вір галавою.
*1944 г., Менск*

## ВЯЧОРКІ

Сіні вечар. Белы снег.
Скрып варот. Дзявочы смех.
Вецер, спрытны жартаўнік,
Кужаль выхапіў і знік.
Хтось згубіў верацяно.
Жарты ўспыхваюць ізноў.
Месяц чысты, малады
Абапёрся на сады,
Паглядае із-за хат.
Дзед надзеў сівы халат,
Выйшаў сенцы адчыніць.
А наўкол агні, агні...
Месяц глянуў за парог,
Залаты сыпнуў гарох.
З хусткаў зоры-матылькі
Разлятаюцца ў куткі.
На камінку смалякі
Палыхаюць. Дзецюкі
Пазіраюць з-за стала,
Ці каханая прыйшла...
Нібы пчолы у вуллі,
Дзяўкі, хлопцы загулі.
Закружыўся калаўрот.
Не змаўкае карагод.
Песня родзіцца сама:
— Ой ты, зімушка-зіма...
Поўнач певень пракрычыць,
Час вячоркам на спачын,
Ды не моўкнуць песні, смех.
Сіні вечар. Белы снег.

## СЛЁЗЫ ДРЭЎ

*Ю. Віцьбічу*

Каля пошты ў машыне сядзелі мы. Было ранне.
«Слёзы дрэў»,— Вы знайшлі параўнанне
Таму прыгожаму шэраню,
Срабрыстаму, трошкі шэраму.

## ОЙ ТЫ, КРАЙ МОЙ

Ой ты, край мой залаты,
Край мой васільковы!
Над ракой чараты,
Пушчы і дубровы...

Як цымбалы, звонкі бор,
Ў зелені даліны...
Срэбра рэчак і азёр,
Вырай жураўліны...

Пад дугою шархунцы,
Коні вараныя...
Шыр і бель ва ўсе канцы,
Песні маладыя...

Пад ракою чараты,
Пушчы і дубровы...
Ой ты, край мой залаты,
Край мой васільковы!

*1944*

## БЕЛАРУСЬ

Беларусь, мая ты кветка,
Як мне шчыра не кахаць
Жыта буйнае ў палетках
І, як мора, сенажаць...

Сад зялёны каля хаты,
Хлопца з пугай на кані...
Лес задуманы, кашлаты
І начлежнікаў агні...

На балоце бусла клёкат,
Неба, соннае ад хмар...
Жураўліны крык далёкі,
Арабінавы пажар.

Снег бялюткі, як лілея,
Жарт вячорак уначы...
Звон цымбалаў і жалеек,
Сум заручаных дзяўчын...

Усё так родна, блізка, міла,
Сэрца радуе, калі
Нават цёмная магіла
На тваёй святлей зямлі.

Не забыць начлег, палеткі,
Жарт вячорак, сенажаць...
Беларусь, мая ты кветка,
Буду век цябе кахаць.

*1945 г., Вустраў. Турынгія*

## ТУРЫНГІЯ

Турынгія — царыца!
Зялёныя лясы...
Ніяк мне не упіцца
Віном твае красы.

Люблю твае я горы
У прываблівых лясох,
Ды сняцца мне узоры
На слуцкіх паясох...

Жалеек сумных граппе,
Дзяўчын задумных смех
Ды слуцкія світанні
Мне мрояцца у сне...

Турынгія — царыца!
Зялёныя лясы...
Ніяк мне не упіцца
ВінОм твае красы.

*1946 г., Драйсікакор*

## ПАДЗЯМЕЛЬНАЯ ПЕСНЯ

На зямлі мне і душна, і цесна;
Пад зямлёю душней, ды прасторней.
Падзямельная ціхая песня
Супакоем мне сэрца агорне.

Лямпы-знічкі, падземныя зоры,
Ў сутарэннях пабліскваюць здрадна.
Даламітныя рушацца горы,
Мне насустрач ідзе непрагляднасць.

Не праспекты — суворыя «штрэкі»,
Не на йгрышча іду я — у «ручу» —
Нада мною азёры і рэкі,
Пада мною агонь неўміручы.

Патаёмнасць і веліч тварэння,
Даламіты і вугальны камень...
Не, не час, а магутнейшы геній —
Бог стварыў ўсё зямное рукамі.

Гэтай думцы было калісь цесна
Ў галаве маёй, зараз — прасторней.
Падзямельная ціхая песня
Супакоем мне сэрца агорне.

*1947 г., Бельгія*

## САНЕТ

Я разгубляў санеты ля дарог,
Калі хаваўся ад сябе самога.
Я не прасіў ратунку у нікога
І сам нікога ўратаваць не мог.

Мінулі дні. Ступіў я за парог
Другой зямлі, не выклятае Богам.
Хоць у грудзёх не выцвіла трывога,
Ды прывід смерці тут я перамог.

Час уваскросіць мілыя санеты,
Час разбудзіць тэрцыны, трыялеты,
Хай на чужой, няветлівай зямлі.

Век не бадзяцца сумнаму па свету,
Плакаць аб тым, што ружы адцвілі...
Сталлю звінець мусіць верш паэта.

*Бельгія, 1947*

## АРЛА БАЧЫЎ Я

Арла бачыў я. Быццам мечам, крылом
Ён рэзаў вятроў выгінастыя спіны;
Ракетай нізрынуўся ў хмараў пралом
Ды йзноў узвіваўся між горных вяршыняў.

А лебедзь па возеры ціха плыла,
Бы ветразь бялюткі цудоўны.
І я заглядзеўся, забыў пра арла,
Палонены чарам князёўны.

Ды вочы увысь ірванулiся зноў:
Арла я ўжо там не пабачыў,
І доўга блукаў па нажох валуноў,
Засмучаны гэтай няўдачай.

Ля глыбы гранітнай праменне піў гад,
Ляжаў ён без мэты, без мары...
І думка кальнула: «Каму з іх я брат:
Арлу ўвышыні ці вось гэтай пачвары?»

*1947*

## НА НОВЫ ГОД

Мару, спадзяюся — прыйдзе хтосьці
З цеплынёй і святасцю ў паглядзе;
Скажа: «З Новым годам!» Любым госцем
За мой стол уквечаны прысядзе.

Як калісь далёка там, далёка,
На Радзіме любай, сінявокай,
Мне падорыць цёплы пацалунак,
З навагодніх лепшы падарунак.

Маўкліня, і свечка ледзь іскрыцца.
Я сяджу, як высмеяны рыцар...
Сэрца разрываецца ад болю.

За акном халоднае світанне.
Не збыліся мары, спадзяванні
І не збыцца, мабыць, ім ніколі.

*1947*

* * *

Я твой абраз, адзіную уцеху,
Пастаўлю ў рамцы залатой на стол.
Ён — твой прамень, замоўкнуўшае рэха,
Мяне сагрэе і разбудзіць. Навакол

Зямное кулі паляту у марах
Цябе шукаць, ужо каторы раз...
Ды ўсё адну, адну ўсё бачу пару:
Мой горкі сум, маўклівы твой абраз.

## У АКІЯНЕ

Вецер-смык на струнах-тросах
грае дзікія факстроты.
Як дазоры, альбатросы,
нібы здані, шчоглы-гроты.

Акіяну й неба шэрасць,
маракі наўкол паселі.
Дзень і ноч калоціць, мэрам
на шалёнай каруселі.

Раптам кіне, нібы з кручы,
скрыгане, як сталь у жорнах;
як у пекле тым кіпучым,
круціць, верціць, бела, чорна...

Паўтарацьмеш безупынна,
як вар'ят той загайданы
— Ўсе пяскі збяру з пустыняў
і засыплю акіяны.

*Атлантычны акіян, 27.2.1950*

## ІДЗІ, ІДЗІ...

Упала ноч.
Як эдэльвейсы, зоры.
Цвітуць над Альпамі.
Аскепак-маладзік
У неба ўрэзаўся.
Блакітнае на горы
Імжыць святло.
А ты ідзі, ідзі...
Якая ноч!
Як у святыні, ціха
І ўрачыста.
На калені упадзі.
Вунь там агонь міргае...
Шчасце з ліхам
Кладуцца спаць...
А ты ідзі, ідзі...
Трывожыць ноч,
як смерці жах мінулы,
І прышласць мроіцца,
як недабіты дзік.
Нібы агонь,
неўсподзеў шуганула

Жаданне жыць.
Каб жыць, ідзі, ідзі...
Разбілась ноч,
і зазвінелі зоры.
Прамень, як штых, бліснуў...
І маладзік
Збляднеў,
самлеў.
Ружовае на горы
Імжыць святло.
А ты ідзі, ідзі...

*1944—1952*

## ПРОСЬБА

Каля Слуцка ёсць адно сяло,
Невялічкае, двароў з дзесятак.
Калі б вас туды як завяло,
Пашукайце, калі ласка, хату...

Паміж хат яна адна, бадай,
На страсе гадуе мох зялёны...
На двары красуе лебяда,
Ля варот сумуюць ціха клёны.

На кале пузаты дрэмле гляк,
Пад хлявом цабэрак у мякіне...
На градзе цвітуць півоні, мак,
Па сяброўках журыцца вярбіна.

Вы напэўна знойдзеце, і вас
Прывітаюць хлебам чорным з соллю,
І сцюдзёны смагу ўтоліць квас,
Пачастуюць бульбаю з фасолей...

Запытайцеся тады у той,
Што спаткае і адчыніць дзверы,
Ці чакае скуль-нібудзь сватоў,
Ці не ўтраціла надзею й веру.

І адкажа — як жа, абяцаў...
Толькі мо нямашака на свеце...
Не чакайце сумнага канца
І маёй пакутніцы скажэце,

Што жыву, кахаю і прыйду,
Як зямлю маланкі зноў ахрысцяць.
Хай прадзе пачынкі светлых дум,
Тчэ сузор'і радаснага прыйсця.

*1952*

## КАЛЯНДАР

### I

Смалой і мёдам пахне у бары,
На небе ў схованку гуляюць хмары;
А дзесь дзятлы, лясныя дактары,
У хворых дрэў адлічваюць удары.

Не стогнуць дрэвы, ведаюць — вясна
Залечыць раны сокам і жывіцай.
А вунь за хмары пяліцца сасна,
Хутчэй святла, хутчэй цяпла напіцца.

Бярэзін косы чэша вецярок,
Асіны крэкчуць, размінаюць плечы.
На ўзлессі бусел прыспяшае крок,
Для жабаў марш прываблівы клякеча.

Казюляў, мошак славіць салавей,
І мне зязюля доўга жыць прарочыць.
А пад нагамі ў леташняй траве
Гараць блакітныя пралескаў вочы.

### II

Сонца спелы сноп
Гарачымі дзідамі коле.
У лузе горды коп,
А мэтлікі вышылі поле.

У поце дзень самлеў,
Маланкі ўзмахнулі сярпамі.
Долу, спразе — ўлеў.
Малоціць гром неба цапамі.

Чуеш колаў грук
Блакітнаю ноччу на полі,
Боль залатых рук
Бадзёрая песня утоліць.

Ноч змахнула сон
Астатняй усмешкай дзяўчыны.
Зор цьмянее звон,
І зоры пайшлі на спачынак.

Сонца спелы сноп
Гарачымі дзідамі коле.
У лузе горды коп,
А мэтлікі вышылі поле.

### III

Прытупіўся прамень.
Не чуваць птушак звону.
Вераб'і толькі сварацца
дзесь за сялом.
Быццам Жар-птушка
над вяршалінай клёну
Махнула перабітым
залатым крылом.
Пасмялелі вятры,
вербам чухаюць грывы;
Сыплюць лісце падногі,
адзвінеўшы жар.
Жураўлі-ўцекачы,
пачакайце, куды вы?
Не займаўся яшчэ
арабінаў пажар.
Як ізрэб'е, туман.
Лес, як старцавы косці.
Чысціць заяц кажух:
у разорах паздром.

Паглядзі, і ў цябе
нежаданая госця
Валасы падмарожвае
серабром...

## IV

Паглядзеў у акно,і здалося —
Зацвілі белым цветам сады.
Разгубляла ружовая восень
Залатыя па снезе сляды.

Па рацэ у блакітных падковах
Пракаціўся ў дрыготках мароз.
Пад страхою аздобаю новай
Кіяшы васільковыя слёз.

Гэта плакала восень па леце,
Успамінаючы радасны май.
Божа мой, а я толькі прыкмеціў,
Што на яблынях цвету няма;

Што лятаюць над садам у небе
Міліярды пабеленых мух,
Што зіма, срэбна-снежная лебедзь,
Падарыла зямлі цёплы пух.

*1952—1953*

## * * *

Байдаркі і яхты... Бурхлівыя хвалі.
Вятры заблудзіліся ў ветразях белых.
І шчоглы хрыбты да вады пазгіналі.
Дарогу у мора бяспечным і смелым!

Дарогу ў мора, у штормы, у буры!
Няўтоймныя сэрцы жывуць небяспекай.
Сівы акіян бровы шэрыя хмурыць,
У сударгі кінула рэчкі і рэкі.

У бухты даўно караблі паўцякалі:
На моры у штормы не знойдзеш ратунку.
А човен плыве па раз'юшаных хвалях,
У чорную даль углядаецца юнга...

*1953*

## БЕЛАРУСЬ

Беларусь ты мая, Беларусь,
Неугасная зорка Венера,
Я агнём тваім вечна гару,
У тваё уваскрошанне веру.

У крывава-чырвоным вянку
Не счарнелі пялёсткі шыпшыны.
Бачу: госці на Нёман-раку
Прыляцелі з далёкай краіны...

Вырай, доўгачаканы, расце.
Груганнё закрычала над лугам.
А у тых белакрылых гасцей
На грудзёх залатыя кальчугі.

Беларусь ты мая, Беларусь,
Неугасная зорка Венера,
Я агнём тваім вечным гару,
У тваё уваскрошанне веру.

*1953*

## ДЫМОК

Над Нёманам ціха
Стаіць хутарок.
Над хатай у небе
Блакітны дымок...

Як сонца заходзіць,
Як стане цямнець,
Дзявочыя вочы
Гарадь у акне.

Дзявочыя вочы
Глядзяць на Заход,
Даўно даражэнькі
Пайшоў у паход.

Паходы, паходы...
Пагасла зара.
А вочы не гаснуць,
А вочы гараць.

Над Нёманам ціха
Стаіць хутарок.
Над хатай у небе
Блакітны дымок...

*1954*

## БОЛЬ

Нявыплаканы спражыць сэрца боль:
Ці хутка мы спаткаемся з Табою?
Стаяць палкі, гатовыя да бою —
Паходу мапу папсавала моль.

З вачэй забрала адпіхнуў кароль,
Падняў «шампань» за маршалаў разбою...
Пажоўклі мы, чакаючы прыбою,
Праелі цыркялі, прапілі бусоль.

Атрутны чад паўзе з «вяршынь» Жэневы:
Пайшлі ў манашкі сёстры Жэнеўевы,
Дэ Кастры зоры лічыць уначы...

Дзе вы, зямлі збавіцелі, прарокі?
Вядзеце войска мужнае на чын!
Правідцаў прасвятлеце недалёкіх!

*1955*

## ЖЫЦЦЁ

Люблю жыццё. І радасць, і туга,
Бы пара крылляў, моцнае з падбітым,
Нясуць на бераг, тайнамі спавіты,
Дзе зор вірлатых вечная шуга.

Вялікі свет. Пустэльні і тайга
Пяску і лёду гурбамі пакрыты.
Для сэрца там не знойдзеш акавіты,
А й там я смерці жах перамагаў.

Жыццё, жыццё — неразгаданы соннік!
Ляціць з мячом і крыжам слаўны коннік
Паміж агнёў па войнікаў касцёх...

Ляці, ляці! Не бойся бліскавіцы!
Дзе пе́рун тне, там шчасце забруіцца;
Дзе ляжа смерць, устане там жыццё.

*1955*

* * *

Не люблю мудрагеляў млосных,
Іх лісіна-сабачыя пысы.
Быццам вожык паўзе паросны
Да чужога пойла місы.

І калючкі чамусь тапырыць,
На яго быццам хтось палюе,
Незайздросных, сумленных і шчырых,—
Прастадушных людзей люблю я.

*1955*

## СОН

Такое часам страшнае прысніцца:
Нясуць труну нябожчыкі маю,
І сам сябе я суправоджу быццам;
Пяю і плачу, плачу і пяю.

І грымнуў пе́рун. Палыхцяць пажары.
Стаю адзін руйновішчаў паміж.
А нада мной на сіне-чорнай хмары
І блісне меч, і зазіяе крыж.

*28 сакавіка 1955 г.*

## МАЎКЛІНЯ

Баюся ў моўкны мой пакой заходзіць.
Хтось скажа — трус... А я прайшоў агні.
І супакой — знаходзіў у прыгодзе,
Чакаў, бы вязень волі, маўкліні.

Тады, як неба на зямлю йшло ў наступ,
Хрысцілі высь пражэктараў нажы,—
Я прабіраўся, што вужака, пластам
У тыл варожы... Вось тады я жыў.

Тады затоеным я жыў дыханнем
І прагна піў маўклівасць зораў, ніў.
Ды пераЖыў раз маўкліню канання...
Маўклівіць ноч. Баюся маўкліні.

*21 траўня 1955 г.*

* * *

Бацькоўскі дом пакінуў я даўно,
Без жалю кон шляхі жарствою сцеле.
Зямля ўздыхае маладосці хмелем,
І чад вясняны блудзіць пад акном.

Ды не шуміць бруснелае віно.
Стаіць на століку бальзаму келіх.
Скрыпяць успадкі карабля на мелі,
А крыллі просяцца у неба ўноў.

Шляхоў нясходжаных на свеце шмат,
І прыгажуняў маладых, дзяўчат,
Дзесь вабіць песня ў ціхія сады.

Духмяны цвет дыміць у сіняй высі.
Дзе вы, мае чубатыя гады?
Блакітны край, вандроўніку прысніся!

*1955*

* * *

Бы мурашка, не па росту падымаю цяжар,
Згібаюся, нясу, глытаю пот гарачы;
Зняможаны, паглядаю ў неба, можа, скажа:
«Апошняя ступень, адпачні, бядача!..»

У небе маўкліня. Цяжка.
Паўзі, чалавек-мурашка!

*1956*

## РАНДО

Веру: смагу ўталю бруёй Случы,
Нарву лілеяў, кіяшоў, аеру;
Мяне ўцягне з галавою далячынь, веру.

Калісьці там, на Поўначы, падлеглы зверу,
Цынготна-хворы я ледзь ногі валачыў,
Ды выжыў, бо не траціў у збавенне веру.

Цяпер — бадзяжныя шляхі. Не ў нас ключы
Ад брамаў княжых. Жабракам няма даверу.
Але ўскросне Збаўца, павядзе на чын, веру.

*17 сакавіка 1956 г.*

* * *

*Не было і няма весялосці...*
*У. Дудзіцкі*

«Не было і няма...» І не трэба.
Весялосцю не купіш тугі.
На абрусе блакітнага неба
Ёсць акраец няспытаны хлеба,
Найвялікшая сэрца патрэба
На аблоні, дзе вецер тугі...
Не было і няма... І не трэба.
Весялосцю не купіш тугі.

*Жнівень, 1956 г.*

## ПРАШУ НЕ ШМАТ

Прашу не шмат — кунегі, ласкі,
Спагадных слоў і цеплыні.
Жыццё, я ведаю, не казка,
І людзі — згорбленыя пні,

Тугой пакрытыя карою,
Свідруе шашаль іх душу.
Цябе хрысцілі пад зарою,
Пад ветру воплескі і шум.

З тваіх грудзей ліліся песні,
Віла вянок ты маіх сноў...
Чаму ружовы ранак весні
Не усміхнецца нам уноў?

Няўжо блакіт засвідзеў казкі?
О людзі, згорбленыя пні!
Прашу не шмат — кунегі, ласкі,
Спагадных слоў і цеплыні.

*1957*

* * *

Прайшоў гуллівы лівень,
(Грымотаў грукат не змоўк).
На поплаве і ніве
Траву, ячмень патоўк.

Вісіць кляноў ярмолка,
Падраная, над хлявом.
З азёр ваду вясёлка
Квяцістым п'е рукавом.

А там, дзе бліскавіца
Агольвае грэх вятроў,
Прысела ночваўчыцай,
Аблізвае сонца кроў...

*1957*

## СМАГА

Расою буйнай спёкі смагу
Не ўтоляць пальмы у пустэльні.
Спадзеўны гімн, глушы развагу,
Настальгіі агонь пякельны!

Пустэльні што? Я не пустэльнік,
Не сніць мне сны ў цянётах пальмаў.
Мне б там, дзе стромы звоніць ельнік,
Дзе ў дуб стагодні пе́рун пальнуў,

Сачыць разгулле навальніцы,
Шаптаць малітву у затуллі...
Забудзь. Глядзі на камяніцы,
Бадзяйся вывіхамі вуліц,

Улевай соды ўтольвай смагу,
Што тыя пальмы у пустэльні.
Спадзеўны гімн, глушы развагу,
Настальгіі агонь пякельны!

*1957*

## НЕ ЎЦЯЧЫ

Ў хвіліну вольную паспешна йду
Ў прасцяг шырокі, дзе цвяты і травы;
Забыцца хочацца пра дзеі, справы,
Уцячы, схавацца ад трывожных дум.

Чмялі і пчолы карагод вядуць,
З цвятамі шэпчуцца таемна травы.
Якія ў іх, жывых, бяздушных, справы?
Куды схавацца ад трывожных дум?

У места шумнае паспешна йду.
Асфальт ды камень... Дзе цвяты і травы?
Хвалююць іншыя тубыльцаў справы.
Не, не ўцячы мне ад трывожных дум.

*1957*

## Я ДУШУ НЕВЫГОЙНА ПАРАНІЎ

Жаўрукоў шчабяткія кларнеты
Срэбрым россыпам будзяць цішу,
І дзяўчатам агеньчыкі кветак
Уплятае вясна ў касу.

Бы выданніцы, сосны, бярозкі
Углядаюцца ў люстра азёр;
Абступіў задуменныя вёскі
Гаманкі, непакратаны бор.

У прасторах жытнёвыя хвалі
Б'юць у грудзі сінявых лясоў;
Вабяць, клічуць блакітныя далі
Незямною бруёй галасоў.

Вечары, буйнаросыя ранні!..
Дзе такія цудоўныя ёсць?
Я душу невыгойна параніў
Аб тваю, Беларусь, прыгажосць.

*15 traўня 1958 г.*

## КАНЦОНА

Балюча жаліць думак звонкі рой.
Адну, бы пчолы матку, я купежу:
Міндоўга замак, пушчу Белавежу
Пабачу і пад Лысаю гарой

Заслухаюся жаўруковаю ігрой
На досвітку, румянкавым і свежым;
А вобраз мілы дзіўнаю мярэжай
Запоўніць сны пад ціхаю зарой...

Ды вось цыганка мо ўгадае шчасце?
На стол упала карта чорнай масці...
Ў калюгах сцежкі на чужой зямлі.

Каля Вагезаў, Альпаў, над Гудзонам,—
Куды б шляхі нядолі ні вялі,
Яна са мной — усіх паэм канцона.

*1959*

* * *

Вясну пазносілі пчолы ў вуллі,
Замуравалі духмяную ў соты.
Праменняў струны расцяла, бы ноты,
Гарачае сонца, каб век гулі.

Ля хмараў восень вязуць жураўлі
З-пад клёну, сосен — пад пальмаў цянёты.
Прымчаўся з паўночнай мёрзлай Галготы
Прастуджаны вецер, стогне ў галлі.

Сумуюць сарокі па лісцяў шасце,
Шукаюць у смецці зярняткі шчасця.
Палоззем свішча на ўхабах зіма.

Прыгожы сон на досвітку сніцца,
І кратае песня вусны сама:
Слязу ураніла на снег крыніца.

*1959*

## ПРЫЗНАННЕ

У мяне ёсць прыгожая песня
Аб дзяўчыне прыгожай адной.
Гэтай песні ў грудзёх маіх цесна.
Ў гэтай песні ёсць слова адно,

Даражэйшае за чырвонцы,
Ласкавейшая за сон
І цяплейшае за сонца...
У гэтым слове срэбра звон.

Я не ўмею спяваць тую песню,
За мяне хай спявае вясна.
Жыць мне стала на свеце цесна:
Ёсць на свеце дзяўчына адна.

Даражэйшая за чырвонцы,
Ласкавейшая за сон
І цяплейшая за сонца...
Не дзяўчына — срэбра звон.

Я не ў сілах назваць яе імя,
За яе і ў агонь бы пабег.
Яе імя з усімі святымі,
Яе імя... кахаю, цябе,

Даражэйшая за чырвонцы,
Ласкавейшая за сон
І цяплейшая за сонца...
О, нямоўкны срэбра звон!

* * *

Свішча вецер.
Вечар. Косы
Дождж у вочы.
Ірве атосы
Калясніцы
конь стаенны.
Бліскавіцы,
быццам кроў

Ад сэрца ў цела,
Разлятаюцца па хмарах.
Пахне гарам.
Навальніцы,
хто не смелы,
хто баіцца?
— Джвагні, джвагні!
Загрымела...
— Ах, як ціха,
як няўмела!
Джвагні!

* * *

Вочы заплюшчу —
яна...
Усмешка, і косы, і плечы.
І рукі працягвае —
на́!..
Бяжэм,
покуль месячны вечар,
Туды,
дзе мяцеліць зіма!
Вочы расплюшчу —
няма.

* * *

Яшчэ снягоў не выкіпела пена,
Вятры ільдзінак зорных не змялі,
А ўжо бруіцца па бярэзін венах
Прыглушаная музыка зямлі.
Шпурнуўшы ў сінь праменне-камертоны,
Гарыць агнём, няўрымсным, дырыжор.
Яшчэ часіна — перуноў трамбоны
Ударыць марш, вясновы з рэ мажор.
Лясы спрасоння зашумяць: «Дзе лісце?»
Зямля нап'ецца сонца і вады.
Памчацца рэчкі ў эстафетны высціг,
У белай радасці закружацца сады...

*1963*

## ШЧАСЦЕ

Я за шчасцем па ўхабах зямлі
І цвярозы бадзяўся і п'яны...
Залатых міражоў караблі
Адплылі, адплылі ў акіяны.

Да пошняе прыстані крок,
Не ў кішэні душа і жаданні.
Тваё месца, паэт і прарок,—
Пад платамі з галотай буяніць.

Не табе, не табе сумаваць,
Не ўсё і ў палацах суцешна.
Мяне будуць вятры адпяваць —
Мне й тады будзе крыху смешна.

## ЖУРАЎЛІ

Із далёкай заморскай зямлі,
Дзе сады зеляпеюць узіму,
Без трывогі ляцяць жураўлі
На сваю дарагую радзіму.

Каля Нёману, лесу наўскрай,
Абкурлычуць прыгожае лета,
А увосень у сонечны край
Зноў у вырай у эскарце дзетак.

А куды мне падацца, куды?
Ці ж навек прысмактала чужына?
Дзе ж напіцца «жывое вады»,
Камень цяжкі каб з сэрца ізрынуў?

Жураўлі, мае сёстры, браты,
Як не выстаю, сум мо задушыць,
Па дарозе ў Святую Святых
Захапеце з сабой маю душу.

*1976*

# Янка Юхнавец

*Янка Юхнавец нарадзіўся на Бягомальшчыне (Докшыці раён) у 1921 годзе. Атрымаў юрыдычную адукацыю. З прыходам нямецка-фашысцкіх захопнікаў быў арыштаваны і вывезены ў Германію. Цяпер жыве ў ЗША.*

*Друкуецца з 1947 г. Выдаў кнігі паэзіі: «Шорах моўкнасці» (1955), «Калюмбы» (1961) і «Новая элегія» (1963).*

## ЦЯРНІСТЫМ ШЛЯХАМ

I

Дзень адшугаў. Ваўком крадзецца цемра.
Лагчына пыле ймглістасць тумаяоў.
І гэты дзень маруднаю хадою
ў абдымках цемрыні ізноў прайшоў.

І я ваўком плятуся па чужыне,
ад болю ран не чую сваіх ног.
І толькі помніцца, што цёмнаю парою
свае радзімы кінуў я парог.

Але ж із гаю
зорнага
мой шлях,
мой ночны шлях асвеціць зараз месяц.
Напэўна, ён на помач нам, тулягам,
сабе самога ліхтаром падвесіў.

Напэўна, нам даверана, тулягам,
пабачыць на зямлі, як знікне цемры сцень,
што засвятліць над краем Новы Дзень.

2

...і з таго часу спапялела шчасце,
юнацкія гады і радасць дзён.
Балонкі чорныя я часта
пачаў лістаць у сонме дзён.

Вандроўнік стаўся адзінокі,
сваё кароткае жыццё
шпурнуў у пыл дарог далёкіх,
забыўся я, што ёсць жыццё.

А Зорка-Лебедзь зіхацела
з таёмнай высі (гэта ты),
— Дзе пахаваюць тваё цела?
Здаецца ты... пытала ты...

Красуня зор, нябёсных хваляў!
Я — лунь сівы пячор зямных
прыйшоў, каб толькі пахавалі
пакуты дзён маіх зямных.

*1946*

3

Жадаю сніць я на чужыне сны,
а ў снох:
вясны зялёныя абрусы,
званіцы гонкія Святой Сафіі,
спрадвечны шум палескіх пушчаў,—
сны тады мяне ажывяць,
пацешыць сэрца леташнясць гадоў,
і буду знаць,
што мытарам убогім
на зямлі сваёй
я нарадзіўся жыць.

*1947*

4

Як капцюрамі кот,
дождж скрабе па даху.
Цемра прытулілася
да празрыстых шыб.
І крадзецца мякка
пад шум дажджу,
да мяне вясняны, мляўкі сон...

Засынаю,
і сніцца раздарожжа.
Як дзіцё, крычу:
— Куды ісці?
І дзе шукаць
таго святога выйсця,
што запаветам мне
ад прадзедаў, дзядоў?..
І голас гнеўны,
але срабрыста-чысты,
да мяне прамовіў з вышыні:
— Мужайся, брат! Цярністым шляхам
знаходзяць Сілу і Жыццё!

*1947*

## ЯШЧЭ НА ЎСХОДЗЕ НЕ БЫЛО СВІТАНКУ

(У дзень 21 чэрвеня 1941 г.)

Яшчэ на ўсходзе не было світанку.
Сукрыста не адсвечваліся на небакраі хмары,
і чараўніча не выгіналі стан,
па пурпуровых ідучы усходках,—
а на Айчыне
дзень даўно пачаўся —
людзі самі цяплілі ўночы ранне,
паветра моршчылася ў абцугох спякоты,
і чадны дым глыбока неба раніў.

І долы млелі пад агністым плугам,
скібамі ільсніліся узараных ніў.
Жаўрук сціхаў і пад мяжой туліўся —
рокатам матораў клекатала сінь.

І вецер з кулямі спрачаўся ятра
за спеўнасць струн сваіх чмяліных,
ды кулі ліплі да наўколля з гулам
і па дрэвах,
на цаглінах
свае імён высякалі.

А на пагарах толькі пеўні
па жыцці пужлівых,
па жыцці адважных
спявалі паніхіду...

*1947*

* * *

Краскі пад узмахам ветру
былі полымем пажару.
Адбіваў навалу хмараў
агнявісты промень-джала.
Ды няўмольна хмараў валы,
каб затуліць прыход начы
крокі цемры прыкрывалі,
хто іх мог перамагчы?
У цемры вецер доўга, доўга
таполяў гонкасць выгінаў.
І срабрыстым клыкам месяц
апону цемры разарваў.

*1947*

## МАЛЮНАК

Цэлы дзень мітусілі неба хмары,
ім цэлы дзень свяціла сонца.
А цяпер яны дайшлі да небасхілу
і яго чакаюць на спачын.
Пухам залатым яны набухлі,
мякка палеглі прад сонечным палацам,
і вячорны промень на кілімы
іх ступіў агністаю ступой.
І так пайшоў, пайшоў памалу
у глыбіню сваіх начных палацаў,
і толькі бронзавы адплыў паветра
у небе ціхай хваляй лёг.

## НА РУІНАХ

Спякотнай завірухай тут агні шумелі,
лажыліся усцяж каменныя сумёты.
Вогнішчам брусналіся панелі,
дажджлівым водгуллем лажыўся жах.

Таполі пышныя рабіліся, як пікі,
ветру аксамітнаму было іх жаль:
ад смутку ён ганяў у небе хмары,
і над пажарышчам яны былі як жар.

Разбітых люстраў асклёпкі із руінаў,
смяяліся заліўна да цьмяных ліхтароў,
і вуліцаў шырокая прыгожасць
выдмамі пустыні засыпана, бы роў.

Бы на вуснах смага, была ўсюды плесня.
Бэлькаў сталь звівалася, як стружка.
У падзямеллі людская чахла песня,
смерць паўзла за усімі смоўжам...

Час — яздок, каня свайго прышпорыў.
Час заглушыў пакуты — жыццё ўскрасіў.
У вокнах заімглелі шторы,
сцены туляць радасць шчаслівае сям'і.

*1947*

## ВЯЧЭРНІ ПРОМЕНЬ СОНЦА ПАГАСАЎ

Вячэрні промень сонца пагасаў.
Хаваўся мерна за гарамі.
Знікаў апошні сцень з зямлі
ў бронзавым святле заходу.
І песні ціхлі,
шорах моўк
у неабсяжнай цішыне.

І хутка змрок іржавы знік
у цемры ночы і дубраў,
і толькі ў небе жоўты месяц
між завулкаў зорных плыў.

І доўга моўкла жудзь начы,
ляжала між людскіх трывог,
і ў ложку росным, у імшарах,
нараджала дзень другі.

І дзень настаў. Дзень нарадзіўся,
і цягнуўся колькі мог.
Але ж...
не вырашыў нічога і гэты дзень.

*1947 г., Баварыя*

* * *

За допытам дарэмна допыт быў
пра скляпы таёмныя яго душы...
З пагоркаў-хмараў
вось замітусіла рось,
і зажурбіў пад дахам голуб шызы.
Жарсна не цалаваныя яшчэ учора вусны
сяння ў пятлі навек заглухнуць.

Ды ён няўкорны — яшчэ зусім падлётак:
— Не я ж, а вы застыглі прад мною у пашане!
Насміхаецца Свабоды горды сын,
ля вісельні наўкола янычары шамнуць.

— І юнацкага мне не шкада жыцця!
Мяне хто зразумеў, дазнацца б толькі...
Густая ціхата. Цікавасцяў гурма
трымала позіркам пятлю вяроўкі.

*1948*

* * *

У краіну далёкую
адпраўляюся.

З мною думкі:
— Што будзе? — адплывуць.
Буду там сабе нядаўнасцей,
што ў ростанях жывуць.

Дарогі пядзь апошняя
з Айчыны памятаецца.
Чужацкія абшары дзівіцца
прышэльцу ад чужых.

...зусім не каюцца,
зусім не пазнаюць:
далёкі ты
ці блізкі да сваіх,
ці ім.

*1949*

* * *

Дня апошняга не было
ў лёце птушак і думках людзей.
Усё віхлялася сваёй мерай:
Бяздумнасць людзям спыніць,
а птушкам ляцець,
дзе коршак не чакае.

Адвекам днесь спатыкае дзень.
Стаіліся птушкі й нават людзі.
У ліку лішняга няма —
наступны дзень,
чагосьці не далічыць.

Учора сонца, насустрач раніцы,
гэта была далёкая дарога.
А ўночы цела страхам абнімае,
бо сны былі ад дня апошняга.

Дзень водведкам спатыкае дзень.
Стаіліся птушкі і нават людзі —
у ліку рознасцяў рознасць ёсць:
уладай слоў
                    пагрэемся.

## ЭСКІЗ

У немань ночы
адыходзіла лета.
          Зарніцы свігалі
у нябёсны схон.

Свяцістасць іхняя
забаўна,
але спалохліва
азёрную
паласкала стынь.

А потым сталася зусім начліва.
Нейкі птах ля возера
заспяваў.

          Псалм
                    у несапраўдным раю
                    падораны усім
                                        між зямных уяў.

*1949*

# З ЧУЖОГА АЛЬБОМА

1

Вельмі добра,
што у садзе восень
дорыць шорах,
і памост
сцеліць намістам па сцяжынках простых
із лістоў.

Вось як добра,
што я з табой,
што нас не дзеляць гады расстання
і што у садзе не спяваюць птушкі —
а каханне — песні нашы
хваляць сад асенні.

Як добра, што я з табой!..

2

Ноч усю я думаў пра яе.
А потым ранкам жадаў сказаць:
— Мая,
ты свет увесь,
агністая зара
у загібах жарслівых рук.
Ля вуснаў ля тваіх я — снег вясняны,
сплысці гатовы няведама куды.
Каб толькі шорах тваіх сукенак
уторвалі сцюдзёныя вятры
услед вандроўнікаў.
Там, на прыстанішчах,
дзе пачынаецца іх мрояў плён,
яны, стамлёныя, без павеі, сталі,
як у духату прад алтаром.

...што я надумаўся, юнак зачараваны:
турбаваць збіраюся свяцейшыя імёны.
Лепш буду я кружок намаляваны
на ейнай шыі запалёнай.

*1949*

## ЖАДАННІ

### 1

Жадаю песняй кахаць цябе
і ласкай жыць у памяці тваёй.
Наперакор хаценню іншай ласкі
жадаю сніць цябе
усё-ткі нічыёй.

У прокмеці тваёй неспадзяванай
пазбег я тэй знаёмае зарукі.
Спыніцца прагну перад табой цяперака...
Імгліцца шчасце
у церпную прынуку.

Жадаю, каб мой голас непачуты
журбой застаўся у грудзёх тваіх.
Жадаю бачыць... Мне ж адно магчыма:
з трывожнай мрояй
я заціх.

Жадаю смуткам і песняй — ці пачуеш? —
лялець цябе у памяці сваёй,
наперакор хаценню пешчаў іншага
сніць цябе, няжданая,
усё-ткі нічыёй.

### 2

Цудоўны дзень, і ты цудоўная.
Навокал краскі — плён вясны.
Жаўрук згублёны
у кволе неба,
а можа,
у сваёй хлусні?

Цудоўны дзень, і ты цудоўная.
Ты сэрцам будзь — у садзе салаўі.
І ў пошалку тваіх
жаданых вуснаў
мяне журбою не лаві.

Дай мне руку тваю і словы
усе ад першага твайго пачатку,
калі змусіла
кагосьці жыць
і не насіць іх,
як загадку.

Цудоўны дзень, і ты цудоўная.
Навокал краскі — плён вясны.
Жаўрук згублёны
ў кволе неба,
а можа,
у сваёй хлусні.

* * *

Дазволь цябе пацешыць і кахаць.
Каротка наша зіма і лета.
А дзеля цябе хачу я летам быць,
І гэтаму прарочыць кожная спакмета.

Навокал поле. Упершыню
туды прывабіла мяне пайсці.
Там ціхата у воддалі сяліб,
там лепш часіны, што былі калісьці...

Вясна было камусьці, а не нам.
Сцелюцца спаміны лісцінёй пад ветрам...
Дазволь цябе пацешыць і кахаць.
Хай будзе доўгая зіма і лета.

* * *

Там, дзе зямля зрабілася вадой,
жадаў ад шчасця
вёсламі паплёхаць.
Ды ты адмовіла: — Не надта
займайся тым, што гэтак лёгка.

Лепш ты зрабіся, юнак, агнём.
Няхай цябе
трысця затула надзіць —
мы небам вузенькім адтуль шугнём
і будзем ведаць: усё нам рада.

* * *

Хуртавіна снежная
круціцца, сцелецца.
Здаецца, бясконцу зіма і зіма.
Дрэвы ў лесе ад подзьмуху ветру —
стамлёныя коні сапуць.

Хваляй збуялай
сувеі ціснуцца,
перашкоды ўзвысіць і задзьмуць.
Разбеглася неба,
да зямлі прыпалае —
дарога заблуканая
у бель-каламуць.

Прытулак на зямлі завірусе ёсць.
Людзі не ўсе дадому вернуцца.
Дзе-небудзь іхні заснежыць лёс,
жыццём звярыным звер.

*1950*

* * *

Навошта мне апавядаць,
як бедная дзяўчына
ушчадзіла некалькі рублёў,
купіць сабе вясельную сукенку.

На вяселлі усім было вясёла.
Замах сукенкі,— узлёты перапёлкі.

Ад шчасця ейнага,
Бог, мабыць, утаміўся...

Благі спакуснік папрасіў
пацалаваць
не сукенку.

Вейкі не ўблажыліся сумнівам.
Яна глядзела на свайго сужэнца.
Яна ў ноч пакроўную
яму падорыць маладзенца.

*1950*

* * *

Шастанні за вокнамі,
я ведаю, былі
на бярозе лісцвіня.

Вецер подзьмухным казаннем
цвердзіў вецямі:
— Ад дня да дня
ёсць дзесьці цішыня,
што веціцца пакутным нараканнем,—

плач зноў аплачацца
тым самым плачам.

*1950*

## ВАДАСПАД ШТОДНЯ...

Там вада ліецца
праз затору,
шуміць, быццам лес, кругом.
Думка няўмысна мая
наведвае гэты харом.

Срабрыстым цвіценнем спад
прыгожыць рачное дно.
Млын стары на адхоне,
пырскі лятуць у акно.

Там вокны даўно разбіты,
і на жорнах расце палын;
і дарога цераз грэблю
цяпер ідзе ў абмін.

З лёту высокага часта
да спаду шугаюць кагаркі.
Бы кропляй лішняй, тады
хвалькі льнуць наўскрайкі.

Пакінен млын і грэбля,
і млынара ужо няма.
Песняй бясконцай ліецца
вадаспад
штодня.

*1951*

## МАНАШКА

У хвалях возера ты месяц назірала,
калі вускраслы ён і, бы мядзяк, ярчысты,
жадаў рассунуць
плойму неба;
у цябе тады, напэўна, сэрца ранай
і вуснамі рабілася
з шэпатам мроі чыстай.

І ты пайшла. Пакінула вянок вясельны.

Там, дзе нарадзілася, манашка, ты,
дзе бацька і маці
цябе на ўлонне бралі,
застаўся выган ля возера усцяж
і сяліба іхная, маўляў ніты
із павуценняў восеньскіх
навітыя.

Пайшла. Пакінула вянок вясельны.
Шум тапалёў цяперака ля вокнаў манастырскіх
і радасць у журбе святыннай,
і сніцца, калі прыходзяць ночы:
з хваляў возера чаруе месяц сэрца
і не растанна сінее прахань неба.

*1951*

## ВЕЖЫ ЗАМКАВЫЯ

### 1

Не папраўлялі вежы замкавыя ужо шмат гадоў,
адно дрэвы там раслі падпраўленыя —
яны самі, прытка, вясною кажнай аж да восені
у стык нябёсаў высілі суччо.
Імёны іхнія лісцінёй пісаліся
подзьмухам нат кволым ветру.
Мірыліся яны аблoжна із дажджом,
ён шныхарыў, па лісціне сплываючы,
але ўпынам не сцюдзяніў,
калі спякота дробніла іх размах.

Прасторы з птушкамі дзялілі вежы,
сценямі атульвалі свой узрост.
Камень выветраны, вельмі стромкі,
з радасцяй выцэрпліваў узвыш.

Яго не раз краналі кулі чужакоў,
ён малеў зычліва ад сталёвай ятрасці.
Як рот у вісельца, на ім раны кроіліся, —
дробкі стуль асыпаныя — зямля карэнням.

Вежы бясстомныя трымаюць свой уздым.
Водгуль моўкная — павуцінне, бы дрэў карэння,
замест згарэлых трамаў паміж сцен
цягнуцца нязблуклай плеценяй.
Там кажная айчынная расіна — праменні сонца
днямі светлымі свеціць іх.

2

Лушчыліся хвалі лускою рыбы —
летняк па-летняму дзьмуў.
Вербалоз над вадой каля замка
зялёныя косы плёў.

З-пад ягоных карэнняў стрыбка
на бязрухлыя грудзі камення,
завіхна ключ дружлівы
глыбіню падзямельную ліў.

Як дзіцяня, гульнёй захаплёнае,
усё там песняй і гульнёй было...
Век знаёмы — не штосьці іншае —
птушка злоўленая
у сіла.

*1951*

* * *

Ноч летняя.
У садзе салаўі заспявалі.
Любуюся спевам.
Спяваю і я.
Мой спеў ніхто не чуе.
Душа размаўляе са мной.

Вялікая радасць спадзевы мецъ.
А можа, так назначана —
адняць сябе ад спадзяванняў
і ў благасцях
жыцця пабыць?

Да заўтра, можа — пакорліва падбаю —
маўкліва не вярнуся,
пачакаць, што значаць
благоцці ў жыцці маім.
Дрэвы называюцца лісцінёю знакаў,
а душа не ведае імя сваё.
З хуткасцю па ёй, бы па дарозе,
радасці імкнуць і дрэннае ўсё.

Апаўдні ў сад вярнуся зноў,
дзе салаўі спявалі аж да раніцы,
і песню да краёў душы спяю,—
спяю сабе,
аніяк хаўтурную.

*1951*

## У ТУЮ НОЧ

У тую ноч я быў адзін у полі
пад крыжам схіленым, сівым.
Ноч плыла нада мною моўкна,
і ўсходзіў месяц спакваля.
А знічкі, здраднікі вышыняў,
секлі небасхіл агнём.

У спелым жыце чуў, як сцежку
святы Мікола пражынаў.
І плач у воддалі: — О любы,
на якой вярсце прыстаў?

А ноч плыла, плыла і моўкла
і над крыжам і над усім...
У кожнай болесці жыцця зарука,—
ах, шмат балючага ў ціхім!

*1952*

* * *

У ноч зімовую,
маўклівую,
маўкліваю за ціхату,
я разбудзіцца хачу заўсёды,
каб словы мілыя
сказаць Начы:
— Дабранач, Ноч!
Ноч, адпачы
на святлістых руках Усходу!

— Дабранач, Ноч! —
і гэтага я не прасплю:
— Пакінь зорамі
агніста-палымянымі
людскія цепрасці.

— Дабранач, Ноч!
Ноч зямлі — дабранач!..
Расінкамі радасці
пакінь пакуты нашы.

Мне хочацца,
і заўтра,
я схлушу:
— Дабранач, Ноч! — скажу: — Дабранач!
Ноч, адпачні! — Зайздросць!
...моўкнасць некалісьці,
тваю збяру.

*1959*

* * *

У манастыры, у гэтым, свечку не цяплі,
а зацяпліўшы,
у іншым
дзесьці
пачуцці іншыя
ахінуць цябе;

і нават снег
па-іншаму забялее,
і нават,
што мінула,
што было учора,
успомніцца
па-іншаму табе.

Мінулае успомні,
калі не будзе будучага!

*1959*

## ЛІСТОК НА ДРЭВЕ

Здрадлівы вецер не любіць цішыню.
Кранаў усё браздлівым шумам,
не сваім:
апраметна
захонамі ляснымі,
крыллямі шасцістымі ляцела
лісціня і трава сухая.

А ён трымаўся на галінцы —
лісток апошні.
Ён жыў вясной яшчэ
І летнім шорахам.
Маці-дрэва высокае і магутнае
не пакідаў.
Не ведаў ён, хто бацька быў яго.
Ён мовай ветру размаўляў:
— Я жыву яшчэ. Любі мяне, цябе прыгожу.
Не страшна мне сустрэць зіму.
У сцюжах сіверу весціць буду:
ты расла, расцеш
у патаемнасць неба...

А вецер дзьмуў, дзічэў,
сцюдзёнасцю калеў.
Неба абяцала: — Не адступлюся.

---

Апаў лісток.
Пайшоў, дарогі не шукаючы.
Каля карэння, бы на парозе,
ён раз шапнуў, у спадзе лётным:
— Блудным сынам буду... Сынам блудным
буду я цяпер.

*1961*

* * *

Спрадвечны той,
хто сваё наканаванне
кляне аддана
над магілай згінутых,
хто родніць іхнае жыццё мінулае,
і даражыць найбольш сваіх славу.

*1961*

* * *

Штогод адна і тая перавага:
у садзе сяння ускросла смерць.
Лісцё апала і напагатове цьмець
у драўлянай песні ствалоў.
Пладзіня радлівая і сачыстая
без болесці із голлем рассталася...
І вецер вогкі, як неба чысты,
весціць зноў:
— Не хачу сказаць: бывайце,
што прыйшло сюды,
каб не развітвацца.

* * *

Вецер шасцеў за вокнамі,
шасцеў.
Хмары месяц зганялі з неба.
А восень, бы спрытныя рукі,
вопратку з дрэў здымалі.

Бы савінае крылле, шамцеў,
шамцеў
за вокнамі шорахна вецер.
Ноч апушчала неадгонныя сцені
цела з душой разверыць.

Перад світанкам вецер заціх,
заціх.
Месяц хмары прагналі.
Званіцы святыняў
не ад зямлі,
а з неба
Нябёснай цвярдыняй стаялі.

* * *

— Галубка шызая,— у песні так пяецца.
Спявай, спявай!
Убраўся сад увесь у май —
вясняны рай.

Вецер, бы наўмысна,
ляціць туды, дзе гай,
красой зялёнай цешыцца...
Ах, вецер, не чапай,
пялёсткаў кволых —
вясняны рай!

...і так здарылася, што зноў,
я зноў руплівы да кахання.
Сад на людзёх. Хачу, каб гай
туліў дваіх спатканне.

— Галубка шызая,—
у песні так пяецца.
Спявай, спявай!
Убраўся сад увесь у май...
І зноў вясной
не сохне гай.

## У ЧАС ДАЖДЖЛІВЫ

...і гэтак зноў,
празмеру ледзь,
лівень ліў,
уліўна,
цяжка.

За вокнамі
у шчырасці падмоў,
дажджовых,
шызнелася усё
сваім наўмерам.

Але пярун не аб'яўляўся.
Нябёсная, напэўна,
змокла столь.
Вецер стромкі
струнь дажджовую
роўнай роўнядзяй застоліў.

Доўга сцень куткі святліцы
вадзяным змрокам ахінала.
Святло навошта?
Не асвеціцца.
Жальба бо наша
із дожджам шчодра.

## УСПАМІН

Я маленькую браў цябе на рукі.
Уздымаў пад неба
на вышыню рук сваіх.

Твае вочы
сонцам былі мне,
і радасць галосная,
ад цябе маленькай,
было небам
над табой і мной.

* * *

Пальцы калючыя хвояў
хапаліся за вецер.
Вецер казытлівы
ад самых зораў плыў.
У дыханні
празорым
Боскім
весняны дзень неспадзяванкай быў.

Вясна, вясна — жыцця пачатак!
Думак збочнасць і песні ...любата!
І словы шчырыя, такі цяжкі ахапак
я кладу вянком ля ног Жыцця.

Ды словы, словы, іх ніхто не чуе...
Дзень спавіваецца ў пеляну начы,
і сонца вечара
дзіцё у маткі просіць,
а тая:
— Любы, ну, не крычы-ы...

* * *

Бы нейкі успамін цяжкі.
Ты ў хаце, ды хата ўсё ж пустая.
Агні запаленыя ля ракі,
на хвалі полымя спадае.

Я гэта бачу за акном.

За даляглядам цішыня чарнее.
А коўш, напоўнены віном,
водбліскам хмяльным калее —

чароўнай прагнасцяй суздром.

Я прыгаства ніяк не атулю...
І толькі вусны, каб вымавіць — люблю,
складаюцца, як да пацалунку.

А хата ўсё ж пустая.
Купальскі вечар. Уявай я лаўлю
твой вобраз, што нада мной вітае.

* * *

Маразянае звонкае ранне.
Асверы скрыпяць, і бушуе зара.
За акном мая любая, бачу,
порсткага поіць каня.
І да ганку да ейнага сцежка
следам
раўнюткім лягла.
І летуценні — думак узлёты.
І словы потым — каханне маё.

Маразяныя звонкія раніцы.
Асверы скрыпяць, і бушуе зара.
Прабягае мой позірк,
спыняецца
так часта ля яе двара.

* * *

Часіны надыходзяць усялякіх прадчуванняў.
Занята дыхаеш веснавым паветрам —
кунега.
І, забыўшыся на ўсё смяротнае,
цягнешся, як кволае сцябло, з цемры
да нечага.

Яно ажно знаёмае,
яно так зялёнае
там, дзе сады запушчаныя,
там, дзе стаўкі зарослыя —
адзіноцтва.

І не жадаецца абы з кім сустрэчаў,
але сукрыта думаеш пра ласкі ўчарайшыя.
А потым неяк узбудрожана:
— Няўжо адгэтуль шчасце
пэўнае
паўночнае?

І адлятае ўсё мінулае.
На хвалях летуценняў сябе шпурляеш.
І потых жданы забаўляе,
мучае
шыпшыну зацвіцелую
сярод шыпуль сваіх калючых.

* * *

Лета, лета на зямлі ўсёй.
Вясна-прамежак крывёю адцвіцела.
Але ж ізноў у садзе пустазелле
расцярушыла сваё семя.

І прынадлівым сям'і пчаліным лоскам
на пустазеллі краскі вырастаюць,

і соты поўныя — жыцця прыталіны —
наліваюцца атрутным сокам.

А лета, лета на зямлі ўсёй.
Вясна-прамежак крывёю адцвіцела.
Але смяецца, млынар смяецца —
не ўзойдзе болей пустазелле.

* * *

...і слёзы дзяціныя — пачатак наш,
і калі збянтэжаныя з адказам і пытаннем —
выступ грайкі зводзіць нас
з нашым цёмным гэткім раннем.

У смутку цяглым дзяціных зваб
на спатканне цягнецца яе рука,
і насустрач той самы раб,
у тых самых берагох рака.

А потым быццам — усё здарыцца...
Ізноў красуюцца краскі дзіў.
Але знаёмае незнаёмым робіцца
там, сярод
ужо даспелых ніў.

## ДАРОГА

Цаліну схавалі ў віткох раллі,
там нешта некалі пасеюць.
Але дарогу ужо там правялі,
бадай падшылі да апрання лею.

Быццам высахлы ручай спякотай,
яна нідзее у слядох калюгаў.

Сарваны прокмецяй узлёту
на ёй сябры, і пыл, і постаць.

Дарога ведае іх скрыжалі,
сярод раллі
яе
і збудавалі.

## КАСЕЦ

Выдрыла скошаная асака.
Цяжкая праца
з любасцяй
касцом працягвалася.
Рака
не выпускала ні кроплі з берагоў,
між імі сціснеся спякотай.

Як квола рэдкае дзявочае рукі
(за якую навет ты ёй увесь аддany),
пралятаў ад ніваў сухавей
блаславёнай ласкай, непамінанай.

І здавалася, усё далей
ад касца адходзілася
пад пушчу асака.
Шырэй расходзіліся за ім пракосы,
быццам водраныя сенажаці косці.

Шчэ надвячоркам ён дакасіў да пушчы.
О, задаволенасць ты нястомная!
Пот абцёр. І вось тады спакмеціў:
трава між дрэў, бы ў зялёным лёце,
бы мудрасць найвялікая у сціплым пераплёце.

Ідзі, касец, дамоў,
ідзі.

## СЦЮДЗЯНІЦЬ...

Сцюдзяніць за горамі спакой і змрок,
А словы круцяцца адсветам дня —
у ціхай мернасці яшчэ не змоўк
стук сэрца і глыбіня,
што сніцца ў начох весняных.

Цісенцца яна і ласкаю і кругам
і слепіць чарам разбуджаную жарсць,
і сэрца робіцца вяршалінай натугаў
скінуць камень: каб высіцца й стаяць.

Але за горамі сцюдзяніцца змрок.
І каменем нямее водбліск дня:
у шпаркасці абвалу ён замоўк —
шуміць у долах падмывамі вясна.

## НЕ СНІЛАСЯ

Вясняная не снілася чароўнасць.
Свядомасць азірнуцца аж назад
мяне не звабіла перахрысціцца
на які-небудзь папад.

...дзе б ні канчаліся дарогі
сумлення ў светлых, як святло,
медузы цела спатыкаецца,
у хвалі кіненае, каб плыло.

Навет і тады чароўнасць сніцца,
і абяцаць бадай што згодны:
— Я пакажу: вунь дом ваш нізіцца,
мне ж камень кінены — прытул мой роднны.

* * *

Пачатак быў пачаткам сам,
зверадаваны пешчамі й друзгамі пары ўсякай.
З імём людскім, скарынкаю абмяклай
на плечы нашы лёг і ў сцінкі рам,
што нашае крыві штодзённай закарэлі.

І болей не здаюцца ўяве думак нашых
ракою змытыя на сплыве мелі,
і вечна нашчыя звяры на пашы,
навокмець незгублёныя ў прасёлах лесу.

Мы таксама сыдземся у сваім пачатку
цішэй начы зімовай; із сумленнем
праз ручай паложым заўтра самі кладку,
што мы ў хаце не асядзем сценем
і думкай не асілімся: як з нашым пакаленнем?

## ПАМЯТАЕЦЦА

1

Памятаецца круты усцін дарогі,
бы сціснены вясняным плёнам дрэў,
І ціхаці душы, ў моўкнасці чутлівыя,
і скраткі ручая, што сонцам дня гарэў.

І незабыўная сустрэча спадзявання:
я — вечны вой... Свабода, ты мая.
І скрык звярыны — не апошні —
часіны будучыні ўтроплю я!

II

Гэтак у дзень небывалы,
там, дзе абтокі цвілі,
ніклі шэпты хвалі
да водшыбаў цеснай зямлі.

І час у раджэнню няведамкім,
у светлым імжэнні душы,

болесцяй гострай справеднай
веціў узмежжа, скажы:

дзе станьвай замкнёнай, спрычопай
цярплівасці згубленых мрой
пакінуцца вокмецяй новай.
я вечны адпуснік — жыцця няўтой.

III

... што ж, калі гэта зусім развіталася,
мабыць, іншыя ведала сцежкі яно,
бо вельмі ахвотна згаджалася,
бы зярно у зямлі прарасці,
разысціся у продані памяці,
завалоданай пошукам гульняў падбойных,
каб цеміць: віхруся у шчасці сваім
навет пад сподам сырым і глухім.

IV

... і дуэт: шалёная ахвота шуму,
і прамінкі ночаў, і кахання,
і полымя, схаванае у сэрцы-глуму,
мне ўсё прыносіць ранне.

Я ўсё адным узлётам
крануць жадаю гораў крылы,
і садам узрасціць гаёў абтокі,
каб сэрцаў полымя засцілі.

Там вусціш дзіўная б жыла.
Там спамін наш лепшы пачынаўся.
Бы жытняёвае далявы узмах
сад на вецер апіраўся.

## ОДА РЫДЛЁЎЦЫ

О, мая зялезная сяброўка,
табе танклявая, прыгожанькая Муза
йшчэ не спявала віншавальных одаў:
баіцца, каб чароўненькія вочкі

ты не засыпала пяском,
каб пантопляў, з шоўку шытых,
ты не забрудзіла зямлёй.

Затое я табе пяю:
о, ты сваёй зялезнай жменяй
засып памерлых між жывых,
каб жыць магло усё жывое.

## РАНІЦОЮ

Пчаліна, як тая струніна гучлівая,
пераляцела вуліцу
і у садзе
згубілася,
бо ж сад гурміцца
прыгажосцяй вяснянай.
        На вуліцу шырокую
з усходам сонца
вецер пpыляцеў
зганяць
пылінкі
        і завярнуўся —
яны уночы адсырэлі,—
пераляцеў у сад,
заблукаўся
часінай тэй
паміж лісцін зялёных,
        і раскунежыўся:
на галінцы кажнай ён абвіс
затуленым маханнем.
        А рэха звонапеўнае
з жалейкі пастуха,
бы спамін, расказвае
свайго пачатку...
        І клікае душа — чароўная нямота:
        І ты ідзі, дзе твой пачатак!

# Алесь Салавей

*Алесь Салавей (Альфрэд Радзюк) нарадзіўся 1 мая 1922 г. у вёсцы Крысава на Койданаўшчыне. У 1937 г. яго бацьку, загадчыка аддзела гандлю райспажыўсаюза, і маці арыштавалі. Засталося трое дзяцей, старэйшы з іх быў Альфрэд.*

*Вучыўся ў Мінскім педтэхнікуме, працаваў у лагойскай раённай газеце.*

*Вершы пачаў пісаць з дзяцінства. Друкаваўся ў раённых газетах, у «Чырвонай змене», «Звяздзе», «Літаратуры і мастацтве», у «Полымі рэвалюцыі», а з прыходам на беларускую зямлю нямецка-фашысцкіх акупантаў — і ў «Беларускай газэце», «Голасе вёскі», «Новым шляху».*

*У 1944 г. эмігрыраваў у Германію. Жыў некаторы час у Аўстрыі, потым выехаў у Аўстралію, дзе ў 1978 г. і памёр.*

*Выдаў кнігі паэзіі «Мае песні» (Менск, 1944), «Сіла гневу» (Остэргофен, 1948), «Звіняць званы святой Сафіі» (1948). У 1982 г. Беларускі інстытут навукі і мастацтва выдаў том выбранай паэзіі А. Салаўя пад назвай «Нятускная краса» (Нью-Йорк — Мельбурн).*

* * *

Зямля мая — абсяг вялікіх скарбаў,
як золата ўначы, як срэбра ўдзень.
Сярод іх шмат такіх цудоўных хварбаў,
што лепшых нельга больш знайсці нідзе.

Калі б сабраў іх дбайнаю рукою
і ўставіў у слухмяныя радкі,—
заззяў бы верш вясёлкавай дугою,
зазнічыў бы праз процьмы, праз вякі.

*1943*

## УЗЫДЗЕ РАНАК СРЭБНЫ НА ЛУГІ

Узыдзе ранак срэбны на лугі,
каберцы іхныя аздобіўшы ў мярэжы.
У росах заіскрацца мурагі,
на грудзі поўныя дыхне абшар бязмежны.

Пачую я: зязюля за ракой
куваць пачне ў бары. І дзяцел будзе стукаць.
Разбудзяць ціхі ранішні спакой
птушыных галасоў прыветлівыя гукі.

Ля нізкіх і зялёных берагоў
крыніца жвавая ключом жывым зазвоніць.
Грамаду хмар — пажоўклых мурагоў —
па небе буйныя узвей-вятры разгоняць.

І сонца яснае з высі тады
пальс агністы сок цурком, нібы праз сіта;
нап'юцца соку гэтага сады,
памочыць вус у ім задумны колас жыта.

Туды, дзе поле шэпча збажынай,
дзе рэчкі хуткая вада цячэ, бруіцца,
іду, спатканы ранішняй красой,
халоднае вады з крыніцы каб напіцца.

То скарб я п'ю дабрадзейкі-зямлі,
дзе нівы і сады і рэкі — ўсё жывое...
Мае тут прадзеды й бацькі жылі,
мне ўсё тут блізкае, усё тут дарагое!

*1938—1941*

## У МРОЯХ

Іду сцяжынкаю, дрымотаю спавіты,
праз нівы хлебныя да коней на папар.
Навокал дрэмле ўсё. Ноч. Спеючае жыта
мне сытым коласам пяшчотна шчыпле твар

і ціха «шу-шу-шу» — калоссямі шапоча.
Палоніць шыр усю нясціхны шэлест-шум.
Хіба ільга ўлавіць шумценне летняй ночы?
Хіба мага не ўчуць узрушанасці дум?

А неба чырваняй, бы зарывам, жаўрыцца.
Што гэта? Ранняя зара?.. А мо пажар?
Суседніх ніваў сціш трывожыць навальніца?
... Вы, коні, блізка ўжо, і блізка ты, папар.

Свайго спабытніка прымай, начлег!..
Хрумстанне.
Агонь. Сябры мае. Звон путаў, ланцугоў.
Эх, ноч ліпнёвая і конскае іржанне,
эх, песні звонкія мае, маіх сяброў!

*Ільля, 11.7.1942*

## ЛІДСКАЕ ЗАМЧЫШЧА

З часоў славутых даўнае пары,
як успамін магутны Гедыміна,
як сведка гучных дзён мае краіны,
стаяць узнёсла замчышча муры.

Грудзьмі ў баёх адстойваючы чынна
зямлі свае і гонар і дары,
касцьмі няраз ляглі за лёс айчыны
тут продкі нашыя — асілкі-змагары.

Не змыла славы іхнай плынь гадоў!
Мы, праўнукі,— надзейная апора
нязгасных спраў вялікіх змагароў.

Нам іхны шлях навекі будзе дораг.
Хай памятае ўсякай масці вораг,
што ў нашых жылах — нашых продкаў кроў!

*Ліда, 18.9.1942*

## З ВАМІ

Кажуць, што можна жыццё перакроіць,—
мне ж не ўдаецца — жыву я ў чужых.
О, дарагая зямля! Хоць у мроях
вырвуся я да цябе, да сваіх.

Нат птушанятка малое начамі
мкнецца пад крылцы матулі свае...
Хай сабе мроі. Затое ў іх з вамі,
з вамі, сябры дарагія мае!

*Рыга, снежань, 1942*

## ПАРОША

Насустрач прышласці сваёй
іду пад светлых мрояў ношай.
Шырока шлях разлёгся мой...
А сяння выпала пароша!

Пуховай пільсцяй мяккі снег
прысыпаў безліч ранаў шчымных.
На свет, пазбаўлены сунег,
зірну сапраўднымі вачыма.

*10.12.1942*

## СНЯГІ

Не пухам лебедзяў абсыпаны лагчыны,
зямля схавалася пад белаю аўчынай,
мадзее воддаль гай адзін нагі...
Сувоі сыпкія, глыбокія снягі.
Няхай сабе... А я іх перакрочу
і з шляху праўднага нідзе, нідзе не збочу!

*1.2.1943*

* * *

Ноч топіцца ў снягох, і ветравей скуголіць,
карозіцца мароз дзябёлы пад акном;
зіме скарыліся палі — а дрэўных голляў
не ўдасца ёй заслаць аснежаным радном.
А нас, жывых — не адалець ніколі!

Стаю ля ганку я. Пад зорным шчытам — дом.
Я цемлюся ўгару, хоць вецер коле вочы,
шукаю зоркі тэй, што шчаснасць нам прарочыць.

*12.2.1943*

## ТРЫЯЛЕТ

Ты мне за ўсё найдаражэй,
о, край садоў, палотнаў белых!
Ты макаў цвет, клёк ніваў спелых,
ты мне за ўсё найдаражэй.
Нішто расцінам не бліжэй
вясны й пітва крыніц брынелых,—
ты мне за ўсё найдаражэй,
о, край садоў, палотнаў белых!

*17.2.1943*

* * *

Зірнула сонца ў маю хату,
як агняцвет, як дар вясны.
На стол заслаўшы з промняў мату,
зірнула сонца ў маю хату.
Хоць аб вясне ў палёх — шчэ сны,
і трызніць шыр пад белай шатай,—
зірнула сонца ў маю хату,
як агняцвет, як дар вясны.

*25.2.1943*

## ХРЫСТОСАЎ ЛЁС

Няверцаў здрадай катаваны,
распяты быў Ісус Хрыстос.
Хоць меў няўгойныя Ён раны
і боль нясцерпны — а ўваскрос!
Знёс мукаў шмат мой край каханы,—
сцяў і яго Хрыстосаў лёс:
яму хоць цяжка, хоць балесне,
ён будзе жыць, ён уваскрэсне!

*3.3.1943*

## РАСЦІ, ЦВІЦІ

Расці,
расці,
жытнёвы дар багаты!
Цвіці,
цвіці,
мой бэз надзей крылатых!
Цвіці,
цвіці,
на сэрцы, цвет жыццёвы!
Расці,
расці,
багаты дар жытнёвы!

*2.5.1943*

## МАКСІМУ БАГДАНОВІЧУ

Нечакана парвецца жыццё... Больш ніколі
яно не ўваскрэсне.
Колькі думак нязбытых бярэ да сябе
падыспадная цьма!
Спатыкае іх вечны спакой. І ўсё роўна ім —
вольна ці цесна...
Толькі той будзе жыць, не памрэ —
у нябыт каму шляху няма.
Не памрэ толькі той, хто аддаў
усе сілы жыцця для народу,
хто мінулае ўславіў красой, зазірнуў хто
і ў прышлыя дні.
Дар ягоны, убраны ў вянкі,
шанавацьмуць нашчадкі заўсёды,
воды ўлеваў не змыюць яго,
і не спаляць пякельныя агні.

*7.9.1943*

## РАМАНС

Толькі там,
дзе айчыны бальзам,
адзінота душы не крапе,
толькі там.
Аб сваёй старане,
я нікому ўспамінаў, о не,
не аддам.

Толькі тут
непатолі прысуд
і маркота няволіць мяне,
толькі тут.
У чужой старане
не забуду цябе я, о не,
родны кут.

*Рыга, 29.11.1943*

# *І заплакалі сумныя далі*

## ВОСЕНЬ

Каля хаты мае дрэвы летнія ўборы асыпалі
і заслалі аранжава-мосяжнай коўдраю двор.
За маўклівым сялом, за панурымі сёстрамі-ліпамі —
з поля звезена ўсё — у сарочцы калючай прастор.

Восень там гаспадарыць; ідзе па зямлі валадаркаю;
ёй належыць усё: поле, поплаў, рака, сенажаць;
ёй належыць нат сонца — зацьміць іншы раз яго
хмаркаю
і заплача, пачне кроплі спорныя слёз асыпаць...

Я гляджу за акно: панадворкі там жоўта-барвовыя,
ходзіць вецер па іх; дрэвы хіляцца з боку на бок;
і заўважыў: шчэ дань засталася адна выпадковая,—
на галінцы кляновай дрыжыць сіраціна-лісток.

З хаты выйшаў на двор. Асцярожна рукою дрыжачаю
абрываю лісток, прыкладаю да твару яго:
ўсёй істотай адчуў адышоўшае лета гарачае,
бураў грукаты, трэск перуноў і спякотаў агонь.

Што ж, нічога! Міне й гэта восень і зімка з марозамі,
прыйдзе час — дрэвы хмурыя лісцем ізноў зашасцяць...
Перабудзем, знясём і нядобрае, й злое, і грознае,
прычакаем вясны, неўнікнёнай сяброўкі жыцця.

*м. Ілья, верасень, 1942*

## РАСА

Раса, раса,
лугоў краса
крыштальная, срабрыстая.
Чый гэта лёс —
каралі слёз,
што так зіхцяць маністамі?

Зірні, пабач!
Чый гэта плач?
Мо траваў сокі йскрыстыя?
Не, гэта — боль,
і сум, і золь,
і кроў зямлі агністая.

*4.5.1943*

## У ВЫРАЙ

У далеч іх нясе адлёт патужны, нестрыманы,
навіны смужныя яны ў далёкі край нясуць.
Вазьмеце, птахі, і мяне з сабой за акіяны,
каб трутнай горычы нідзе не бачыць і не чуць.

Хто знае, мо там лепш, мо там няма журбы сукротнай...
Нядрэнна птахам быць, а лепш — хмурынкай
бестурботнай.

*1943*

## АПЭЛЕС І АЛЯКСАНДР МАКЕДОНСКІ

Вялікі мастак Апэлес —
высокая слава мінулых вякоў,
даўнейшае Грэцыі гонар —
аднойчы паднёс Аляксандру ён свой
малюнак. Там быў валадар на кані.
— Няважны малюнак,—
сказаў валадар.
Такое «пахвалы» мастак не чакаў.
Да працы цудоўнай падведзены конь
зайржаў гэтак гучна і моцна,
што слаўны мастак не сцярпеў, адказаў:
— Твой конь разумее мастацтва ляпей,
як ты, валадар мой магутны!

*19.9.1943*

* * *

І заплакалі сумныя далі,
і маркотай дыхнулі палі.
Слёзы — зімных ільдзінак каралі,
а маркота — апёкі зямлі.

Плачце, плачце! Хай колкія стрэлы
суму жальнага грудзі пратнуць
тым, што вашай нявіннасці цела
паглумілі, не даўшы дыхнуць.

Тым, што скрухай таптаді да долу,
што кідалі ўзлёт пад адхін.
Скруцяць, скруцяць сабе яны голаў,—
дарма помсце прарочаць загін.

Ім не сцяць маіх думак і сэрца,
не згадаць іх жыццёвы сакрэт.
Застануся я тым аж да смерці,
кім жыццё мяне вывела ў свет!

*15.12.1943.*

## *Так блізка — і гэтак далёка*

### РАМАНС

Няма нідзе
блакітных васількоў —
такіх, што ў нас — няма нідзе.
І ўноч, і ўдзень
яны — трывога сноў:
я на чужыне не знайшоў
такіх нідзе.

Тваіх вачэй
блакіт, о квецік мой,
о любая, за ўсё сіней
блакіт вачэй...
Сябруе сум са мной,
бо не знайсці ў зямлі чужой
такіх вачэй.

*Рыга, 22.10.1943*

### ДОЖДЖ

І кроплі дробныя — спярша адна, другая —
сыпнулі мяккім волавам у твар.
Махнула грываю улева дажджавая
і падмяла ад пылу тратуар;
мяне абсыпала жарствой дажджу; ільдзінкі
сыпнула за каўнер. Перада мной,
узняўшы парасон, паспешна йдзе дзяўчынка,
яе здагнаў я, параўнаўся з ёй.
Без слоў, забыўшыся пра ўсё на цэлым свеце,
падходжу да яе; пад парасон
і я стараюся схавацца, і — закмеціў
пагляд вачэй. Які чароўны ён!
Пагляд вачэй... Пад'езд. Дзяўчынкі дом.
Яе няма больш. Зноў я пад дажджом.

Бывае шмат у нас сустрэчаў нечаканых.
Шкада, яны—мамэнт. І больш — для закаханых.

*Рыга, 1943*

* * *

Лёгкай рукою на шыбах узоры мароз вытыкае.
Помню маленства часы: цёплым дыханнем сваім
іх я кранаў, прагграваў невялічкі кружочак-ваконца,—
дзеда-мароза й зіму ўбачыць хацеў праз яго.

Дзён незваротных узоры! Карункі маіх успамінаў!..
Іх не крану я цяпер, імі аздоблю свой верш.
Выткуцца ў вершы ўспаміны такім жа чароўным узорам,
тонкім, як стрункі чуцця ў сэрцы маім маладым.

*4.1.1944*

## НА ХУТКІХ КРЫЛЛЯХ ВОЛЬНАГА ПЕГАСА

### ПРЫСВЯЧЭННЕ

Мінаюць дваццаць першыя угодкі
майго жыцця. Пакуль яшчэ не стар —
усё, што я набыў за час кароткі,
што маю — пакладу на свой алтар.
Для вас, сябры мае і аднагодкі,
народзе мой, крывіцкі мой абшар,
нашчадкі прышлага, былога продкі,
я прысвячаю слоў сардэчных дар.
Дармо, што вас не бачу гэтым часам,
дармо, што есць мяне чужыны золь,
грызе душу цяжкой разлукі моль,—
знясу усё — і зло, і перагасы,
да вас прымчу слоў гэтых хлеб і соль
на хуткіх крыллях вольнага Пегаса.

### 1

Калі ўзварушаць росных траваў бліскі
вятры паўдня — там край, мая зямля,—
здаецца мне, што чую голас блізкі,
дармо, што ён даносіцца здаля.

Яго страчаю я з паклонам нізкім,
яму шляхі далей шчэ значу я,—
гайдае ён майго чуцця калыскі
і неспакой сцішае спакваля.
Калі ж дыхне наўсуперак калючы
паўночны вецер — клёк з радзімы ён
гняце назад; шлю покліч наўздагон —
а голас разбіваецца аб кручы.
На грудзі камень-жоран ціспе, млён
свідруе сэрца жорстка і балюча.

2

Не мае боль граніц і берагоў.
Я клічу ўсемагутнага Зевеса:
о мой Зевес, о слаўны бог багоў,
змяці, скрышы нягодныя злавесы;
не дай паўночным скогатам шляхоў,
захутай іх суцьмежнаю завесай;
вярні назад паўдзённы ўздых вятроў
і прагані навалу хмараў звесых.
Так просіць помачы найвышшай той,
хто стрэнецца з няўхільнаю бядою,
калі яна і цягніць за сабою,
і вязніць у жахлівы горан свой —
з апошніх сіл ён дужаецца з ёю,
нібы плывак, што топіцца,— з вадой.

3

О мой Зевес!.. Здаецца, у эфіры
мяне пачуў ён — шле сваіх бажкоў:
ляцяць яны, імклівыя Зефіры,
з усходу й захаду — з усіх бакоў.
Лагодны подых шлюць на ўлонне шыры,
даюць жыццю, што мерзне, цёплы схоў.
І гэткі ласкавы, і гэткі шчыры
павеў паўдня вяртаецца ізноў.
Хоць я наяве гэтага не бачу,
затое ў мроях пешчу і пашу,
бо толькі можа ў іх уняць душу
адзін паэта — больш ніхто, пяйначай.
Тады нястрыманасць болесцяў глушу
наплывам новых хваль крыві гарачай.

4

Тады прыходзіць Муза. Мне яна —
сяброўка дум узнёслых і натхнення.
Ніхто апроч яе — яна адна
вядзе мяне да спраў і летуценняў.
Туды вядзе, дзе творчасці вясна
становіцца на шлях маіх імкненняў,
гатовая ў няпомые адагнаць
натоўпы чорныя свавольных ценяў.
Я з ёй заўжды. І нас не разлучыць.
Так над калыскай хворага дзіцяці
схінаецца і ўдзень і ўночы маці,
яна глядзіць яго, яна не спіць,
гатова нат жыццё сваё аддаці,
каб ейнае магло дзіцятка жыць.

5

У звоне рыфмаў і у іхным рэі
спявае Муза мне ўвесь час, заўжды,
і кажны раз прытуліць і сагрэе —
крылатай думка робіцца тады:
нясе мяне і ў край, што ў ранах млее,
нясе мяне і ў прышласць праз гады,
дзе новы ўсход пурпураю зарэе,
дзе вольнага жыцця цвітуць сады.
Даруй, чытач мой, мне за гэткі ранні
і без пары, без часу смелы лёт.
Але ж, казаў той, думкі ломяць лёд
замінаў. І у творчым парыванні
чаму ж парой не ўзняцца да высот?..

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

6

Нікому дум маіх не ўзяць на засаў,
пакуль жывуць — усякі змогуць час.
Пакуль жыццё у сэрцы не пагасла,
хачу радзіму ўбачыць шчэ хоць раз.
Маё жыццё і я — нястрымна, засаб
ірвёмся ўвысь, на родных ніў Парнас...

На хуткіх крыллях вольнага Пегаса
ляту, мой Край, сябры мае, да вас.
. . . . . . . . . . . . . . .
. . . . . . . . . . . . . . .
. . . . . . . . . . . . . . .
. . . . . . . . . . . . . . .
. . . . . . . . . . . . . .
. . . . . . . . . . . . . . .

7

Ляту, ляту з далёкае чужыны —
ля зораў неба торнага мой шлях.
Вітанне вам, знаёмыя мясціны,
табе, зямлі сялянскае прасцяг!
Я быў, і ёсць, і буду вашым сынам,
бацькамі — вы. Не спаў я па начох —
жылі ў маіх вы думках неадхлынна,
а засынаў — былі ў маіх вы снох.
Даўно не бачыў вас. У дальнай зморы
мне кажны месяц быў даўгім, як год.
Праз сотні вёрстаў, сотні перашкод,
праз немарач лясоў, праз стромы гораў
сягаў да вас, радзіма і народ,
сягаў да вас, крывіцкія прасторы.

8

Вось і яны, мурожныя лугі,
што хараством нязгасным вабяць вока.
Ля іх, у сценях лозаў,— берагі
ракі-Вусы — дзе плыткай, дзе глыбокай.
Бягуць да берагоў тых праз лагі
крыніцы, поўныя зямнога клёку.
А з неба ў люстры водаў, як багі,
адсвечваюцца белыя аблокі.
Вуса, Вуса! Ці помніш, як вясной
тваім я захапляўся ледаходам?
А ўлетку у абдымкі плынных водаў
ныраў і дна кранаўся галавой?
Ці помніш, як па коўзкай гладзі лёду
на спрытных коўзнях бегаў я зімой?

9

Ці помніш?.. Ад ракі ідуць прысады
на ўсход. Там бачна Шылава гара.
Туды калісь я бегаў на агляды
высокіх хвояў, што пастáлі ў рад.
Чуў іхны звон і быў бясконца рады,
калі, ўзабраўшыся на хвою, пазіраў
на шыр палёў, на пышнасць даляглядаў,
дзе перад гэтым краскі я збіраў.
Тут восеняй, вясной, зімою, летам
па два-тры тыдні я бываў штогод.
Да дзеда ў госці прыязджаў. Турбот
улетку больш за ўсё было — палетак
карцела кажны абысці; і от —
мне сталася найлюбым месца гэта.

10

Тут, трэ сказаць, я гадаваўся, рос,
дармо, што змалку строга і няміла
мяне кідаў па іншых месцах лёс.
Бо толькі тут мяне зямля ўпаіла
жывой вадой; багаццяў ейных плёс
уліў у грудзі моцы плынь і сілы,
маю душу да самых зор узнёс,
ёй даў узлёт і даў Пегаса крылы.
З маленства сэрца толькі тут маё
любоў да краю роднага адчула.
За вёскай з дзедам быў парой; кранула
мяне — ён ведаў — ніваў тхнень, гаёў.
«Унучку, глянь,— казаў дзядунька чула,—
усё, што бачыш,— наша, ўсё сваё».

11

І я праходзіў праз палі, праз нівы —
сем год было мне. (Хутка дні ішлі!)
Купаўся ў моры збажыны шумлівай
і прыпадаў грудзямі да зямлі.
Прыкладваў вуха да яе — чулліва
я адчуваў, як сокі там цяклі,
як выплывалі напаверх імкліва,

як травы ў гуках, чутных мне, раслі.
І думаў я аб тым, каб тыя гукі
сабраць і у адзін звязаць клубок,
напоўніць імі любы мой куток —
тады не бачыў бы ні зла, ні мукі.
(такі з мяне маленькі быў прарок,
які не знаў ніякай шчэ навукі).

### 12

Суладнасць свету — бы увесну сад
была ў маіх вачох у тыя годы.
І ейная прывабная краса
мяне запаланіла назаўсёды.
І я — драбочак свету — скмеціў сам,
што кажны ейны пэрл — то дар прыроды,
што кажны ейны чар — жыццю пасаг
і лек духовы ў жоўцьныя нягоды.
Мне люба ўсё было: і лес, і луг,
і шапаценне тхненнае расцінкі,
і мігаценне срэбнае расінкі.
Быў велічным сусвету кажны рух —
і згодныя жывой істоты ўчынкі,
і сонца ўсходзячага зыркі круг.

### 13

Любіў вясной глядзець у сінь нябёсаў,
раскошай дыхаць іхнаю, калі
па ціхім моры вышыні дзівоснай
хмурынкі лёгкія, як пух, плылі;
калі ў мой край на крылях веснаносных
ляцелі стройным клінам жураўлі...
. . . . . . . . . . . . . . . .
. . . . . . . . . . . . . . . .

Вясна прайшла. А восень стрэла сумна.
Урэзаліся ў памяць тыя дні:
з тужлівым крыкам птушкі ў вышыні
ляцелі ў вырай над пустэчай гумнаў.
«Нядобрае прарочаць штосьць яны»,—
казалі людзі, глядзя ўвысь задумна.

## 14

А потым?.. Пачалося і пайшло...
Зямлю ўсчала разбойніцкая зруха.
Бы град, людскія галавы далоў
крывавая сыпнула завіруха.
Нямала ейны меч злажыў галоў,
і чалавек ёй кажны быў — што муха.
Муку жуды смяротны млын малоў,
драпежная крышыла косці скруха.
Нясцерпным пеклам стаўся белы свет,
яго зямля — суцэльнай дамавінай.
На кажным кроку — гнеў, разбой злачынны,
за імі — поцемкі, крывавы след;
куды ні ступіш — слёзы, кроў бязвінных
і сыты чорным груганом абед.

## 15

Тады я страціў бацьку, страціў маці.
Я быў з дзяцей старэйшым — меў тады
пятнаццаць год. Са мной — шчэ трое
ў хаце —
сястра, браты... Ні хлеба, ні вады...
Ну, вось і ўсё... Да гэтага няшчасце,
і холад грызкі — дзень не без бяды,
і недавер вакольны, і пракляцце
без дай прычыны — на усе лады.
Мо гэта шмат каму не даспадобы,
але з маленства лгаць я не прывык —
абману скрух мой галаў не панік.
Хто стрэў мой кон, той знае — дні жалобы
меў гэным часам селянін-мужык
і ўнук дасконны дзеда-земляроба.

## 16

На собскім целе ранаў знёс нямала.
Штодня дурманіў розум дымны чад
і злыбяда ў слату, у гразь таптала;
сягаў няраз і мне крывавы кат
адсекчы галаў. Мой узрост нясталы
расправу адхіляў — дык быў нагляд.

Так сілаў шмат згубіў. Наканавала
мне доля жыць, як бачна ўжо, няшмат.
Пяклі агнём мяне пакутаў шчымы,
з грудзей юнацкую смакталі кроў,
забралі моц, што я ў жыцці знайшоў,
але ж ні ў летні вар, ні ў холад зімаў
ім не аддаў нязрадную любоў
да роднага людства і да радзімы.

17

Цяпер ні далеч, ні сыры туман
ні шэрых вечароў, ні мутных ранняў,
ні хараства чужога хітры зман
любові тэй не ўзяў і ўзяць не ў стане.
Крывіч — радзімаю назоў мне дан!
Я рад, я ганаруся гэтым званнем,
усім сабой людству сваіму аддан,
такім я быў і буду да скanання.
Заўжды — ці я за працаю цяжкой,
ці між сяброў, пры радасці удзеле,
або хваробай кінуты ў пасцелю —
успамінаю кут каханы свой.
Заўжды — пакуль пачуцці не знямелі —
жыву і дыхаю, мой Край, табой.

18

Мой дарагі! Тваіх глыбінь крыніцы
гаілі раны ў сэрцы мне няраз.
Каб не было цябе, даўно я ніцма
зваліўся б долу ў завірушны час.
Калі б не ты — калючая кастрыца
нягодаў выела б мне вочы ўраз.
І там, дзе ты, я лекаў змог напіцца
і моцы іхнае агонь не згас.
Цяпер ці мала болесцяў сцішае
мне аб табе нат добры успамін.
Заўсёды ты са мной — я не адзін.
Які шчаслівы той, хто адчувае,
што ён адданы Краю свайго сын —
яму жыццё і сілы прысвячае!

19

Якой жа бачу я зямлю тваю
цяпер, мой Край? Яна — уся на ранах.
Паблекла, веліч страціўшы сваю
і хараство, што так было каханым.
Манголец, акрываваўшы зямлю,
нікім, нікім не прошаны, не званы,
айчыну найдарожшую маю
злачынна нішчыць гвалтам нестрыманым.
Жадае ён крыві, вязніцаў, крат,
не можа жыць ён без агню, без войнаў,
стварыў закон нялюдскасці разбойны.
Чаму ж, чаму маўчыш, мой родны брат?
Хіба хапае сіл глядзець спакойна,
як рэжа цела Краю твайго кат?

20

Рухомы моцных прадзедаў крывёю,
не йдзі з нядужасцяй ляной ступой,
ты ж у руках трымаеш моцна зброю.
Бо ты жывеш, валодаеш сабой.
Хай дні твае не хмурацца тугою,
а з высака узнятай галавой —
з нястрымнаю крывіцкаю сям'ёю
адважным будзь — ідзі ў апошні бой.
Сама сабой да нас не прыйдзе воля,
сама сабою з неба не зляціць.
Калі зняволеным не хочаш быць,
а хочаш жыць — выходзь на бітвы поле!
І волю толькі зможам мы здабыць
змаганнем збройным, моцным, як ніколі.

21

Не лёгкім будзе бой. З крыві, з агня
не кажны выйдзе цэл. Шмат з нас паляжа.
Магчыма, там складу і голаў я,
але не трусам — воінікам адважным.
Мы зброяй — родам даўнага кап'я —
перад сусветам сцвердзім і дакажам,

што слаўная крывіцкая сям'я
сіл досыць мае на загубу ўражжу.
І недарма сваю мы кроў пральём,
і недарма складзём свае ахвяры.
Усё, аб чым з нас кажны сніў і марыў,
калі не нам — нашчадкам прынясём!
І неба Крыўі не зацемраць хмары,
і тор жыцця не зарасце быллём.

## 22

Заціхне бой. За намі — перамога!
І новы дзень усходняя зара
народзіць. Дзень той абяцае многа...
Цяпер і ў прышласць зазірнуць пара.
Для Крывіча, а не для трутня злога
нясе яна і моц і плён дабра
к сабе і кліча й вабіць маладога
прарока і паэту-змагара.
Як сымбаль вечнага жыцця, заззяе
над Крыўяй вольнай светланосны зніч.
Зямля на Пяруна ўладарны кліч
адкажа спорнай працай і ўраджаем.
І без чужое ласкі — сам Крывіч
гаспадаром здалее быць над Краем.

## 23

Каб чэрпаць веду і навукі дар,
сваіх дзяцей пашле ў свае ён школы,
а кажны вучань — будучы змагар,
што не аддасць чужынскім гордам волі.
Не зломіць больш яго варожы ўдар.
Абыдзе ён лясы, абыдзе долы,
усё — нат дзіўных таямніцаў чар —
ён падпарадкуе сабе наўкола.
Узняўшы бел-чырвона-белы сцяг,
ён з войскам собскім, дружным і адзіным,
на варту стане любае Айчыны.
. . . . . . . . . . . . . . . . . .

І не кране нас ліхадзей злачынны.
. . . . . . . . . . . . . . . . . .

І ён, той светлай прышласці усход,
перад вачмі маймі гарыць нязгасна.
Магуты, славы, вольнасці прыход
нязломнай Крыўі — сонечны і ясны.
Яго ў баёх здабудзе мой народ.
Шлях будзе вольны — і на ўзлёце часу
прымчыцца ён у Край без перашкод
на хуткіх крыллях вольнага Пегаса.
Заўсёды бачыць прышлы дзень найперш
натхнёны Музаю юнак-паэта.
Хоць ён юнак, а ў Край, вясной сагрэты,
праносіць веру над усім наўзверш.
І толькі з думкаю і з верай гэтай
я сведама пушчаю ў свет свой верш.

*Рыга, 2.5.—29.10.1943*

# СІЛА ГНЕВУ

## *Гамоніць даўнай праўды звон*

### ТЫ

І лясы, і лугі, і блакітныя нівы,
неба — вечная сінь, дол — зяленіва шоўк.
Гэта — Ты. І чаму я з Табой нешчаслівы?
І чаму я жыцця без Цябе не знайшоў?

За любоў да Цябе я пакутаваць мушу,
а ў разлуцы з Табой — існаваць, а не жыць,
і за слова свае дзесь у негадзь ці ў сушу,
як за слова Твае — галавой налажыць...

І ў глыбінях душы нараджаецца сіла,
гнеў — тэй сіле імя, і прарочыць яна:
за любоў да Цябе — непакорнаму — крылы,
за разлуку з Табой — вінавайцу — труна.

Непакорнаму — Ты і блакітныя гоні,
вінавайцу з труны — галавы не ўздымаць.
На шырокіх шляхох старадаўнай Пагоні
парыванняў Тваіх «ні разбіць, ні стрымаць!».

*1937—1942*

## РАДЗІМА

Пакідаю я сталіцу,
горад хмуры пакідаю,
ад'язджаю у раздолле
хлебных ніваў і палёў.
Добрай раніцы, гушчары,
хмызнякі лясоў дрымотных,
луг і ты, Вуса-рака!
Добры дзень, палёў абшары,
добры дзень, браты і сёстры,
вёска Крысава мая!

Тут на белы свет з'явіўся,
тут я першы раз паветра
удыхнуў, і першых крокаў
моц я толькі тут адчуў.
І цяпер, цяпер заўсёды
я адвітваю увесну,
я адведваю улетку,
я аглядваю увосень,
я наведваю узімку
вёску Крысава сваю.

І увесну, і улетку
я найлепшы сябра сонцу,
я камрат звяром і птушкам,
брат бліжэйшы чалавеку
і прыроды верны сын.

І увосень, і узімку
я прыроды верны сын!
Я увесну благаслаўляю
маладыя збожжа ўсходы,
іх вітаю ўлетку я!

Я увосень благаслаўляю
плён багаты рупнай працы,
хлеб штадзённы і спажытак.
Іх вітаю ўзімку я!

Не хацеў бы жыць ніколі
у пясках сухіх пустыняў.
У марозных снежных стэпах,

зледзянелых і бязлюдных,
жыць ніколі не хачу.
У пясках сухіх пустыняў
я загіну ад спякоты,
у марозных снежных стэпах,
зледзянелых і бязлюдных,
я ад холаду памру.

Не было й няма нічога
шчаслівейшага радзімы,
раскашнейшага радзімы,
прыгажэйшага радзімы —
не было й няма нідзе.
Хай жыве мая радзіма!

Багацей, палі і нівы,
і паўней, засекі й свірны!
Шчаслівей, браты і сёстры,
вёска Крыскава мая!

*1938*

* * *

...сцелюць галовы, як снапы, малоцяць цапамі сталёвымі, на таку жыццё кладуць, веюць душу ад цела.

*«Слова аб палку Ігаравым»*

Там, на пякельным таку, дзе цапамі малоцяць галовы,
веюць ад цела душу, поле ўсцілаюць касцьмі,
моцна трымаюць свой сцяг непакорныя ўнукі Усяслава,
падае збіты адзін — іншы змяняе яго.

Думаеш, воража, змыць непахісную славу крывёю?
Высям бязмежным раўню ейнай крывёй замуціць?
Колькі жыццё ні тапчы — не ўзнясешся да ясных
сузор'яў,
колькі ўгару ні сягай — высяў табе не таптаць.

*1939*

* * *

Выйдзі, паслухай — гучаць галаслівыя медныя трубы:
з цемры былога выходзь наперад да яснага сонца!
Б'юць барабаны, грымяць цуды пад небам высокім:
радуйся, песні спявай — не ўваскроснуць былога
аковы.
Прадзедам думна скажы — багаты і самы шчаслівы,
і весялейшы за ўсіх ты чалавек на ўсім свеце.

Я і не слухаю вас, галаслівыя медныя трубы!
Верны самому сабе, у думках раблюся паўдзікім,
зброю з камення чашу — крочу ў часы нэаліту,
волі сапраўднае сын, я палюю на хіжага звера,
прышлым стагоддзям кажу: багаты і самы шчаслівы,
і весялейшы за ўсіх я чалавек на ўсім свеце.

*1939*

## ГУМАНІЗМ

Прыемна нам сталеццяў пыл страхнуць...
*М. Багдановіч*

### 1. ФРАНЦІШАК СКАРЫНА

У месце Вільні, у цішы ад бруку,
у шэрым замку, думна-самавітым,
ў пакоі сціплым, даўнінай спавітым,
я з ім спаткаўся без размоў, без гуку.

Стагоддзі пылу я страсаю з друку,
між літар бачу зрокам прагавітым,
як людзям простым, людзям паспалітым
са словам нёс ён праўду і навуку.

З бязмежнай прорвы тхленнага змяркання
падняў радзіму дух яго глыбінны...
Гартай балонкі мудрага выдання:

радкоў чырвоных краскі і галіны,
паўмесяц, сонца — як вянок адзіны,
як непагаснасць вечнага світання!

### 2. ВАСІЛЬ ЦЯПІНСКІ

Дзвіны шырокай бурныя глыбіны
плывуць імкліва, крышаць перашкоду
і праз парогі — цвёрдую пароду —
нясуць у далі свой наплыў няспынны...

Зямляк вялікі слаўнага Скарыны —
з зямель Наддзвіння, з полацкага роду —
душы парывы прысвячаў народу,
стаяў на службе праўды і айчыны.

«Шануй,— вучыў ён,— над сябе самога
свой родны звычай, не здраджай чужому,
вучы нашчадкаў, школа — іх дарога

да дому продкаў, праведнага дому...»
Дзвіна спявае вечны гімн былому —
стагоддзі пылу не змялі нічога.

### 3. СЫМОН БУДНЫ

Ад зыркіх промняў — першых іскраў рання —
агні ўзняліся, і было іх многа.
А ён прыходзіў знішчыць духа злога
туды, дзе цемры йшчэ было ўладанне.

Ішоў са словам праўды і пазнання,
і з гэным словам, дадзеным ад Бога,
была для люду дзіўная спамога:
душы вялікай буйнае паланне!..

Я сёння бачу: зноў зладумаў змова
над славай краю спеліць план імглісты,
браздзжыць над ёю катняя акова.

А ён не гасне — свеціць дух вячысты,
няхай пад пылам — ды заўсёды чысты,
і з ім не моўкне даўнай праўды слова!

*1943*

## КРЫЖОВЫ ШЛЯХ

Нарадзіўся Ты — з Табою
быў Ісус Хрыстос.
Змыць Цябе валвой прыбою
прагнуў бураў стос.

Дзень мінаў — разбою хвалі
большалі ўтрая.
У раз'юшанай навале
стаў на погі я.

Неслі разам крыж пакуты —
Ты і я з Табой,
і цяглі няволю й путы
зморанай ступой.

Чорт вязаў нас ланцугамі,
нашы душы трос.
Мы цярпелі — разам з намі
быў Ісус Хрыстос.

А пасля... Твой твар пахмуры...
Ты ў агні гарыш...
Разлучылі нас віхуры —
стаў цяжэйшым крыж.

Не міну з тупой гурбою
Ні аднэй вярсты.
Там, дзе Ты — і я з Табою,
а дзе я — там Ты.

Да ўваскросу ў свет нязнамы
дойдзе — хто ўсё знёс.
Мы ідзём, і разам з намі —
Сам Ісус Хрыстос.

*Кірхгайм, Аўстрыя, 1945*

## МАЛІТВА

Як боль свой выказаць хачу я —
Твой боль з грудзей маіх імкне.
Хто без Цябе мяне пачуе?
Цябе хто ўчуе без мяне?

З табой разлучаны, я страціў
сябе самога; ён адзін —
супольны смутак сына й Маці,
глыбокай болесці зацін.

Да надзямнога Валадара —
у зле разлукі — Ты ці я
маліцца будзем: гушчу хмараў
мальба не ўзбурыць нічыя.

Яна не зрушыць засць начную
і беспрасвецця не міне.
Ён без Цябе мяне не чуе,
Цябе не чуе без мяне.

Вялікі цуд жыцця, збавенне —
далёка ад Цябе ў глушы
адчуць Твайго багаславення
на сэрцы хрэст, цяпло ў душы;

пачаць малітвай,— і не дарам,
няхай у думках нам, дваім,
размову з вышнім Валадарам —
маім Вызбаўцам і Тваім.

Малітва зрушыць засць начную,
сустрэчы нашай днём бліснe.
Са мною Ён Цябе пачуе,
з Табой пачуе Ён мяне.

*1945*

## СМУТЛІВАЯ МАЦІ

Адарвалі, схапілі, сілком павялі.
Зледзянелыя хмары. І водгулле грому.
Ці жыве на далёкай зямлі?
І ці прыйдзе дадому?

І начамі, і днямі — з відна да цямна —
чорны жах у сваволлі нявінных лякае...
І смутлівая ходзіць Яна —
сына, сына шукае.

А па промені сонца — па нітцы даўгой —
аганькамі сцякае аблокаў ільдзіна.
— Як знайсці? Як пабачыць Яго?
Дзе зняволілі сына? —

— Замолчать! — ...І на твары маршчыны зляглі.
Горыч слёзаў... Пра болесць — нідзе і нікому?
Ці жыве на далёкай зямлі?
І ці прыйдзе дадому?

І здаецца стагоддзем часіна адна.
Без канца павучыну правосень сукае...
У сваволлі крывавым Яна
плача — сына шукае.

*1945*

## *Да нашай явы берагоў*

* * *

Даволі спаць. Адчыніш вейкі —
вачэй не змочыць слёз раса.
Сягоння песню салавейкі
пачула нівы паласа.

Туды з пахмурнага пругмення
праз гай цвяцістны мы ідзём.
Дарунак сонечны — праменне
у поўных прыгаршчах нясём.

Зярняты сонца сеем. Глеба
усходы згодныя дае:
растуць яны, імкнуцца ў неба,
спяляць пад ім плады свае.

І пад прасвядным ураджаем
цвіцее ўцехаю прастор.
Прылівам сілаў адчуваем:
вядзе ў жыццё няхісткі тор!

*5.5.1944*

* * *

Не сагрэе сонца майго твару,
не ўсміхнецца ў вочы мне блакіт,
калі неба засцяць змроку хмары
і жухнее долу малахіт.

Не, жыццё не ў тым, што чуеш, бачыш,
не ўва ўсмешках сонца, не ў цяпле,
і жыццё не ў горы, і не ў плачы,
не ў гібенні блізкага у тле.

А не ведаць сну, не знаць спакою —
і не смерць, таксама й не жыццё.
Ліха жыць з напасцяю цяжкою,
блага йсці з напасці ў небыццё.

Дрэнна знаць раскошу і багацце —
гэта згіне, марна прабяжыць.
Жыць — быць роўным з роўным і змагацца
за сваё прызначанне, каб жыць.

*1944*

* * *

Аблокаў плач — мая туга,
мая няўцешная панурасць.
Вясёлкі радужнай дуга —
усіх,— пад сонцам слепне хмурнасць.

Рассыплюць хмары слёзны сум,
зірне блакіт, луджоны сонцам,—
і я — ягоны аднадум —
такі ж ажыўлены, як ён сам.

Блакіт, вясёлкавай дугой
падперажы маркоты хмары!
А плачу плач з нудой, з тугой
расплюхні ў сонечным пажары!

Спалі маланкавым агнём,
раструшчы горы гора громам!
Не цёмнай ночай будзь, а днём,
гасціннасць дай сваім харомам!

*1944*

## ЯЛІНКА

«Наш Божа, татку нам вярні,
нядобра нам адным...»
Ялінка. Дзеці. І агні,
і дым, сінявы дым.

А я, дарослы, поўны ўяў,—
бы прывід небыцця.
Чаму не дым сінявы я?
Чаму я не дзіця?

Чаму? Ці здолеў бы дзіцём,
ці змог бы дымам быць?
Пакутным змучаны жыццём,
мой дух юнацкі спіць...

Як загудзе калядны звон,—
ад таткі мо прывет? —
прачнецца дух той, возьме ён
мяне ў прывабны свет,

у гэны дзіўны свет, куды
на крылах сны ляцяць,
дзе вёсны, вечныя сады,
дзе росы зіхацяць...

Ялінка. Дзеці. І агні,
і дым, сінявы дым.
«Наш Божа, татку нам вярні,
нядобра нам адным...»

*На чужыне, 1945*

## МАЛЕНСТВА

Пад беллю дрэвы маўчаць прароча,
ля хаты ходзіць мароз дзябёлы...
А ён праз шыбы пабачыць хоча
снягоў сувоі — такі вясёлы.

На сцежцы ежу знайшла сініца,
працяглым ветрам зіма ўздыхае.
Глядзіць, глядзіць ён, не наглядзіцца,
смяецца, ручкай, як птах, махае.

Мой сынку, сынку! І я з табою
такім пацешным, як ты, раблюся;
ваюю смела са злой зімою,
імчуся ў звабнасць па снежным пусе.

І за сініцай, за госцяй з гаю —
хачу ўвагнацца — няўціхны, жвавы,
халодны вецер з двара ганяю,
у снох вітаю ўсясвет цікавы.

Адплюшчу вочы... О дайце змогу
мінуць няспогадзь — пары шаленства! —
І я знаходжу сваю дарогу
у хорам светлы майго маленства.

*1946*

## СПІ...

Ты адзін — усё-усенькае:
радасць, мукаў забыццё.
Немаўлё маё маленькае,
найсвятлейшае жыццё.

Спі, мой сынку... Аргентынаю
не злякае сябра-сон,
нешчасліваю гадзінаю
над табой не дзынкне ён.

Гаварыць пачнеш — часінкай той
зможаш праўду сна ўяўляць.
Кажны рух твой новы, сынку мой,
будзе родным прамаўляць;

не ўсміхнецца ні Бразыліі,
ні Алясцы, ні Канго...
Станьце ж, станьце, сны, ідыліяй
непадкупнага, свайго.

Не крануць хай слыху ценькага
словы: Пе́ру, Парагвай,
і няхай у снох маленькага
ажыве бацькоўскі край.

*На чужыне, 1946*

* * *

Пачні з Гамера ці пачні з Сакрата:
паэтаў — безліч, філасофаў — цьма.
А хто нячутых зыкаў струны кратаў?
Няўжо такіх шчэ не было і няма?

Былі — іх слова ў свеце не прапала
і не лягло ў згібенні на таку.
І несмяротны будучы Купала
Гамеру ціснe — бачу я — руку.

Музыкі вечнага не змоўкне лера.
Хто йдзе ў вякі — той не памрэ зусім.
Вітае двух — Сакрата і Гамера
разважны й спеўны будучы Максім.

А дзе ж нашчадкаў дружная кагорта,
і як «у перашкодах дух расце»?..[1]
Пражытае даўно кійком падпёрта,
а новае пляцецца у хвасце.

Як мала толькі быць адным паэтам,
каб з мудрасцяй вялікшай падружыць.
Як цяжка, цяжка ў збітым, перапетым
пад атамнай насупленасцяй жыць!

Хто шлях з цяжкой стагнацыі пакажа?
Хто думку ўздыме вышай устакрат?
Калі ж яшчэ нясказанае скажа
цяпершчыны Гамер або Сакрат?

*26.9.1946*

## *Жывому — жыць, знішчэнню — смерць*

* * *

Чорны крук закракаў на ўсё горла,
званкаспеўных птахаў пошчак змоўк.
Шэры конь з віхрастай цёмнай грывай
па дарозе з тупатам прабег.
Праграмеў падковамі, прагрукаў,
выкрасіў на бруку сноп агню.

[1] Словы Уладзіміра Дубоўкі.

Хмара змрочная ўспаўзла на неба,
захамарыўся блакітны дзень.
Пырснулі нажамі свігавіцаў,
неба перакроіўшы, агні.
Купы хмараў з грукатам грымотным
лінулі улеваю на дол.

Разліліся ўспененыя рэкі,
пазатоньвалі лугі, палі,
трэснула зямля, і на аскепкі
пашчапалася над ёю высь.
Ой, з благім насоўваюцца хмары,
не на добрае іх трушчыць гром!

*1941*

## * * *
**(Паводле Дантэ)**

О не, не цёмным воблакам шпакі
лятуць, калі зіма ў марозных путах
ідзе насустрач — а на ўсе бакі
нясуць вятры плямя навалаў лютых;
надзеі лепшага ў нябыт пайшлі —
і не ўсміхаецца жыццё ў пакутах!

О не, не жальным крыкам жураўлі
трывожаць супакой высі празорнай,—
а ўзнятыя вятрамі ад зямлі

натоўпы хмар. Штадня — ўсё горай, горай...

*1943*

## * * *

Толькі выгляне сонца з-за хмараў,—
знікне зноў. Скуль бяруцца яны?
Можа, гэта жутлівасць пажараў?
Можа, гэта суцьмежжа вайны?..

І марнее жытнёвы палетак,
і чакае касца сенажаць.
Кажуць людзі: настала ўжо лета
ды чамусьці яго не відаць.

*20.7.1943*

## ЗЯМЛЯ Ў АГНІ

Зямля ў агні. Гарачыня.
Сусвету — не дыхнуць.
Пякельнай лавы не суняць,
крыві струменіць муць.

Зямлі, зямлі гаспадары —
на дзвюх, на дзвюх нагах —
сусвету скарбы і дары
у пекла топчуць. Жах.

«Хадзі сюды, хадзі сюды! —
мне кажуць.— У паход
мы рушым. Выведзем з бяды
радзіму і народ!»

Адзін: «Вазьмі, вазьмі — ці меў? —
вінтоўку — новы стыль...»
Я ўзяў. Я ўвесь акамянеў —
гнілы, крывы кастыль.

Другі: «Вось келіх у мяне —
пітво ў ім змагароў.
Вазьмі!» — Я ўзяў, зірнуў: на дне —
людскія слёзы, кроў.

А трэці: «Змогся? Супачынь!
Прыляж на ложак наш».
Я лёг. Прачнуўся ўначы —
не ложак, а труна.

І ля мяне, і ля труны —
і века, і цвікі...
Ідуць яны, ідуць яны —
шкілеты... мерцвякі...

*Менск, 27.06.1944*

* * *

Крыніцы звонкае струмень
замоўк — не піць вады з прыгорстаў...
Ізноў наперадзе сухмень
дарогаў нудных, прыкрых вёрстаў.

Як і раней, ізноў, ізноў
мяне чакае жах нязнаны.
Мо гэта звада трызных сноў,
мо імі я ў палон забраны?

Чаму так цяжка, цяжка мне?
Жывых не бачу і не чую.
На голых дошках у труне
жыву — і днюю і начую.

«Цярпі!» — мне кажуць. Я цярплю.
«Накрыем,— зноў мне кажуць,— векам,
пасля... апусцім у зямлю,
і там ты станеш чалавекам...»

*5.7.1944*

* * *

Пусціня... пусціня... пусціня...
і на сэрцы, і ў думках, і ў целе.
Струны ліры аб смерці звіняць.
Ці даўно аб жыцці мне звінелі?

Так нядаўна... Чаму ж, для чаго
самі людзі жыццё растапталі?
Згас жыццёвых імкненняў агонь,
ліра змоўкла у скогаце сталі.

*Рыга, 6.8.1944*

* * *

Дваццаты век. А ён... Хіба маўчыць паэт?
Чаму не будзіць вершаў век дваццаты?..
Грымяць і абяскрыльваюць гарматы
жыцця імпэт.

Руйнуюць і нясуць раскошу ўцехі ім —
двуногім падабенствам чалавеку.
Нялюдству ўсё, прыдбанае спрадвеку,
было чужым.

О не, сусвет! Не ты бурхлівы шквал, не ты.
А ў шквале сам гарыш, і я згараю.
Крывавы акіян. Агонь без краю.
І дым густы.

Не ты,— знішчэнняў жах, з мянушкаю —
сусвет,
клыкоча, супакой з планеты сцершы:
— Калі я гавару — нямеюць вершы,
маўчыць паэт.—

*Пуйкуле, Латвія, 9.8.1944*

## ПАКЛОН

Ізноў крануўся эшалон,
ізноў за поручні бяруся.
Паклон, Эстонія, паклон
табе ад сына Беларусі!

Густы імшарнік. Хмызнякі.
Ялінкі. Кволыя бярозкі.
Бягуць чыгункай цягнікі,
смуткуюць сцежкі і дарожкі.

Пакіну я цягнік. Да вас,
да вас пайду, зямлі сцяжынкі!
Скажэце, дзе хоць посны квас,
хоць хлеба чэрствага скарынка?

Скажэце, як мне абысці
напасце смерці ашалелай?
Скажэце, як і дзе знайсці
спачынак для душы збалелай?

Пакіну змрочны эшалон
і ад чыгункі адракуся.
Паклон, Эстонія, паклон
Табе ад сына Беларусі!

*Масяру, Эстонія, 13.8.1944*

* * *

Ужо тры дні, ужо тры дні
не меў скарынкі хлеба ў роце.
Не кормяць вершы больш ані,
няма й граша ў папернай псоце.

Дзівак паэта, ну й дзівак,
хацеў насыціцца ён вершам!
Пісаў, пісаў, цяпер — жабрак,
сярод галодных — самы першы.

Чаму, навошта, для каго
глуміў паперу, чэрняй мазаў?
Сам ні ў ваду, і ні ў агонь,
ні ў муляры, ні ў вадалазы.

Няўжо такі жыцця закон,
о Муза, строгая багіня? —
Спрытнейшы — хай бяздарны ён —
жыве, менш спрытны — здольны — гіне

*Гэдэмэмтэ, Эстонія, 16.8.1944*

* * *

Лясы. Узгоркі. Паплавы.
Блакіт нябёсаў. Сінь азёраў...
Далёка вы, далёка вы,
радзімы блізкія прасторы!

А дні сярод палёў чужых
спяляць пасевы залатыя.
Пайдзі, прыслухайся да іх:
шумяць пасевы, ды не тыя.

Шумяць. У даль палёў зірні:
яшчэ далей — палі радзімы.
Плывуць крывёй над імі дні
і плыць сягаюць над чужымі.

Знішчэнне там, дзе іхны след.
Сваім, чужым — адно. Дзе ж дзецца?
Куды ні глянь — вялікі свет,
а чалавек не мае месца.

*Гэдэмэстэ, Эстонія, 6.9.1944*

* * *

Плыве вадаплаў і плыве
ад смерці да смерці у госці.
Пагібель маёй галаве
прарочыць бязлітасна хтосьці.

І кажа мне, кажа: «Глыне
цябе ненажэры прадонне.
А морскія камні на дне
спакой табе вечны адзвоняць».

«Пакіньце! — прарокаў прашу.—
Нялёгка ад вашага мору
спакойна хаваць мне душу
на дне неспакойнага мора».

І цяжка маёй галаве.
Прароцтвы — калючыя восці.
Плыве вадаплаў і плыве
ад смерці да смерці у госці.

*Балтыйскае мора, 15.9.1944*

* * *

Нідзе не адступае,
за мной — услед, услед.
Пакінь мяне, сухі шкілет —
твая каса даўно тупая!

На зруйнаванне готык
ідзі яе вастрыць!
Няхай агнём яна гарыць —
пякучым будзе ейны дотык!

І павядзе дарога
па звалавым гарбе —
да тых, што вывелі цябе
падкошваць плод жыцця зямнога.

Перадсмяротным духам
іх сцешыць Сатана;
гарбаты трон да іх яна
даўно паслала мяккім пухам.

Ступай па ім — знямога
няласкай не кране.
Пакінь мяне, пакінь мяне —
чакаеш ты сябе самога!

*Берлін, 7.11.1944*

## FRÖHLICHE WEIHNACHTEN[1]

Так, Fröhliche Weihnachten. Так, паны,
з грубой душой пад знакам павучыны.
Што ж маеце, вандалавы сыны,
да тэй жанчыны?

Яна з малой дзяўчынкаю — дачкой,
асіліўшы пакуты і знямогу,
вязе ў касцёл праз ваш несупакой
малітвы Богу.

Дзяўчынка ўся ссінела, як той «Ost»[2]
на світцы ў маці. Ost'аўка — не пані,
ёй месца і ні ў свята, і ні ў пост
няма ў S-Bahn'е[3].

Арыйскі дух з вагону гоніць прэч
жанчыну-маці і дачку жанчыны...
...Карае вас, карае Божы меч
ліхіх, бясчынных.

І знікне чорны прывід Сатаны,
і згіне зверства след на хіжым твары.
Так, Fröhliche Weihnachten. Так, паны,
людства пачвары!

*Берлін, 24.12.1944*

---

[1] Вясёлых Калядаў! *(ням.)*

[2] «Усход, усходні» *(ням.)*. Літары гэтага слова, белыя на сінім, мусілі насіць на грудзях работнікі і работніцы — «остаўцы, остаўкі», — прымусова прывезеныя ў Нямеччыну з акупаваных гітлераўцамі ўсходніх земляў, у тым ліку і з Беларусі.

[3] S-Bahne (поўнасцю Stadt Bahn) — так звалася гарадская чыгунка ў Берліне.

## СЛУЧАНКА

Вочы твае — васількі. Я не бачу
радасці ў іх. Хто пакрыўдзіў случанку?
Многа няўцехі, балючага плачу
ля негасціннага ганку.

А за спіною — суровыя дзверы;
іх зачыніла твая валадарка,
носьбітка расы — чысцейшай без меры;
ты, беларуска, — татарка...

Зараз няшчасце вялікае ў пані
(з ім жа і гнеў — на цябе, небарака):
здох пры паданым табою сняданні
ейны ўлюбёны сабака.

Пані ў распачы ліхой, у трывозе
рэчы твае ў калідор паўкідала,
аж да цямна — ля дзвярэй на марозе —
кару адбыць загадала.

... Белую шаць асыпаюць тапол,
з імі прыгадвае дом свой случанка.
Плачуць мае васількі у няволі —
цяжка табе, паланянка.

*Вена, 16.2.1945*

* * *

З агню вар'яцкага, з пякельнай цемрыні,
ад дзён, што ночамі зрабіў пажараў дым,
уцёк я да палёў. Зірні, зямля, зірні,
ці ж быў раней такім сухім я і блядым?

Як жыў табой, тады не ведаў цемры я.
І быў тады, як ты, прыбраная вясной.
Цяпер жа? Кажаш мне — цяпер я не твая.
А ты? Ты месяца жыхар, чужынец мой.

*Вена, Швадорф, 25.3.1945*

* * *

... у дзявочыя вочы, як зоры,
мне цяпер, як глядзеў, не глядзець.

*М. Сяднёў*

Да жыцця ад пагібелі крочу,
а ратунку не бачу нідзе.
Мне на вас, непаўторныя вочы,
як глядзеў я раней,— не глядзець.

Давядзецца мне долу зваліцца,
патрабуе пагібелі лёс.
Будуць гэтыя вочы журыцца
і ніколі не выплачуць слёз.

Хай яны не гавораць аб гэтым,—
уяўляю такімі я іх.
Каб не быў я у сэрцы паэтам,
дык спяваў бы цяпер аб другіх.

Вочы шчырыя, вочы без жалю
я журботнымі змог уявіць.
Мне яны ўсю душу ўсхвалявалі —
так ніхто йшчэ не ўмеў хваляваць.

І цяпер ім я смутак прарочу,
не даю ім на радасць надзей,—
мне на вас, непаўторныя вочы,
як глядзеў я раней,— не глядзець.

*8.4.1945*

## ДВАЦЦАЦЬ ТРЫ

Мне сяння роўна, роўна дваццаць тры.
Жарства мне ногі рэжа, плечы — клунак.
Аснежных Альпаў гайсуны-вятры
мяне загналі на спачын у клуню.

Паблізу цёплы дом... І я прылёг.
Ды сэрцы — лёд... Адчуў сябе як дома.
Аб днёх спакою, вельмі рэдкіх днёх
мне прыгадала пахкая салома.

Такі, знаёмы змалку, тхненны пах.
Ідзе хтось... «Дзеду?..» «Блуд, унук,
шмат блуду...»
Стаіць з даўжэзнай люлькаю ў зубах
двуногі вырадак, тупы адлюдак.

«Weg! [1] — кажа ён.— Ты бачыш.— Keine Platz,[2]
тут працаваць мне трэба, ты — заміна».
Як быццам я не ў клуню, а ў палац
зайшоў — ягоная так цвердзіць міна.

І я пайшоў. І ўпарта па шляхох
чужых, няласкавых, праношу ўпотай
усё, чым я жыву і што збярог
у сэрцы, не падужаным Галготай.

Імкненне, след нялюдскасці сатры!
Няхай яна ў нябыце люльку слюніць...
Мне сяння роўна, роўна дваццаць тры.
Жарства мне ногі рэжа, плечы — клунак.

*1.5.1945*

* * *

А ўсё ж мы вернемся дахаты, у айчыну,
і не заблудзімся ў шляхох чужой зямлі.
А я вярнуся не адзін, а з сынам —
нашчадкам Крывічоў і іх сям'і.

Скажу, укленчыўшы: Крывіччына святая!
Хай Ты насмерць была распятай, а жывеш.
Тваіх дзяцей ні даль і ні імгла густая
не абясплодзілі ў чарсцьве пустэльных меж.

Жывому — жыць. Знішчэнню — смерць. Жывое
кідае па сабе жыццё. Жывому — плод.
Ты не памрэш, Крывіччына! З Табою
ніколі не памрэ крывіцкі род.

*12.5.1946*

---

[1] Прэч! *(ням.)*
[2] Няма месца *(ням.)*.

# ЗВІНЯЦЬ ЗВАНЫ СВЯТОЙ САФІІ

*Юрку Віцьбічу*

1

Вітанне, космасу прастор!
Ніпіто мне нейкі перавал там!
Ad astra[1] слынных лётаў створ
узнёс мяне на зайздрасць Альпам;
шугнуў удаль, як метэор,
з найноўшай зброі пальнуў залпам...
Ты не мінеш смяротных ран,
пантэра хіжая, тыран!

2

І папярхнуўся спеў застольны,
і чорнай сцёк упыр крывёй;
змярцвеў гармідар беспатольны,
прад сконам гаркнуўшы савой.
А над Дзвіною горад стольны[2]
схіліўся думнай галавой,
і ўскалыхнуўшыся ў стыхіі,
загуў змагарны звон Сафіі.

3

З канцоў паўстала даўніна,
з аддаляў выйшаў год за годам;
і адпаўзла ў нябыт мана,
і вечны скон прыйшоў нягодам.
А непакорная Дзвіна
плыве з былым і з новым згодам,
і новым днём гудзе здавён
святой Сафіі грымны звон.

---

[1] Ad astra *(лац.)* — даслоўна — да зораў, пераносна — да вялікага, да найвышэйшага ідэалу *(аўт.)*.
[2] Маецца на ўвазе Полацак *(аўт.)*.

4

Святляр жыцця, цямнiяр агонiй
i неўмiручасцi сiмптом —
няўцiхны звон. Гудзьбе ягонай
званы астатнiя гуртом
уторыць згодай неўгамоннай:
Дзын-дум! Бам-бом! Дзян-дум! Бам-бом!
Сваё паўторнае свiтанне
спаткаць выходзьце, Крывiчане!

5

Звiнiць Святой Сафii дар,
не моўкне збытая надзея.
Займай пасад свой, валадар,
нашчадак слаўны Чарадзея!
Паслухай: звону кажны ўдар —
жыцця вялiкшая падзея.
Хай здрада б'ецца ў цвердзь iлбом...
Дзын-дум! Бам-бом! Дзын-дум! Бам-бом!

6

Звiняць званы Святой Сафii —
гамонiць збуджаная даль,
iрвуцца путы векавыя,
i ломiцца кайданаў сталь.
Нясуць законы вечавыя
сумлення чыстага крышталь
людству, зямлi, святлом спавiтай,
крывёю праўднаю здабытай.

7

Званы звiняць. Шумяць на ўтор
лясы Крывiччыны блакiтнай;
вiтае iх Птушыны тор[1]
сузор'ем, поле — песняй жытняй,
валвой[2] — азёраў буд-гутор,
узбераж — казкаю ракiтнай...
Вялiкi край, шматспеўны край,
легендаў вечных мудры бай!

---

[1] Птушыны тор — Млечны Шлях *(аўт.)*.
[2] Валва — хваля на возеры або моры, якая падымаецца ў часе ветру сцяной *(аўт.)*.

8

Звіняць званы. А па далёкай
зямлі (там — ноч, святла — нідзе)
яшчэ ўсё мучыць катаў лёкай
выгнанца ў зморы і нудзе.
Ды краты нішчацца. Шырокай
далінай шлях-зварот вядзе
у сёлы ўсіх дароў на нівах,
у месты ўсіх званоў гуллівых.

9

Званы звіняць. І гэн — з нямой
чужыны, горнай і бяздомнай,
ідзе мой брат і сябра мой —
змагар краіны зычназвоннай.
Заміны — бачыць ён — гурмой
над прорвай рухнулі прадоннай;
ён чуе — кліча вольны дом:
«Да-дому! Бом! Дзын-дум! Бам-бом!»

10

Звіняць званы Святой Сафіі,
Дзвіной імчыцца бурны стром.
Грымяць паходы баявыя,
сусвет узрушыўшы суздром.
Зямля пяскі змяла сухія,
азёры стрэслі лёд-паздром.

. . . . . . . . . . . . . .

11

Няма табе канца і краю,
абшар, прамудрасці сабор!
Я выйду з кола небакраю —
я неўтрыманасці сябёр!
Мяне да дум маіх — да краю
прымчыць найноўшых лётаў створ
туды, дзе ў велічнай стыхіі
звіняць званы Святой Сафіі.

*1946*

* * *

Вянкі, табе вянкі,
аздобная краса!
Буйней, ідзі ў вякі,
з няволі ўваскрасай!

Табе нязгасна жыць
у сэрцах у людскіх.
З табой не засушыць
вянкоў, вянкоў маіх.

*1945*

* * *

Мне і ў цемру не забыцца
светлых сноў.
Прада мною ты як быццам
зноў.

Гляну ўвысь, а ейны прозірк —
сінявой.
І здаецца зоркай позірк
твой.

У небе месяц, я на доле —
як браты.
Наша ўсё, усё раздолле —
ты.

*1942*

* * *

Ён салодкі цяпер, але першы быў шмат саладзейшы.
А мой шлях да цябе, хоць і першы, ды быў карацейшы.
І нязмрочны мой шлях не абходжаны гэтак нікім.
Я ніколі яго не міну ў падарожжы цяжкім.

Ён узносіць, вядзе, уздымае ўгару — да світання.
Ён салодкі цяпер — пацалунак узлётаў кахання.
Але першы — няма параўнанняў і словаў яму:
ён зрывае ільды і зганяе з пацёмкаў зіму.

*1943*

* * *

Снег ідзе... Вецер гуллівы да ліпаў —
сясцёр сіратлівых —
лёгка пабег, прывітаўся, махнуў белабрысай чупрынай...
Гэткім бываю і я, калі стрэнуся з любай дзяўчынай.

*1944*

* * *

Скажаш мне — і пайду
праз лясы, праз узгоркі.
Хай далёка знайду
хлеб няўцешны ды горкі.

Але будзе той хлеб
за цябе маёй мукай;
горны край, дальны стэп —
не даўгою разлукай.

І цярпенне маё,
і мой шлях у нязнанасць —
прабуджэнне тваё,
небыццю непадданасць.

*1945*

* * *

Дабрыдзень, мая зарніца!
Даспела твая пшаніца.
Прынось жа свой серп хутчэй,
і ніве — цяжар з плячэй.

І сноп ты, зажаўшы, звяжаш,
пры працы мне шмат не скажаш.
А вечар дыхне з лагчын —
пачую: «Цяпер спачын».

*1945*

* * *

Найпершы парыў абяскрылены
штормам імгненным.
І досвітку ўсмешкі ахінены
дымам ваенным.

А даль, як і ўчора, туманіцца
тропам цярністым...
Ідзе не барвоваю раніцай —
змрокам імглістым.

Так рана ў дарослацць канодныя
кінула косці.
Мінае княі непраходныя
без маладосці.

Ды як перад ёй ні туманіцца
шлях непаўторны —
вяшчуе наступную раніцу
промень вячорны.

*1945*

* * *

Мінаюць дні. Прайшла вясна. Адззяць і лету.
А з дня на дзень чакаеш ты — яго няма.
Загінуў мо далёка дзесь у злыднях свету?
Забыўся мо — і неспакой трымціць дарма?

А бэз адцвіў. І сенажаць зграбае травы.
Растуць жыты. Ім не мінуць сярпа й вязьма.
Хмурнее твой пагляд вачэй — такі яскравы.
Чакаеш ты і тужыш ты — яго няма.

*1945*

* * *

Аб табе успамін — найвышэйшая ўцеха,
неўтаймованы боль і надзеяў прачын.
І заўсёды ўва мне адгукнецца, як рэха,
аб табе успамін.
І не гасне са мной, і пад сонцам праводзіць
да наступнага дня — да прасвяды зямной,
а як ноч праміне — па заранні ўзыходзіць
і не гасне са мной.

*1947*

* * *

Хочацца плакаць — стрымваю слёзы,
болю не ўсцішаць яны.
Стромкія хвоі. Ніцыя лозы.
Грэчкі. Пшаніцы. Ільны.

З імі, над імі стройная постаць
вёснаў не йдзе спатыкаць:
цяжка ў няволі стан ёй выпростваць,
цяжка мяне прычакаць.

Толькі пабачыць — слёз не стрымаю
(хто іх тады не пральe?).
З імі на заўтра радасць хаваю —
я не праплакаў яе.

*1947*

# ДОМІК У МЕНСКУ

Паэма

1

Цвіці, вясна мая, цвіці!
З табой парываў пошуг поруч.
Няхай знікае ў небыцці
глухіх часін туга і горыч.

Бязмежжа ніваў калыхай,
пашлі ім веслівыя сокі —
зямлі і неба дар — няхай
узносіць іх узрост высокі.

З тваёй ацвеценай красой
насіцьму ўсцешаную мрою:
на луг, аздоблены расой,
ступлю з праддзённаю зарою.

Прайду па ім гаспадаром,
паклон пашлю багаццю ніваў,
сустрэну песняю свой дом —
вяшчуняй спору й плённых жніваў.

Цяпер жа — немань, ноч над ім,
тугой засмучаным харомам,
ахутаў далі зманны дым,
спакой трывожыць высі громам.

Жуда над вокнамі брыдзе,
кручча сядзіць на шэрых стрэхах...
Ты засталася ў бядзе,
мая пакіненая ўцеха!

2

А з тым харомам-домам я
маленькі дом успамінаю:
над самай Свіслачай стаяў,
ці сяння ён стаіць — не знаю.

Я ў ім пражыў адпюткі дзень
і ёй у ім глядзеў у вочы.
З акна зайздросціў нам прамень,
як мы, на розвіт неахвочы.

Я голас ейны ў доме чуў —
той звон крыніц, нібы срабрысты.
Я з насалодаю адчуў
ягоны спеў крыштальна чысты.

Пабачыў працу ейных рук
на ўзорах, ёю вышываных.
Я чуў — на вулцы голскі брук
змаўкаў нібы зачараваны.

Мне помніць доўга дзень у тым
у доме простым, а раскошным.
Я мілым быў і дарагім
ягоным госцем — мо й апошнім.

Бязмежна ўдзячны дому й дню —
няўтоме рук і сціплай працы:
пазнаў я з імі прасціню
пышнейшай над усе палацы.

3

Мы нарадзіліся наўзбоч
здаволлем выпешчаных сцежак.
Сляпіла вочы цемра-ноч,
святлом нам быў маленькі ўзмежак.

Мы працярэбвалі шляхі
да межаў дзён, заўсёды ясных,—
ды адшпурляў віхор ліхі
да ночаў вечных і заўчасных.

Не песціў зваблены пагляд
зарніцаў ранніх і вячорных —
хмурнеў суровы гул гармат
сцяной дымоў — густых і чорных.

Нязгаснасць радасці здалёк,
як зніца, клікала, будзіла —
ды прыбліжальны мужны крок
гняла антыхрыстава сіла.

Мы не спыняліся, яе
вось-вось імкліва дасягалі...
Нястомна зло ланцуг куе,
і не сціхаюць штормаў хвалі.

Куды ні глянь — на растанёх
прапекла крыж пакут прыгнула.
І тое, чым бы жыць я мог, —
адным-аднюткім днём мільгнула.

4

Пакінуў з болесцяй яго —
ізноў паклікалі дарогі.
А дому йшчэ ні аднаго
я не знайшоў — так свет убогі.

Як шоўк — ля дому на двары
краса мураваў аксамітных.
Як жвір — заморскія каўры
маіх прытулкаў нявыбітных.

Ля дому ў пуні моцны сон,
як пух — і сена, і салома.
Як грант — чужы начлег-прыгон,
не адпачынак — толькі ўтома.

Ці ж у маёй бядзе цяжкой
магільны холад камяніцы
замене сціплы мой пакой
у вокнах з позіркам дзянніцы?

Ці ж у мужчынскіх споднях твар
пад голас эпохі маляваны,
заменіць мне яе — той чар,
ні з кім у свеце не зраўнаны?

І той, хто страціў дом-харом,
пазнаў ля сцен чужых і ўпартых:
палац з раскошай і дабром
яго, найбеднага, не варты.

5

І з росным ранкам, з ясным днём,
і на зары, і на паўдзёнпі,
«адзіны дом, каханы дом» —
няўціхна сэрца б'ецца-звоне.

Граніц мінаючы драты,
брыдзе мой лёс гарбатым дзедам.
«Каханы ты, адзіны ты» —
утораць сэрцу думкі следам.

Званочкі-краскі, васількі.
Ці ж то яны? Яны ж — далёчы.
Між іх мільгаюць матылькі.
А ў думках — толькі дом і вочы.

Рамонкі — безліч, безліч іх!
Адна краса — палі і ўзмежкі.
А мне здаецца — вочаў тых
глыбокі смутак і... усмешкі.

Маркотны шлях. І пад ступой
скрыпяць пяскі, бы снег аб полаз.
Я не спаткаюся з табой
і больш не чуцьму ейны голас.

Ізноў палі. І белізна
садоў-гаёў; на сэрцы — склока:
вакол вясна, цвіце вясна,
а вы... не блізка — так далёка...

6

Драўляны дом, блакітны дом!
Маіх найлепшых мар прытулак.
Ці так жа ўсё сваім акном
глядзіш на вузенькі завулак?

Ці шчасцем ты сваім багат,
ці шашаль сцены твае губіць?
Ці так жа ўсё зялёны сад
тваю ідылію галубіць?

Скажы ты мне, скажы ты мне,
дзе зараз тая, што начамі
малілася сваёй вясне —
такая... з сінімі вачамі?

Ці ён цяпер, як і тады,
ад нечага ўсё сумна, цяжка?
Як пражывае малады
свой век прыгожая манашка?

Што з ёй цяпер? Свой ціхі сум
яна ў вачох па мне ці носіць?
Гаротнасць цяжкіх яе дум
каго развеяць яна просіць?

Драўляны дом, пястуй свой сон,
гадуй у садзе свой спачынак.
Ты мар найлепшых пантэон,
адзіны дум маіх прыпынак.

7

О, незабыўныя радкі
майго калегі М. Сяднёва!
Вы дум цвяцістыя вянкі,
цытую вас я слова ў слова.

Я з вашым аўтарам пра вас
успамінаў у Беластоку,
і з вамі я тужыў ці раз
ля водаў Рыжскае затокі;

і праз далейшыя шляхі
былі вы песняю адзінай;
ступаў я з вамі праз імхі
лясоў Эстоніі гасціннай;

і пры насланні — дымных днёх —
былі вы знічкай успаміну,
жылі ўва мне ў трывожных снох
і ў бамбасховішчах Берліну.

Ды Reich'у згін не пахіснуў
і не паставіў на калены;
мяне ад вас не адхіснуў
і стогн руін агністай Вены.

Як з вамі я, вы ідзяцё
за мной па скалах Альпаў хмурых.
І вы, як дом,— маё жыццё,
мая нясхільнасць у віхурах.

8

Як дом над Свіслачай-ракой —
найсціплы скарб мае сталіцы,
так згадка — плач тугі, якой
цяпер трымцяць і вёснаў гліцы.

Адпорны сіберным вятром —
ён частка цэлага хараму,
ды мне цяпер — бы сам харом,
нібы мой дом самога дому.

Яна ж у ім — яна жыла,
мо й сяння зносе ў ім няўцеху,
і пад крывавым пеклам зла
не знае радасці і смеху.

Мо ў тундрах, мо сярод пяскоў
нясе пакрыўдны здзек сваволі —
і па слядох яе бацькоў
далей грыміць ланцуг няволі...

Туга салодкая мая
даўно са мною не сябруе,
а ў сэрцы джгаліць, як змяя,
і ў ёй, нібы ў агні, гару я.

І дакарае мне: «Чаму ж
і дом, і ў ім яе пакінуў?
Няхай бы ты — і смел, і дуж —
харобрым рыцарам загінуў».

9

Ты дакарай мне, дакарай,
мая туга — неўтаймаванасць!
Бясслаўна я пакінуў край...

. . . . . . . . . . . .

...Была вясна. Маёй вясне —
заўсёды жыць, бы казцы-сказу.

10

А беларуская вясна —
я не знайшоў нідзе ёй роўных.
Краса на ўсёй зямлі — адна,
ды шмат у ёй аздоб чароўных.

І рознасць іхная ў вясне —
і ў тэй вясне харому-дому...
Як першы цёплы дзень блісне,
марозу весцячы утому,—

гарыць крыштальны, чысты снег,
і дзень, як сонца,— прамяністы.
Ледзь кропля звонкая са стрэх
спадзе, маўляў смарагд агністы,—

і ажывае свет красы:
і дол, і неба — зоры й зоры;
і прачынаюцца лясы,
гамоняць рэкі і азёры;

снягі струменямі вады
да іх імкнуцца нестрымліва,
плывуць і крышацца ільды,
пад сонцам таюць зігатліва.

Яшчэ руцвянаю травой
не ўскрыты ўзрэччы і пралескі,
а пад нябёснай сінявой
цвітуць блакітныя пралескі.

11

Пяшчоту вясніх абыймоў
зямля ўдыхае шырай-шырай.
Шпакі вяртаюцца дамоў —
не вабіць іх далёкі вырай;

лятуць у свой харом — у ім
найбольш, як дзе, цяпла й раздолля...
І з днём праменна-залатым
п'юць дрэвы сок святла й здаволля.

Цвіце, адцвітвае гарэх.
Снягі сайшлі. А дол — пад беляй:
То пух асінавы, бы снег,
кладзецца лёгкаю пасцеляй.

Дымнее пахкая ралля —
ёй сейбіт зерне дорыць-сее.
Пчала спяшае да вулля.
Блакіт насупліва хмурнее.

Разважна крочыць першы гром
за хмарна-змрочнымі дзвярыма..
Зямля, абмытая дажджом,
буяе пышнасцяй кілімаў.

Зноў адчыняе дзверы выш,
рвучы суцэлле хмар на болкі,—
зіяе з іх праменны спіж
дугой шматколернай вясёлкі...

12

Вясна праводзіла ў шляхі,
дзяліла смутак развітання.
Над ёй глуміліся штыхі —
зняслаўцы ейнага світання.

. . . . . . . . . . . . .

Як лістапад, спадала з дрэў
вясна, адцвілая заўчасна;
і сам харом шугаў, гарэў,
гарэў, здавалася, нязгасна;

схаваўся ў дыме і агні
і дом зруйнованай сталіцы...
І доўга йшчэ ў далечыні
займаўся полыск палавіцы.

Жаўрэў крывёю небакрай —
куды ні йшоў я і ні ехаў...
Вялік шырокі свет-бяскрай —
бясконцы шлях пакут-няўцехаў.

13

За дом, за пышную вясну
ішоў, і йду, і не спынюся.
Павекаў стомных не самкну
у несціханай завірусе.

Мае цярністыя шляхі
вядуць да дзён, заўсёды ясных, —
не адшпурне віхор ліхі
да ночаў цёмных і заўчасных.

Шукае спрагнены пагляд
зарніцаў ранніх і вячорных.
Сціхае строгі гул гармат
і кане дым — густы і чорны.

О, нездарма зара здалёк
мяне і клікала й будзіла:
пад прыбліжальны мужны крок
трасецца злыдніцкая сіла.

Само сабе ланцуг куе
прапекла й зло пад штормаў хвалі.
Я не згубіў зары — з яе
вачэй не зводзіў у навале.

І на апошніх растанёх
хай не змыкаюцца павекі,
каб тое, чым я жыць не змог,
было маім — было навекі.

14

І з росным ранкам, з ясным днём —
і на зары, і на паўдзённі —
цябе я помніў, дом-харом,
цябе я помню і сягоння.

Твая аздоба пекнаты —
і па-над полем, і на полі.
Каханы ты, адзіны ты,
ты мне не быў чужым ніколі!

Ішоў праз далеч нацянькі,
ступаў апоўдні, апаўночы,
у жыце бачыў васількі,
мне ў іх яе зіялі вочы.

Стаптаў ці мала мурагоў,
пераступаў, мінаў узмежкі —
да незабыўных берагоў
мяне вялі яе усмешкі.

І верыў: ёй не быць рабой!
І прыйсце блізкае вяшчую:
няўхільна ўбачуся з табой
і голас ейны зноў пачую.

Сустрэне цвецень-белізна
усіх садоў, адыдзе склока.
Вакол вясна, цвіце вясна —
і вы так блізка, недалёка.

15

Цвіці, вясна мая, цвіці!
З табой парываў пошуг поруч.
Нехай знікае ў небыцці
глухіх часін туга і горыч,

Бязмежжа ніваў калыхай,
пашлі ім веслівыя сокі —
зямлі і неба дар — няхай
узносіць іх узрост высокі.

З тваёй ацвеценай красой
здзяйсняю ўсцешаную мрою:
на луг, аздоблены расой,
іду з праддзённаю зарою.

Прастую ўдаль гаспадаром,
паклон нясу багаццю ніваў.
Цябе вітаю песняй, дом —
вяшчуняй спору й плённых жніваў.

Пад сонцам светла-маладым
і нада мной, табой — харомам —
не засціць неба трутны дым,
блакіт развеяў хмары громам.

А поруч нас яна ідзе,
аб ёй і водгалас — як рэха...
Цябе не кінуў у бядзе,
мая нястрачана ўцеха!

*1944—1945*

## *Несмяротнасць*

### I

### ЯШЧЭ НЕ МОЎКНУЦЬ...

Яшчэ не моўкнуць стройныя санеты...
І супіць бровы хісткі век атому,
і ў нашы рукі хаасную ўтому
упарта сунуць модныя паэты.

Ды ў снох не звянуць збожжавыя леты,
куток праўдзівы продкавага дому,
паклон удзячны спогаду зямному,
малітвы шчырай пошуг у сусветы.

А вы жадалі б з векапомных стромаў,
культураў даўных змесці веліч томаў?..
Пайду няўхільна, сумны, адзінокі

(у суме — праўда, ў адзіноцтве — сіла)
туды, дзе думка клікала, будзіла,
дзе вам згібенне прараклі прарокі.

*1947*

## ЯК ВАС...

Як вас прысыпле глейкі груд магілы,
ці хто стрывае ў свеце завіруху?
Душа — не цела — абмінацьме скруху
аж там, дзе яснуць ззяйныя свяцілы.

Над пусткай долі йшчэ разгорне крылы,
як ён спачыне ад п'янога руху.
Абдорыць глебу чыстым зернем духу —
жывым насеннем несмяротнай сілы.

Яно ў тваім жа неспакойным сэрцы
расло, буйнела, каб не сцерлі гэрцы,—
ты сам кунежыў, не аддаўшы звадам.

На месцы прышлых папялоў планеты
з яго пад сонцам зноў узыдуць кветы —
пышнецьмуць буйна выпешчаным садам.

*1947*

## ЦЕМРА

Святлу пагібель прагрыміць імгнення,
мана спапеліць вашыя аблоні.
А вас цікавяць рук маіх далоні?
Мазоль свой жорсткі я здабыў сумленна...

І мора дужым рада бурапенна,
імклівай хваляй у нязнанасць гоне.
І гінуць людзі — іх змяняюць коні.
І цёмнай сілай дыхае гіенна.

А недаспелым ападае колас,
а непачуты замаўкае голас.
Паўзе аблуда іхны след зацерці.

Ты іх мінаеш — не шукай збавення,
ты іх абходзіш — спатыкай згібенне,
мацуй на скон свой валадарства смерці.

*1947*

## РАСТВО

На беспрасветным нашым бездарожжы
няўзнак абыдзем плач жабрачай леры,
сям'ёю дружнай пры Святой Вячэры
згадаем дом свой — сумны і прыгожы.

Палынуць думкі па Дзвіне, па Сожы,
па Нёмне,— ўсюды — праз пацёмак шэры:
«Настала радасць,— стукацьмуцца дзверы,
Радзіўся, людзі, збаўца Вам — Сын Божы!»

Спавіты змрокам летуценні нашы,
п'ём слёзы мукаў з недапітай чашы.
Святла шукаем — не знайшлі нічога.

О дзе ж вы, дзе ж вы, што цяпер не з намі?
На кручах свету не спачынем снамі,
спаткаем разам прыйсце дня святога!

*1947*

## КРЫВІЧЫ

Старэтных вечаў водгалас пасцежны,
твая йшчэ слава штормамі не сцята.
Гудзе званамі вольная Палата,
Дзвіною рушыць на прастор бязмежны.

Прабудны покліч — гоман прыбярэжны —
далёка чутны — наваколле ўзнята:
«Хай згіне цемра! Час табе, адплата!»
«Хай сонца ўзыдзе! Прэч, набег
драпежны!»

А чольны шэраг вой вядзе адважны,
мячом падступным грозна-недасяжны.
З гадоў паходных і з вякоў суровых

не сцемяць змрокі раніцы краменнай.
Над ёй лунаюць светласцяй праменнай
нашчадкаў сцягі ў далях пурпуровых.

*1948*

## НЯХАЙ

Няхай да скону будзеш ты бяздомны
без хатняй ласкі, радасці айчыстай —
акраплюй потам на зямлі агністай
нямыя шахты і глухія домны;

куй на кавадле водгук даўгапомны
сталёвай сілы, моцнасці вячыстай —
застанься з верай і душою чыстай
заўсёды дужы і нідзе нязломны.

Ды помні: прышласць свеціцца ў зары ўся,
і ты аблуднай цемры не скарыўся.
Цяжар чужыны з віхрам волі дружны.

А пошуг мрояў — са збыццём суладны.
У край жаданы, праўдзе падуладны,
ідзе нясхільна толькі той, хто мужны.

*1948*

## ЗАРАНКА ЎСХОДУ

Ці адчуваеш? Вёсны адшумелі
з пары, калі мы вольнымі арламі
шугалі ў высі... З хвалямі-кругамі
пакінуў човен долы, травы, мелі.

Да іх з праводзін чайкі адляцелі.
Ці новых стрэнеш перад берагамі
нязнаных светаў? Дзесьці за марамі
ці ты спачынеш? На якой пасцелі?

Тускнее захад. І заранка ўсходу
на ўзлётных крылах будзіць насалоду —
у ёй світальна-велічнае штосьці:

жыццё няўхільна хіліцца да схілу,
але не зляжа ў цёмную магілу
жывы адвеку подых маладосці.

*1949*

## ЗА

За цёмна-сінім, за Чырвоным Морам
спатканы будзеш акіянам хмурым.
Ды ты не з долаў, схіленых віхурам,
не з узбярэжжаў, падуладных зморам.

Хай загамоняць з'юшаваным хорам
ліхія хвалі, хай з глыбіняў мурам
твой шлях загацяць,— не, не быў панурым —
не паддасіся здрадлівым спакорам.

Што паўстрымае з волі і навагі
імклівасць дужых? Глянь на шчоглаў сцягі:
яны палошчуць пад вятрамі, бурай

у шызым змроку свой узвіў світальны —
праз шэрань хмараў у блакіт крыштальны
узносяць пошуг над вадою бурай.

*1949*

## ПРАЗ НЕСПАГАДУ

Да сонцаў ясных, як сваім вяслом бы
ні гнаў ты човен — летуценне-мару,—
не завітаеш да Мадагаскару
і не закінуць хвалі да Каломбы.

Ці ж то адзіны ў шляхох залом быў?
Праз неспагаду ты пайшоў на кару,
не прамяняўшы дубу, ясакару
на чырвань вежаў, на шаблоны-пломбы.

Няхай Гвінея ці няхай Гаваі —
і найдалейшы кут не пахавае
дум неразменных і аб ліпе гойнай,

і аб бярозе, і аб думным клёне —
аб тэй прывабнай пекнаце-аблоні —
без іх не злечыш болі невыгойнай.

*1949*

## УЗВІЎ

Бунтуе воды акіян грымотны —
прадонна-жадны і дабру і ліху.
Гамоняць хвалі — ім няма суціху.
Чаму ж ты, дружа, хмуры і журботны?

У стомным шэпце ветразяў узлётных
узвіў слабее, просіцца аддыху.
На блізкі ўзбераж дзень прыляжа крыху,
пасцеле з пены белыя палотны.

Над сном спачыну ўзыдзе месяц нізкі,
сыпнуўшы ў завадзь агнявыя бліскі.
Як дол пяшчаны ўтульнага кунежжа,

ён агартае залатым спакоем...
Ледзь золак,— зноўку збуджаны прыбоем,
вітацьмеш далеч бурнага бязмежжа.

*1949*

## НАДОЙСЦЕ

Старчма прыўстане вадаплаў на грудзе
шалёнай хвалі акіяну-гневу.
І зноў удалеч праз вятры і ўлеву
шляхі скіруе — непакорны зблудзе.

Далёкі бераг-Конадзень. Ён будзе
прадвесцем зыркім збытага спадзеву.
Раджайнай глебе-пешчы — дар засеву,
пустэльнай злечы — згібель у агудзе.

О, не скарайся навальніцам грымным,
плыві да спыну смелым, непаўстрымным!
У віхрах пенных не паддайся звадзе.

О, ненаўвеце золата якойсьці
нязнанай выспы, а тваё Надойсце
шуканай волі ў славе і прасвядзе.

*1949*

## НА ЦІХІ БЕРАГ

На ціхі бераг ступіш асцярожна,
каб не нарушыць даўнага спакою.
Чароды ж думаў хлынуць талакою —
за далягляды палятуць трывожна.

То ж бо ў ваддалях жыць ім толькі можна,
дзе круг жыццёвы вірыцца ракою,
дзе пад палянай, сонечнай лукою
нябёсаў веліч зігаціць пабожна.

Дзень учарашні кануў за марамі.
Яго хацеў бы ацвяціць дарамі —
пярлістым скарбам знойдзенае волі.

Калі ж сустрэне заўтрашняе з сяння,
збудзіўшы ў росах ранняе світанне —
ён не адыдзе ў незварот ніколі.

*1949*

## ВОДДАЛЬ

Прачнешся воддаль з першым «ку-ка-рэ-ку»,
яшчэ сампоўнач. Досвітак не блізка.
Спакой сялібы. Ранняя адбліска
зары далёкай не замжыць павеку.

І адчуваеш вейную бяспеку:
высока ззяе празаранкі рыска,
і песціць долу зыбкая калыска
шляхі ў нябёсы птаху-чалавеку.

Ляце празорнай за гарой крутою
купацца ў сонцы, сябраваць з хадою —
абы да траваў дакрануцца босым,

па дабравесці — громе перуновым
як і ў маленстве, усміхацца новым
ліпнёвым краскам і купальскім росам.

*1952*

## СЛОВА

Яно паўстала на тваім пачатку,
было цяплейшым, найласкавым: «Ма-ма»...
Сціскала сэрца ўтратных зыкаў гама,
калі забралі і яго і татку.

Зрывала восень з дрэў, з палёў апратку.
Ступаў у безвёдзь — стрэла школы брама,
за ёй пабачыў: слова — цемры яма.
Святло блізкога ззяла толькі ўкрадку.

Пад перагасай штормаў, бураў, ветраў
расхрыстаў грудзі найглыбейшых нетраў —
жыццё пульсуе рытмам незмаўканым:

ад нівы хілай, стромага узвышша
шырэй гамоніць, больш узнёсла піша,
папеліць жахі вольных дум вулканам.

*1952*

## ЗМАГАРОМ НАРОДУ

Хай ваша слова вечна расцвітае
і будзе клічам да жыцця народу.
Яго гнялі ўсе — з захаду і ўсходу —
знішчалі поступ рупнага ратая.

Як поўнач сыдзе — новы дзень світае,
узысцем сонца весцячы пагоду.
Знаходзіць шчасце, дзіўную прыгоду
уцехаў зыркіх раніца святая.

Ваяўнікі вы лепшай, шчаснай долі!
Ваш дух крылаты негадзі адолеў,
аздобіў праўду пышнымі вянкамі.

Бязмежна ўзнёслых, вольных лётаў птахі
высока ўзнеслі духу краю гмахі —
пазамінулых і перад вякамі.

*1952*

## НАД СЛУЦКАМ ДНЕЕ

Над Слуцкам днее. Гасне ноч на зорах.
І з першым снегам вецер дзьме калючы.
Прастуе ўперад рыцар неўміручы,
за ім — нядрэмнасць вояў у дазорах.

Ён бачыць золак, чуе кажны шорах,
вітае ў думках сон прабудны Случы...
Абшар бязмежны і прастор нясплючы,
у вас не мае месца хіжы вораг.

Агні жывыя, іскры лістападу,
узлётнасць ваша не зазнала спаду.
За вас у муках рыцарскай дарогай

крывёй сцякалі, гінулі і мерлі,
каб вас навекі злыбеды не сцерлі,
каб вы свяцілі прыйшлай перамогай.

*1952*

## НЕ СПІШ СПАКОЙНА

Не спіш спакойна, мой далёкі браце,
як сполах ночаў, дні твае насталі.
Пад звон зялеза і пад скрыгат сталі
імкненняў пошуг прападае ў страце.

Без спыну ў доме, без начлегу ў хаце
капаеш долы, засяваеш далі.
Пад імі злыдні праўду пахавалі —
куеш навекі ім сваё пракляцце.

Непакананы жорсткаю пакутай,
перамагаеш змея мукі лютай.
І шлях паўторны да жыцця з цярпення

няволі злуду паліць перунамі.
З табой, са мною — крочыць поплеч з намі
паўтору-кругу змена-пакаленне.

*1952*

## ЛІСТ

На снежных землях поўначы халоднай,
сярод абтокаў, званых Салаўкамі,
дзе дні здаюцца доўгімі вякамі,
пад сэрцам носіш ліст ад маці роднай.

«Ратуй нас, Божа... У бядзе заўсёднай
не дай нядолю зносіць жабракамі...
Вярні мне сына...» — Злоснымі ваўкамі
жахаюць вочы варты падкалоднай.

Пайшоў на мукі, цемраю караны,
за словы праўды — пакліч неўстрыманы,
за водгук славы, сцертай ланцугамі.

Драбок найменшы ад крыві ахвярнай
не гіне кропляй, згубленай і марнай —
плыве раскутай волі берагамі.

*1952*

## ЗГОДА

Салодкіх песняў аб свабодзе, міры
ты чуў ці мала — іхнаму паўтору
няма і краю. Глянь з-пад гаю-бору —
на нівы лезуць жудасныя ўпыры.

Нібы ягняты, у жыццёвым віры
лісліва ўтораць шуму жыта-хору:
«Жыве між намі згода без дакору,
як вы, наш голас непадкупны, шчыры».

Сваймі вачыма з думкаю прадбачнай
не зычыш полю долі небарачнай.
Але расціна падпадае, звяне —

цішком спакуснік смокча з яе сокі.
А на трыбуне радыя прарокі
ёй весцяць шчасце, радасць, красаванне.

*1952*

## МАЛА

Спытаюцца ў цябе трыбуны масаў:
чаму маўчыш так шмат і творыш мала?..
У свеце хварбаў радасных і красаў

кальчэе з холаду зямная гала.
Ствары мелодыю вясны, музыка,
яшчэ й сыграй, каб маса не праспала

світання прыйсцьнага. Ды пальцы — смыка
і струн і скрыпкі не краналі здаўна.
Не вобразы ў суладнасці вялікай,

а злітыя ў адно — і флора й фаўна
твой зрок заслоньвалі. Цягнуў ты лямку
кавалка хлеба дзённага бясслаўна,

і біўся ў пазачыненую клямку
кавадла й молата, рыдлёўкі й кіркі.
Ты меў адну прызначаную рамку —

ублізь і ўдалеч, удаўжкі і ўшыркі —
мятлу, мяшкі з пшаніцаю ці соляй.
Згінаўся горб — і неба водбліск зыркі

не мог, пануры, ты разгледзець болей.
...Прыгнёблены і стомай, і змярканнем,
не цешаны дабром, хвалёнай воляй,

сядаў тварыць, іграць. Ды парываннем
цябе натхняла Муза неахвотна.
О, лепш было маўчаць з убогім граннем,

без сябры доўга плачучы маркотна,
без Бацькаўшчыны плачучы заўсёды...
Душа няўстрым пакутвала гаротна,

сузорны шлях да вышняй насалоды
шукаючы ў празмерлівым гарэнні.
Натуга сіл падужвала нягоды —

і захлыналася чуццё ў натхненні.
Ты йзноў сядаў. Сугучны хор бязлікі
гучэў у дыяментавым тварэнні.

Тады ў акрыленых руках музыкі
і скрыпка валадарна, думна грала.
Луналі з крышталёвых тонаў зыкі —

скупыя зыкі — іх было так мала...

*1952*

## II

## НА ЧЫСТЫМ АРКУШЫ

Александрыйскі верш! Ты пад рукой Максіма
гучнеў і ажываў — з табой жыла радзіма:
і ейны колішні, і ейны прыйшлы дзень,
нятускная краса і сіл зямных струмень.
І з імі ты не змоўк. А думка рвецца птахам
сягаць, ісці з табой праведна-знічным шляхам —
туды, дзе йшлі бацькі, куды йшчэ не дайшлі.

Не збіся ж, верны сын,— шмат зблытаў на зямлі.
Дык будзь, мой чуйны верш, прасвядай і спамогай.
Дарэмна не скажы і пра мяне самога:
«На чыстым аркушы, прад вузенькім акном
прыгожа літары выводзіць ён пяром...»

*1947*

## АДЗІНОЦТВА

Пазбаўлены ўсяго, цярпеннем сум падпершы,
знаходжу супакой — яго прыносяць вершы.
Глядзіцца слепа ў ноч халодных шыбаў шкло.
Мітужны каганец — і ўцеха, і святло.
Ды цемры акіян не можа кроплю гэту
майго агню ўтапіць. Чужы і вам, і свету,
не гасну я ў нудзе, у сценах небыцця —
наслань знямеласці не стне майго чуцця!
Яно знайшло ў сабе і дол, і шлях уласны —
над імі зазігцеў дзянніцы позірк ясны.
Развейваецца змрок. Займаецца зара.
Ідзі ж насустрач ёй — пара табе, пара!

*1947*

## НОВЫ ГОД

Штогоду — Новы Год. Надзей вякі наўкола.
Між іх твайго жыцця ўсё звужваецца кола.
Збыццё надзей за ім? О не — сляды няўдач!
А ў ім, як у вузле,— і боль, і сум, і плач;
і сыплюць шаць злыбед яны табе на скроні,
а ты — усёй душой — на водгульныя гоні,
дзе быў на золку дзён свет вечнасці, як дом,
і ў ім, нібы сам Бог, ты быў гаспадаром.
Цяпер ён — зроку даль. А для душы — бліжэйшы
парыў назад у свет — праўдзівы, найвышэйшы.
Яшчэ адзін парог — Сузорны Новы Год,—
Яшчэ адзін твой крок — да вечнасці зварот.

*1947*

## МАКСІМ БАГДАНОВІЧ

Далёка ад зямлі прадзедавых загонаў
ён песціў у душы гармонію паўтонаў.
Ды сэрца рвалася на волю, на прастор —
туды, дзе гуў лясун, шумеў спрадвечны бор,
і сон вадзяніка, і зорных ночаў лоні,
мінуўшчыны сляды, і коннікі Пагоні,
мадоннаў вобразы, случанкаў паясы.
О, васільковы край бязмежнае красы!
Адведаў шыр тваю — ды ёю дыхаў мала...
А вечнасць разам з ім цябе не пакідала,
і памятаць заўжды — апошні быў зарок,
а з ім — нясвяны дар — ацвецены вянок.

*1948*

## І СОНЦУ, І ВЯСНЕ

Не здрада гэта, не, і гэта — не каханне.
Чаму ж чакаем так натхнёнага спаткання
з табой, адданаю не мне, мной — не табе?
Калі ж той радасны, жаданы час праб'е,
мы падуладныя вышэйшым чулым тэмам
спяшаемся хутчэй у спеўны Mozarteum.
Там гімны йскрыпка шле і сонцу, і вясне.
Нялюдскі скача смык па ўзбуджанай струне.
Так Паганіні йграў. З Фларэнцыі азванай
плыве ягоны спеў валвою ўсхваляванай.
Ён не мінае нас і знойдзенай зямлі
з-пад Сожа і Дняпра, з-пад Нёмана і Вяллі.

*1948*

## СЯРОД ЧАРОЎНЫХ НІЎ

Спаткаўся я з табой, вясёлай і ўрачыстай,
сярод чароўных ніў Ламбардыі цвяцістай.
«Твая адзіная,— ты цешыла,— са мной:
пад вышыняй светласцяй, над пышнасцяй зямной.
Я з ёй, як ты, прыйшла з-пад неба — яснай сіні,
табой аспеванай, да йскрыпак Паганіні.
З валошкавых шнуроў, з пралескавых палян
прынеслі мы свой дар і ў песенны Мілан.
Лунаў там наш — твой спеў — нязмоўкны голас краю.
З ім слаўныя шляхі да знічнага бяскраю:
да водаў буйных тых, якімі ўсе плыты
вядуць да берагоў, адкуль і мы, і ты».

*1949*

## ЗІРНІ

Я не хачу сустрэць за цёмным акіянам
вачэй заморскіх юр ды іхным быць каханым.
Зірні, як пеніцца абшараў водных шквал,
слупамі ўзносячы пад неба грозны шал.
Нягода праміне — і студзенем падлёдным
утаймаваны гнеў замрэ у сне халодным.
І не ўзбудзіць яму прытоеных віроў
без буры лютае — хаўрусніцы вятроў.
А смутак вечны твой — той ціхі позірк зорны,
далёка ад цябе, згасанню непакорны,
у звабным харастве ўзыходзіць над парой,
лагодзіць пешчамі і свеціцца зарой.

*1949*

## СВЯТАЯ

(На матыў Р. М. Рыльке)

У полымі вайны народ марнеў ад спрагі,
сцюдзёнае вады нат з падарожнай плягі
ён і глынка не меў. Дзяўчына — стройны стан —
пайшла шукаць ваду, лячыць народ ад ран.
Праз спёку, едкі дым малітвы несла Богу,
і стому зносячы, прасіла ўсім спамогу.
Ды вось пагляд застыг на юнаку адным —
ён быў паранены. На твары маладым —
васкова-жоўты сцень, бяссілля выраз цьмяны.
Схілілася яна, перавязала раны,
прынесла ў прыгаршчах крынічнае вады.
Яшчэ вам доўга жыць, юнацкія гады.

*1949*

## І ХМУРНЫ ПАС РАДЗЕЕ

На Schafberg узыдзі. Зубчастаю калеяй
маленькі паравік паўзе ўгару далей — і
ужо ў вышынях ты. Пад шэрай ватай хмур
суседніх гор сцяна — нібы халодны мур.
Пад схіламі — вясна, і хмурны пас радзее,—
ты бачыш дол, прастор, блакітнае Mondsee
іскрыцца і блішчыць. А хвалі... Ці ж яны
не тыя блізкія журботныя ільны?
І вось, каб толькі знаў, і вось каб толькі ведаў
каротшы лёту шлях — адразу б іх адведаў.
Цяпер жа йзноў — уніз. Зубчасты тор ізноў.
Маленькі паравік разбудзіць з мройных сноў.

*1948*

## ЗВОН

Пад спёкай сонца дзень пры вечары растаяў.
А ты йшчэ не даплыў да ўцехі — да Гаваяў.
Ці ўгледзіш песняў дол, ці ўчуеш небны звон
зямное цішыні? Прываблены здавён
гамонкамі палёў і казкамі лясными,
твой позірк зігаціць абтокамі аднымі:
там травы — зык зямлі, ды рэкі — вадаграй,
там дрэвы — струнаў звон, ды краскі —
спеўны рай.

Там родзіцца, расце і там цвіцее тое,
што блізкае табе і песні маладое,
так знанае, як даў уцяміць Сам Спадар,—
нідзе няўтратнага жыцця твайго алтар.

*1949*

## ПАЛАДЫН

З дзядоў і прадзедаў — гады ў вякі наніжам —
спыніліся шляхі аж пад Паўдзённым Крыжам.
З ім верных пяць сяброў. А ты — зусім адзін.
Куды ж цяпер ідзеш, нясхільны Паладын?
Спакой вакол цябе. Не хочаш ты спакою.
Хто вольны — дужы той. Сцяжынаю цяжкою
ты прагнеш праставаць імкненню наўздагон —
туды, дзе йшчэ жыве драпежны мастадонт.
Пад стомаю ў руках не схіліш алябарду.
Ты з ёй нясеш любоў, нянавісць і пагарду.
Нянавісць — жорсткі скон ап'яненым крывёй,
любоў — для спрагненых бальзам вады жывой.

*1950*

## НАДЗЯМНЫМ

Ніяк няўсцешаны нязвыклым новым светам,
яшчэ ты не чаўрэў у сутарэнні гэтым,
дзе за халоднаю цаглянаю сцяной
папугу і кату, чымся табе са мной,
больш выгады й цяпла. Нямудрыя стварэнні
крычаць, пішчаць, няма спакою ў сутарэнні.
Газеты і лісты адхінены. Ты спіш.
І гасне каганец. Міргкі Паўдзённы Крыж
праз цёмнае акно, закутае у краты,
твой запалоніць сон. Не зведаеш ты страты:
тугі адлыне боль у забыцці адным —
яе Паўдзённы Крыж атуліць надзямным.

*1951*

## РАЗВІТАННЕ

Паставіла на стол букет вясновых кветак
і адышла. А я — твайго адойсця светак —
застаўся з горкаю, журботнаю думой;
ты без мяне, яна ж — дума — усцяж са мной:
навошта ты прыйшла у мой гасцінны хорам
не ўцехаю спавіць, а сціснуць грудзі горам?
Без сэрца і душы агнём сваіх вачэй
запаланіць змагла. Куды было б лягчэй
не ведаць цеплыні, што застаецца лёдам,
не песціць пустыша, што вырасце бясплодам;
не быць прывабленым адойшлым ад вясны,
не бачыць той букет — не польны, не лясны.

*1952*

## У АКІЯН

Ступіўшы на зямлю, імкнешся да ўзбярэжжа.
Ізноў у акіян твой плаў дарогу рэжа,
нібы спакон вякоў прапрадзедаў нарог
імкнецца`супачыць у пушчах, у барох.
У ўзбуджаным бары, ля шматгаліннай гушчы,
пад гоманам вятроў у ўсхваляванай пушчы
табе сам Архітэкт там дом пабудаваў —
цудоўны дом з імхоў, з кашлатых дрэў і траў.
Пад домам тым бруяць крыніцы надзямныя,
з зямлёй злучыўшы высь у сокі наліўныя.
Пры гэным доме — дуб, таполя, важны клён —
старая Грэцыя, найдаўны Вавілон.

*1951*

## СУМ

Агні ўзбярэжныя пагаслі за вадою.
На моры вусцішна. З маркотай і бядою
ты лепш мяне, зямля, навекі пахавай.
Маё апошняе, распачнае: бывай,
бывай, нязжытае буйное ўцехі ніва!
І ў струнах горычы збуджаецца шчасліва
яшчэ нястрачаны дзівосных зыкаў час.
Ты бачыш: твой маяк у цемры не пагас.
Як соладка ўва ўсім, чаго няма, знаходзіць
здаволле, хоць яно ўсуполь з нудой не ходзіць.
На моры — зваль віры. Між іх знайшоў спакой
нязнаны спыну сум — адзіны сябра мой.

*1951*

## ПРЫПЫНАК

Сардэчная хвала гасціннаму прыпынку!
Пабуду тут яшчэ прыемную часінку...
Прабачыш, ведаю, за мой даўгі пабыт.
Усцяж мне роіцца: ты ўцехаю спавіт.
У хораме тваім, у сонечнай святліцы
я ў рукі браў тамы з утульнае паліцы.
Чытаў, забыўшыся аб поўных зморы днёх
і аб усім благім, аб чым забыцца мог,
З зяленіваў зямных, з вышынных сіняў, беляў
тут гутарыў са мной разважлівы Longfellow.
Я з ім шчаслівы быў. І ў дзіўным свеце ўяў
пад сонцам Індыі душой супачываў.

*1952*

## У СВЕТЛЫ ДЗЕНЬ

У светлы дзень Пятра — у дзень твайго анёла
цвілі — прыгадваеш? — лугоў шнуры вясёла.
І песцілі палі спацехі мройнай сны,
намірг забыўшыся пра сполахі вайны.
Яна ж, няўмольная, падкошвала, таптала
вясёласць пешчаў-мрой. Цябе ў нязнанасць гнала.
Блакітныя ільны, мядзяныя жыты
усцяж пыталіся: — «Нас не пакінеш ты?» —
Ізноў той час. Туды, дзе дні спацеху снілі,
імчаць, нясуць душу твайго святога крыллі.
А з імі ўзносішся на ўзлёце лёгкім сам.
Ці адчуваеш ты? — ты там, ты толькі там.

*1952*

## СВЯТЛЯРНЫЯ АГНІ

Той вечар памятны — і ці ж ільга забыцца? —
у сэрцы і душы, святлеючы, агніцца.
Па бліскных клавішах узмахі рук стрункіх —
празвесцівы акорд пачуццяў парыўкіх.
Праменны рой высі — сузор'яў пералівы..
Удумлівы Шапэн, Рахманінаў чуллівы,
Бетховен, Вагнер, Бах, Чайкоўскі, Барадзін —
сягаў шматструнны зык да сонечных гадзін.
Гучацьме вечна ён над лёдам анямелым,
будзіцьме дрэму сну праменнем дзённа-смелым.
Ільды цямнярныя, святлярныя агні.
Руку сваю святлу, ажыўчасць, прасцягні.

*1952*

## У ІМ І ПА-НАД ІМ

Як люстра, магістраль. І аўты, і палацы.
Наўзбоч праходзіш ты без хаты і без працы.
І не спыняешся ля полыскных вітрын,
мінаеш засень дрэў, жывы зялёны тын.
Аркестра. Музыка. Трамбоны, трубы, флейты.
З кішэннай пусцінёй ад іх імкнеш далей ты —
у мройлівы прасцяг прывабных змалку зор,
ільсністы ад расы, блакітны ад азёр.
У ім і па-над ім — свой Моцарт і Сальеры,
свой Дантэ, свой Шэкспір. Да іх табе
усе дзверы
у ім адчынены... Далёкі бераг, порт
і блізкі сэрцу зык — найчулых струн акорд.

*1952*

## ЗАРА

Nature gives to every Time and Season
Some beaties of its own.[1]

*Dickens*

Дабрывечар, Зара! З каляднае ялінкі
цярушацца на дол пухнатыя сняжынкі.
Успыхваюць агні праменнем свечак-зор —
і гіне з цемраю нязгода і дакор.
З агнямі цёплымі Зары Святой Вячэры
узносімся і мы да тэй надземнай веры,
дзе неба, і зямля, і ён, і ты, і я —
пад Вышнім Спозіркам сугодная сям'я.
Душы злагодненай усцешанняў глыбокіх
стаюцца блізкімі пачуцці ўсіх далёкіх.
Апошняя свяча гарыць, як Прыйсце Дня,—
нявіннасць светлая, любоў і цеплыня.

*1952*

## ВОСЕНЬ

**(Р. М. Рыльке)**

Спадару Божа, час настаў: пара
сукрыцца ў сценях сонечным гадзінам,
пусціць вятры ў палі красы й дабра.
Дазволь жа йшчэ ў садох даспець пладом,
двума цяплейшымі даруй іх днямі:
няхай нап'юцца вышнімі дарамі —
салодка-цьмяным і густым віном.
Хто страціў дом — таму яго не мець.
Хто сам — самому й знаць тугі абладу:
пісаць лісты, не зводзіць з кніг пагляду,
не спаць, блукаць праз гай, адзеты ў медзь,
пад неспакойным віхрам лістападу.

*1948—1952*

---

[1] Прырода дае кожнаму часу і пары году некаторыя іхнія собскія прыгажосці. *Дзікенс*

## III

### ЧАЛОМ, ЧАЛОМ...

Чалом, чалом, слухмяныя актавы,
і рыфмаў звон, і спеў радкоў, чалом.
Скасіў мадэрн ажыўшых сокаў травы,
а кветкі іх назваў вялікшым злом.
Я з вамі йду пад полагам няславы,
дваццаты век вас выціснуў на злом
і на жанчын мужчынскія ўсклаў споднi
і пасадзіў саву на храм Гасподні.

*1947*

### НУ, ШТО...

Ну, што яшчэ? Зноў ліра заспявала?
Цяпер не спеў, а гром — суддзя й рашай!
Ты мёртвых строф — іх слова заняпала —
з імглы вякоў на смех не ўваскрашай.
І я маўчу. Спрачацца толку мала.
На ўсім жывым ліпіць сухі лішай:
людская порсць нікчэмства і звыроддзя —
апошні крык бязбожнага стагоддзя.

*1947*

### ПАКІНУЎ Я...

Пакінуў я шаблонны свет уплываў,
здалося мне — абшар цвіцеў зарой.
Да заваёў свайго героя вывеў —
змагаўся ён, стаяў за чын гарой.
Але пад клум прыліваў і адліваў
ён спарахнеў, аброс імхом, карой,
паставіў дом не з цэглы, а з картуны,
падзьмуў віхор — і ўвесь канец фартуны.

*1947*

## НЕ ЎСПАМІНАЙ

Маўчы, мой верш! Не ўспамінай эпохі.
Яна — патоп, і над табою — глум.
Ды як мінуць вось тыя ахі й охі,
той самы чын і той жа шум-бурум?
І як знайсці на ток зямлі хоць трохі
жывых слядоў, цвярозых вечна дум?
Няўжо чало пад тэй зялезнай каскай
больш не жыве ні яваю, ні казкай?

*1947*

## СЛУПЫ

Дарэмна вы на глыбах крыгалому
сваіх ідэй паставілі слупы.
Наплыў ільдоў саб'е іх, як салому
б'юць на таку зухвалыя цапы.
Хай з вас ніхто не рад учынку злому,
ваш грымны чын — бяздарны і тупы.
Самым сабе не знойдзеце вы броду.
Ну, чым яшчэ паслужыце народу?

*1947*

## НІШЧЫМ

Зусім нішчым. Сухі пясок пустыні
ваш ідэал. Мякіна — мозаг, кроў.
Пабачыў вас — на коўзкай лёднай строні
бязродны гурт скапычаных кароў.
Апошні раз у высь нябёснай сіні
ваш правадыр — ваш бык на скон зароў.
На баўтунох вы селі за квактуху,
курчат няма — вось ваша сіла духу.

*1947*

## АЛЬПЫ

З усіх бакоў пасталі вы, як сцены.
Не долу гладзь — граніт з усіх бакоў.
Гурмой гарбоў пад беллю снежнай пены
застылі вы, бы ў сівізне вякоў.
І не стрымаць — мой пошуг летуценны,
нібы арол — крылаты птах, з акоў
на волю мкне, — устрыбны ўздым пракуды! —
а вам стаяць, не рушыцца нікуды.

*1947*

## СПАКОЙ

Хачу цяпер ад клуму й каламесы
спакой знайсці для сэрца і душы.
А мой спакой — бы ветразь той бялесы:
ірвіся ў свет, не знай сляпой цішы;
пакінь зямлю — рубеж глухі, кумесы,
хвальшывы цвет на здраду не сушы
і не гнібей на зваленай калодзе,
а гімн спявай жыццёвай насалодзе!

*1947*

## АД ШУМНЫХ РЭК

Denn was der Mensch in seinen Erdeschranken
Von hohen Glück mit Götternamen nennt...

Goethe[1]

Ад шумных рэк і ад азёраў поўных,
пязнаная з магільна-зімным сном,
яна — узлёт у вобразах чароўных,
узнёсласць дум, акрыленых чуццём.
Без вас, без вас, астыглых і бяскроўных,
займаецца абуджаным агнём.
Я толькі з ёй. І ейнымі шляхамі
іду, яны — прызначаны не вамі.

*1948*

---

[1] Бо быў чалавек у ягоных зямных абмежжах
высокім шчасцем Боскім імём названы...

*Гётэ*

## СЦЮЖА

Збівае з ног раз'юшаная сцюжа.
У чоўне сноў і сонца не ўсплыло.
Цяпер не спіш, усё імкнешся дужа
ступіць на дол, ухутаны ў цяпло.
Навошта ж ты пра заўтра дбаеш, дружа,
калі ў цябе і сяння не было?
Надыдзе змрок — якраз, калі світае,—
і дагарыць надзея залатая.

*1948*

## SILENTIUM[1]

Молчи, скрывайся и таи
И чувства и мечты свои.
*Цютчаў*

Каму сказаць пра ўцеху ці пра мукі
праз неўгамон, праз тупат ідучы?
Не западуць тваіх пачуццяў ґукі
у немы гул прадоннае начы.
Не знай яго — не зведаеш прынукі,
не з ім ідзі на зніч свой — і маўчы.
Гаворыць той, хто моўчкі ў свет прастуе,
хто не маўчыць, адстаўшы, той — статуя.

*1948*

## ІДЗЕШ, ПЛЫВЕШ

Са свету ў свет ідзеш, плывеш і едзеш,
ступаючы ці ў першы новы свет.
А па-за ім у ґоры стогне недзе ж
той кут, дзе быў гаспадаром твой дзед.
Над шэраняй шляхоў бясконцых згледзіш
хаморны змрок і сонца ўсплеск — прасвет —
ты думаеш: акно — ці мо яшчэ не? —
у дзедаў свет — канец твайго мучэння.

*1948*

[1] Silentium *(лац.)* — «Маўчанне» — загаловак верша Ф. Цютчава, першыя радкі якога ўзятыя тут за эпіграф.

## ЗА ПОРТ САІД

За Порт Саід ты вырушыў мяльчастай
істужкай вод у далягляд руды.
На пострапе сцягой, даўно пачатай,
бітмо людзей вядзе пакут сляды
«Цветов и льда» няма. А «арапчата»?
«Не кинул им ты на ходу плоды?»
О не, о не! З ласункамі не борздкі
бяздомны шлях бязлітасны і жорсткі.

*1949*

## ПЕРАД ВЯСНОЙ

О. Афрыка! Крывіччынай была б ты,
каб Нёман быў твой паўнаводны Ніл,
я над табой спыніў бы лёт крылаты,
далей у свет сягаць не меў бы сіл.
Прабач за сум з мае далёкай хаты —
счарнелы жаль бусліных пругкіх крыл.
Перад вясной узнёслага адлёту
дай лёгкасць ім прасвяднага звароту.

*1949*

## НАДОЙСЦЕ ДНЯ

Калі мінеш сцямнелы ў спёцы Адэн,
надойсце дня спрадвесціць далячынь.
Без краю шыр задыміцца, як ладан,
і з водамі сальецца небасінь.
А там і свет, ніколі не разгадан,—
ружовы ўсход — пачатку сонца плынь.
І як не край зямлі за акіянам,
так не канец пязнанаму ў пазнаным.

*1949*

## УЗБУДАМ ХВАЛЬ

Узбудам хваль віраццa гнеўна воды
і пеняцца з распачай пад карном.
Куды плывеш? На час ці назаўсёды?
Каму, скажы, пакінуў сумны дом?
Нязнаных зор ты бачыш карагоды,
знаёмыя — пад акіянскім дном.
За Афрыкай з пяскамі залатымі
яны ў душы зігцяць тваймі святымі.

*1949*

## АКІЯН

Шуми, шуми, послушное ветрило...
*А. Пушкін*

Roll on, thou deep and
dark blue Ocean-roll...
*Byron*[1]

Шумі, шумі, мой ветразь паслухмяны,
хвалюйся ўсцяж, пануры акіян.
Залечыш мо на сэрцы болесць — раны —
па тэй зямлі, што завалок туман?
Я ёю быў, як ты, ускалыханы
і ўспоены. Навекі ёю п'ян.
Маўляў ты сам, неўсціхамір заўсёды,
я з ёй цяпер і дружны, і нязгодны.

*1949*

## ЗА ГОДАМ ГОД

Адыдзе ноч. І акіяну хвалі
расступяцца — пабачыш сонца ўсход.
Пад ім гады, на дне што векавалі,
гады надзей плывуць — за годам год.
Перад табой — няведамыя далі,
нязнёслыя дакучлівых нягод.
Яны ў чуцці акордаў волеграйных,
спатканых тут — на хвалях вод бяскрайных.

*1949*

---

[1] Каціся ты, глыбокі й цёмны акіян,— каціся...
*Байран*

## ПАЎДЗЁННЫ КРЫЖ

Цябе ніяк не надзіць сон суседаў.
Выходзіш зноў на построп. Зноў глядзіш:
адылі там — цікавасць Бог табе даў —
над позіркам гарыць, не гасне ўзвыш.
Сярод агнёў, якіх яшчэ не ведаў,
праменіцца і сам Паўдзённы Крыж.
Пад роўнікам шукай тае планеты,
дзе зноў над ім апынішся ўва сне ты.

*1949*

## У НОВЫ СВЕТ

У новы свет пад зорным небам новым
на хвалях дзён гады жыцця плылі.
І ветразі пад подыхам вясновым
спыніліся надвечар ля зямлі.
Пабачыў ты: над захадам барвовым
жаданыя свяцілы не ўзышлі...
Запальвай іх хоць у душы прачулай,
каб цемра-ноч навек не агарнула.

*1951*

## ЧАЎНЫ

*М. С. і А. К.*

Пры берагох Вяллі блакіднаводнай
спыніліся самотныя чаўны.
Мае сябры, за ўцехаю прыгоднай
без нас цяпер не паплывуць яны.
Калышуць іх пад зоркаю праводнай
усплескі хваль. А нашы мроі-сны —
ледзь толькі мы павекі прызачынім —
усё лятуць да іх прасторам сінім.

*1950*

## ЯК АКІЯН

Няўхільнага ты просішся згібення,
о свет, сабе не можаш рады даць.
Як акіян у ўсхваляванай пене,
не бачыш дня яскравую пастаць.
А па-за днём на сон у мяккім сене
ты прамяняў саломы жорсць, каб спаць.
А людзі? Ці ж на брыж прадоння людзі
збавення мур паставяць у заблудзе?

*1951*

## ЗОРЫ

Прыслухайся: да высяў клічуць зоры,
між іх і ў іх — і новы свет, і ты.
Пад імі — дол няўцешны, і суворы,
над імі — край святлярна-залаты.
І паўтары — не быў душою хворы
той пілігрым, што не спыніў ляты
да воддаляў, яшчэ нікім не знаных,
да здзейсненняў, бяздушшам не таптаных.

## У ЦІШЫНІ

У цішыні, на ўскраі ночы цёмнай
ты думаў шмат аб сённяшнім сваім.
Твая вясна пад жальбаю бяздомнай
і адцвіла, і знікла, быццам дым.
А ты з душой юнацкай і нястомнай
ідзеш у дні заўсёды маладым.
І ажыве — хай толькі сілаў стане —
вячорны змрок у заўтрашнім світанні.

*1951*

## ВАМ ХОЧАЦЦА

Вам хочацца раскошаў, выгад свежых,
і цёплых вод, і зыркага святла.
Маўляў, няма няслаўнае суцьмежы,
пара бядот у небыт адплыла.
Але ці з вас перасягнуў хто межы
узлётам дум — ад пня і да стала?
Імкнёны свет? Ці да яго ўзняліся?
Ці дараслі да ясназорнай высі?

## У ДОБРЫ ЧАС

У добры час — сустрэчаў свет цікавы —
адведаў я нясконччаны ваш дом.
Няхай у ім былі ўсяго дзьве лавы,
і лава ў ім няхай была сталом,—
я ад душы вам зычыў шчасця, славы
і келіх піў за вас, сябры, нагбом:
за ваш узлёт, уцехаю спавіты,
за кут бацькоў, у сэрцы не забыты.

*1952*

## ЗНІЧЫ

Малым дзічком ты быў у маладосці
і жыў між дрэў, між траў. Плыла рака.
Зігцела высь. Бязмежжа весялосці
гушкала свет на крылах ветрака.
Ці б не хацеў паўтору тэй любосці?..
Стырчма тырчыць шчаціннне ў вяпрука.
Ні сонца йшчэ, ні зоры йзноў, ні знічы
не вернуць больш нявіннай ранняй дзічы.

*1952*

## ШЛЯХ

...Green in Summer, white in Winter
Ever singing, ever singing.

*H. W. Longfellow*[1]

Усё ўздыхай, і мучыся, і енч аж —
адчуеш там садоў і ніваў спель.
Красой вясны зяленівасць увенчыш,
сагрээш ёй зімы сцюдзёнай бель.
Адзіны спеў — пабожна нізка ўкленчыш
жыццю свайму, усім — нязгіну хмель:
у гушчарох — у лесе і за лесам —
нязблудны шлях нясхільным Геркулесам.

*1952*

## КІТАЙ

Далёка жаль і «плач твой аб старонцы»...
Падзеяў том у неабмін лістай —
спыні пагляд на заўтрашняй балонцы:
стаіць, як мур, абуджаны Кітай.
Зноў свежы ліст — цяжэе том бясконцы.
І бачыш ты, спадар зямлі — ратай,
як паўстае з глыбіняў вірных мелеч,
а з сэрц малых, няскорных духам,— веліч.

*1952*

## НАЯВЕ

Я толькі йзноў цябе наяве ўбачу,
калі ўзляціш у высненую ўзвыш,
дзе больш няма ні жалю і ні плачу,
іскрыстым дзе агнём навек гарыш.
Перад святлом цямнейшую няўдачу
не ўваж канцом, хай з ёй — прадонна брыж:
твой навет лёс у Калыму й Камчатку
займанай быў зарой твайго пачатку.

*1952*

---

[1] Зялёны ўлетку, белы ўзімку,
вечна спеўны, вечна спеўны.
*Г. У. Лангфела*

## НАЎВЕЦЕ

Найноўшае напамяці, наўвеце:
і цішыня, і валадарны гром.
І балазе яно ў вадойшлым леце
свяжыла дол не спрышам, а вядром.
А ты? Няўжо пазнаў усё на свеце?
Ягоным ты ці быў гаспадаром?
У ім, старым, пры новым не рабі ты
замкнёны круг з ягонае арбіты.

*1952*

## КОЛА

І круціцца гісторыі ўсё кола,
у ім — адзін і той жа самы дзень:
узмах крыла вышыннага сакола,
за небасхіл прадонная карцень.
Высокі ўстрыб і нізкі звал. Наўкола
пазнай жыцця няўрымслівы струмень:
адведаць высь, вярнуцца ўдол — не спасці,
крылатым зноў радзіцца, не прапасці.

*1952*

## ІМКНІСЯ ЎСЦЯЖ

Імкніся ўсцяж на зніч нязгаснай веры
у ясны дзень, у твой світальны край.
Учора хай былі эпохі эры,
ды сяння ім без заўтра быць не дай.
У век шляхоў за межы стратасферы
твая душа узносіцца няхай
далей і прэч ад стоптаных надзеяў
да надзямных, нязгіну годных дзеяў.

*1952*

# З ВЕРШАЎ РОЗНЫХ ГАДОЎ

* * *

У жылах шчах крыві струмень
і скута сэрца болем войстрым.
Ізноў наперадзе сухмень
дарогаў нудных, прыкрых вёрстаў.

Як і раней, ізноў, ізноў
мяне чакае жах, нязнанасць.
Мо гэта звада трызных слоў,
мо імі я ў палон забраны?

Чаму так цяжка, цяжка мне?
Жывых не бачу і не чую.
На голых дошках у труне
жыву — і днюю, і начую.

«Цярпі!» — Мне кажуць. Я цярплю.
«Накрыем,— зноў мне кажуць,— векам,
пасля... апусцім у зямлю,
і там ты станеш чалавекам».

*Беласток, 5.7.1944*

* * *

Трамвай — даўжэзная, танклявая труна —
напханы трупамі людзей, бы селядцамі.
А з мяккай шэрані паднебнага руна
спадае долу дождж і ў шыбы б'е дубцамі.

Дол адчыняецца. Дарога ў цемру. Спрут
дратоў трамвайных, пэўна, шлях мой перапутаў.
Няўжо і я, як іншыя, халодны труп?
Няўжо не вырвацца мне з тагасветных путаў?

*Кёнігсберг, 9.7.1944*

* * *

Расцалаваў я алавік,
як той паэта — сакратаршу.
Хай я галодны — ён прывык
пісаць... А кішкі граюць марша.

Нясмела суну за парог,
а ў думках: — Мо і не прагоняць?
— Как раз спекли мы вам пирог! —
ламана кажа мне эстонец.

— Идите прочь! Мои сыны
на фронте бьются, вы... вы что же?..
...О, дзе ж вы, дзе вы, тыя дні,
калі я йшоў на стан варожы?

У летуценнях я ішоў
у бой за волю, за айчыну.
Наяве йду... за латышоў?
Мо за эстонцаў? Не! —
Лепш згіну

у чыстым полі пад кустом
без лусты хлеба, без табакі.
Абмые неба хай дажджом
і пахаваюць хай... сабакі.

*18.8.1944*
*Гедэмэстэ, Эстонія*

* * *

Бывай, Гэдэмэстэ, бывай,
апошні суворы прытулак!
Паеду, памчуся ў свой край —
ніхто так, як ён, не прытуліць.
Скарыся, шляхоў далячынь!
— Нязваныя, чую я — госці
у доме тваім. Супачын
рыхтуюць табе... на пагосце.—
— Не едзь! — мне скуголяць вятры.

— Сабакам і сукіным сынам
назваў цябе дом твой. Утры
слязу,— па табе там асіны
льюць слёзы.—
                    Ізноў хтось: — Чакай!
У доме — злачынец і вораг...—
Бывай, Гэдэмэстэ, бывай,
апошні прытулак суворы!
Хай шлях невыразны — пара
ступіць на яго.
                    Падзямелле
грукоча: — Што ж, майстра пяра,
хістаешся, сеўшы на мелі?
Прабач! За табою — штыхі,
зірні — сцень пагібелі блеклы.
Забудзься на дом — і шляхі
пабачыш ты выйсцьныя з пекла.
А потым — і рай.—
                    Што мне рай?
Мне ўсё, што не дом,— не прытулак.
Сцякае крывёю мой край —
цяпер нат і ён не прытуліць...
Бывай, Гэдэмэстэ, бывай!

*Гэдэмэстэ, Эстонія, 1944*

## СТАЎСЯ ЎСЮДЫ ГОСЦЕМ ВЫПАДКОВЫМ

Стаўся ўсюды госцем выпадковым.
Дзе не ступіш — ля чужых варот.
На дарозе ўбачыў я падкову,
а ляжыць яна наадварот.

У Еўропу з Азіі сабраўся,
не даехаў — выгналі назад.
Пэўна, спераду яшчэ бяда ўся,
бо падкова — перадам у зад.

Што мяне спаткае — невядома.
Непамысныя вакол сляды.
Ці назад, ці ўперад — ты не дома.
Словам — ні туды і ні сюды.

*Лібава, 1944*

## УСПАМІН

Зайсці і не застаць ані нікога дома,
вярнуцца ані з чым — ці ж гэта не знікома?
Хоць побач дні-сябры — гадоў-азёр кругі,
а ўсё-ткі па адным імкнуцца ў берагі.
Што сталася з табой, мой дружа адзінокі?
Мо гэтак, як і я, маркоты лічыш крокі?
Мо пад трамвайны звон у шуме гарадскім
успомніў раптам ты аб самым дарагім?
Вось вечарэе ўжо. І месяц невясёлы
прыйшоў сюды адтуль, дзе слёзна плачуць долы.
Ён быў там сёння ўдзень.
Як зноў пачне світаць —
о хоць бы з ім адным твой успамін застаць.

*1952*

# Сяргей Ясень

*Сяргей Ясень (Янка Запруднік) нарадзіўся 9 жніўня 1926 г. на Навагрудчыне. У 1944 г. выехаў у Германію. Цяпер жыве ў ЗША.*

*Друкавацца пачаў у 1947 г.*

## ЯШЧЭ АДНО

Колькі на этапах іх перажылося!..
Гэткіх цяжкіх... проста да знямогі.
З вераю, што сыдуцца дарогі,
Мы развіталіся, гэтак бо прыйшлося...

Не здолела маці ўдоваль наглядзецца,
Сын цяпер яшчэ ў душы цалуе рукі.
Развітальных слоў нямыя гукі
Ўсё яшчэ не сціхлі, нам здаецца.

А пад іх балючыя разлівы
З верай гэткай жа ў супольную дарогу,
Памаліўшыся, ля нашага парогу,
Нарастаюць новыя:
«Трымайся! Будзь шчаслівы!»

* * *

З апошняй зоркай ночка дагарае,
А ў дагаранні — свежы, новы дзень.
У сіні бор паплёўся сумна цень:
З апошняй зоркай ночка дагарае.

І сну напіўшыся, адсвежаны прамень
Ізноў хвалу Усемагутнаму зайграе:
З апошняй зоркай ночка дагарае,
А ў дагаранні — свежы, новы дзень.

## МУЗЫКА

Хваля думак...
Дні пражытыя? —
Не скажаш...
Што з табой?
Чаму раны, рубцамі пакрытыя,
Бруяцца дзіўною журбой?..
Дзе ты блукаеш? —
Па ўсіх мясцінах...
Мелодыя ціха віецца...
Маці,
сябры,
дзяўчына —
Часам незнаёмая,
мройна ўсміхнецца...
Жывеш у мінулым, хвалюешся, мроіш
І ціхай пяшчотаю сэрца напоіш.
Нешта плача ў табе —
мо душа? —
Сам не ў змозе.
Няхай... пашто сцішаць у салодкай
трывозе
Бязмежны сум,
натхненне,
радасць
І думак рой...
Што з табой?..

## ВУГЛЯКОПЫ

Змяшаўшыся з вуглём, ляглі
Глыбы цемрадзі — густыя, ліпкія.
Каменне моўчкі слязой усхліпвае, —
Мо жаліцца на штось зямлі?
І ціха, ціха, як...
Не! Ўжо рушыла!
Ускалыхнулася ў супакойным сне
цемрадзь.

Глядзі!
Вунь ідуць!
Гэй, хто там?
Чуеце?!
Чаго, двуногія, вы тут вандруеце?
Куды пячысцікі вас нясуць?!
А там, на невідомых хвалях,
Пераліваюцца то ўверх, то ўніз,
Плывуць гуськом адзін, другі,
І прыбліжаюцца з аддалі
агеньчыкі.
Не крычы: не спалохаеш —
У вочах іхных зацятасць свеціцца.
Жывой пілой у сцены ўрэжуцца
І задрыжыць зямля, завохкае.
І бязлітасна нутро
Старое зямлі крышыць —
Упорыста, без перадышкі
Дабіваецца ў ядро
сталь.
А ў рогаце дзвёх стыхіяў
Чуваць:
— Дзяўбі! Дзяўбі! — Адчыніцца.
Бо цяпер хто спыніцца,
Таму будуць вякі ліхія!
Першай сутычкі кончыўся гром.
На невідомых хвалях —
То ўверх, то ўніз —
замільгалі
І паплылі
адзін, другі
гуськом
агеньчыкі.
Змяшаўшыся з вуглём, ляглі
Глыбы цемрадзі — густыя, ліпкія.
Каменне моўчкі слязой усхліпвае, —
Мо жаліцца на штось зямлі?

*1948*

## І ТРЭБА Ж БЫЛО...

> Сёння Купала, а заўтра Ян —
> Будзе вам, хлопчыкі, усё ліха вам.
>
> *Купальская песня*

І трэба ж было здарыцца тады —
Пры вогнішчы яшчэ адзін агонь сустрэць:
Шчэ больш гарачы, палкі, малады...
І так згарэць!..

І каб адтуль! — з блакітных воч,
Такіх, як часам неба ўлетку...
І нанясло ж у гэну ноч
Знянацку так папасці ў сетку.

І трэба ж было здарыцца тады —
Адчуць пры вогнішчы агонь яшчэ адзін:
Шчэ больш бурлівы, пахкі, малады —
Агонь-язмін...

І каб адкуль! — з салодкіх губ,
З такіх, як з ліпаў мёд бывае —
Агонь, што дакране і зруб
П'янога шчасце вырастае.

Як папараці-кветкай, запаліць
Зарой вяснянаю жыцця гады...
І ўсё згубіць...
Эх, трэба ж было здарыцца тады!

*1948*

## ВОСЕНЬСКАЯ ПЕСНЯ

Падае лісце, падае з клёнаў
Музыкай жоўтай, сумам чырвоным.

Сцелецца лісце, сцелецца долам
Шчасцем мінулым, подыхам кволым.

Золата ўнізе, уверсе просінь —
Родзіцца песня, родзіцца ўвосень.

Ціхай малітвай, шэптам квяцістым
Сцелецца песня, сцелецца з лістам.

*1953*

# Анатоль Бярозка

*Анатоль Бярозка (Мацей Смаршчок) нарадзіўся на Брэстчыне (Ляхавіцкі раён). Па адукацыі — медык.*

*У 1944 г. выехаў у Германію. Цяпер жыве ў ЗША.*

*Выдаў кнігу паэзіі «Адзінаццаць вершаў» (1989) з паралельнымі перакладамі на англійскую мову.*

## АДЛЁТ ЖУРАЎЛЁЎ

Вераснёвае сонца гуляе
на іх крыллях — і ціха, тужліва
крыллі йграюць у ветры, моў струн пералівы,
над іржышчам пустым, над гаем.

Вольны покліч далёка нясецца
ў паднябесных сініх шляхох...
Там, далёка дзесь, родны астаўся парог —
асталося вернае сэрца.

І лятуць. А пад імі, з нямою малітваю,
засынаюць палі ў адзіноце...
А іх крыллі, сіняю залітыя,
вераснёвае сонца залоціць.

## ЛІСТ ДА МАЦІ

(пераклад з забытага)

На схіле восені дзён
к табе імкнуся у думах —
а думы не знаюць запынаў.
Хочаш — абое ў сутонні вячэрнім
ва ўсмешку твар,
як у бэзу пукі, ахінем...

Ты там, у вёсцы маёй убогай,
дзе восень залоціць кляны,
а ўранні туман
засцілае лугі ды папары;

ты прадзеш сваё горкае зрэб'е,
успамінаеш падзеі а дні,
калі выпіла горычы чару —
і мо плачаш: не вернецца сын
з далёкай дарогі...

А я тут, у месце чужым і далёкім
пад хмарным восені небам
ў мітусні парожняга дня
ды знясіллі дарэмных узлётаў,—
адзін, бязмоўна стаю
а ўдыхаю павевы зімы
і гляджу на лісцё, што пад вокнамі гіне,
і веру,
што усмешку маю
данясуць табе хмары.

* * *

Сягоння патухла тваё акно...
Ціхі вечар ізноў, як учора;
але сёння патухла тваё акно...

Гэтаксама неба начное глыбока,
гэтаксама іскрацца воды ў месячным ззянні
і нязменна хвалі цалуюць пясок
і хіляцца вербы над ціхай Вяллёю;
гэтаксама вецер шасціць ў аерах ды лозах
і свецяцца зоры — сягоння, як учора.

Сярод россыпі вокан
патухла толькі адно.
Дык чаму ж зашчаміла мне сэрца журба
адзіноты бяздонием,
ды чаму на грудзёх цяжкі камень улёгся
з балючым дакорам?

Ад далёкага лесу — ад цёмнага бору
песня чуецца дзесьці далёка-далёка...
А ці песня аб шчасці і долі?
А мо папараць-кветка мая расцвітае ды вяне?

Ў гэты вечар патухла тваё акно;
з ім яшчэ адна кволая іскра, што грэла мяне,
датлела ў цемры сягоння...

Вецер вербы цалуе; аеры шумяць над вадою...
Сярод россыпі вокан
патухла адно...

* * *

Поле, далёка — шырокае поле... І неба над полем
сіняе... Неба бяздоннае... Шолах вячэрніх палёў
ціхі, як песня з грудзей набалелых, што з ветру
парывам
па струнах вечару ймкне... І слухаюць нівы...
Гэта песня, што полымем пеніць кроў —
гэта песня аб волі!

Там — магілы дзядоў
пад крыжамі пахілымі дрэмлюць —
здзірванелая спадчына сівых вякоў; як чорныя раны
ўеліся доўгія цені крыжоў у шэрую зямлю,
ўпалі на жоўць пяску, ўкрылі траву пад сабою
чорным сумам...

Гэтта, на гэтых курганах
вякамі здабычу дзялілі чужыя багі а цары
і крывавыя іх алтары
дыміліся доўга — нашай крывёю.

За полем хаты. На стрэхах мох абвіс зялёны;
звіслі стрэхі над хатамі. Неба вячэрні пажар
палымее на шыбах чырванню. Сцелецца цень па загонах,
рабска паўзе па зямлі... Моў халодная сталь,
грудзі зямлі халодныя... Вецер ад родных хат —
развее мо гора?

Хаты — бедныя, цёмныя... Пад вашымі стрэхамі соннымі
сэрца маё вашай доляй жыве, вашым болем сумуе...
Вечар пад стрэхамі сніць сваю думу-тугу векавую —

з думай-песняй ад хатаў шырока-разгоннаю
вечар, сэрца, магілы і поле злілося ў адзін псалм —
Крывія!

І моляцца сонцу разоры —
сонцу, што ўжо дагарае на шэрым попеле хмар.

* * *

Тысячай воч палымяных, распаленых цемрай начною,
неба ўпілося ў зямлю; і на цяжкія скібы раллі
зорныя бляскі упалі; і плоймай злавесна-нямою
чорна у чорных баразнах цені ліхія ляглі.

Ноч шапталася з ветрам... За полем шырока ўзараным
шэрыя хаты, бедныя стрэхі ў знямозе паснулі;
ў стрэхі неба ўпілося ззяннем зор палымяных...
Ноч шапталася з ветрам... Так ціха... Не чулі
сонныя стрэхі пахілых хат; закарэлыя рукі;
бо цяжкі мазоль тых рук, як цяжкія скібы раллі;
чорная доля, як чорны хлеб... У ёрмы прынукі
доўгіх вякоў ланцугі волатаў моц упраглі.

Тысячай воч палымяных неба ўпілося ў баразны,
ў ціхія хаты... ў жорсткія рукі... ў чорны іх хлеб і ў соль.
Шэрыя хаты, цвёрдыя рукі — маўклівы і грозны:
гэтак ціха маўчаць умее толькі магутны боль.

* * *

Абяздолены мой стромы шлях
аніколі не давёў мяне да шчасця —
і трывога тоіцца ў грудзях,
каб бясследна не прапасці.

І кляну я горкі лёс ліхі,
і напружваю ў знямозе сілы...
Ці ж вядуць мае самотныя шляхі
да забытае, бяскрыжае магілы?

## ЗМЕСТ

*Барыс Сачанка.* Вяртанне дадому . . . . . . . . . . . 5

### *Наталля Арсеннева*

Між берагамі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10

#### ПАД СІНІМ НЕБАМ
1920—1927

Пад сінім небам . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
«Сонца вяснянае ў золаце косаў»... . . . . . . . . . . 11
Летуценні . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
Крыніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13
Калі людзі пакрыўдзяць цябе . . . . . . . . . . . 15
Восень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15
Калі ноч запануе . . . . . . . . . . . . . . . . 16
Ночы й думкі . . . . . . . . . . . . . . . . . 17
Вясна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18
Пралескі . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18
Май . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19
Восень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 20
Восень у Вільні . . . . . . . . . . . . . . . . 21
«Светлы дзень дагараець над сумнай зямлёю...» . . . . . . 21
Лес шумеў . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22
Ціха плыў месяц . . . . . . . . . . . . . . . . 23
«Ночкай сягоння мне ў самыя вочы...» . . . . . . . . . 24
Люблю я сонца залатое . . . . . . . . . . . . . 25
Красавік . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26
Сыплюцца з клёнаў лісты . . . . . . . . . . . . 26
Толькі ўчора . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
Увечары . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
Перад ночай . . . . . . . . . . . . . . . . . 28
«У небе палаюць чырвоныя хмары...» . . . . . . . . . 29
Шэпты ночы . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
Па матыў хаўтурнага маршу . . . . . . . . . . . . 30
Недасяжнае . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
Мэта жыцця . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
Жыццё . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32
Шчасце . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
Калыханка . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
Снег падаў . . . . . . . . . . . . . . . . . 34
Развітанне . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
Родны край . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
Вячорны абразок . . . . . . . . . . . . . . . 37
Вячорнаю парою . . . . . . . . . . . . . . . . 38

Пытанне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38
Уначы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 39
На сенажацi . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
Улетку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
Увечары . . . . . . . . . . . . . . . . . . 41
Васiлькi . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 41
Ноч . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42

## ЖОЎТАЯ ВОСЕНЬ

1927—1937

Жоўтая восень . . . . . . . . . . . . . . . . . . 43
Каб крылы... . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44
Iшла вясна . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44
Узноў вясна . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
На парозе . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
Яшчэ адна вясна . . . . . . . . . . . . . . . . 46
Смяялася ў вочы вясна . . . . . . . . . . . . . 46
Першы снег . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47
Туга . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47
Часта ўвечары . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
Тае вечар . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
Калi . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
Запалiлi каштаны . . . . . . . . . . . . . . . . 50
Вячорная мiстэрыя . . . . . . . . . . . . . . . 51
Паралель . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 51
Завея . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
Новая зiма . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
Цiша . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
Вечар . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
Вячорная часiна . . . . . . . . . . . . . . . . 55
Ноч . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
Прывiды . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
Хаценнi . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57
Вясёлка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57
У задушкi . . . . . . . . . . . . . . . . . . 58
Вясновая калыханка . . . . . . . . . . . . . . 59
Восень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
Незгаданае . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
Увосенi . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
Места . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 61
Зiмовая ноч . . . . . . . . . . . . . . . . . 61
Зiмою . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
Зоры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63
З восеньскiх настрояў . . . . . . . . . . . . . 63
Асеннi вечар . . . . . . . . . . . . . . . . . 64
Восень у гаi . . . . . . . . . . . . . . . . . 64
Часiны творчасцi . . . . . . . . . . . . . . . 65
Асенняя элегiя . . . . . . . . . . . . . . . . 65
Прызабытае . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
Фестываль . . . . . . . . . . . . . . . . . . 67
Калi скончыцца дзень . . . . . . . . . . . . . 67
Вячорны абразок . . . . . . . . . . . . . . . . 68
Ночныя гадзiны . . . . . . . . . . . . . . . . 68
Хворая восень . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
Асеннюю цiшай . . . . . . . . . . . . . . . . 69

Лебядзіная песня . . . . . 70
Месяц . . . . . 71
Напрадвесні . . . . . 71
Ноч . . . . . 72
Ахрысціў мяне нехта ў зялёнай дуброве . . . . . 73
Паэт . . . . . 73
Заміж мяне . . . . . 74

## СЯГОННЯ
1941—1943

Сягоння . . . . . 75
Пясняр . . . . . 76
Асенні вецер . . . . . 76
У сонечны дзень . . . . . 77
Асенняя дарога . . . . . 78
Толькі ўвесну . . . . . 78
Не хочацца . . . . . 79
Спарышы . . . . . 80
Калі . . . . . 81
Пасля буры . . . . . 82
З выраю . . . . . 82
Кроплі золата восень губляе . . . . . 83
Ткалля . . . . . 84
Перад бурай . . . . . 85
Маладзік . . . . . 86
Жыве Беларусь . . . . . 87
Малітва . . . . . 88
Салаўі . . . . . 88
З камарынай песняй . . . . . 89
Куды? . . . . . 90
Вечар у Вільні . . . . . 90
Моўчкі ночы сузор'ямі капаюць . . . . . 91
Перажытае . . . . . 92
Песня . . . . . 92
Асенні холад . . . . . 93
Дысананс . . . . . 94

## НЕ АСТЫЦЬ НАМ
1944—1949

Без песні жураўлінай . . . . . 96
Уночы . . . . . 97
Сустрэча . . . . . 97
Уцекачы . . . . . 98
Сівой вярбой . . . . . 99
Здагонім сонца . . . . . 100
Снежань на чужыне . . . . . 101
Жыццё . . . . . 102
Рабіна . . . . . 103
Забудземся . . . . . 103
Пачакай! . . . . . 104
Ноч . . . . . 105
Буду сяння . . . . . 106
Лявоніха . . . . . 106
Першы снег . . . . . 107

Я — пішу . . . . . . . . . . . . . . . . . . 108
Дождж . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
Маці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
Восеньскае. . . . . . . . . . . . . . . . . . 110
Ён дайшоў . . . . . . . . . . . . . . . . . 110
І сніцца мне . . . . . . . . . . . . . . . 112
Снежань . . . . . . . . . . . . . . . . . . 113
У гасподзе Падуанскай . . . . . . . . . . . . 114

## НА РОСТАНЯХ

Развітанне . . . . . . . . . . . . . . . . . 116
А бераг далёка . . . . . . . . . . . . . . . 117
Зоры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 118
Тут гэтага няма . . . . . . . . . . . . . . 118
Знаю . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 119
Першая восень . . . . . . . . . . . . . . . 120
Тут гэткае завуць зіма . . . . . . . . . . . 120
Вясна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 121
Мелодыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . 122
Ізноў восень . . . . . . . . . . . . . . . . 123
Спякота . . . . . . . . . . . . . . . . . . 123
Вусціш . . . . . . . . . . . . . . . . . . 124
Асеннія лісты . . . . . . . . . . . . . . . 125

Я й жыццё

Я чалавек . . . . . . . . . . . . . . . . . 125
Гары, Заход! . . . . . . . . . . . . . . . . 126
Мой скарб . . . . . . . . . . . . . . . . . 127
Няма калі . . . . . . . . . . . . . . . . . 127
Залатое . . . . . . . . . . . . . . . . . . 128
Гадзіннік . . . . . . . . . . . . . . . . . 129
Праўда . . . . . . . . . . . . . . . . . . 129
Дзіўлюся я сама . . . . . . . . . . . . . . 130
Майму жыццю . . . . . . . . . . . . . . . 131

Яны усцяж са мной

Алярм . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 132
Дваццаць . . . . . . . . . . . . . . . . . 133
Плач . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 133
На элегійны лад . . . . . . . . . . . . . . 133
Месяц . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 134
Малачай . . . . . . . . . . . . . . . . . . 135
Імкні, цягнік . . . . . . . . . . . . . . . 135
Ліст . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 136
На сцежцы . . . . . . . . . . . . . . . . . 137
Так проста . . . . . . . . . . . . . . . . 138
«Акцыя» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 138

Прыйдзе час і на песню

Хоць вясна . . . . . . . . . . . . . . . . . 140

Не здрадзім

О, шыпшына мая, Беларусь! . . . . . . . . . . 141
Жылі мы й будзем жыць . . . . . . . . . . . 142
Калі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 143

Ледзь красавік
Вясна на бруку . . . . . . . . 144
Магнолія . . . . . . . . 144
Цвіці, вясна . . . . . . . . 145
Вера . . . . . . . . 146

Аджытае (Марыльчын год)
Вясна . . . . . . . . 147
Лета . . . . . . . . 147
Восень . . . . . . . . 148
Зіма . . . . . . . . 149

Брамы
Няёмка мне . . . . . . . . 149
Альфа й Амега . . . . . . . . 150
Самотныя . . . . . . . . 151

Прывіды
Заміж прадмовы . . . . . . . . 152
Вежа . . . . . . . . 153
Завулак . . . . . . . . 153
Дамок . . . . . . . . 154
Сад . . . . . . . . 154
Увесну . . . . . . . . 154
Узбярэжжа . . . . . . . . 155

Узноў
Жаўцее ліст . . . . . . . . 155
Восені . . . . . . . . 156
«Хто ж мне, як не ты, разгарнула...» . . . . . . . . 156
«Ёсць дзіваў так шмат на свеце...» . . . . . . . . 157
«Дык як тут не жыць мне табою...» . . . . . . . . 157
Гэтак будзеш ты мной . . . . . . . . 157
Не першыя . . . . . . . . 158
Адвітанне . . . . . . . . 160
Час — не час . . . . . . . . 160

Тэма вясна
Вырaі . . . . . . . . 161
Сон . . . . . . . . 162
Першыя краскі . . . . . . . . 164
Дабранач! . . . . . . . . 164
Тваё імя . . . . . . . . 166
У ганчарах . . . . . . . . 167
Каб не маці . . . . . . . . 167

***Вінцук Адважны***

Хто ён? . . . . . . . . 170
Зязюлька . . . . . . . . 172
Пераніcь у вёсцы Луконіцы 1921 г. . . . . . . . . 172
Зубры . . . . . . . . 175
Свінні . . . . . . . . 177
Наш Мядзведзь . . . . . . . . 177
Каток — мамін сынок . . . . . . . . 178
Жабы . . . . . . . . 179

Сабачая мова . . . . . . . . . . . . . . . . . . 180
«Кукурузнік» . . . . . . . . . . . . . . . . . 181
Дзіва . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 181

## *Алесь Смаленец*

На форце . . . . . . . . . . . . . . . . . . 184
Прад атакай . . . . . . . . . . . . . . . . . 184
Зрання ў акопах . . . . . . . . . . . . . . . 184
На старой дзялянцы . . . . . . . . . . . . . 185
Расстрэл . . . . . . . . . . . . . . . . . . 185
Жонцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 186
Будка 175 . . . . . . . . . . . . . . . . . . 186

## *Алесь Змагар*

Бывай, Радзіма . . . . . . . . . . . . . . . 188
І ніяк яе не разлюбіць . . . . . . . . . . . . 188
Шапаціцца . . . . . . . . . . . . . . . . . 189
Штодзень . . . . . . . . . . . . . . . . . . 189
Не змагу . . . . . . . . . . . . . . . . . . 189
І гады мінаюць за гадамі . . . . . . . . . . 190
Мроі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 190
«Куды б цябе лёс ні закінуў...» . . . . . . . . 190

## *Рыгор Крушына*

«О, слова салодка-хмялёвае...» . . . . . . . . . . 192
Апошняя растань . . . . . . . . . . . . . . 192
Адвячоркам . . . . . . . . . . . . . . . . 193
Да цябе, дарагая . . . . . . . . . . . . . . 194
Усюды дарогі . . . . . . . . . . . . . . . 194
Катрынка . . . . . . . . . . . . . . . . . 196
У засмучаных эмоцыях . . . . . . . . . . . 197
Пасля працы . . . . . . . . . . . . . . . . 197
Белая нявіннасць . . . . . . . . . . . . . . 199
Гэтак часта . . . . . . . . . . . . . . . . 200
Здань вясны . . . . . . . . . . . . . . . . 201
Настальгія . . . . . . . . . . . . . . . . 201
Згадка . . . . . . . . . . . . . . . . . . 202
Родныя гукі . . . . . . . . . . . . . . . . 203
Прысадамі . . . . . . . . . . . . . . . . 203
А тут інакш . . . . . . . . . . . . . . . . 204
Прыдарожны куст . . . . . . . . . . . . . 205
Хатні сыр . . . . . . . . . . . . . . . . . 205
«Мастацкае слова...» . . . . . . . . . . . . 206
«У Слуцку смачныя ігрушы!..» . . . . . . . . 207
«Пад акном стокрылы клён...» . . . . . . . . 207

## *Хведар Ільяшэвіч*

«Даўгая астрожная ноч...» . . . . . . . . . . 210
«Чуе сэрца, што не нмога...» . . . . . . . . . 210
«Годзе песні пяяць аб нудзе!..» . . . . . . . . 211
«Хмары чорныя звіслі над намі...» . . . . . . . 211
«Беларусь ты мая расспяваная!..» . . . . . . . 211
«Вуліцы! Вуліцы! Вуліцы!..» . . . . . . . . . 212

«Па вёсках Беларусі...» . . . . 212
«Колерам ціхае роспачы...» . . . . 213
«Кладуцца на бруку і сценах...» . . . . 213
«Зацвітай, родны край, зацвітай!..» . . . . 214
«Цягнікі і станцыі...» . . . . 214
«Ноч ужо. Я не сплю...» . . . . 215
Расшумеліся ветры... . . . . 216
Дзень павіс шэрай хусткай . . . . 216
Цымбалы . . . . 217
Нехта стаў за акном і маўчыць . . . . 218
«Ашалелы вецер на прасторы свішча...» . . . . 218
Сябрам . . . . 219

## *Уладзімір Дудзіцкі*

На парозе турмы . . . . 222
А ратунку не было й няма . . . . 222
Пакуль песня яшчэ не спета . . . . 223
Блакіт вачэй . . . . 224
Жыві . . . . 224
Гады крылатыя . . . . 225
Не зракуся . . . . 225
Была восень . . . . 226
Хай пеніцца віно . . . . 227
Каб хоць раз усміхнулася шчасце . . . . 227
Пякельны дар . . . . 228
«Не першы раз і не апошні, мусіць...» . . . . 228
Адменная ода . . . . 229
Даты і іксы . . . . 230
Ні маністаў, ні зораў . . . . 231
Вусны і песні . . . . 232
Далей і далей . . . . 233
Няпослуху дзівацкага сакрэт . . . . 234
Ля берагоў крывіцкае Нямігі . . . . 234
Кавалачак неба . . . . 235
Грахі . . . . 235
Пракалоліся вочы жалю . . . . 236
Шлях . . . . 236
На скрыжаванні . . . . 237
Для несмяротнай Беларусі (З паэмы «Маіх уяў ружовых ранкі») . . . . 238
Чорная карта . . . . 240
Я не ведаю, дзе ты... . . . . 240

## *Янка Золак*

Мая малітва . . . . 244
«Я пасею песні...» . . . . 244
«Часам стане сумна дужа...» . . . . 245
Пароша . . . . 246
Жаўрук . . . . 246
Гады прамінаюць . . . . 247
Мазалі . . . . 248
Я не паддамся трывогам . . . . 248
«Як шалёныя ў пене коні...» . . . . 249
Сэрцу . . . . 249
Сум па Радзіме . . . . 249

Каму паскарджуся . . . . . . . . . . . . . . . 250
Раманс . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 250
Васілёчкі . . . . . . . . . . . . . . . . . 251
Сустрэча з земляком . . . . . . . . . . . . . 251
Два казлы. Байка . . . . . . . . . . . . . . 252
Над Случчу . . . . . . . . . . . . . . . . . 252
Крылатае сэрца . . . . . . . . . . . . . . . 253
Вятрыска з радзімай краіны . . . . . . . . . 254
«Залатой пшаніцаю спелі мае крозы...» . . . . . . . 254
Ода маці . . . . . . . . . . . . . . . . . 255
Каля рэчкі Лані . . . . . . . . . . . . . . 255

Наша мова. Акраверш

Мая Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . 258
Маці мая — Беларусь . . . . . . . . . . . . . 260
На чужыне . . . . . . . . . . . . . . . . . 260

## *Уладзімір Клішэвіч*

Званы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 262
Васілёк . . . . . . . . . . . . . . . . . . 262
Жураўлі . . . . . . . . . . . . . . . . . . 263
Гусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 263
«Мне ў няволі жыццё падаела...» . . . . . . . . . 264
Ліст з Сібіры . . . . . . . . . . . . . . . 265
Адказ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 266
Трыялет . . . . . . . . . . . . . . . . . . 267
«Ой, чаму ў вас, тужлівыя ліпы...» . . . . . . . . 267
Канцона . . . . . . . . . . . . . . . . . . 268
Актава . . . . . . . . . . . . . . . . . . 268
«Слёзы ліліся з вачэй на чужыне...» . . . . . . . . 268
«Праміпуць учора дзён суровых слякаць...» . . . . . . 269
Жыццё . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 269
Вечар . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 270
«Цэлы вечар думаю без мэты...» . . . . . . . . . 270
Век наш страшны . . . . . . . . . . . . . . 271
«Быў і я маладым калісьці...» . . . . . . . . . . 271
«Лямпа гарыць на стале...» . . . . . . . . . . . 272
Трыпціх . . . . . . . . . . . . . . . . . . 272
«Ад жаху кроў у маіх жылах стыне...» . . . . . . . 273
«Лягу спаць, толькі мне не спіцца...» . . . . . . . 273
Возера . . . . . . . . . . . . . . . . . . 274
Развагі . . . . . . . . . . . . . . . . . . 274
«Навошта я пішу, хто мае ў тым патрэбу?..» . . . . . 275
У дзень нараджэння . . . . . . . . . . . . . 275
«Хочаш плач ці душыся ад смеху...» . . . . . . . . 276
«Змаўкаю я, знікае голас слова...» . . . . . . . . 277
«Дзе толькі не стагналі мы!..» . . . . . . . . . . 277
Грэцыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . 277
Смерць Сакрата . . . . . . . . . . . . . . . 278
Рым . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 278
Час . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 279
Захад сонца . . . . . . . . . . . . . . . . 279
«Што на свеце людскія ахвяры...» . . . . . . . . . 280
«Цішыня над вадою нямая...» . . . . . . . . . . 280
Чалавек . . . . . . . . . . . . . . . . . . 281

У вырай . . . . . 281
«З табою мы заўсёды неразлучна...» . . . . . 281
Белая кветка . . . . . 282
Залатая восень . . . . . 283
Сцягач . . . . . 283
Дантэ . . . . . 284
Фантазія . . . . . 284
Смутак па Радзіме . . . . . 284
Родны край . . . . . 285
«Шумяць ад ветру кіпарысы ўсцяж...» . . . . . 285
Маці-Беларусь . . . . . 286
«З дрэва гук праляціць аднатонна...» . . . . . 286
Конь . . . . . 286
Папярэджанне . . . . . 287
На чужыне . . . . . 287
«Кідай, паэт,— а то душа астыне...» . . . . . 288
Трыялет . . . . . 288
Старасць на чужыне . . . . . 289
«Ніхто ў мяне маці...» . . . . . 289
«Ты не пытай аб лёсе...» . . . . . 289
«Як гублялася ў цемры дарога!..» . . . . . 289
«Віхры смерці ляцелі ў абдымкі...» . . . . . 290
«Запавет на чужыне такі...» . . . . . 290
Лос-Анджэлес . . . . . 290
«Дарогі мяне прывялі...» . . . . . 291
Мінск . . . . . 291
Хатынь . . . . . 291
Сябрам . . . . . 292

## *Масей Сяднёў*

«То ўскрэсне, то запаліцца, то згасне...» . . . . . 294

На досвітку

Пастушка . . . . . 295
Адзінства хараства . . . . . 295
Хвала вясне, дажджу і грому . . . . . 296
Жаданне . . . . . 297
Сосны . . . . . 298
У дарозе . . . . . 298
Хутчэй, зара! . . . . . 299
Не і так . . . . . 299
Маё хуліганства . . . . . 300
З народнага ладу (вяселле) . . . . . 301
Жыццё . . . . . 302
Снегапад . . . . . 302
Просьба . . . . . 303
Домік у Мінску . . . . . 303
Маленства . . . . . 304
Развітанне з летам . . . . . 305
Прадчуванне . . . . . 306

Патушаныя зоры

Жах . . . . . 306
Уночы . . . . . 307
«Жудка. Цемень мне сэрца гняце...» . . . . . 307

«Затуманілася даль...» . . . . . . . . . . . . . . . 308
«Хадзіў я ў пустыні і ціхім і сумным...» . . . . . . . 308
Зманліваець . . . . . . . . . . . . . . . . . 309
Жыццё . . . . . . . . . . . . . . . . . 310
«Хацеў бы ўзяць цяпер я посах...» . . . . . . . . . 310
Таварышом . . . . . . . . . . . . . . . . 311
Крывічом . . . . . . . . . . . . . . . . . 312
Здрайцам . . . . . . . . . . . . . . . . . 313
«Мусіць больш не маючы нічога...» . . . . . . . . . 313
Маім бацьком . . . . . . . . . . . . . . . 314
Да песняў . . . . . . . . . . . . . . . . 315

На маршрутах

Інвалід . . . . . . . . . . . . . . . . . . 315
Усцешаныя геніі . . . . . . . . . . . . . . 316
З «Гістарычных датаў» . . . . . . . . . . . . 316
Цяжкі адказ . . . . . . . . . . . . . . . . 317
Страх . . . . . . . . . . . . . . . . . . 318
Вайна цішыні . . . . . . . . . . . . . . . 319
На спынку . . . . . . . . . . . . . . . . 319
Жабраку . . . . . . . . . . . . . . . . . 320
Прага . . . . . . . . . . . . . . . . . . 320
Дарожныя ўражанні . . . . . . . . . . . . . 321
«Вёрсты шлях мой далёкі накрылі...» . . . . . . . 322
Снежань . . . . . . . . . . . . . . . . . 322
Майму начному сябру . . . . . . . . . . . . 323
«Я хачу, каб мне жыццё, пягоды...» . . . . . . . . 324
Над морам . . . . . . . . . . . . . . . . 324
З недасланых лістоў . . . . . . . . . . . . . 325
Развітанне . . . . . . . . . . . . . . . . 327
Сінія вочы . . . . . . . . . . . . . . . . 327
Хусцінкі . . . . . . . . . . . . . . . . . 328
Дарогі . . . . . . . . . . . . . . . . . . 329
«Я думаў, што гарэць, нібы на ветры, мне даволі...» . . . 329
Раман . . . . . . . . . . . . . . . . . . 330
Кляштар . . . . . . . . . . . . . . . . . 330
Стрыманасць . . . . . . . . . . . . . . . 331
На пляжы . . . . . . . . . . . . . . . . . 331
Асеппленасць . . . . . . . . . . . . . . . 332
Сум . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 332
«Едзеш ты. Ці ж магчыма?..» . . . . . . . . . 333
«Будзь мне ты ўсім...» . . . . . . . . . . . . 333
Як малітва . . . . . . . . . . . . . . . . 334
Маленькая просьба . . . . . . . . . . . . . 334
Вечар . . . . . . . . . . . . . . . . . . 335
«Даўно агні патухлі ў вокнах...» . . . . . . . . . 335
Радасць . . . . . . . . . . . . . . . . . 336
Восень . . . . . . . . . . . . . . . . . . 336
Сон . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 337
Адзіноцтва . . . . . . . . . . . . . . . . 337
Разбітае лётнішча . . . . . . . . . . . . . 338
Знявера . . . . . . . . . . . . . . . . . 338
Далёкае . . . . . . . . . . . . . . . . . 339
Відзенне Бацькаўшчыны . . . . . . . . . . . 340
«Цяпер я ў неба болей закаханы...» . . . . . . . . 340
Боль . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 340

«Тут жылі мы і болей не будзем тут жыць...» . . . . . 341
Суцэльнасць . . . . . . . . . . . . . . . . . 342
Залатое шуганне . . . . . . . . . . . . . . . 342
Уначы . . . . . . . . . . . . . . . . . . 343
Балада . . . . . . . . . . . . . . . . . . 343
«Прыглядаюся, каб не разбіцца...» . . . . . . . . . 344
На заходзе сонца . . . . . . . . . . . . . . 345
Анёл . . . . . . . . . . . . . . . . . . 346

Як сважыта к штодзённы

«Баюся тых дарог...» . . . . . . . . . . . . . 346
Стомленасць . . . . . . . . . . . . . . . . 347
Выгнанец . . . . . . . . . . . . . . . . . 347
«Вось і ноч. Як даўней — нікога...» . . . . . . . . 348
Малітва . . . . . . . . . . . . . . . . . 349
Акіян . . . . . . . . . . . . . . . . . . 349
Смутак . . . . . . . . . . . . . . . . . . 350
У пушчы . . . . . . . . . . . . . . . . . 351
Вокамгненне . . . . . . . . . . . . . . . . 351
Кавалкі холаду . . . . . . . . . . . . . . . 351
Вясна . . . . . . . . . . . . . . . . . . 352

Роздум

Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . . 353
Зялёная веліч . . . . . . . . . . . . . . . 353
Ля ціхай брамы . . . . . . . . . . . . . . . 354
Патрыёты . . . . . . . . . . . . . . . . . 355
«Занадта ўсё да сэрца я прымаў...» . . . . . . . . 355
Палітычная элегія . . . . . . . . . . . . . . 356
«Я з вамі быў і мог, як вы...» . . . . . . . . . . 356
Будучыня . . . . . . . . . . . . . . . . . 357
«Няздзейсненых слоў ужо годзе...» . . . . . . . . 357
Жывы ўспамін . . . . . . . . . . . . . . . . 358
З Новым Годам . . . . . . . . . . . . . . . 358
Маладым . . . . . . . . . . . . . . . . . 359
Суродзічы мае . . . . . . . . . . . . . . . 360

Слова

«Мяне чакае небыццё...» . . . . . . . . . . . 361
Нараджэнне песні . . . . . . . . . . . . . . 361
Сінія вочы . . . . . . . . . . . . . . . . 362
«Часта думаў я і думаю над гэтым...» . . . . . . . 363
Вёсцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . 363
Я не паэт . . . . . . . . . . . . . . . . . 364
«Звычайны я. Я славы не прыдбаў...» . . . . . . . . 365
Следам за песняй . . . . . . . . . . . . . . 365
Майму вершу . . . . . . . . . . . . . . . . 367
«Але і так жыццём дыхнуць...» . . . . . . . . . . 368
Элегійнае . . . . . . . . . . . . . . . . . 368
Простымі словамі . . . . . . . . . . . . . . 369
Зайздрасць . . . . . . . . . . . . . . . . 369

На спынку

Не явай, а вечным сном . . . . . . . . . . . . 370
Адчуванне начы . . . . . . . . . . . . . . . 371
«Я кожны дзень паміраю...» . . . . . . . . . . 371

Адзінота (з Рыльке) . . . . . . . . . . . . . . 372
«Жыжа» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 372
Сястры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 373
«Усё ізноў як і было...» . . . . . . . . . . . 374
Галубінае сэрца . . . . . . . . . . . . . . . 375

Ачышчэнне агнём

Жалейка . . . . . . . . . . . . . . . . . . 378
Адчуванне ўзлёту . . . . . . . . . . . . . . 379
Малітва . . . . . . . . . . . . . . . . . . 379
Паэт . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 380
Звальненне паэта . . . . . . . . . . . . . . 381
«Не дасягнуць, не ўзяць, не разгадаць...» . . . . . . . 381
Ноччу на балконе . . . . . . . . . . . . . . 382
Надзея . . . . . . . . . . . . . . . . . . 383
«Жыву цяпер я ў цёплай хаце...» . . . . . . . . . 383
Лампадка . . . . . . . . . . . . . . . . . 384
Грэшная душа . . . . . . . . . . . . . . . . 385
Безна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 385
«Я нездаволены самім сабой...» . . . . . . . . . 386
Сястры Дар'і . . . . . . . . . . . . . . . . 387
Сястра . . . . . . . . . . . . . . . . . . 387
«І ўсё я нечага чакаю...» . . . . . . . . . . . 388
Патаемнае . . . . . . . . . . . . . . . . . 389
Таямніца . . . . . . . . . . . . . . . . . 390
Мора ў паходзе . . . . . . . . . . . . . . . 390
Акіян і неба . . . . . . . . . . . . . . . . 391
Скарга хваляў . . . . . . . . . . . . . . . 392
Распяты Хрыстос . . . . . . . . . . . . . . 393
70 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 394

Санеты

Арфей . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 394
Лебедзь . . . . . . . . . . . . . . . . . . 395
Жаночая просьба . . . . . . . . . . . . . . 395
Святло і змрок . . . . . . . . . . . . . . . 396

Уяўленне

Венецыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . 396
Мая Lorelei . . . . . . . . . . . . . . . . 397
Ты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 398
«Я з вандраванняў толькі што вярнуўся...» . . . . . . 399
«Ты падабаешся ўсё мне...» . . . . . . . . . . 400
«Душа маркоціцца мая...» . . . . . . . . . . . 400
На паляванні . . . . . . . . . . . . . . . . 401

Прароцтва сівілаў

Прароцтва сівілаў . . . . . . . . . . . . . . 402
Айчына . . . . . . . . . . . . . . . . . . 403
Чужына . . . . . . . . . . . . . . . . . . 403
Сучасная балада . . . . . . . . . . . . . . 404
Атам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 405
Адзінокая маці . . . . . . . . . . . . . . . 406
«Dead end» . . . . . . . . . . . . . . . . . 407
Пра вусны ў ідалаў . . . . . . . . . . . . . 407
Бягун . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 408

Будуюць дом . . . . . 409
Адказ на запрашэнне . . . . . 409

Памяць
Восень . . . . . 410
Помнік славы . . . . . 411
Беларускім паэтам . . . . . 412
Беларусь . . . . . 413
Кросны . . . . . 419
Памяць . . . . . 422
Агонь . . . . . 424
Сказ пра нашу кабылу . . . . . 426
Бабулька . . . . . 430
Мая музыка . . . . . 434

А часу больш, чым вечнасць
Замала часу . . . . . 437
«З вітком гадоў ступаю ўсё цяжэй...» . . . . . 438
Сэрца . . . . . 438
Белыя воблакі . . . . . 441
На чужых загонах . . . . . 441
«У адзіноце блукаў я...» . . . . . 442
«На чужых на загонах...» . . . . . 443
Гора . . . . . 443
«Бяжыць вада, вірue...» . . . . . 444
Хвалі на моры . . . . . 444
«Безліч разоў качка дае нырца...» . . . . . 445
Восень . . . . . 445
«На дрэве, як маністы...» . . . . . 445
Зажурылася восень... . . . . . 446
Восень адмалацілася . . . . . 446
Восень — гаспадыня . . . . . 447
«Восень — гэта калі рэжуць авечак...» . . . . . 447
Павуцінкі . . . . . 447
Лістапад . . . . . 448
Дрэвы ў парку . . . . . 448
«Стаміліся пад вечар дрэвы ў парку...» . . . . . 449
«Пад вечар дрэвы сцішыліся ў парку гэтак...» . . . . . 449
«Аголелыя ў парку дрэвы...» . . . . . 449
Скарга бяскрылых, ці Як крылатыя дапамаглі бяскрылым (казка для дзяцей) . . . . . 450
«У думках я часта бываю цяпер у Менску...» . . . . . 451
«Я цэлае сваё жыццё аддаў слову...» . . . . . 452

## *Міхась Кавыль*

«Я іншоў па краі прадонпя...» . . . . . 454
Адзін, адзін . . . . . 454
Помніш, мама? . . . . . 455
У вір галавою . . . . . 455
Вячоркі . . . . . 456
Слёзы дрэў . . . . . 457
Ой ты, край мой . . . . . 457
Беларусь . . . . . 457
Турынгія . . . . . 458
Надзямельная песня . . . . . 459

Санет . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 460
Арла бачыў я . . . . . . . . . . . . . . . . . . 460
На Новы Год . . . . . . . . . . . . . . . . . . 461
«Я твой абраз, адзіную уцеху...» . . . . . . . . 461
У акіяне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 461
Ідзі, ідзі... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 462
Просьба . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 463
Каляндар . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 464
«Байдаркі і яхты... Бурхлівыя хвалі...» . . . . . . . . 466
Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 467
Дымок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 467
Боль . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 468
Жыццё . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 469
«Не люблю мудрагеляў млосных...» . . . . . . . . 469
Сон . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 470
Маўкліня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 470
«Бацькоўскі дом пакінуў я даўно...» . . . . . . . . . 470
«Бы мурашка, не па росту падымаю цяжар...» . . . . 471
Рандо . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 471
«Не было і няма...» І не трэба... . . . . . . . . . 472
Прашу не шмат . . . . . . . . . . . . . . . . . 472
«Прайшоў гулліві лівень...» . . . . . . . . . . . 473
Смага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 473
Не ўцячы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 474
Я душу невыгойна параніў . . . . . . . . . . . . 474
Канцона . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 475
«Вясну пазносілі пчолы ў вуллі...» . . . . . . . . 475
Прызнанне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 476
«Свішча вецер. Вечар. Косы...» . . . . . . . . . . 476
«Вочы заплюшчу — яна...» . . . . . . . . . . . 477
«Яшчэ снягоў не выкіпела пена...» . . . . . . . . . 477
Шчасце . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 478
Жураўлі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 478

## *Янка Юхнавец*

Цярністым шляхам . . . . . . . . . . . . . . . . 480
Яшчэ на ўсходзе не было світанку (у дзень 21 чэрвеня 1941 г.) 482
«Краскі пад узмахам ветру...» . . . . . . . . . . 483
Малюнак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 483
На руінах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 484
Вячэрні промень сонца пагасаў . . . . . . . . . . 484
«За допытам дарэмна допыт быў...» . . . . . . . . 485
«У краіну далёкую...» . . . . . . . . . . . . . . 486
«Дня апошняга не было...» . . . . . . . . . . . . 486
Эскіз . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 487
З чужога альбома . . . . . . . . . . . . . . . . 488
Жаданні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 489
«Дазволь цябе пацешыць і кахаць...» . . . . . . . 490
«Там, дзе зямля зрабілася вадой...» . . . . . . . . 490
«Хуртавіна снежная...» . . . . . . . . . . . . . 491
«Навошта мне апавядаць...» . . . . . . . . . . . 491
«Шастанні за вокнамі...» . . . . . . . . . . . . 492
Вадаспад штодня... . . . . . . . . . . . . . . . 493
Мамашка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 493
Вежы замкавыя . . . . . . . . . . . . . . . . . 494

«Ноч летняя. У садзе салаўі заспявалі...» . . . . . . . . 495
У тую ноч . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 496
«У ноч зімовую...» . . . . . . . . . . . . . . . 497
«У манастыры, у гэтым, свечку не цяплі...» . . . . . . . 497
Лісток на дрэве . . . . . . . . . . . . . . . . 498
«Спрадвечны той...» . . . . . . . . . . . . . . . 499
«Штогод адна і тая перавага...» . . . . . . . . . . . 499
«Вецер шасцеў за вокнамі...» . . . . . . . . . . . 500
«Галубка шызая,— у песні так пяецца...» . . . . . . . 500
У час дажджлівы . . . . . . . . . . . . . . . . 501
Успамін . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 502
«Пальцы калючыя хвояў...» . . . . . . . . . . . . 502
«Бы нейкі успамін цяжкі...» . . . . . . . . . . . . 503
«Маразянае звонкае ранне...» . . . . . . . . . . . 503
«Часіны надыходзяць усялякіх прадчуванняў...» . . . . . 504
«Лета, лета на зямлі ўсёй...» . . . . . . . . . . . 504
«...і слёзы дзяціныя — пачатак наш...» . . . . . . . . 505
Дарога . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 505
Касец . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 506
Сцюдзяніць . . . . . . . . . . . . . . . . . . 507
Не снілася . . . . . . . . . . . . . . . . . . 507
«Пачатак быў пачаткам сам...» . . . . . . . . . . . 508
Памятаецца . . . . . . . . . . . . . . . . . . 508
Ода рыдлёўцы . . . . . . . . . . . . . . . . . 509
Раніцою . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 510

## *Алесь Салавей*

### МАЕ ПЕСНІ

«Зямля мая — абсяг вялікіх скарбаў...» . . . . . . . . 512
Узыдзе ранак срэбны на лугі . . . . . . . . . . . 512
У мроях . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 513
Лідскае замчышча . . . . . . . . . . . . . . . 514
З вамі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 514
Пароша . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 515
Снягі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 515
«Ноч топіцца ў снягох, і ветравей скуголіць...» . . . . 515
Трыялет . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 516
«Зірнула сонца ў маю хату...» . . . . . . . . . . . 516
Хрыстосаў лёс . . . . . . . . . . . . . . . . . 516
Расці, цвіці . . . . . . . . . . . . . . . . . . 517
Максіму Багдановічу . . . . . . . . . . . . . . 517
Раманс . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 518

І заплакалі сумныя далі

Восень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 518
Раса . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 519
У вырай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 519
Апэлес і Аляксандр Македонскі . . . . . . . . . . 520
«І заплакалі сумныя далі...» . . . . . . . . . . . 520

Так блізка — і гэтак далёка

Раманс . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 521
Дождж . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 521
«Лёгкай рукою на шыбах узоры мароз вытыкае...» . . . . 522
На хуткіх крыллях вольнага Пегаса . . . . . . . . . 522

## СІЛА ГНЕВУ


Гамоніць даўнай праўды звон

Ты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 533
Радзіма . . . . . . . . . . . . . . . . . . 534
«Там, на пякельным таку, дзе цапамі малоцяць галовы...» . 535
«Выйдзі, паслухай — гучаць галаслівыя медныя трубы...» 536
Гуманізм . . . . . . . . . . . . . . . . . 536
Крыжовы шлях . . . . . . . . . . . . . . 538
Малітва . . . . . . . . . . . . . . . . . 539
Смутлівая маці . . . . . . . . . . . . . . 540

Да нашай явы берагоў

«Даволі спаць. Адчыніш вейкі...» . . . . . . . . . 540
«Не сагрэе сонца майго твару...» . . . . . . . . . 541
«Аблокаў плач — мая туга...» . . . . . . . . . . 542
Ялінка . . . . . . . . . . . . . . . . . . 542
Маленства . . . . . . . . . . . . . . . . 543
Спі... . . . . . . . . . . . . . . . . . . 544
«Пачні з Гамера ці пачні з Сакрата...» . . . . . . . 544

Жывому — жыць, знішчэнню — смерць

«Чорны крук закракаў на ўсё горла...» . . . . . . . . 545
«О не, не цёмным воблакам шпакі...» . . . . . . . . 546
«Толькі выгляне сонца з-за хмараў...» . . . . . . . 546
Зямля ў агні . . . . . . . . . . . . . . . 547
«Крыніцы звонкае струмень...» . . . . . . . . . . 548
«Пусціня... пусціня... пусціня...» . . . . . . . . . 548
«Дваццаты век. А ён... Хіба маўчыць паэт?..» . . . . . 549
Паклон . . . . . . . . . . . . . . . . . . 549
«Ужо тры дні, ужо тры дні...» . . . . . . . . . . 550
«Лясы. Узгоркі. Паплавы...» . . . . . . . . . . . 551
«Плыве вадаплаў і плыве...» . . . . . . . . . . . 551
«Нідзе не адступае...» . . . . . . . . . . . . . 552
Fröhliche Weihnachten . . . . . . . . . . . . . 553
Случанка . . . . . . . . . . . . . . . . . 554
«З агню вар'яцкага, з пякельнай цемрыні...» . . . . . 554
«Да жыцця ад пагібелі крочу...» . . . . . . . . . 555
Дваццаць тры . . . . . . . . . . . . . . . 555
«А ўсё ж мы вернемся дахаты, у айчыну...» . . . . . 556
Звіняць званы святой Сафіі . . . . . . . . . . . 557


## ВЯНКІ


«Вянкі, табе вянкі...» . . . . . . . . . . . . . 560
«Мне і ў цемру не забыцца...» . . . . . . . . . . 560
«Ён салодкі цяпер, але першы быў шмат саладзейшы...» . 561
«Снег ідзе... Вецер гуллівы да ліпаў — сясцёр сіратлівых...» 561
«Скажаш мне — і пайду...» . . . . . . . . . . . 561
«Дабрыдзень, мая зарніца!..» . . . . . . . . . . 562
«Найпершы парыў абяскрылены...» . . . . . . . . . 562
«Мінаюць дні. Прайшла вясна. Адззяць і лету...» . . . 563
«Аб табе успамін — найвышэйшая ўцеха...» . . . . . 563
«Хочацца плакаць — стрымваю слёзы...» . . . . . . . 563
Домік у Менску. Паэма . . . . . . . . . . . . 564

Несмяротнасць

I

Яшчэ не моўкнуць . . . . . . . . . . . . . . . . 574
Як вас... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 575
Цемра . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 576
Раство . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 576
Крывічы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 577
Няхай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 577
Заранка ўсходу . . . . . . . . . . . . . . . . 578
За . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 578
Праз неспагаду . . . . . . . . . . . . . . . . 579
Узвіў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 579
Надойсце . . . . . . . . . . . . . . . . . . 580
На ціхі бераг . . . . . . . . . . . . . . . . 580
Воддаль . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 581
Слова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 581
Змагаром народу . . . . . . . . . . . . . . . 582
Над Слуцкам днее . . . . . . . . . . . . . . 582
Не спіш спакойна . . . . . . . . . . . . . . 583
Ліст . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 583
Згода . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 584
Мала . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 584

II

На чыстым аркушы . . . . . . . . . . . . . . 585
Адзіноцтва . . . . . . . . . . . . . . . . . 586
Новы Год . . . . . . . . . . . . . . . . . . 586
Максім Багдановіч . . . . . . . . . . . . . . 587
І сонцу, і вясне . . . . . . . . . . . . . . 587
Сярод чароўных ніў . . . . . . . . . . . . . 588
Зірні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 588
Святая (На матыў Р. М. Рыльке) . . . . . . . 589
І хмурны нас радзее . . . . . . . . . . . . . 589
Звон . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 590
Паладын . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 590
Надзямным . . . . . . . . . . . . . . . . . 591
Развітанне . . . . . . . . . . . . . . . . . 591
У акіян . . . . . . . . . . . . . . . . . . 592
Сум . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 592
Прыпынак . . . . . . . . . . . . . . . . . . 593
У светлы дзень . . . . . . . . . . . . . . . 593
Святлярныя агні . . . . . . . . . . . . . . . 594
У ім і па-над ім . . . . . . . . . . . . . . 594
Зара . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 595
Восень (Р. М. Рыльке) . . . . . . . . . . . . 595

III

Чалом, чалом... . . . . . . . . . . . . . . . 596
Ну, што... . . . . . . . . . . . . . . . . . 596
Пакінуў я... . . . . . . . . . . . . . . . . 596
Не ўспамінай . . . . . . . . . . . . . . . . 597
Слуцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 597
Нішчым . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 597
Альны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 598

Спакой . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 598
Ад шумных рэк . . . . . . . . . . . . . 598
Сцюжа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 599
Silentium . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 599
Ідзеш, плывеш . . . . . . . . . . . . . . 599
За Порт Саід . . . . . . . . . . . . . . . . 600
Перад вясной . . . . . . . . . . . . . . . 600
Надойсце дня . . . . . . . . . . . . . . . 600
Узбудам хваль . . . . . . . . . . . . . . 601
Акіян . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 601
За годам год . . . . . . . . . . . . . . . . 601
Паўдзённы крыж . . . . . . . . . . . . . 602
У новы свет . . . . . . . . . . . . . . . . 602
Чаўны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 602
Як акіян . . . . . . . . . . . . . . . . . . 603
Зоры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 603
У цішыні . . . . . . . . . . . . . . . . . . 603
Вам хочацца . . . . . . . . . . . . . . . . 604
У добры час . . . . . . . . . . . . . . . . 604
Знічы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 604
Шлях . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 605
Кітай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 605
Наяве . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 605
Наўвеце . . . . . . . . . . . . . . . . . . 606
Кола . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 606
Імкніся ўсцяж . . . . . . . . . . . . . . 606

## З ВЕРШАЎ РОЗНЫХ ГАДОЎ

«У жылах шчах крыві струмень...» . . . . . . . . . . 607
«Трамвай — даўжэзная, танклявая труна...» . . . . . . 607
«Расцалаваў я алавік...» . . . . . . . . . . . . 608
«Бывай, Гэдэмэстэ, бывай...» . . . . . . . . . . . 608
Стаўся ўсюды госцем выпадковым . . . . . . . . . . 609
Успамін . . . . . . . . . . . . . . . . . . 610

## *Сяргей Ясень*

Яшчэ адно . . . . . . . . . . . . . . . . . 612
«З апошняй зоркай ночка дагарае...» . . . . . . . . 612
Музыка . . . . . . . . . . . . . . . . . . 613
Вугляконы . . . . . . . . . . . . . . . . . 613
І трэба ж было... . . . . . . . . . . . . . . 615
Восеньская песня . . . . . . . . . . . . . . 615

## *Анатоль Бярозка*

Адлёт жураўлёў . . . . . . . . . . . . . . . 618
Ліст да маці (пераклад з забытага) . . . . . . . . 618
«Сягоння патухла тваё акно...» . . . . . . . . . . 619
«Поле, далёка — шырокае поле... І неба над полем...» . . 620
«Тысячай воч палымяных, распаленых цемрай начною...» . 621
«Абяздолены мой стромы шлях...» . . . . . . . . . 621

Туга па Радзіме: Паэзія беларус. эміграцыі/
Т 81 Уклад., прадм. і біягр. даведкі Б. Сачанкі.— Мн.: Маст. літ., 1992.— 639 с.: іл.
ISBN 5-340-01086-6.
Тоска по Родине: Поэзия белорус. эмиграции.

У кнізе сабраны творы паэтаў беларускай эміграцыі XX стагоддзя. Большасць з іх у Беларусі друкуецца ўпершыню.

4702120000—112
Т ———————— БЗ 54—91
М 302(03) — 92

ББК84 Бел7

*Литературно-художественное издание*

**ТОСКА ПО РОДИНЕ**

**Поэзия белорусской эмиграции**

*Составитель*
*Саченко Борис Иванович*

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**ТУГА ПА РАДЗІМЕ**

**Паэзія беларускай эміграцыі**

*Укладальнік*
*Сачанка Барыс Іванавіч*

Рэдактар *У. А. Арлоў.* Мастак *В. А. Губараў.* Мастацкі рэдактар *А. І. Цароў.* Тэхнічны рэдактар *Л. М. Шлапо.* Карэктар *Я. Ф. Харко.*

ІБ № 3820
Здадзена ў набор 12.12.90. Падп. да друку 16.06.92. Фармат 84×108[1]/32. Папера афсетная. Гарнітура звычайная новая. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 33,60. Ум. фарб.-адб. 33,60. Ул.-выд. арк. 28,49. Тыраж 5000 экз. Заказ 1364.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.